КУЛЬТУРА ▸ ГРАМАДСТВА ▸ ЭКАНОМІКА ▸
ЛЮДЗІ ▸ ПАДЗЕІ ▸ ФАКТЫ

◂ № 8 (231) ◂ 25 лютага ◂ 2011 г.
www.novychas.org

# Новы Час

ISSN 2218-2144



**ЧАМУ ВЫБУХНУЛА ЛІВІЯ?**

Стар. 28

**МЫ ЧАКАЕМ ПАЧАТКУ, А ЁН — КАНЦА**

Пасля падзей 19-га снежня нямала апазіцыянераў з'ехалі за мяжу. Здрада ці выратаванне? Гэта ў віленскім Доме правоў чалавека Вольга Хвоін высвятляла ў давераных асобаў экс-кандыдатаў у прэзідэнты

Стар. 4

**ПАРКІНГ ЛЯ БЕЛАГА ДОМУ**

Так атрымалася, што прыкладна праз гадзіну з моманту, калі мой самалёт прызямліўся ў Вашынгтоне, я стаяла перад Белым Домам

Стар. 31

**ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ**

Стар. 9–24

**ЧЫТАЙЦЕ Ў НАСТУПНЫМ НУМАРЫ!**

**ВОСЕМ ЗМОВАЎ І АДНА РЭСПУБЛІКА**

Нарыс Сяргея Нікалюка з цыклу «Азбука паліталогіі»

▸ РОЗДУМ

# СПАЗНАЦЬ КОШТ ВЫБАРУ

Вольга ХВОІН

**Першы, можна сказаць, пробны прысуд Васілю Парфянкову па крымінальнай справе аб масавых беспарадках 19 снежня прайшоў хутка і гладка. На другім атрымалася замінка — відэазапісы з падзей каля Дома ўраду паказалі, што абвінавачванні расіянам Арцёму Брэусу і Івану Гапонаву не маюць доказнай базы. Суд абвясціў перапынак да 1 сакавіка для перакваліфікацыі абвінавачвання. Унутры Беларусі і за яе межамі чакаюць развіцця падзей, але ні тут, ні там не гатовыя да кардынальных дзеянняў.**



Атрымліваецца, што Гапонаў і Брэус два месяцы сядзелі ў турме, іх справу рыхтавалі да судовага разбіральніцтва, а ў выніку судзіць няма за што. Доказаў нападу на міліцыянтаў няма, вокны ў Доме ўраду хлопцы не білі, а адміністрацыйныя «суткі» за ўдзел у несанкцыянаванай акцыі ўжо адседзелі.

Суд над расіянамі можна разглядаць і як своеасаблівы палітычны рэванш рэжыму. Нягледзячы на дыпламатычныя захады, гэтых хлопцаў перавялі ў статус абвінавачаных, як намёк на тое, хто ў Беларусі камандуе. Хаця гэты самы «камандзір» вымушаны быў прыняць умовы Расіі і на пастаўкі энергарэсурсаў, і на падпісанне пагадненняў аб адзінай эканамічнай прасторы. Можна чакаць, што 1 сакавіка абвінавачванні Брэусу і Гапонаву будуць перакваліфікаваныя ў больш мяккія, адпаведна, з больш мяккімі пакараннямі — і авечкі цэлыя, і ваўкі сытыя.

Вяртаючыся да справы Васіля Парфянкова, можна сказаць, што гэта быў своеасаблівы лакмус на рэакцыю міжнароднай супольнасці і беларускага грамадства. Хоць праваабаронцы і казалі пра неперakanаўчую доказную базу, Васіля Парфянкова пакаралі 4 гадамі строгага рэжыму. У давесак ён мусіць кампенсаваць страты ў памеры 14 мільёнаў 700 тысяч рублёў за пашкоджаны будынак, вадасцёкавыя трубы, шкло і газон. З Еўропы прагучалі чарговыя заявы наконт непрымальнасці і заклапочанасці гэтым вырakам. Але больш жорсткіх крокаў, як тое абяцала вярхоўны прадстаўнік ЕС Кэтрын Эштан (у тым ліку дадатковых палітычных і эканамічных санкцый), у дачыненні да Беларусі не назіраецца. Натуральна, для ЕС Парфянкоў — фігура не такая знакавая, як, напрыклад, Някляеў ці Саннікаў, але ёсць сам факт першага прапушчанага ўдару.

Што тычыцца ўнутранай зваротнай рэакцыі, то ў шырокіх колах яна не выйшла далей асуджальных размоў на кухні. Градус незадаволенасці расце, але не дасягнуў таго пакасчыку, калі людзі гатовыя рызыкнуць сваёй бяспекай і дабрабытам. Разам з тым на заклік праваабаронцаў цягам некалькіх дзён сабралі грошы (14 мільёнаў беларускіх рублёў) для кампенсацыі шкоды за пабітыя вокны ў Доме ўраду. Грошы пералічылі на рахунак Галоўнага гаспадарчага ўпраўлення Адміністрацыі прэзідэнта, якое выставіла грамадскі пазоў да абвінавачаных па крымінальных справах за ўдзел у масавых беспарадках.

Беларуская Хрысціянская дэмакратыя ініцыявала кампанію «стань сведкам» з заклікам да людзей, якія прысутнічалі вечарам 19 снежня на плошчы Незалежнасці, прыходзіць у суды і выступаць у якасці сведак па справе. Сустаршыня БХД Віталь Рымашэўскі мяркуе, што калі б на суды адважыліся прыйсці сотні людзей, гэта было б вялікім пазітыўным знакам для беларускага грамадства. Дарэчы, тэрмін расследавання справы па частках 1 і 2 артыкулы 293 Крымінальнага кодэкса (масавыя беспарадкі) падоўжаны пракуратурай Мінска да пяці месяцаў.

Трэба прыгадаць і яшчэ адзін факт. Першы крымінальны прысуд па справе аб «беспарадках» 19 снежня вынесла суддзя Вольга Комар. Выявілася, што яна (у дзявоцтве Вольга Канойка) — выпускніца знакамітага беларускага, а потым зачыненага ўладамі Коласаўскага ліцэя. Гэта выклікала абурэнне ў апазіцыйных колах і паказала, што ўцёкі з аднаго ідэалагічнага поля ў іншае, якія б прыгожыя і разумныя перабежчыкі ні былі, не даруецца. «Для Васіля Парфянкова кошт ягонага выбару быў вызначаны Вольгай Комар — чатыры гады пазбаўлення волі. Але і Вользе, якая таксама зрабіла ў гэтай сітуацыі свой выбар, давядзецца спазнаць ягоны кошт», — напісаў водгук у «Народнай волі» дырэктар зачыненага Нацыянальнага гуманітарнага ліцэя Уладзімір Колас.

Поствыбарчыя падзеі сталі своеасаблівай маральнай чысткай. Ярка праявілі людзей з моцнай грамадзянскай пазіцыяй, кухонных рэвалюцыянераў, абыякавых і заангажаваных у палітыку Лукашэнкі. І рэзка негатыўная рэакцыя з апазіцыйнага боку на ўчынкі ці то міліцыянтаў, якія «выконвалі свой абавязак» 19-га, ці то суддзяў, што «выконваюць» яго цяпер — нармальны працэс структуравання грамадства. Гэта падзел не на франты і барыкады. А падзел на тых, хто не гандлюецца з уласным сумленнем і пачуццём годнасці. З улікам таго, што апошнія гады дэмакратычна арыентаваная супольнасць Беларусі жыве ад аднаго судовага працэсу да наступнага, даўно наспела крышталізацыя грамадзянскай свядомасці.

ПРЭЗЕНТАЦЫЯ

# «БЕЛАРУСЬ МЯЦЕЖНАЯ» ВЯРТАЕЦЦА

Аляксей ХАДЫКА

**Кандыдат гістарычных навук Ніна Стужынская прадставіла грамадству другое выданне сваёй кнігі «Беларусь мяцежная: з гісторыі ўзброенага антысавецкага супраціву: 1920-я гады».**

Кніга прысвечана малавядомым старонкам гісторыі змагання за свабоду і незалежнасць несавецкай Беларусі ў першае дзесяцігоддзе савецкага панавання. Публікацыя выйшла ў серыі «Невядомая гісторыя», выдавай Анатолем Тарасам

Фактычны адлік аповеду — Слуцкі збройны чын. Першае выданне выйшла да яго 80-годдзя, другім аўтар адзначыла 90-годдзе буйнейшага антысавецкага паўстання ў Беларусі. Дадаліся шматлікія фатаздымкі і архіўныя матэрыялы, якія Ніна Стужынская збірала ва ўстановах Расіі, Беларусі, Літвы, Польшчы і Германіі. Аўтарцы адчыніліся і былыя сакрэтныя сховішчы дакументаў НКУС. Больш падрабязна разглядаецца дзейнасць тайнай палітычнай арганізацыі «Зялёны дуб», якая каардынавала антыбальшавіцкі рух у Беларусі, напоўніліся дэталямі біяграфій Юркі Лістапада, Рамана Грача, Барыса Каверды і іншых.

Як адзначыла даследчыца, з гадамі працы над тэмай, «паменела пафасу, а ўзмацніўся ўзважаны навуковы падыход». Да таго ж і ўласны сацыяльна-палітычны досвед падкарэктаваў высновы. Гісторык — не суддзя, а прафесіянал, дадала яна, але зазначыла, што паралелі 1920-х і 1990–2000-х гадоў зрабіліся для яе яшчэ больш відавочнымі.

«Тое, што савецкую ўладу быццам рахманыя беларусы сустрэлі са слязьмі радасці на вачах — гэта міф, з якога можна толькі смяяцца. Але гэты міф пакуль застаецца ў падручніках», — зазначыла даследчыца.

Між тым, дзейнасць антысавецкага супраціву 1920-х магла зрабіцца падмуркам для сучаснай дзяржаўнай свядомасці беларусаў і ідэалогіі, якая дагэтуль выразна не сфармулявана. Дзеячы супраціву выказвалі настроі саспелага на мяжы XIX і XX стагоддзяў беларускага грамадства, якое марыла пра пабудову еўрапейскай незалежнай дэмакратычнай дзяржавы. Характэрна, што многія партызаны 1920-х удзень выходзілі на палеткі, а ўначы змагаліся з ворагамі — тымі, хто перашкаджаў мірнай стваральнай працы. Яскрава выяўлялася выразная рыса нацыянальнага беларускага характару — аддасць сям'і, прывязанасць да сваёй малой радзімы. Ніхто не хацеў саступаць і сыходзіць.

Тэма нацыянальнага беларускага супраціву 1920–1930-х гадоў для Ніны Стужынскай — і пуцяводная зорка, і выпрабаванне. У 2002 годзе першае выданне прынесла ёй прэмію імя Францішка Багушэвіча беларускага ПЭН-цэнтра: прыз уручалі Васіль Быкаў і Уладзімір Арлоў. Але зрабілася ўскосная прычынай яе выгнання з Інстытута гісторыі НАН Беларусі з ініцыятывы сталіністаў-рэтраградаў.

І зараз, дзеля палітыкі сённяшняга рэжыму і існавання рэтраграднага інстытуту ВАКу, які «фільтруе» навуковыя працы на прадмет ідэалагічнай лаяльнасці, абарона аўтаркай доктарскай дысертацыі ў Мінску практычна немагчымая. Але ёсць Варшава, Вільня, Кіеў — увогуле, вольны навуковы свет. Паступова даспявае беларускае грамадства. Калі першае выданне, сёння суцэльны рарытэт, да рэалізацыі дзесяць гадоў таму не прыняла нават ліберальная «Акадэмкніга», дзе кнігары «пабаяліся скандалу», то новы выпуск «Беларусі мяцежнай» можна будзе знайсці ў многіх кнігарнях. Рыхтуецца пашыранае выданне ў рускім перакладзе.

ПРАВЫ ЧАЛАВЕКА

# КОЛА ДОПЫТАЎ

Альбіна ВІШНЕЎСКАЯ

**Акрамя традыцыйных выклікаў у КДБ, міліцыю і пракуратуру, апазіцыйных актывістаў выклікаюць у контрвыведку і органы па барацьбе з арганізаванай злачыннасцю. Праз допыты па справе аб «масавых беспарадках» праходзяць па некалькі разоў.**



Праз трэці допыт давялося прайсці Вользе Піманавай, актывістцы ініцыятыўнай групы Някляева. Яе выклікалі ў бабруйскую міліцыю як сведку. Следчы Сяргей Грыневіч задаў ёй 33 пытанні пра акцыю 19 снежня. Сказаў, што іх даслалі з Мінска. Ужо двойчы Вольгу дапытвалі ў бабруйскім КДБ.

Брэсцкую актывістку Кацярыну Пашко на трэці раз выклікалі ва ўпраўленне па барацьбе з арганізаванай злачыннасцю і карупцыяй. Ёй адмовілі, каб пры допыце прысутнічаў прадстаўнік для абароны яе інтарэсаў. Актывістку знялі на відэа і ўзялі адбіткі пальцаў. Дзяўчыну распытвалі пра падзеі на плошчы 19 снежня. Паводле яе словаў, супрацоўнік упраўлення Сяргей Антанюк падчас допыту вёў сябе вельмі груба і пагражаў. Дагэтуль актывістку дапытвалі ў абласной пракуратуры і КДБ.

Ва ўпраўленні па барацьбе з арганізаванай злачыннасцю дапыталі і старшыню Брэсцкай гарадской арганізацыі Партыі БНФ Віктара Клімуса. У яго цікавіліся, да чаго заклікалі кандыдаты на плошчы ў Мінску 19 снежня. Актывіст таксама паведаміў пра «вельмі хамскія і пахабныя» адносіны супрацоўніка міліцыі Сяргея Антанюка, які, дарэчы, не сказаў пра свае пасаду.

Навагрудская актывістка БХД Дар'я Бахар прыйшла ў КДБ з даверанай асобай Таццянай Качагур і Канстытуцыяй. А калі камітэтчыкі сказалі даверанай асобе пакінуць кабінет, Дар'я зацытавала ім артыкулы Канстытуцыі аб праве мець свайго прадстаўніка. І сказала, што не будзе даваць паказанняў без даверанай асобы. «На гэта яны мне адказалі, што не могуць браць паказанні, і паклікалі ў кабінет панятых, каб тыя засведчылі, што я адмовілася даваць паказанні. Я ж, у сваю чаргу, у пратаколе дапісала, што супрацоўнікі КДБ адмовіліся браць паказанні ў прысутнасці маёй даверанай асобы», — паведаміла актывістка Радыё «Свабода».

У Мазырскім аддзеле КДБ дапыталі калінкавіцкую актывістку БХД Тамару Зайцаву. Яна не была ў Мінску 19 снежня, а назірала ў гэты дзень у Калінкавічах за галасаваннем. Але паколькі дома яна не начавала, яе вырашылі залічыць у сведкі сталічных «масавых беспарадкаў». Допыт праводзіў оперупаўнаважаны Васіль Прыходзька.

У Светлагорску камітэтчыкі адмыслова прыехалі дадому да Святланы Міхальчанкі, каб адвесці яе на допыт. Бо ў жанчыны, кіраўніка раённай арганізацыі партыі левых «Справядлівы свет», баліць нага, і ёй складана рухацца. Святлана была толькі на Кастрычніцкай плошчы і не рушыла на плошчу Незалежнасці з прычыны хворай нагі.

У Бялынічах у адсутнасць гаспадароў правяліператрус у кватэры Алега Мяцеліцы, даверанай асобы экс-кандыдата Някляева. Там зараз часова пражывае іх знаёмы. Нічога цікавага чэкісты не знайшлі і з'ехалі ні з чым.

У Віцебскім абласным упраўленні КДБ дапыталі як сведку актывістку руху «За свабоду» Тамару Карызну. Яна не была на акцыі 19 снежня. І следчы пачаў распытваць пра перадвыбарчую дзейнасць экс-кандыдата Алеся Міхалевіча, у камандзе якога працавала актывістка.

Звольнілі з працы Уладзіслава Варанецкага, кіраўніка віцебскага выбарчага штаба Андрэя Саннікава. Ён працаваў на Віцебскім заводзе электравымяральных прыбораў. Начальнік у адкрытую сказаў, што звальняе хлопца з-за яго палітычнай дзейнасці, бо не хоча праблемаў. На прадпрыемства прыходзіла міліцыя, праводзіліся «гутаркі» наконт апазіцыянера.

У Рагачове гэбісты дапыталі сябра АГП Уладзіміра Тамковіча, які каардынаваў у раёне працу назіральнікаў і меў на выбарах стасункі з прадстаўнікамі АБСЭ. «Мэта была — папярэдзіць мяне пра наступствы за дыскрэдытацыю Рэспублікі Беларусь», — сказаў ён у інтэрв'ю «Свабодзе». Уладзімір Тамковіч падаваў скаргі наконт падліку галасоў.

А ў дачыненні да рэдактара і выдаўца газеты «Вольнае Глыбокае» Уладзіміра Скрабутана пракуратура вядзе праверку наконт «негатыўных» выказванняў пра Лукашэнку. Яго дапыталі і заявілі, што хочуць вынесці папярэджанне з прычыны недапушчальнасці падобных выказванняў. «Данеслі» на рэдактара праўладныя назіральнікі з выбарчага ўчастку, дзе ён галасаваў.

Скрабутан патлумачыў, што на выбарчым участку ў размове са знаёмай супрацоўніцай райвыканкама ён проста агучыў сацыялагічныя даследаванні. І давёў, што станоўчы рэйтынг Лукашэнкі напярэдадні выбараў складаў 35–40 працэнтаў. Назіральнікі распачалі спрэчку, што ён набярэ 80 працэнтаў галасоў. Скрабутан адмаўляе, што ён пагражаў «зладзіць рэвалюцыю» і «ўсіх узарваць», як потым было напісана ў скарзе.

У пракуратуры заявілі, што будуць праводзіць праверку далей. Гэта значыць, як паведаміла «Свабода», будуць шукаць сведак, якія чулі змест гаворкі на выбарчым участку.

ЗВАРОТ

# КВАТЭРУ СУДДЗІ!

**Жыхары Астравецкага раёна заступіліся за Аляксандра Дзямешчыка.**

Зварот на імя міністра юстыцыі і старшыні Гродзенскага абласуда, напісаны з ініцыятывы актывіста Руху «За Свабоду» Івана Крука, падтрымалі 18 чалавек. Выканаўчыя ўлады Астраўца ўжо каля трох гадоў не забяспечваюць старшыню раённага суда спадара Аляксандра Дзямешчыка службовым жытлом. Суддзя вымушаны штодзень дабірацца на працу са Смаргоні. Ён губляе вельмі многа часу на дарогу ў суд і дамоў. Улічваючы вялікую нагрузку на працы, у Дзямешчыка практычна не застаецца часу на стасункі са сваёй сям'ёй.

Актывіст Руху «За Свабоду» падазрае, што старшыня Астравецкага райвыканкама сп. Кавальчук наўмысна адцягвае рашэнне жыллёвага пытання старшыні райсуда, каб трымаць яго «на кароткім ланцужку прасіцеля».

Паводле Івана Крука, суддзя Дзямешчык намагаецца добрасумленна выконваць свае абавязкі, заўсёды імкнецца разабрацца ў сутнасці справы і выносіць справядлівае рашэнне, праз што заслужыў павагу жыхароў раёна.

Жыхары Астраўца просяць міністра неадкладна вырашыць жыллёвае пытанне Дзямешчыка, а таксама звяртаюцца да старшыні Гродзенскага абласуда з просьбай кампенсаваць суддзі транспартныя выдаткі цягам апошніх трох гадоў.

**Паводле інфармацыі Руху «За Свабоду»**

ДЫКТОЎКА

# АНШЛАГ У ДВА ЗАХОДЫ

Алена ВАРАЖБЕЙ

**Беларуская дыктоўка ў Мінску прайшла з аншлагам. У Літаратурным музеі Максіма Багдановіча давялося тэрмінова дадрукоўваць бланкі лістоў. А саму дыктоўку з нагоды Міжнароднага дня роднай мовы праводзіць у два этапы.**

«Сёння такі ажыятаж. Мы, вядома, не чакалі», — сказала Алена Анісім, намесніца старшыні Таварыства беларускай мовы.

Арганізатары адзначылі сімвалічнасць сёлетняга мерапрыемства. Вуліца Максіма Багдановіча, на якой знаходзіцца аднайменны музей, творы паэта для дыктоўкі і юбілейны год Максіма Багдановіча.

У залі музея 21 лютага дыктоўку правялі для дзвюх групаў. Як паведаміў Алег Трусаў, у ёй узялі ўдзел каля 150 чалавек.

На яго думку, людзі ў няпростай моўнай сітуацыі хочуць сябе праявіць. «То бок гэта праява патрыятызму. Чалавек прыйшоў пісаць дыктоўку ў Дзень роднай мовы. Ён паказвае, што ён беларус. Што ён за незалежнасць, як і Багдановіч. І тэксты мы падабралі адпаведныя».

Для IV Усеагульнай дыктоўкі, нагадаем, былі прапанаваныя на выбар верш Максіма Багдановіча «Я хацеў бы спаткацца з Вамі на вуліцы...» і яго празаічны тэкст «Хто мы такія?».

Арганізатары звярнулі ўвагу на асвятленне мерапрыемства ў СМІ. Пра яго распавядалі не толькі неафіцыйныя выданні, але і дзяржаўныя, у тым ліку беларускае тэлебачанне.

«Канечне, людзей кожны год большае, — рэзюмавала Алена Анісім. — І гэты год не стаў выключэннем. І асабліва ўсцешна, што далучаецца моладзь. І не толькі тыя, хто ведае, што такое ТБМ і з'яўляецца сябрам ТБМ. А і многа новых людзей. Шанаванне роднай мовы і жаданне штосьці зрабіць на яе карысць, дзеля яе папулярызацыі, дзеля яе пашырэння ўжывання ў грамадстве, — гэта вельмі і вельмі важна. І менавіта гэтае жаданне прысутнічала ў людзей».

На дыктоўку прыйшоў і сакратар пасольства Расійскай Федэрацыі. «І ён пісаў дыктоўку. І даволі добра напісаў», — паведаміла Алена Анісім.

Таварыства беларускай мовы правядзе яшчэ дыктоўкі па творах Багдановіча. Яны ладзяцца ў сядзібе ТБМ (вул. Румянцава, 13) — 15 і 25 сакавіка. Пачатак а 18-й гадзіне.

## ТЫДНЁВЫ АГЛЯД

# ВЫСОКІЯ ПАГРОЗЫ, «ГАЛУБЯТНІ» І ЗАЛАТАЯ БУЛЬБА

Генадзь КЕСНЕР

**Набраўшыся сілаў падчас адпачынку ў Сочы, кіраўнік Беларусі зноўку абрынуўся на сваіх тутэйшых і замежных апанентаў, не абмяжоўваючы сябе ў выразах. Ён таксама заявіў, што можа выкарыстаць армію для забеспячэння канстытуцыйнага парадку ў краіне.**

Беларускі прэзідэнт ніколі не лезе ў кішэню за словам, асабліва калі яго перапаўняюць эмоцыі, тым больш адмоўныя. Вельмі нервова рэагуе афіцыйны беларускі лідар на ўсё, што тычыцца мінулых прэзідэнцкіх выбараў, якія міжнародная супольнасць не прызнала свабоднымі і справядлівымі. Асаблівую рэакцыю ў кіраўніка дзяржавы выклікаюць санкцыі, што ўжо ўведзены Еўрасаюзам у дачыненні да яго самога і яшчэ 156 асобаў, якім выстаўляюць за віну пераслед апанентаў дзейнай улады, асабліва пасля трагічных падзей 19 снежня і ў наступныя дні.

Аляксандр Рыгоравіч зноў допусціў не вельмі прыстойныя (альбо вельмі не прыстойныя) выказванні на адрас міністра замежных спраў ФРГ Гіда Вестэрвеле. Адказваючы на пытанні журналістаў 19 лютага, прэзідэнт заявіў літаральна наступнае: «Яны нас закалыхвалі, Захад нас закалыхваў, прыехалі тут вялікія дзеячы правільнай і няправільнай арыентацыі, і мяне ўжо пачалі папракаць у тым, што я, бачце вы, асудзіў "галубятню" гэтую і гэтак далей. Ну, не падабаюцца мне блакітныя, я і сказаў, што не падабаюцца. Бачце вы, асобныя міністры замежных спраў на мяне пакрыўдзіліся. Чаго на мяне крыўдзіцца? Мы ў дэмакратычным грамадстве жывем, тым больш я прэзідэнт і маю права выказаць свой пункт гледжання і сваю пазіцыю. Я яму чэсна і сказаў гэта ў вочы. І за гэта, бачце вы, яны крыўдзяцца. Нармальны лад жыцця трэба весці. Мы яго (ненармальны лад жыцця — заўв. Г. К.) не прымаем, і нам не трэба яго навязваць. У Германіі гэта магчыма, у Польшчы — калі ласка, няхай яны там гэтым займаюцца, а нам сюды гэтага не трэба. Хаця гэтага дабра хапае, на жаль».

Што ж, сапраўдная плынь найвышэйшай талерантнасці і павагі да высокапастаўленых еўрапейскіх палітыкаў.

Праз некалькі дзён Аляксандр Лукашэнка зрабіў прызнанне, якое выклікала цэлую хвалю эмоцый у беларускім грамадстве. Кіраўнік Беларусі заявіў, што гатовы звярнуцца па дапамогу да вайскоўцаў для прадухілення спробаў звяржэння канстытуцыйнага ладу. Разам з тым, Лукашэнка падкрэсліў, што пойдзе на такія меры толькі ў выключных выпадках. З такой заявай Лукашэнка выступіў 21 лютага падчас наведвання Другой інжынернай брыгады ўзброеных сіл. У той жа час кіраўнік дзяржавы заявіў, што сістэма бяспекі Беларусі «вытрымала выпрабаванне на трываласць, пацвердзіла правамернасць прынятых раней рашэнняў, паказала ўсяму свету, як абараняць нацыянальныя інтарэсы і не дазваляць далучаць сябе да хаосу дзяржаўных пераваротаў».

Натуральна, тут мелася на ўвазе спецаперацыя 19 снежня па разгону масавай акцыі пратэсту, у выніку якой за кратамі апынуліся амаль сямсот чалавек, у тым ліку абсалютная большасць кандыдатаў у прэзідэнты. 42 чалавекі абвінавачваюцца ў арганізацыі і/альбо актыўным удзеле ў масавых беспарадках. Наступствы для гэтых людзей могуць быць вельмі адмоўнымі, прыкладам таму — прысуд, вынесены выпускніцай зліквідаванага ўладамі Нацыянальнага гуманітарнага ліцэя імя Якуба Коласа, а сёння суддзёй суда Фрунзенскага раёна Мінска Вольгай Комар сябру выбарчага штаба Уладзіміра Някляева Васілю Парфянкову ў выглядзе чатырох гадоў пазбаўлення волі ў калоніі строгага рэжыму. А што будзе далей?

Аднак у клетцы сядзелі два юнакі, аднаму з якіх 23, а другому — 28 гадоў, прычым абодва выглядалі даволі інтэлігентнымі асобамі, на выгляд, не здольнымі на інкрымінуемыя ім злачынствы. Відаць, гэта падчас судовага пасяджэння зразумеў і сам дзяржаўны абвінаваўца Кунаш. Бо пасля допыту сведак — супрацоўнікаў міліцыі Алега Дударчыка і Аляксандра Якаўлева, паказанні якіх былі, мякка кажучы, не пераканаўчымі, а таксама вывучэння відэаматэрыялаў справы пракурор заявіў хадайніцтва аб аб'яўленні ў судовым пасяджэнні перапынку да 1 сакавіка, таму што, па словах Сяргея Кунаша, у яго ўзнікла неабходнасць перафармуляваць і выставіць расіянам новае абвінавачанне. Юрысты ў адзін голас кажуць, што Брэусу і Гапонаву будуць інкрымінаваць іншы артыкул Крымінальнага кодэкса, які прадугледжвае не такое суровае пакаранне.

Такім чынам, застаецца пачакаць да вясны ў літаральным сэнсе гэтага слова. Дарэчы, 1 сакавіка стане сапраўды «судным днём», бо, апроч Гапонава і Брэуса, у Маскоўскім райсудзе сталіцы пачнецца разгляд справы абвінавачанага ва ўдзеле ў масавых беспарадках Дзмітрыя Мядзведзева (во дык супадзенне!), а ў судзе Фрунзенскага раёна сталіцы пачнуцца працэсы над прэс-сакратаром экс-кандыдата ў прэзідэнты Андрэя Саннікава Аляксандрам Атрошчанкавым, якому інкрымінуюць арганізацыю масавых беспарадкаў (ад 5 да 15 гадоў пазбаўлення волі), і над Змітром Новікам, якому «шыюць» удзел у масавых беспарадках.

Тым часам чухаюць патыліцы і людзі, якія вельмі далёкія ад палітыкі і актыўнага грамадскага жыцця. Усе з жахам чакаюць жыровак з паявлячанымі сумамі для аплаты камунальных паслуг, а калі глядзяць на цэннікі ў крамах, якія мяняюцца ледзь не штодня, то самы час назапашваць валер'янку. Кошты на грэчку, якая ўжо зрабілася недасягальным прадуктам для вялікай колькасці беларусаў, у некаторых гандлёвых кропках ужо перавысілі 18 тысяч айчынных рублёў за 900-грамовы пакуначак, двойчы за некалькі тыдняў даражэў цукар, растуць кошты на мяса і малочную прадукцыю. Але мяне асабіста больш за ўсё ўразілі кошты на «нацыянальны скарб» Беларусі — бульбу. 23 лютага (мо, спецыяльна да так званага мужчынскага свята — Дня абаронца Айчыны?) кошт кілаграма гэтага карняплоду на рынку «Максімус» у Мінску сягнуў 3 800 рублёў! Вось так! Бульбачка, як і грэчачка, ужо зрабіліся залатымі прадуктамі. Смачна есці!



## ФІГУРЫ ТЫДНЯ

### АНТОН КУШНІР




Беларускі спартсмен Антон Кушнір перамог на этапе Кубка свету па фрыстайле ў раздзеле «лыжная акрабатыка», што адбыўся ў АСК «Раўбічы». Тыдзень таму ён першынстваваў на аналагічных спаборніцтвах у Маскве.

Антон Кушнір набраў 256,31 бала і стаў залатым прызёрам спаборніцтваў, малады спартовец Дзяніс Восіпаў — бронзавым прызёрам з вынікам 237,42 бала. Срэбра заваяваў украінец Станіслаў Краўчук — 244,49 бала.

Для Антона Кушніра, які ў мінулым сезоне быў лепшым у Кубку свету, гэта трэцяя перамога на кубкавых этапах у цяперашнім сезоне. Дзяніс Восіпаў прызёрам падобных спаборніцтваў стаў упершыню. З-за траўм цяперашні сезон прапускаюць вядомыя беларускія фрыстайлісты Дзмітрый Дашчынскі і Аляксей Грышын.

### СЯРГЕЙ МУСІЕНКА



Заяву кіраўніка Аналітычнага цэнтра «ЕСООМ» Сяргея Мусіенкі агенцтву «Інтэрфакс» пра тое, што ўлады, з падачы набліжанага да дзяржорганаў дырэктарата дзяржпрадпрыемстваў, рыхтуюць прававое поле для наменклатурнай прыватызацыі, ацанілі як занадта смелую для прадстаўніка наменклатуры.

«Ніхто ніколі не адмаўляў, што ў значнай частцы тых, хто мае ўладу, ёсць вострае жаданне правесці наменклатурную прыватызацыю. Хтосьці стаіўся і сядзіць на нізкім старце. Зараз гэтыя працэсы рыхтуюцца больш граматна ў параўнанні з пачаткам 90-х гадоў», — сказаў Мусіенка, каментуючы праект плану мерапрыемстваў па рэалізацыі палажэнняў дырэктывы № 4.

Па рэкамендацыях Рэспубліканскай асацыяцыяй прадпрыемстваў прамысловасці ў план уваходзіць прапанова аб магчымасці перадачы топ-мэнэджэрам дзяржпрадпрыемстваў долі ўласнасці. План, які мяркуюць зацвердзіць сумеснай пастановай урада і Нацбанка, прадугледжвае магчымасць прыняцця агульным сходам акцыянераў рашэння пра выкуп акцый уласнай эмісіі за кошт чыстага прыбытку «з мэтай наступнай іх перадачы мэнэджменту прадпрыемства». Акрамя таго, праект прадугледжвае магчымасць «накіравання часткі чыстага прыбытку дзяржаўных і напаўдзяржаўных арганізацый на набыццё акцый, якія належаць Рэспубліцы Беларусь па намінальным кошце». Прэзідыўм Саўміна 18 лютага ў цэлым ухваліў праект плану мерапрыемстваў па рэалізацыі дырэктывы № 4. Разам з тым кіраўнік Беларусі Аляксандр Лукашэнка заявіў, што не допусціць у краіне наменклатурнай прыватызацыі. «Гавораць, прайшлі выбары — і пачнецца наменклатурная прыватызацыя. Не будзе ніякай наменклатурнай прыватызацыі ў Беларусі ніколі. Ні Лукашэнка, ні яго дзеці не атрымаюць ні аднаго кавалка ад дзяржаўнай уласнасці проста так», — сказаў кіраўнік дзяржавы журналістам.

### УЛАДЗІМІР НЯКЛЯЕЎ



Беларускі ПЭН-цэнтр з прапановы паэта Генадзя Бураўкіна прыняў рашэнне вылучыць Уладзіміра Някляева на атрыманне Нобелеўскай прэміі па літаратуры. ПЭН-цэнтр мае права высоўваць кандыдатуры на саісканне Нобелеўскай прэміі, аднак у ідэале неабходныя рэкамендацыі замежных ПЭН-цэнтраў і нобелеўскіх лаўрэатаў, таму беларуская арганізацыя будзе працаваць у гэтым кірунку. Неабходна будзе правесці працу і па перакладзе твораў Някляева на еўрапейскія мовы, у прыватнасці на англійскую і шведскую. Някляеў — аўтар больш чым 20 кніг паэзіі і прозы, лідар руху «Гавары праўду!», экс-кандыдат у прэзідэнты Беларусі. У дзень прэзідэнцкіх выбараў Някляеў быў збіты, змешчаны ў СІЗА КДБ. 29 снежня яму было прад'яўлена абвінавачванне ў арганізацыі і ўдзеле ў масавых беспарадках у Мінску ўвечары 19 снежня (арт. 293 Крымінальнага кодэкса, да 15 гадоў пазбаўлення волі).

Пісьменнік і выдавец Адам Глобус у сваім LJ выступіў з рэзкай крытыкай на адрас Някляева. «Палітолаг Андрэй Іларыёнаў пра падзеі ў Мінску сказаў: "З расійскага боку рыхтавалася правакацыя пад назвай 'Імітацыя аранжавай рэвалюцыі'. Менавіта такога роду правакацыю расейскія ўлады і рыхтавалі…" Я б не паверыў Іларыёнаву, каб не ведаў імітатара. Безумоўна, наш Някляеў, як быў, так і застаўся імітатарам. Усё, за што ён калісь браўся, было развалена, разбурана і панішчана. Ён развaліў самы ўплывовы часопіс «Крыніца», ён развaліў Саюз пісьменнікаў, ён развальвае і дыскрэдытуе апазіцыйны рух. Ніякіх палітычных перакананняў у імітатара няма і ніколі не было; ні тады, калі ён чытаў вершы на з'ездзе КПСС, ні цяпер, калі чытаў гумарыстычныя куплеты замест праграмы неабходных дзеянняў… Дзяржава не адрозніваe імітатараў рэвалюцыі і рэвалюцыянераў, яны для яе ўсе на адзін твар», — зазначае Глобус.

ЭМІГРАЦЫЯ

# МЫ ЧАКАЕМ ПАЧАТКУ, А ЁН — КАНЦА

**Пасля падзей 19-га снежня нямала людзей з апазіцыйнага актыву з'ехалі за мяжу. Многія ўсур'ёз думаюць пра тое, каб змяніць краіну і свой лёс. Здрада ці выратаванне? Гэта ў віленскім Доме правоў чалавека Вольга Хвоін высвятляла ў Віктара Гарбачова, Алега Мяцеліцы і Андрэя Бабіцкага, давераных асобаў экс-кандыдатаў у прэзідэнты.**



Віктар Гарбачоў



Андрэй Бабіцкі



Алег Мяцеліца

**Віктар Гарбачоў, лідар кампаніі «За свабоднае развіццё прадпрымальніцтва», быў даveранай асобай Уладзіміра Някляева**

— 20 снежня ў тры гадзіны ночы да мяне дадому прыйшлі прадстаўнікі праваахоўных органаў. Пайшлі да няпоўнагадовага сына ў школу, паспрабавалі яго «выклікаць на шчырую размову». Радуе, што настаўнікі не дазволілі гэта зрабіць, сказалі, што калі ім трэба бацька, дык хай шукаюць яго і з ім размаўляюць. Днём зноў прыехалі да майго дома з пажарнай машынай — спрабавалі ўвайсці ў кватэру праз вакно. Жонка ім адчыніла дзверы, але, натуральна, мяне не знайшлі. Быў вобшук у маёй маці. На допыты выклікалі дачку.

Прадстаўнікі спецслужбаў ішлі літаральна па маіх слядах. Я жыў у адным месцы, потым мяняў месца знаходжання, і праз дзень туды прыходзілі спецслужбісты. І гэта ва ўмовах, калі ўсе тэлефоны былі адключаныя, ніякіх кантактаў не было. Мне нічога не заставалася, як з'ехаць з краіны, каб заставацца на свабодзе. Я з'ехаў ужо ў студзені, далучыўшыся да сваіх сяброў па шчасцю. Па шчасцю — бо гэта людзі, якія неабыякавыя, гатовыя працаваць, і не на словах, каб у Беларусі адбыліся перамены. Цяпер не стаіць пытанне пра тое, каб прасіць палітычны прытулак. Найперш актуальнае вызваленне палітвязняў. Мы расказваем, што насамрэч адбылося 19-га снежня і пазней, падтрымліваем адносіны з актывістамі як унутры Беларусі, так і за яе межамі.

**Алег Мяцеліца быў даveранай асобай Уладзіміра Някляева, намеснікам рэспубліканскага передвыбарчага штабу**

— Гэта была першая Плошча, на якой я змог пабываць, — можна сказаць, мая мара. Пачынаючы з 2001 года мяне перад кожнымі выбарамі садзілі на «суткі». Цяпер былі прынятыя ўсе меры бяспекі. 17 снежня ўвечары мы з Юрыем Алейнікам цудам змаглі адарвацца ад праследу. За намі на трох машынах ганяліся хвілін 40 у раёне Акадэміі навук. Мая дачка тады была побач, дык сказала, што толькі ў кіно такое бачыла. Мы з'ехалі на кватэру, якая нідзе не была «засвечаная». 19-га каля штабу было многа людзей — журналісты,назіральнікі. Нам падавалася, што гэта надзейны варыянт, каб дайсці і даставіць апаратуру. Што адбылося, мы ўсе ведаем. Я асабіста выносіў Някляева на руках. З кім ні размаўляў — ніхто не памятае твараў тых, хто збіваў людзей, усё адбылося вельмі хутка.

Калі быў разгон, мы прарвалі ачапленне вайскоўцаў з боку БДУ. У метро жанчына на ўваходзе крыкнула: «Хлопцы, не трэба жэтонаў! Бяжыце ўніз!» Ноччу-днём ішлі зачысткі, мы зразумелі, што сядзець на дне бессэнсоўна. Ноччу нас на машыне вывезлі ў Невель у Расіі. Мэта была — Вільня. Добра, што тут ёсць беларускі Дом правоў чалавека — пляцоўка, з якой можна пачынаць нешта рабіць. Мы ехалі на два дні, на тры, потым на дзесяць, потым на месяц, на два... Хто хоча нешта рабіць для Беларусі, едзе ў Варшаву, Кіеў, Вільню. Хто хоча атрымаць выгоду з сітуацыі, едзе ў краіны з лепшымі сацыяльнымі ўмовамі — Швецыю, Францыю, Бельгію, Чэхію. У Беларусі засталася мая сям'я — жонка і двое дзяцей.

Мне страшна, калі мае дзеці будуць жыць у такой краіне. Таму я баюся, але нешта раблю. Думаю, сваякам лягчэй, калі яны ведаюць, што родныя людзі не за кратамі, а на волі. Гэта своеасаблівы адказ тым, хто часам вінавацяць нас ледзьве не ў здрадніцтве. У папярэдніх кампаніі я даў сябе затрымаць на суткі, і якая карысць з таго была? Тут мы нешта робім — адразу пайшлі ў Чырвоны крыж, Сейм. Імкнёмся сабраць факты таго, што на Плошчы была правакацыя.

**Андрэй Бабіцкі, каардынатар кампаніі «Еўрапейская Беларусь», быў даверанай асобай Андрэя Саннікава**

— Мы пабачылі, як забіраюць актывістаў, нашых сяброў, узломваюць рэдакцыі недзяржаўных СМІ. Сустрэліся з родзічамі тых, хто ўжо сядзіць. І яны сказалі нам: «З'язджайце!» У Беларусі засталіся бацькі, сястра і каханая дзяўчына. Імкнёмся з роднымі падтрымліваць адзін аднаго хаця б маральна, бо я разумею, у якой сітуацыі яны там засталіся. Дадому прыходзяць невядомыя, супрацоўнікі КДБ, пытаюцца, дзе я. Але сям'я была маральна гатовая да такога, бо ведала, чым я займаюся і ў якой краіне мы жывём.

***— Не баіцеся, што вашыя жанчыны вас не дачакаюцца?***

**Андрэй Бабіцкі:** Ну, канешне, думаю пра гэта. Але ёсць вера, што з сем'ямі будзе ўсё добра, што даб'ёмся справядлівасці.

**Віктар Гарбачоў:** Я ўпэўнены, што мая жонка мяне не кіне. Мы жывыя, здаровыя і духам не падаем.

**Алег Мяцеліца:** Лукашэнку шкада. Мы чакаем пачатку, а ён — канца. Наша будучыня наперадзе.

***— Калі вы ўвязваліся ў палітычную кампанію, напраўду разлічвалі, што Лукашэнка добраахвотна аддасць уладу?***

**Алег Мяцеліца:** Калі б не спадзяваўся, што нешта зменіцца, дык і не жыў бы. Як можна жыць без надзеі?! Калі мы не зробім гэта, то будуць вымушаныя зрабіць нашыя дзеці. Да таго ж, калі б не было акцый пратэсту пасля гэтых «выбараў», у дэпрэсію ўпала б мноства людзей. Не кажу, што мусіў быць жорсткі сцэнар, але быў разлік на вялікую колькасць людзей. Тады мы маглі б стаяць доўга, абараняць Плошчу. Ведаю, што былі такія настроі нават сярод вайскоўцаў і міліцыянтаў. Але было бачна, што Плошча праспешвалася. Не буду называць асобаў, магчыма, яны гэта рабілі неасэнсавана, паддаліся на правакацыі, але факт праспешвання быў. Папросту не хапіла часу кандыдатам, каб арганізаваць групу, што мусіла спыняць правакацыі. Усё навальвалася камяком, людзей падсоўвалі да гэтых дзвярэй.

***— Ці не было ў вас на плошчы Незалежнасці адчування нестандартнага сцэнару?***

**Андрэй Бабіцкі:** Калі даведаўся пра Някляева, то адразу стала зразумела, што ўжо ненармальна. Радуе, што па праспекту прайшлі ювелірна — ніводнае шкло не было пашкоджанае, ніводная машына. Бачыць аграмадны натоўп, канца і пачатку якога не бачна, людзей з агнём спадзеву ў вачах вельмі прыемна. Я асабіста стараўся не дапускаць правакацый. Мы рабілі перыметр з боку Дома ўраду з людзей, потым бачу нейкага чалавека, які бяжыць са сцягам і крычыць: «Наперад!» Але спыніць натоўп мы не змаглі, бо не чакалі такой правакацыі. Не хапіла Цэнтралізаванага загаду забяспечыць парадак. Віна не віна, але арганізавацца мы не змаглі.

***— Адзін з кандыдатаў прызнаўся да выбараў, што разумее — могуць быць ахвяры. А вы гатовыя да гэтага?***

**Віктар Гарбачоў:** Лукашэнка сам сказаў, што будзе сваю ўладу да апошняга патрона абараняць.

**Андрэй Бабіцкі:** Чаму мы мусім думаць аб ахвярах, калі не плануем гвалту? Калі б нешта такое і было, то гэта на сумленні ўлады, а не нашай.

**Алег Мяцеліца:** Я не веру кандыдатам, якія заклікаюць на плошчу, але запэўніваюць, што ўсё будзе мірна і плённа. Лукашэнка — гэта дыктатура. Беларусь не заплаціла за сваю незалежнасць. Толькі праз пакуты можна ацаніць каштоўнасць нечага. Увогуле, усё адносна. Хіба не ахвяра — зламаныя лёсы, маральная падаўленасць людзей?

**Віктар Гарбачоў:** Усе нашыя сустрэчы з еўрапейскімі палітыкамі паказалі, што людзі зацікаўленыя ў тым, каб валодаць інфармацыяй. Яны разумеюць, што цяперашняя ўлада Беларусі для еўрапейскай супольнасці — пагроза. Параўноўваюць сітуацыю з тым, як у 1933 годзе Гітлер пачынаў маршыраваць па Еўропе, а яму апладзіравалі і сур'ёзна не ўспрымалі. Чым гэта скончылася, мы ведаем.

***— Калі вы збіраецеся вярнуцца ў Беларусь?***

**Алег Мяцеліца:** Сігналам вяртання будзе спыненне крымінальных спраў. Свае статусы — падазраваныя ці абвінавачаныя — мы не ведаем. Вы ж бачыце, што людзей спачатку саджаюць на суткі, а потым ляпяць крымінальную справу. Калі пад хатні арышт выпусцілі Ірыну Халіп, Сяргея Вазняка, Наталлю Радзіну, ужо былі спадзяванні, што нешта мяняецца, і мы зможам хутка вярнуцца.

**Андрэй Бабіцкі:** Пастараемся тут стварыць пляцоўку для дэмакратычных сілаў, каб ЕС мог атрымліваць інфармацыю з першых вуснаў, а не ў скажоным выглядзе. Тут наўпрост можна працаваць з беларусамі — вакзалы, гандлёвыя цэнтры.

**Віктар Гарбачоў:** Дарэчы, на кожнай другой машыне з беларускімі нумарамі стаяць спецпропускі. Чыноўнікі гавораць, што трэба падняць эканоміку, а самі ездзяць у гандлёвыя цэнтры Вільнюса. Дзеці багатых чыноўнікаў вучацца па еўрапейскіх праграмах.

***— Не думаеце, што падзеі 19 снежня пойдуць на карысць і беларускай апазіцыі, і грамадству?***

**Віктар Гарбачоў:** Адназначна, так. Нашым паплечнікам трэба сказаць, што час спыніць сваркі і ісці ў рэгіёны працаваць з людзьмі. Канцылярыя Еўропы, Амерыкі, Расіі з беларускім народам дасць свой вынік. Я адчуваю, што яшчэ год-два — і сітуацыя рэальна пераломіцца. Сітуацыя яна мусіць з нашай дапамогай. Трэба аналізаваць памылкі, мы, відаць, недапрацоўвалі з боку праваабарончай дзейнасці. Урываюцца ў кватэры, а актывісты не ведаюць, што рабіць, ідуць без позвы на допыт. Хачу, каб мае дзеці не па маіх слядах пайшлі, а ў вольнае плаванне.

Прадпрымальнікі разумеюць, што з гэтай уладай мы свабоды для дзейнасці не атрымаем. Засталіся праблемы высокай арэнды, штрафных санкцый. Магу сказаць, што многа прадпрымальнікаў дапамагалі рэчамі, транспартам, грашамі палітычным вязням. Думаю, каля траціны актывістаў у штабах былі прадпрымальнікі. Я з'ехаў, а мае структуры ў рэгіёнах працягваюць працаваць.

ГРОШЫ

# ХІСТКАЯ СТАБІЛЬНАСЦЬ

Вольга ХВОІН



**Беларусам трэба рыхтавацца ў гэтым годзе да чарговай дэвальвацыі рубля як мінімум на 8%. Такія высновы можна зрабіць з заявы старшыня праўлення Нацыянальнага банка Пятра Пракаповіча.**

Паводле яго слоў, курс нацыянальнай валюты да кошыка замежных валют у 2011 годзе будзе знаходзіцца ў межах абвешчанага калідора +/- 8%. Прэс-служба кіраўніка дзяржавы паведамляе, што банкаўская сістэма Беларусі ў поўным аб'ёме забяспечвае крэдытаванне эканомікі краіны. «Толькі за студзень 2011 года прырост крэдытаў склаў 3,2%, а да ўзроўню лютага 2010 года — 44%, што значна вышэй запланаванага паказчыку. Пры гэтым доўгатэрміновыя крэдыты банкаў раслі больш хуткімі тэмпамі, чым у цэлым аб'ёмы крэдытавання ў краіне», — гаворыцца ў афіцыйным паведамленні.

Разам з тым пастаянны прадстаўнік Міжнароднага валютнага фонду ў Беларусі Наталля Калядзіна прапанавала беларускім уладам зрабіць больш жорсткай грашова-крэдытную палітыку краіны і дэвальваваць нацыянальную валюту.

«Мы лічым, што для скарачэння дэфіцыту гандлю патрабуецца макраэканамічная карэктыроўка. Новыя замежныя запазычанні павінны спрыяць павелічэнню золатавалютных рэзерваў, што магчыма, толькі калі гандлёвы дэфіцыт пачне скарачацца. Гэта можа быць дасягнута толькі ўзмацненнем жорсткасці грашова-крэдытнай палітыкі і больш гнуткай курсавой палітыкі. Акрамя таго, замежнае фінансаванне не бязмежнае і залежыць ад сітуацыі на міжнародных фінансавых рынках, якія зараз хутка змяняюцца», — падкрэсліла эксперт МВФ.

У адказ на гэта Пётр Пракаповіч у размове з Лукашэнкам паведаміў, што банкаўская сістэма краіны працуе без збояў, і ўносіць нейкія карэктывы ў яе функцыянаванне, у тым ліку праводзіць дэвальвацыю рубля, у бліжэйшы час немэтазгодна.

Аднак бадзёрыя вердыкты банкаўскай сістэмы не зусім карэлююцца з агульнымі тэндэнцыямі ў эканоміцы. На пасяджэнні Савета міністраў Пётр Пракаповіч гаварыў, што сітуацыя ў знешнім гандлі ставіць пад пагрозу зрыву выкананне праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі на 2011–2015 гады. «Калі мы не вырашым пытанне з дадатным сальда знешняга гандлю да 2014 года, то ўсе нашы планы, праекты, у тым ліку па падвышэнні жыццёвага ўзроўню насельніцтва, могуць апынуцца пад пагрозай зрыву. Не гаворачы ўжо аб эканамічнай і фінансавай бяспецы», — зазначыў Пракаповіч. Адмоўнае сальда па таварах і паслугах складае амаль 10 мільярдаў долараў. Праграма сацыяльна-эканамічнага развіцця прадугледжвае паніжэнне адмоўнага знешнегандлёвага сальда пачынаючы з бягучага года. На сёлета самае высокае адмоўнае сальда — 9% да ВУП.

Апроч таго, з сярэдзіны 2010 года назіраецца стабільнае скарачэнне золатавалютных запасаў. Толькі за студзень яны скараціліся больш чым на 500 мільёнаў долараў. Нацбанк афіцыйна называе гэта «характэрнай для студзеня з'явай». Прычыны — «выкананне разлікаў у замежнай валюце па абавязальніцтвах 2010 года, а таксама традыцыйнае падзенне аб'ёмаў балансу валюты, якая паступае ў краіну, на фоне высокага запатрабавання ў валюце для разлікаў за энерганосьбіты».

За мінулы месяц аб'ём міжнародных рэзервовых актываў Беларусі ў нацыянальным вызначэнні скараціўся на 575,8 мільёна долараў (на 9,4%) і склаў амаль 5,5 мільярда долараў. Золатавалютныя запасы па методыцы МВФ за гэты перыяд паменшыліся на 687,7 мільёна долараў (13,7%) і склалі 4,3 мільярда долараў. Выпраўляць сітуацыю Нацбанк спрабуе абмежавальнымі метадамі. Біржавы збор, які выплачваецца пры набыцці валюты, павялічаны да 2% ад сумы здзелкі, а камерцыйныя банкі могуць набываць валюту толькі за кошт уласных сродкаў і толькі на суму, роўную розніцы паміж продажам і пакупкай валюты насельніцтвам.

У адпаведнасці з Асноўнымі кірункамі грашова-крэдытнай палітыкі Беларусі на 2011 год, рост міжнародных рэзервовых актываў у бягучым годзе павінен скласці не меней 1,2 мільярда долараў. Асноўнымі фактарамі такога росту павінны стаць прыцягненне 6,4 — 6,5 мільярда долараў прамых замежных інвестыцый і згаданае выпраўленне перакосу ў знешнегандлёвым балансе.

СТАТЫСТЫКА

# ВЕР СВАЙМУ КАШАЛЬКУ

**Перад выбарамі былі падвышаныя заробкі, пенсіі. У студзені — папулізм саступіў месца рэалізму.**

Па дадзеных Нацыянальнага статыстычнага камітэта, намінальная налічаная сярэднемесячная заработная плата працаўнікоў краіны ў студзені гэтага года склала 1409,6 тысяч рублёў, і паменшылася ў параўнанні са снежнем 2010 года на 11,7 %, або на 186,2 тысяч рублёў.

Нягледзячы на адмоўны паказчык, улады абяцаюць сёлета падвышэнне рэальных грашовых прыбыткаў насельніцтва больш чым на 15%. Намеснік міністра фінансаў Беларусі Уладзіслаў Татарыновіч заявіў, што на працягу года «рэальныя прыбыткі грамадзян паводле пастаўленай задачы павінны павялічыцца на 8–10%». «Гэта тычыцца як заработнай платы працаўнікоў дзяржразліковых прадпрыемстваў і працаўнікоў бюджэтнай сферы, так і пенсій і сацыяльнай дапамогі», — паведаміў прадстаўнік Мінфіна. Самы прыемны прагноз абяцае рост грашовых прыбыткаў беларусаў за пяцігоддзе ў 1,7 — 1,76 разы.

Аптымістычныя прагнозы гучаць на фоне падвышэння цэнаў на прадукты, камунальныя паслугі, адукацыю. Афіцыйная статыстыка паведамляе, што індэкс спажывецкіх цэн на тавары і паслугі ў студзені 2011 года ў параўнанні са снежнем 2010 года склаў 101,4%. Інфляцыя за снежань — 1%, за студзень — 0,8%.

Цягам месяца істотна падскочылі цэны на харчовыя тавары. Індэкс коштаў на харчовыя тавары склаў 102,1%, у тым ліку па алею раслінnаму — 102,4%, крупах прасяных — 104,4%, садавінагароднінай прадукцыі — 104,9%, гарэлцы — 105%, цукру — 110%. Тытунёвыя вырабы падаражэлі на 5,2%. Кошты на адукацыю выраслі на 13,2%, паслугі пасажырскага транспарту — на 2,2%.

КАЛОНКА КАНСТАНЦІНА СКУРАТОВІЧА

# У НАДЗВЫЧАЙНЫМ РЭЖЫМЕ



**Вядома, што нікому з бестэрміновых сучасных прэзідэнтаў не падабаецца тое, што здарылася ў Егіпце, Тунісе ды мае намер працягнуцца ў іншых краінах.**

Прыкладам, яшчэ колькі гадоў таму існаваў нейкі бізнэс-план па аб'яднанню Беларусі з Сербіяй, а крыху пазней — з Лівійскай Джамахірыяй. Што тычыцца Мілошавіча, тут усё зразумела. Ён паўстаў на шляху мадэрнізацыі калісьці самай свабоднай сацыялістычнай краіны свету. За гэта, а яшчэ за сто мільёнаў, якія спатрэбіліся новаму сербскаму ўраду, яго і аддалі ў рукі правасуддзя. Яго ажыццявіла — так ужо атрымалася — звычайная жанчына з альпійскай швейцарскай дробнабуржуазнай сям'і, у якой вышэйшым жыццёвым прынцыпам было патрабаванне жыць так, каб не замінаць іншым людзям.

Звалі яе, як многія памятаюць, Карла дэль Понтэ. Гэта жанчына (зноў жа амаль выпадкова) стала пракурорам Міжнароднага трыбунала па былой Югаславіі — толькі таму, што Швейцарыя ёсць абсалютна нейтральнай краінай. Яна не ўваходзіць ні ў NATO, ні ў Еўрасаюз, ні нават у ААН. Расія і Кітай не хацелі, каб абвінаваўцам быў прадстаўнік NATO, крый Божа, ЗША. А кіраўніцтва Швейцарыі бачыла ў гэтым прызначэнні магчымасць падняць міжнародны аўтарытэт сваёй краіны. Маўляў, мы заўжды застаёмся ў баку. А тут такая зручная нагода. Жанчына, якая да гэтага займала пасаду генеральнага пракурора Швейцарыі і змагалася з мафіяй, пагадзілася.

Гэта спачатку задаволіла ўсе бакі. Пасля ўжо ніхто ніякага задавальнення не выказваў. Нават швейцарскія ўлады. Адкуль каму было ведаць, што настроі гэтай шараговай мяшчаначкі, якая стала пракурорам, вызначае памкненне пакончыць з беспакаранасцю, якая так доўга дазваляла моцным гэтага свету чыніць беды мільёнам і мільёнам людзей. Ад уласнікаў дробных крамак, змушаных штотыдзень плаціць рэкецірам за «крышу», да бедных ізгояў, выгнаных салдатамі са свайго жытла, згвалтаваных, абрабаваных або знішчаных. Дарэчы, шыкоўная кніга былога пракурора, якая (цытую анонсы) «адкрыла свету вочы на вайну ў Югаславіі, падала шакуючыя факты пра падзеі ў Сербіі і Албаніі, выклала скандальныя разаблачэнні прадстаўнікоў ААН, якія тармазілі ажыццяўленне правасуддзя», пабачыла свет толькі праз пяць гадоў пасля адстаўкі аўтаркі з ганаровай пасады.




Але размова пра тое, чым усё заканчваецца. Звычайная мафія мае мэтай пранікненне ў органы дзяржкіравання для атрымання лёгкага доступу да дзяржаўных рэсурсаў. Ёсць і адваротны шлях — група людзей, якая ад імя народа ажыццяўляе кантроль над рэсурсамі, фактычна карыстаецца імі як сваімі ўласнымі. А гэта і ёсць атрыбутам палітычнай мафіі. Дзейнічае яна па прынцыпе, дасціпна вызначаным колішнім іспанскім дыктатарам Франка: «Сябрам — усё, астатнім — закон». Прычым закон належным чынам адаптаваны.

Прыкладам, у Беларусі ёсць закон аб надзвычайным становішчы, згодна якому прэзідэнт мае права ўводзіць і ажыццяўляць адмысловыя меры і метады па ўсёй краіне або на асобных яе тэрыторыях. Прыкладам, абмяжоўваць свабоду прэсы, дзейнасць палітычных партый і грамадскіх арганізацый, што і ажыццяўляецца адпаведнымі дзяржаўнымі інстытутамі.

Але надзвычайнае становішча ніколі не ўводзілася на самай справе. Не было ў тым пільнай патрэбы. Тым не менш, ужо 16 гадоў запар (пачынаючы з забароны друкаваць антыкарупцыйны даклад Антончыка) пастаянна практыкуюцца абмежаванні правоў і свабодаў грамадзян, палітычных партый, арганізацый, СМІ, быццам краіна жыве ва ўмовах надзвычайнага становішча.

Адзначым вельмі характэрную дэталь: у адносінах да дзяржаўных СМІ фактычна практыкуецца папярэдняя цэнзура. Акрамя таго, фактычна кіраўніцтва дзяржавы змушае праваахоўныя органы займацца палітычным вышукам супраць сваіх палітычных апанентаў. Часам здаецца, што кіраўніцтва пачувала б сябе больш камфортна, калі б у краіне існавалі радыкальныя групоўкі. Каб аднойчы ўзяцца і ўсіх «замачыць».

Гэта вельмі дрэнна. Як адзначаў класік, калі стрэльба вісіць на сцяне, яна павінна стрэліць. З той простай, але прынцыповай нагоды, што яна — стрэльба. Іншыя «феномены і ноумены» не ствараюць выключэнняў. Прыкладам, пры абсалютызме ўлада манарха не падлягае ніякай рэвізіі. Яна з'яўляецца атрыбутам дынастыі, а дынастыя — атрыбутам дзяржавы. У абмежаванай манархіі, караля ці каго іншага могуць і «звольніць» з пасады за неэтычныя паводзіны. А прэзідэнтаў абавязкова пераабіраюць. Бо гэта цалкам адпавядае сутнасці пасады, якую яны займаюць.

Калі ж гэта немагчыма, страляе стрэльба. А потым прыходзіць Карла дэль Понтэ.

Каму ж гэта спадабаецца.

ПАЛЕМІКА

# ПРА ПРЫДВОРНУЮ ПАЛІТАЛОГІЮ

Анатоль АСТАПЕНКА,
доктар паліталогіі

**Мала хто заўважыў, што ў тых нумарах «СБ», дзе друкаваўся шэдэўр прапаганды — «За кулисами одного заговора» — у рубрыцы «Политические диалоги» быў змешчаны артыкул «Мифы и реальность демократии», які падрыхтаваў прафесар Вячаслаў Оргіш.**




Змест дыялогаў і асаблівa спосаб іх выкладання нагадаў мне савецкія часы, калі з любой нагоды масава штампаваліся патрэбныя ідэалагічныя матэрыялы. Пасля ўсталявання шматпартыйнасці і ліквідацыі КПСС многія кадры савецкай грамадскай навукі тэрмінова пераарыентаваліся, рынуліся асвойваць новыя гарызонты паліталогіі, сацыялогіі і іншых сучасных навук аб грамадстве. Адным з такіх філосафаў і быў Вячаслаў Оргіш. У 2001 годзе ён узначальваў штаб адзінага тады кандыдата ў прэзідэнты Уладзіміра Ганчарыка, за што яго і звольнілі з працы. Але доўга Оргіш не бедаваў. Сэрдабольны Іосіф Сярэдзіч узяў яго палітычным аглядальнікам «Народнай Волі» і нават зрабіў сваім намеснікам.

Адзін за адным у «НВ» выходзілі артыкулы прафесара Оргіша, які абвясціў інтэлектуальную вайну ненавіснаму лукашэнкаўскаму рэжыму. Ён стаў рупарам апазіцыі.

І вось нечакана ўжо не ў «НВ», а ў «Советской Белоруссии» выйшаў артыкул Оргіша «Прыйшоў час сыходзіць з барыкад», дзе ён выклаў дыяметральна процілеглую пазіцыю сваім нядаўнім антыдыктатарскім публікацыям у апазіцыйнай прэсе. Як напісаў адразу Валер Карабалевіч: «Вячаслаў Пятровіч не сышоў з барыкадаў, а проста перабег на яе другі бок».

І вось вам — «Дыялогі», мэта якіх — поўнае апраўданне існуючага рэжыму, асуджэнне Плошчы і ўсёй дэмакратычнай апазіцыі. Расцягнутыя на два нумары, але шматслоўе не дадае ім доказнасці.

Цэнтральнае паняцце «Дыялогаў» — «палітычныя эліты», вакол якіх і вядзецца ўся гульня. Словы «эліта», «эліты» «эліт» у гэтым творы сустракаецца 156 разоў. Ну а ўвесь сэнс дыялогаў зводзіцца да таго, што для Беларусі дэмакратычныя каштоўнасці Захаду не падыходзяць. Нядаўні дэмакрат В. Оргіш наогул ставіць пад сумнеў неабходнасць дэмакратызацыі грамадства: «Сторонники институционального подхода работают не с эмпирически подтвержденной теоретической гипотезой, … а с идеологической мифологемой, опираясь на которую они стремятся втиснуть эту жизнь в прокрустово ложе любезной им демократии». Так што ніякай дэмакратыі нам не патрэбна. І беларуская палітычная эліта, па «тэорыі» прафесара Оргіша, не падтрымлівае і ніколі не падтрымае гэтай «любезной» дэмакратыі.

І тут узнікае пытанне. Што і каго трэба разумець пад палітычнай элітай?

«ПОЛИТИЧЕСКАЯ ЭЛИТА — внутренне сплоченная, составляющая меньшинство социальная общность, выступающая субъектом подготовки и принятия важнейших стратегических решений в сфере политики и обладающая необходимым для этого ресурсным потенциалом. Ее характеризует близость установок,… а также причастность к власти (независимо от способа и условий ее обретения).» (А. Мельнік. Политология. Мн., 2003).

Апазіцыя ў гэтую «социальную общность» яўна не патрапляе, бо зусім не пры ўладзе. Ды што там! Яе не пусцілі нават у выбарчыя камісіі, куды лёгка трапіў мой сусед-п'янтос з сямю класамі адукацыі, які, фактычна, увайшоў у гэтую эліту.

Значыць, эліту трэба шукаць сярод бліжэйшага асяроддзя прэзідэнта, адміністрацыі і наогул сярод людзей пры ўладзе. І паколькі курс нашага ўраду адметны стабільнасцю, то эліту пачнём шукаць з часу яе ўсталявання, з 1994 года. Добра памятаю, газеты тады пісалі — у палітыку ўвайшлі «молодые волки», і гэтая каманда прывяла А. Лукашэнку да ўлады. Імёны іх вядомыя: А. Фядута, А. Лябедзька, Л. Сініцын, Д. Булахаў, У. Ганчар, І. Ціцянкоў.

Пазнаёмімся, спадар Оргіш, з палітычнай элітай? Аляксандр Фядута і Анатоль Лябедзька цяпер на слыху. Толькі ўбачыць іх нельга — сядзяць у турме, славутай «амерыканцы». Іван Ціцянкоў у 1995 годзе, каб выслужыцца, рваў бел-чырвона-белы дзяржаўны сцяг на Доме ўраду, але гэты самаахвярны ўчынак не ацанілі — усё роўна ён потым быў вымушаны ўцякаць у Маскву. Уладзімір Ганчар — адна з самых трагічных фігур нашай новай гісторыі, бо ў яго няма нават магілы, да якой маглі б прыйсці ягоная жонка і дзеці. Міхаіл Чыгір, прэм'ер-міністр з 1995 па 1996 гады, за ўдзел у альтэрнатыўных прэзідэнцкіх выбарах па версіі апазіцыі ў 1999 годзе адсядзеў 8 месяцаў у турме. Былы дырэктар Мінскага трактарнага заводу Міхаіл Лявонаў выйшаў на волю ў студзені 2010 года, адсядзеўшы 8 гадоў. Другі Лявонаў — Васіль — былы міністр сельскай гаспадаркі адсядзеў тры гады… Леанід Калугін кіраваў «Атлантам» ад 1993 да 2001 года, за намер узяць удзел у прэзідэнцкіх выбарах 2001 года супраць яго была распачатая крымінальная справа па фактах «злоўжывання службовым становішчам». Цяпер Калугін прыняў пострыг і стаў манахам Ніканам.




Былы міністр знешнеэканамічных сувязяў Міхаіл Марыніч быў асуджаны на пяць гадоў. З турмы выйшаў інвалідам. Былы міністр МУС генерал Юры Захаранка знік у 1999 годзе… Гэты спіс палітычнай эліты Рэспублікі Беларусь мінулых гадоў можа быць падоўжаны. Спіс жудасны. Селекцыя эліты па стандартах «вертыкалі».

Магчыма, сучасная палітычная эліта выправілася, законы не парушае і нарэшце выконвае сваю ролю авангарда палітычнага жыцця краіны, як напісана ў падручніках паліталогіі, і яе мае на ўвазе В. Оргіш у сваім знакавым дыялогу? Паглядзім.

Вось жа, зусім нядаўна быў галавой Адміністрацыі прэзідэнта Генадзь Нявыглас. Цяпер ён старшыня Беларускай федэрацыі футбола. А дзе ж Уладзімір Канаплёў, былы старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу? Кіраўнік федэрацыі гандбола. Палітычная эліта перакінулася ў спартыўную. Праўда, гэта іх не выратавала ад чорнага спісу неўязных у краіны ЕС. А гэты спіс вельмі цікавы і немалы. Што ж гэта за эліта, якую не пускаюць у Еўропу?

Цяперашняя палітычная «эліта» — гэта не авангард грамадства, і «важнейших стратегических решений в сфере политики» яна даўно не прымае. Гэта бязвольная шэрая маса запалоханых, карыслівых людзей, якія стаяць па стойцы «смірна» перад сваім начальствам, што можна назіраць у шматлікіх справаздачах БТ.

Сістэма страху вырасціла халуёў на ўсіх узроўнях улады, ва ўсіх дзяржаўных і яшчэ больш — недзяржаўных арганізацыях. Калі савецкія функцыянеры ў выпадку нейкіх абставін сыходзілі са сваіх пасадаў, то пазбаўляліся толькі сваіх прывілей, доступу к «карыту». Цяпер жа можна пазбавіцца не толькі гэтага, і прыведзены спіс скалечаных лёсаў яскрава сведчыць пра тое, што можа здарыцца…

На старонках свайго «дыялога» ў СБ В. Оргіш прыходзіць да «навуковага» выніку: «Сильная президентская власть в Беларуси (по терминологии ее критиков — авторитарный режим) — это в определенном смысле выбор самой белорусской элиты, ее представителей в местных эшелонах власти». Менавіта гэтай «эліты» (яна заслугоўвае толькі двукосся), мэтанакіравана сфармаванай аўтарытарным рэжымам. Для яе, сапраўды, няма іншага выбару. Яна — сааўтар 19 снежня.

У доказ сваіх намаганняў апраўдаць рэпрэсіі, Оргіш спасылаецца на высновы сацыёлага Жанны Грышчанка: «Деятели местной власти в Беларуси придерживаются патерналистских представлений, предпочитают работать под опекой и в системе иерархически выстроенной государственной власти, опираясь на волю и директивы Центра». Але па сутнасці гэта цытата пацвярджае адваротнае: гэта не эліта, гэта абслуга рэжыму.

Я разумею, перад Оргішам стаяла нялёгкая задача: абгрунтаваць існуючы цяпер у Беларусі аўтарытарны рэжым і даказаць, што ён лепшы за еўрапейскія дэмакратыі. І гэта пасля бругальнага разгону плошчы 19 снежня, на фоне несціхаючай хвалі рэпрэсій.

Вымушаны канстатаваць: з задачай ён не справіўся. Ды і немагчыма справіцца, бо гэта тое самае, што інтэрпрэтаваць відавочны еўрапейскі прагрэс як рэгрэс. Каб надаць навуковы выгляд сваім кволым развагам, скрозь пабудаваным на пяску, Оргіш апелюе да антычнай дэмакратыі. Але якім чынам?

Для фармавання правільнага погляду на дэмакратыю, паводле Оргіша, дастаткова азнаёміцца з працамі Арыстоцеля, які «считал принципиально важным для правильной демократии наличие ограничительной нормы, а именно, чтобы все граждане, собравшись вместе, могли видеть один другого. В связи с этим он называет предельную цифру граждан одного полиса — 20 000». Так што Амерыка са сваёй хвалёнай дэмакратыяй хай не лезе, бо мае не 20 000, а пад 200 мільёнаў насельніцтва. Так што ў яе дэмакратыя — «няправільная».

Ніжэй у згаданых дыялогах, В. Оргіш наогул «мочыць» дэмакратыю. На гэты раз, грунтуючыся на «Экспертным заключении Платона», з якога вынікае, што «при демократии граждане перестают уважать законы, повсеместно царит культ потребительства, люди крайне отчуждены друг от друга, укореняется эгоизм. В результате крайняя свобода оборачивается крайним рабством, произволом толпы...»

А далей уласныя высновы, якія і не маглі сасніцца Платону: «Надо ли нам под маркой развития представительной системы народовластия поощрять развитие предвыборных балаганов в виде неизвестно кем проплаченных радио- и телешоу, уличных митингов, пикетов, листовок, плакатов и т.п...»

Вось вам і апраўданне беззаконня на Плошчы, арыштаў больш як 700 чалавек. Чытайце Платона!

Ну і, як разынка, на заканчэнне хвалебнай оды Оргіша рэжыму — абгрунтаванне неабмежаванага тэрміну прэзідэнцкага праўлення Аляксандра Рыгоравіча. Таксама антычнасць, але прыклады бяруцца ўжо з гісторыі. Што там чатыры тэрміны, Перыкл — грэцкі правіцель V стагоддзя да нашай эры — выбіраўся 31 раз! Калі памножыць на пяць, то атрымаем — 155 гадоў!

Так што хадзіць і хадзіць яшчэ беларусам на Плошчу…

На заканчэнне мне б хацелася запытаць у Вячаслава Пятровіча наступнае. Ці задумваліся вы над тым часам, калі беларускі аўтарытарны рэжым рухне? Ні адна дыктатура вечнай не бывае. Куды вы тады пойдзеце служыць? Вам як даследчыку хрысціянства, пэўна ж, вядома, што нават Іуда пасля здрады Хрысту пакаяўся, праўда, са спазненнем.

# TV ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

## 28 ЛЮТАГА, ПАНЯДЗЕЛАК

**03.20, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**03.30** 83-я цырымонія штогадовай прэміі «Оскар». Прамая трансляцыя.
**07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.50** Навіны.
**07.05, 08.10, 18.50, 00.00** Зона Х.
**07.30, 08.25, 11.55** Дзелавое жыццё.
**08.30** «У свеце матораў».
**09.10** Жаночае ток-шоў «Жыццё як жыццё».
**10.10** Здароўе.
**10.35** Культурныя людзі.
**11.05, 17.25** Крымінальная меладрама «Зацьменне» (Расія - Украіна).
**12.10** Камедыя «Сёмы пялёстак» (Украіна).
**14.05** Дакументальна-біяграфічны цыкл «Мая праўда» (Украіна).
**15.15, 19.10** Навіны рэгіёна.
**15.40** «OFF STAGE LIFE».
**16.05** Nota Bene.
**16.30** Серыял «Маршрут лїтасці» (Расія).
**18.25** Праграма «Акно ў Еўропу».
**19.25** «КЕНО».
**19.30** «Арэна». Праграма аб спорце.
**19.55** Ход у адказ.
**21.00** «Панарама».
**21.45** «Камандзіроўка». Журналісцкае расследаванне.
**21.55** 83-я цырымонія штогадовай прэміі «Оскар» (ЗША).
**00.10** Дзень спорту.
**00.20** Хакей для ўсіх.

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.15** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** Контуры.
**10.10** «Мая жонка мяне прычаравала». Шматсерыйны фільм.
**11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00, 23.30** Навіны спорту.
**11.10** Тэлечасопіс «Звяз».
**11.50** «Тата на ўсе рукі». Камедыйны серыял.
**12.20** «Дэтэктывы».
**13.10** Кантрольны закуп».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.50** «Зразумець. Прабачыць».
**15.25** «Хачу ведаць».
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**17.05** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**18.20** «Зваротны адлік».
**18.55** «Чакай мяне».
**20.00** Час.
**21.05** Ток-шоў «Адчынены фармат».
**22.10** «Залаты капкан». Шматсер. фільм.
**23.35** «Ганне Вескі. Гарачая эстонская жанчына».
**00.35** «Іван Падушкін. Джэнтльмен вышуку». Шматсерыйны фільм.
**01.25** Начныя навіны.

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** «Тыдзень».
**09.35** «Вялікі сняданак».
**10.05** «Пяць гісторый».
**10.40** «Трымай мяне мацней». Тэленавэла.
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Я-вандроўца».
**13.00** «Ля парадната пад'езду».
**13.50** «Зорны рынг».
**15.00** Канцэрт М.Задорнава.
**16.00** СТБ прадстаўляе: «КультУРА!».
**16.50** «Рэпарцёрскія гісторыі».
**17.10** «Наша справа».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Агонь кахання». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.35** Фільм «Шпацыр». Расія , 2003 г.
**22.55** «Сталічны футбол».
**23.25** Фільм «9 рота». Расія-Фінляндыя-Украіна, 2005 г.

**06.35** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05, 16.55** Дэтэктыўны серыял «Чыста англійскія забойствы» (Вялікабрытанія).
**09.00** Серыял «Ты маё жыццё».
**10.00** Авантурная камедыя «Як зарабіць 20 мільёнаў баксаў» (ЗША).
**11.50** Пра мастацтва.
**12.15** Школа рамонту.
**13.10** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**14.10** Серыял «Сіла прыцягнення».
**15.05** Мультсерыял «Сямейка піратаў».
**15.30** Пазакласная гадзіна.
**15.45** Навіны надвор'я.
**16.05** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».
**18.00** Серыял «Ты маё жыццё».
**19.05** Кінааповесць «Пацаны» (СССР).
**20.50** Калыханка.
**21.05** Тэлебарометр.
**21.10** Беларуская часіна.
**22.15** Камедыйны серыял «Інтэрны».
**22.55** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**23.25** Авертайм.
**23.55** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ерліга. Агляд тура.
**00.50** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».

### РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.00** «Карціна свету».
**09.55** Надвор'е на тыдзень.
**10.00** «Гарадок».
**10.20** «Ранішняя пошта».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**12.20** «Кулагін і партнёры».
**12.50** «Крамлёўскія асы». Дак. фільм.
**13.50, 16.50, 19.50, 23.35** Навіны - Беларусь.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.25** «Рускі шакалад». Тэлесерыял.
**16.15** Тэлесерыял «Дворык».
**17.20** «Кулагін і партнёры».
**17.50** «Таямніца святога Патрыка».
**18.50** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**20.30** Тэлесерыял «Індус».
**22.20** Тэлесерыял «Аператыўнікі. Хронікі забойнага аддзела. Новая версія».
**23.20** «Нічога асабістага».
**23.45** «Весткі.ru».
**00.05** «Вялікае-вялікае дзіця. Юры Багатыроў». Дакументальны фільм.

### НТВ

**06.05, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 23.20** Сёння.
**06.10** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.35** Серыял «Таксістка».
**09.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.20** «Кулінарны паядынак».
**11.20** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**12.05** «Да суду».
**13.30** Дэтэктыўны серыял «Следапыт».
**15.10** «Прафесія-рэпарцёр».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.30** Серыял «Вуліцы пабітых ліхтароў».
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.35** Серыял «Пагоня за ценем».
**21.35** Прэм'ера. Баявік «Святаяннік».
**23.45** «Сумленны панядзелак».
**00.35** «Школа зласлоўя».

### EUROSPORT

**09.30** Тэніс. Турнір WTA у Катары. Фінал.
**10.30** Біятлон. Чэмпіянат Еўропы ў Італіі (Рыднаун). Жанчыны. Гонка пераследу.
**11.00, 15.00, 17.00** Скачкі з трампліна. Чэмпіянат свету ў Нарвегіі (Осла). Мужчыны. Камандныя спаборніцтвы.
**12.15** Лыжнае дваяборства. Чэмпіянат свету ў Нарвегіі (Осла). Мужчыны. HS 106. Прамая трансляцыя.
**13.30** Лыжныя гонкі. Чэмпіянат свету ў Нарвегіі (Осла). Жанчыны. 10 км вольным стылем. Прамая трансляцыя.
**15.45** Лыжнае дваяборства. Чэмпіянат свету ў Нарвегіі (Осла). Камандныя спаборніцтвы. 4х5 км. Прамая трансляцыя.
**18.15, 23.30** Лыжныя гонкі. Чэмпіянат свету ў Нарвегіі (Осла). Жанчыны. 10 км вольным стылем.
**19.15** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**19.45** Футбол. «Клуб чэмпіёнаў». Часопіс.
**21.00** Самыя моцныя людзі планеты. Турнір «Giants Live» (Кіеў, Украіна).
**21.50** Вось дык так!!!
**22.00** Пра рэстлінг. Агляд WWE.
**22.30** Пра рэстлінг. Vintage Collection. ЗША.
**00.30** Лыжнае дваяборства. Чэмпіянат свету ў Нарвегіі (Осла). Камандныя спаборніцтвы. 4х5 км.
**01.15** Футбол. «Клуб чэмпіёнаў». Часопіс.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Тыдзень у «Аб'ектыве».
**07.30** «Пад покрывам нябёсаў», маст. фільм, 1990 г., ЗША–Італія–Вялікабрытанія.
**09.45** Дакументальная гадзіна: «Чэслаў Немэн», дак. фільм, 2007 г., Польшча.
**10.45, 15.20** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**11.05, 15.35** ПраСвет.
**11.30, 16.05** Эксперт.
**12.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**12.05** Фільматэка майстроў: «Пад покрывам нябёсаў», маст. фільм, 1990 г., ЗША–Італія–Вялікабрытанія.
**14.20** Дакументальная гадзіна: «Чэслаў Немэн», дак. фільм, 2007 г., Польшча.
**16.30** Басаножпа свеце: «Вануату».
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Мой родны горад», серыял.
**17.30** «Час гонару», серыял: 18 серыя.
**18.20** «Уладзімір Арлоў», 2008 г., Беларусь.
**18.40** Прэс-экспрэс (агляд медыяў.)
**18.55** «НКВД – гестапа. Браты па крыві», дак. фільм, 2009 г., Беларусь.
**19.30** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.35, 00.40** Гарачы каментар.
**19.45** Калыханка для самых маленькіх.
**19.55** Еўропа сёння.
**20.25** «Дзе мае бацькі? Пакінутыя дзеці ў Румыніі», дак. фільм, 2008 г., Румынія.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.20** Сцяна, дак. цыкл.
**21.35** Прыватная калекцыя.
**22.05** «Пад покрывам нябёсаў», маст. фільм, 1990 г., ЗША–Італія–Вялікабрытанія.
**00.20** Аб'ектыў.

## 1 САКАВІКА, АЎТОРАК

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 16.55, 18.00, 19.00, 23.05** Навіны.
**06.05, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**06.45** Nota Bene.
**07.05, 08.10, 18.50, 01.00** Зона Х.
**07.30, 08.30, 11.55** Дзелавое жыццё.
**08.35** «Арэна». Праграма аб спорце.
**09.10** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**10.05** Серыял «Маршрут літасці» (Расія).
**10.50** Крымінальная меладрама «Зацьменне» (Расія - Украіна).
**11.40** «Камандзіроўка». Журналісцкае расследаванне.
**12.10** Меладрама «Вярнуць Веру» (Расія).
**13.45** Хранікальна-дакументальны фільм «Гвардыя. Баявыя традыцыі». 6-я серыя.
**14.05** Ход у адказ.
**15.15, 19.10** Навіны рэгіёна.
**15.35** «Патрабуецца».
**15.50** Дэтэктыўны серыял «Жураў-2».
**16.55** Серыял «Маршрут літасці» (Расія).
**17.50** Крымінальная меладрама «Зацьменне» (Расія - Украіна).
**19.25** «КЕНО».
**19.30** «Сфера інтэрасаў».
**19.55** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**21.00** Панарама.
**21.45** Актуальнае інтэрв'ю.
**22.00** Дэтэктыўны серыял «Абдуры мяне - 2» (ЗША). 5-я серыя.
**23.15** Камедыя «Пацалунак на поспех».
**01.05** Дзень спорту.

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.20** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Жыць здарова!».
**10.20** «Мая жонка мяне прычаравала». Шматсерыйны фільм.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Смак».
**11.50** «Тата на ўсе рукі». Камедыйны серыял.
**12.20** «Дэтэктывы».
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Кантрольны закуп».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.50** «Зразумець. Прабачыць».
**15.25** «Хачу ведаць».
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**17.05** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Шчаслівыя разам». Серыял.
**18.55** «Хай кажуць».
**20.00** Час.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** «Доктар Тырса». Шматсер. фільм.
**22.15** «Залаты капкан». Шматсер. фільм.
**23.35** Навіны спорту.
**23.40** «Несакрэтныя матэрыялы».
**00.15** «Іван Падушкін. Джэнтльмен вышуку». Шматсерыйны фільм.
**01.0** Начныя навіны.

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** СТБ прадстаўляе: «Гаворыць і паказвае Мінск».
**09.00** Фільм «Шпацыр». Расія , 2003 г.
**10.40** «Трымай мяне мацней». Тэленавэла.
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Агонь кахання». Серыял.
**13.50** «Дурні, дарогі, грошы». Гумарыстычны серыял.
**14.40** «Халасцякі». Серыял.
**15.35** «Ваенная таямніца».
**16.50** «Сталічны футбол».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Агонь кахання». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** «Апошні сакрэт Майстра». Серыял.
**21.30** «Вялікі горад».
**22.05** «Аўтапанарама».
**22.55** «Хірамант». Серыял.
**23.50** «Пантэра». Серыял.

**06.35** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Камедыйны серыял «Інтэрны».
**08.35, 16.50** Дэтэктыўны серыял «Чыста англійскія забойствы» (Вялікабрытанія).
**09.40** Серыял «Ты маё жыццё».
**10.45** Камедыйная кінанавэла «Мядзведзь».
**11.40** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ерліга. Агляд тура.
**12.30** Авертайм.
**13.00** «Запал па культуры».
**13.45** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**14.45** Серыял «Сіла прыцягнення».
**15.45** Пазакласная гадзіна.
**16.00** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».
**18.00** Серыял «Ты маё жыццё».
**19.05** Дакументальна-пазнавальны фільм «Версальскі садоўнік» (Францыя).
**20.15** «Калыханка».
**20.30** Тэлебарометр.
**20.35** Беларуская часіна.
**21.40** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ерліга. Чэлсі - Манчэстэр Юнайтэд. Прамая трансляцыя.
**23.40** «Спорт-кадр».
**00.10** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».

### РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.20** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**10.10** «Свята ў чаканні свята. Фазіль Іскандэр». Дакументальны фільм.
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** «Нічога асабістага».
**11.45** «Кулагін і партнёры».
**12.15** Тэлесерыял «Індус».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.25** «Рускі шакалад». Тэлесерыял.
**16.15** Тэлесерыял «Дворык».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.20** «Кулагін і партнёры».
**17.50** Тэлесерыял «Таямніца святога Патрыка».
**18.50** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**19.50, 23.20** Навіны - Беларусь.
**20.30** Тэлесерыял «Індус».
**22.20** Тэлесерыял «Аператыўнікі. Хронікі забойнага аддзела. Новая версія».
**23.30** «Весткі.ru».
**23.50** «Ад шатра да сцэны. Галоўны цыган Савецкага Саюза». Дакументальны фільм.

### НТВ

**06.05, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 23.20** Сёння.
**06.10** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.35** Серыял «Таксістка».
**09.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.20** «Кватэрнае пытанне».
**11.20** «Жаночы погляд».
**12.05** «Да суду».
**13.30** Дэтэктыўны серыял «Следапыт».
**15.10** «Прафесія-рэпарцёр».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.30** Серыял «Вуліцы пабітых ліхтароў».
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.35** Серыял «Пагоня за ценем».
**21.35** Прэм'ера. Баявік «Святаяннік».
**23.45** «Капітал.ru».

### EUROSPORT

**09.30** Футбол. «Клуб чэмпіёнаў». Часопіс.
**10.45** Лыжнае дваяборства. Чэмпіянат свету ў Нарвегіі (Осла). Камандныя спаборніцтвы. 4х5 км.
**11.45, 16.15** Лыжныя гонкі. Чэмпіянат свету ў Нарвегіі (Осла). Жанчыны. 10 км вольным стылем.
**12.45, 20.00** Скачкі з трампліна. Чэмпіянат свету ў Нарвегіі (Осла). Мужчыны. Камандныя спаборніцтвы.
**13.45** Лыжныя гонкі. Чэмпіянат свету ў Нарвегіі (Осла). Мужчыны. 15 км вольным стылем. Прамая трансляцыя.
**15.15** Біятлон. Чэмпіянат Еўропы ў Італіі (Рыднаун). Мужчыны. Гонка пераследу.
**15.45** Біятлон. Чэмпіянат Еўропы ў Італіі (Рыднаун). Жанчыны. Гонка пераследу.
**17.00** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**17.30** Футбол. «Клуб чэмпіёнаў». Часопіс.
**18.45, 00.15** Лыжныя гонкі. Чэмпіянат свету ў Нарвегіі (Осла). Мужчыны. 15 км вольным стылем.
**21.00** Бокс.
**22.00** Бокс. Турнір па версіі WBC Official Eliminator у ЗША.
**00.00** Экстрэмальны спорт. Freeride Spirit.
**01.15** Супербайк. Чэмпіянат свету ў Аўстраліі (Філіп-Айленд). Заезд 2-і.
**02.15** Вось дык так!!!

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў.
**07.20, 19.35** Гарачы каментар.
**07.35, 12.05** «Гняздо», серыял: 6 серыя.
**08.25** «Час гонару», серыял: 18 серыя.
**09.10, 13.40** «Мой родны горад», серыял.
**09.35, 14.05** Еўропа сёння.
**10.05, 14.35** «НКВД – гестапа. Браты па крыві», дак. фільм, 2009 г., Беларусь.
**10.35, 15.05** Прыватная калекцыя.
**11.10, 15.40** «Дзе мае бацькі? Пакінутыя дзеці ў Румыніі», дак. фільм, 2008 г., Румынія.
**11.40, 16.10** «Уладзімір Арлоў», 2008 г., Беларусь.
**12.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**12.55** «Час гонару», серыял: 18 серыя.
**16.25** МакраФон: З архіву «Jazz Jamboree»: «Sun Ra Arkestra».
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Мой родны горад», серыял.
**17.30** «Кансультацыя ў ружовым садзе» серыял: 26 серыя.
**18.20** ПраСвет.
**18.45** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Варшаўская канфедэрацыя».
**18.55** Два на два (тэледыскусія).
**19.30** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.45** Калыханка для самых маленькіх.
**19.50** Праект «Будучыня».
**20.15** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**20.25** Госць «Белсату».
**20.40** «Над Нёмнам» (тэлечасопіс).
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.20** Сцяна, дак. цыкл.
**21.35** Асабісты капітал.
**21.50** Рэпартэр.
**22.20** «Доктар Марцін», серыял.
**23.05** Басаножпа свеце (спазнаваўчая праграма): «Незвычайная кава».
**23.30** Аб'ектыў.
**23.50** Гарачы каментар.

## 2 САКАВІКА, СЕРАДА

### 1

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 16.55, 18.00, 19.00, 23.05** Навіны.
**06.05, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.10, 18.50, 00.50** Зона Х.
**07.30, 11.55** Дзелавое жыццё.
**08.35** Сфера інтэрасаў.
**09.10** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**10.05** Серыял «Маршрут літасці» (Расія).
**10.50** Крымінальная меладрама «Зацьменне» (Расія - Украіна).
**11.40** Актуальнае інтэрв'ю.
**12.10** Меладрама «Каханне Аўроры» (Расія - Украіна).
**13.45** Хранікальна-дакументальны фільм «Гвардыя. Баявыя традыцыі» (Беларусь). 7-я серыя, заключная.
**14.05** Праграма «Акно ў Еўропу».
**14.30** Відэафільм АТН «Млын моды: Венскія фантазіі».
**15.15, 19.10** Навіны рэгіёна.
**15.35** «OFF STAGE LIFE».
**15.50** Дэтэктыўны серыял «Жураў-2».
**16.55** Серыял «Маршрут літасці» (Расія).
**17.50** Крымінальная меладрама «Зацьменне» (Расія - Украіна).
**19.25** «Спортлато 5 з 36». Забаўляльнае шоў.
**19.30** «КЕНО».
**19.35** Зямельнае пытанне.
**19.55** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**21.00** «Панарама». Інфармацыйны канал.
**21.45** Актуальнае інтэрв'ю.
**22.00** Дэтэктыўны серыял «Абдуры мяне -2» (ЗША) 6-я серыя.
**23.15** Драматычны трылер «Зман» (ЗША).
**00.55** Дзень спорту.

### Н

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.20** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Жыць здорава!».
**10.10** «Мая жонка мяне прычаравала». Шматсерыйны фільм.
**11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00, 23.35** Навіны спорту.
**11.10** «Смак».
**11.50** «Тата на ўсе рукі». Камедыйны серыял.
**12.20** «Дэтэктывы».
**13.10** «Кантрольны закуп».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.50** «Зразумець. Прабачыць».
**15.25** «Хачу ведаць».
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**17.05** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**18.20** «Шчаслівыя разам». Серыял.
**18.55** «Хай кажуць».
**20.00** Час.
**21.05** «Доктар Тырса». Шматсер. фільм.
**22.15** «Залаты капкан». Шматсер. фільм.
**23.40** Асяроддзе пасялення.
**00.40** «Іван Падушкін. Джэнтльмен вышуку». Шматсерыйны фільм.
**01.30** Начныя навіны.

### СТВ

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**07.45** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**08.30** «Апошні сакрэт Майстра». Серыял.
**09.30** «Аўтапанарама».
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.40** «Трымай мяне мацней». Тэленавэла.
**11.30** «Далёкія сваякі».
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Агонь кахання». Серыял.
**13.50** «Дурні, дарогі, грошы».Серыял.
**14.40** «Халасцякі». Серыял.
**15.30** «Хірамант». Серыял.
**16.50** «Новыя падарожжы дылетанта».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Агонь кахання». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** «Апошні сакрэт Майстра». Серыял.
**21.30** «Мінск і мінчане».
**22.05** «Дабро пажаліцца».
**22.55** «Хірамант». Серыял.
**23.50** «Пантэра». Серыял.

### ЛАД

**06.35** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05, 16.55** Дэтэктыўны серыял «Чыста англійскія забойствы» (Вялікабрытанія).
**09.00** Серыял «Ты маё жыццё».
**10.05** Камедыя «Тапінамбуры». 1-я серыя.
**11.20** Спорт-кадр.
**11.45** «Рэпарцёр «Беларускай часіны».
**12.35** Медычныя таямніцы.
**13.10** Медычныя таямніцы +.
**13.25** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**14.25** Серыял «Сіла прыцягнення».
**15.20** Мультсерыял «Сямейка піратаў».
**15.50** Пазакласная гадзіна.
**16.05** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».
**18.00** Серыял «Ты маё жыццё».
**19.05** Кінааповесць «Вам і не снілася...».
**20.45** «Калыханка».
**21.05** Тэлебарометр.
**21.10** Беларуская часіна.
**22.10** Камедыйны серыял «Інтэрны».
**22.50** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**23.20** Рэальны свет.
**23.50** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».

### РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.20** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**10.10** «Міхаіл Гарбачоў пра сябе». Дакументальны фільм.
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** «Кулагін і партнёры».
**12.00** Тэлесерыял «Індус».
**13.50, 16.50, 19.50, 23.20** Навіны - Беларусь.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.25** «Рускі шакалад». Тэлесерыял.
**16.15** Тэлесерыял «Дворык».
**17.20** «Кулагін і партнёры».
**17.50** Тэлесерыял «Сустрэчная паласа».
**18.50** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**20.30** Тэлесерыял «Індус».
**22.20** Тэлесерыял «Аператыўнікі. Хронікі забойнага аддзела. Новая версія».
**23.30** «Весткі.ru».
**23.50** «Гістарычныя хронікі». Дак. фільм.

### НТВ

**06.05, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 23.20** Сёння.
**06.10** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.35** Серыял «Таксістка».
**09.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.20** «Дачны адказ».
**11.20** «Развод па-руску».
**12.05** «Да суду».
**13.30** Дэтэктыўны серыял «Следапыт».
**15.15** «Справа густу».
**15.40** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.25** Серыял «Вуліцы пабітых ліхтароў».
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.35** Серыял «Пагоня за ценем».
**21.35** Прэм'ера. Баявік «Святаяннік».
**23.45** Прэм'ера. «Вайна супраць сваіх. Дзянікін, Капель, Бонч-Бруевіч...».

### EUROSPORT

**09.30** Лыжныя гонкі. Чэмпіянат свету ў Нарвегіі. Мужчыны. 15 км вольным стылем.
**10.30** Лыжнае дваяборства. Чэмпіянат свету ў Нарвегіі (Осла). Камандныя спаборніцтвы. 4х5 км.
**11.30** Зімовыя віды спорту. Лыжнае дваяборства.
**11.45** Лыжнае дваяборства. Чэмпіянат свету ў Нарвегіі. HS 134. Прамая трансляцыя.
**13.00** Лыжныя гонкі. Чэмпіянат свету ў Нарвегіі (Осла). Камандныя спаборніцтвы. Спрынт. Кваліфікацыя. Прамая трансляцыя.
**15.00** Лыжныя гонкі. Чэмпіянат свету ў Нарвегіі (Осла). Камандныя спаборніцтвы. Спрынт. Прамая трансляцыя.
**16.15** Лыжнае дваяборства. Чэмпіянат свету ў Нарвегіі (Осла). HS 134.
**16.45** Лыжнае дваяборства. Чэмпіянат свету ў Нарвегіі (Осла). Гонка па сістэме Гундэрсена. Прамая трансляцыя.
**17.45** Скачкі з трампліна. Чэмпіянат свету ў Нарвегіі (Осла). Мужчыны. Камандныя спаборніцтвы.
**18.45** Скачкі з трампліна. Чэмпіянат свету ў Нарвегіі (Осла). HS 134. Кваліфікацыя. Прамая трансляцыя.
**20.00, 01.30** Лыжныя гонкі. Чэмпіянат свету ў Нарвегіі. Камандныя спаборніцтвы. Спрынт.
**21.00** Лыжнае двaяборства. Чэмпіянат свету ў Нарвегіі. Гонка па сістэме Гундэрсена.
**21.30** «Алімпійскія гульні». Часопіс.
**22.00** «Спартовае вандраванне». Конны спорт. Часопіс.
**22.05** Абранае па серадах.
**22.10** Конны спорт. Кубак свету. Канкур.
**23.10** Навіны коннага спорту.
**23.15** Гольф. Чэмпіянат свету. Accenture Matchplay (ЗША).
**00.15** Гольф-клуб.
**00.20** Яхт-клуб.
**00.30** Скачкі з трампліна. Чэмпіянат свету ў Нарвегіі (Осла). HS 134. Кваліфікацыя.

### БЕЛСАТ tv

**07.00** Аб'ектыў.
**07.20, 19.35, 00.20** Гарачы каментар.
**07.30** «Зграя», сенсацыйны серыял.
**08.25, 13.00** «Кансультацыя ў ружовым садзе» серыял: 26 серыя.
**09.15, 13.55** «Мой родны горад», серыял.
**09.40, 14.20** Праект «Будучыня».
**10.10, 14.50** Рэпартэр.
**10.35, 15.15** Асабісты капітал.
**10.50, 15.30** Два на два (тэледыскусія.)
**11.20, 16.05, 20.40** Госць «Белсату».
**11.35, 16.20** Гісторыя пад знакам Пагоні.
**11.40** «Над Нёманам» (тэлечасопіс).
**12.00, 19.30** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**12.05** «Зграя», сенсацыйны серыял.
**16.30** «Над Нёманам» (тэлечасопіс).
**16.50** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Мой родны горад», серыял.
**17.35** «Доктар Марцін», серыял.
**18.20** Беларусы ў Польшчы.
**18.40** Эксперт.
**19.10** Сальда (эканамічная праграма).
**19.45** Калыханка для самых маленькіх.
**19.55** На колах.
**20.20** Навігатар.
**20.35** Вагон.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.20** Сцяна, дак. цыкл.
**21.35** «Песня на два галасы», дак. фільм.
**21.55** Два на два (тэледыскусія).
**22.30** «Цудоўны дзень», маст. фільм.
**00.00** Аб'ектыў.

## 3 САКАВІКА, ЧАЦВЕР

### 1

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 16.55, 18.00, 19.00, 23.05** Навіны.
**06.05, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**06.45** Nota Bene.
**07.05, 08.10, 18.50, 01.45** Зона Х.
**07.30, 08.30, 11.55** Дзелавое жыццё.
**08.35** Зямельнае пытанне.
**09.10** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**10.05** Серыял «Маршрут літасці» (Расія).
**10.50** Крымінальная меладрама «Зацьменне» (Расія-Украіна).
**11.40** Актуальнае інтэрв'ю.
**12.10** Камедыйная меладрама «Рамонак, кактус, маргарытка» (Украіна).
**13.45** Відэафільм АТН «Бешанковічы» цыклу «Зямля беларуская».
**14.05** Дак. цыкл «У пошуках ісціны».
**15.15, 19.10** Навіны рэгіёна.
**15.35** «Зброя». Цыкл дак. фільмаў.
**15.50** Дэтэктыўны серыял «Жураў-2».
**17.00** Серыял «Маршрут літасці» (Расія).
**17.50** Крымінальная меладрама «Зацьменне» (Расія-Украіна).
**19.25** «КЕНО».
**19.30** Сфера інтэрасаў.
**19.55** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**21.00** Панарама.
**21.45** Актуальнае інтэрв'ю.
**22.00** Дэтэктыўны серыял «Абдуры мяне-2» (ЗША). 7-я серыя.
**23.15** Камедыя «Утаймаванне свавольных».
**01.00** Дак. цыкл «Зброя будучыні» (ЗША).
**01.50** Дзень спорту.

### Н

**06.00, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Жыць здорава!».
**10.20** «Мая жонка мяне прычаравала». Шматсерыйны фільм.
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Смак».
**11.50** «Тата на ўсе рукі». Камедыйны серыял.
**12.20** «Дэтэктывы».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Кантрольны закуп».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.50** «Зразумець. Прабачыць».
**15.25** «Хачу ведаць».
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**17.05** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Шчаслівыя разам». Серыял.
**18.55** «Хай кажуць».
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** «Доктар Тырса». Шматсер. фільм.
**22.15** «Залаты капкан». Шматсер. фільм.
**23.20** Нашы навіны.
**23.35** Навіны спорту.
**23.40** Гандбол. Ліга чэмпіёнаў.
**01.15** Начныя навіны.

### СТВ

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** «Апошні сакрэт Майстра». Серыял.
**09.30** «Дабро пажаліцца».
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.40** «Трымай мяне мацней». Тэленавэла.
**11.30** «Далёкія сваякі».
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Агонь кахання». Серыял.
**13.50** «Дурні, дарогі, грошы». Гумарыстычны серыял.
**14.40** «Халасцякі». Серыял.
**15.30** «Хірамант». Серыял.
**16.50** «Добры дзень, доктар!».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Агонь кахання». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** Прэм'ера! «Апошні сакрэт Майстра». Серыял.
**21.30** «Праўда».
**22.05** «Аўтапанарама».
**22.55** «Хірамант». Серыял.
**23.50** «Пантэра». Серыял.

### ЛАД

**06.35** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Камедыйны серыял «Інтэрны».
**08.35** Дэтэктыўны серыял «Чыста англійскія забойствы» (Вялікабрытанія).
**09.35** Серыял «Ты маё жыццё».
**10.40** Прыгодніцкая камедыя «Тапінамбуры» (СССР). 2-я серыя.
**11.55** «Бітва экстрасэнсаў».
**12.50** Дача здароўя.
**13.25** Біятлон. Чэмпіянат свету-2011. Ханты-Мансійск. Змяшаная эстафета. Прамая трансляцыя.
**14.55** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**15.55** Пазакласная гадзіна.
**16.10** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».
**17.00** Дэтэктыўны серыял «Чыста англійскія забойствы» (Вялікабрытанія).
**18.00** Серыял «Ты маё жыццё».
**19.05** Вострасюжэтная меладрама «Асабістая справа суддзі Івановай» (СССР).
**20.40** «Калыханка».
**21.00** Тэлебарометр.
**21.05** Беларуская часіна.
**22.05** Камедыйны серыял «Інтэрны».
**22.45** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**23.20** Час футболу.
**23.50** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».

### РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.20** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**10.10** «Аляксандр Гадуноў. Уцёкі ў нікуды». Дакументальны фільм.
**11.00** Весткі.
**11.30** «Кулагін і партнёры».
**12.00** Тэлесерыял «Індус».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.25** «Рускі шакалад». Тэлесерыял.
**16.15** Тэлесерыял «Дворык».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.20** «Кулагін і партнёры».
**17.50** Тэлесерыял «Сустрэчная паласа».
**18.50** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.00** Весткі.
**20.30** Тэлесерыял «Індус».
**22.20** Тэлесерыял «Аператыўнікі. Хронікі забойнага аддзела. Новая версія».
**23.20** Навіны - Беларусь.
**23.30** «Весткі.ru».
**23.50** «Паядынак».

### НТВ

**06.05** Сёння.
**06.10** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.35** Серыял «Таксістка».
**09.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Вочная стаўка».
**11.15** «Таямнічая Расія».
**12.05** «Да суду».
**13.00** Сёння.
**13.30** «Савецкія біяграфіі».
**15.15** «Справа густу».
**15.40** Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.25** Серыял «Вуліцы пабітых ліхтароў».
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.35** Прэм'ера. Серыял «Пагоня за ценем».
**21.35** Прэм'ера. Баявік «Святаяннік».
**23.20** Сёння.
**23.45** Прэм'ера. «Вайна супраць сваіх. Ігнацьеў, Карнілаў, Махроў...».

### EUROSPORT

**09.30, 12.15, 17.00** Скачкі з трампліна. Чэмпіянат свету ў Нарвегіі (Осла). HS 134. Кваліфікацыя.
**10.30** Лыжныя гонкі. Чэмпіянат свету ў Нарвегіі (Осла). Камандныя спаборніцтвы. Спрынт.
**11.15, 16.00** Лыжнае дваяборства. Чэмпіянат свету ў Нарвегіі (Осла). Гонка па сістэме Гундэрсена.
**13.15** Біятлон. Чэмпіянат свету ў Расіі (Ханты-Мансійск). Змяшаная эстафета. Прамая трансляцыя.
**15.00** Лыжныя гонкі. Чэмпіянат свету ў Нарвегіі (Осла). Жанчыны. Эстафета 4х5 км. Прамая трансляцыя.
**17.45** Скачкі з трампліна. Чэмпіянат свету ў Нарвегіі. HS 134. Прамая трансляцыя.
**19.45** Біятлон. Чэмпіянат свету ў Расіі (Ханты-Мансійск). Змяшаная эстафета.
**21.00** Баявыя мастацтвы. К 1. Сусветны Гран-пры (Токіо, Японія).
**22.50** Скачкі з трампліна. Чэмпіянат свету ў Нарвегіі (Осла). HS 134.
**00.15** Біятлон. Чэмпіянат свету ў Расіі (Ханты-Мансійск). Змяшаная эстафета.
**01.30** Лыжныя гонкі. Чэмпіянат свету ў Нарвегіі (Осла). Жанчыны. Эстафета 4х5 км.

### БЕЛСАТ tv

**07.00, 12.00** Аб'ектыў.
**07.20** Гарачы каментар.
**07.30** «Цудоўны дзень», маст. фільм, 2005 г., Польшча.
**09.05** «Доктар Марцін», серыял: 26 серыя.
**09.50** «Мой родны горад», серыял.
**10.20, 14.05** На колах.
**10.45, 14.35** Беларусы ў Польшчы.
**11.05, 14.50** Госць «Белсату».
**11.20** Без рэтушы: «Песня на два галасы», дак. фільм, 2009 г., Польшча.
**11.40** Сальда (эканамічная праграма).
**12.05** «Доктар Марцін», серыял: 26 серыя.
**12.50** «Край светлых мрояў», дак. фільм, 2008 г., Польшча.
**13.40** «Мой родны горад», серыял.
**15.10** Без рэтушы: «Песня на два галасы», дак. фільм, 2009 г., Польшча.
**15.30** Эксперт.
**15.55** Сальда (эканамічная праграма).
**16.10** Навігатар.
**16.25** Два на два (тэледыскусія).
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Школа на санцапёку», серыял.
**17.35** «Цудоўны дзень», маст. фільм, 2005 г., Польшча.
**19.10** «Бульбаны», мультсерыял.
**19.20** Гісторыя пад знакам Пагоні.
**19.30** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.35** Гарачы каментар.
**19.45** Калыханка для самых маленькіх.
**19.50** Праект «Будучыня».
**20.20** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**20.30** «Беспрацоўныя», дак. фільм, 2009 г., Польшча.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.20** Сцяна, дак. цыкл.
**21.35** Рэпартэр.
**22.00** Форум: «Па-за законам»
**22.45** «Трэці афіцэр», дэтэктыўны серыял.
**23.35** Аб'ектыў.
**23.55** Гарачы каментар.

# ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ

Выпуск №2 (54) (люты)

www.lit-bel.org www. novychas.gmail.com

Культурна-асветніцкі праект Грамадскага аб'яднання «Саюз беларускіх пісьменнікаў» і «Новага часу»


Анонс


«НАВІНЫ»: літаратурна-грамадскае жыццё лютага ........ с. 2.
«ПУБЛІЦЫСТЫКА»: «Розгалас» ад Інгі ЛІНКВІСТ ........ с. 3.
«ЭСЭ»: «Сведчанне» Віктара ЯРАЦА ........ с. 4.
«ПРОЗА»: новае апавяданне Віктара КАЗЬКО ........ с. 5.
«ПАЭЗІЯ»: вершы Януся МАЛЬЦА ........ с. 6.
«ПРОЗА»: «Паўстанец» Віталя БЫЛЯ ........ с. 7.
«ПРОЗА»: апавяданне Сяргея ЕГАРЭЙЧАНКІ ........ с. 8–9.
«ПАЭЗІЯ»: «Дэбют» Святланы КАНЬКОВАЙ-ДУДАРЭНКІ і «Парцэлы» Алеся МАКРАЦОВА ........ с. 10.
«ЭСЭ»: «Застацца Мележам» Анатоля КУДРАЎЦА ........ с. 11.
«ЗАПІСЫ»: старонкі дзённіка Ніла ГІЛЕВІЧА ........ с. 12–13.
«ЧЫТАЛЬНЯ»: фрагменты рамана Уладзіслава АХРОМЕНКІ «Тэорыя змовы» ........ с. 14–15.
«ЛІТКАКТЭЙЛЬ»: пытанні чытачоў, «Розгалас» ды шорт-ліст літаратурнай прэміі імя М. Багдановіча ........ с. 16.


ПАЗІЦЫЯ

## НА МЯЖЫ ЭТНІЧНАГА ВЫМІРАННЯ


*Станіслаў ДУБЯНЕЦКІ,*
*кандыдат філасофскіх навук*


**У сённяшняй Беларусі працэс дэнацыяналізацыі (дэбеларусізацыі) грамадства дасягнуў своеасаблівай «кропкі незвароту», калі ўсе сферы духоўнай культуры і побыту народа пазбаўлены сваёй нацыянальнай асновы. Такая сапраўды трагічная сітуацыя стала заканамерным вынікам шматвяковага і мэтанакіраванага выцяснення роднай мовы з афіцыйнага і грамадскага жыцця.**



Таму небеспадстаўна мова беларусаў трапіла ў свайго роду Чырвоную Кнігу — складзены ЮНЕСКА атлас «Мовы свету ў небяспецы», куды аднесены мовы, якія апынуліся пад пагрозай поўнага знікнення. І таму такую непрытоеную трывогу і шчырую занепакоенасць занядбаннем роднай мовы выказваюць прадстаўнікі розных грамадскіх арганізацый і аб'яднанняў. У гэтым сэнсе вельмі надзённа гучыць зроблены ў адмысловай Заяве Рады Саюза беларускіх пісьменнікаў (снежань 2010 года) вывад аб тым, што адмаўляючыся ад сваёй мовы, беларусы страчваюць не толькі сваю культурную адметнасць і нацыянальную самабытнасць, але і будучыню сваёй нацыі.

Дадзеныя апошняга перапісу насельніцтва (2009 год), паводле якога ў нашай краіне пражывае 84% беларусаў, але беларускую мову лічаць роднай толькі 53% жыхароў, міжволі раскрылі разбуральны характар асімілятарскай палітыкі ўладаў, татальнай русіфікацыі беларускага грамадства. А яшчэ гэта можа сведчыць аб паспяховым завяршэнні пачатых у сталінскія часы эксперыментаў па перавыхаванні «спакойных і талерантных беларусаў», або, гаворачы словамі Рыгора Барадуліна, «антычалавечых доследаў па дэнацыяналізацыі».

Памятаеце, з якой любоўю і пяшчотай гаварыў пра родную беларускую мову Уладзімір Караткевіч. Ён называў яе мовай Скарыны і Буднага, Багдановіча і Купалы, Багушэвіча і Коласа, мовай соцень геніяў, што яшчэ прыйдуць, а таксама мовай настаўнікаў і паэтаў, вучоных і кампазітараў, мовай першай матчынай калыханкі і апошняга «бывай», мовай мільёнаў людзей па ўсім свеце і, галоўнае, на нашай беларускай зямлі. «Няма цябе, — пісаў Караткевіч, — і няма суцяшэння ў горы. Няма цябе — і вось нямы язык, і нельга сказаць слоў радасці. А калі ўбіць сабе ў галаву цалкам дурную думку, што ў нейкім далёкім будучым цябе не будзе, то нашто нам тады такая будучыня?»

Дык як магло так здарыцца, што тое, аб чым перажываў і папярэджваў наш класік, спраўджваецца ўжо цяпер, усяго праз дваццаць гадоў пасля абвяшчэння незалежнасці Беларусі? Чаму мы засталіся такімі абыякавымі і глухімі да засцярогі нашага вялікага Паэта-Прарока Францішка Багушэвіча, які як быццам сэрцам адчуваў, што беларускі народ можа раздзяліць лёс тых народаў, што «страцілі сваю мову, а потым і зусім замёрлі»? У чым жа вытокі і прычыны такой глыбокай дэбеларусізацыі беларускага грамадства?...

### Горкая расплата

Аб упадку (летаргіі) беларускага нацыянальнага жыцця, якое наступіла пасля залатога веку Рэнесансу, неаднойчы з вялікай душэўнай боллю і трывогай разважаў Максім Багдановіч. Асабліва мэтанакіравана, на яго думку, стараліся «дабіць беларускую культуру ў часы Расійскай імперыі», калі канфіскоўвалі і палілі беларускія кнігі, забаранялі пропаведзь на беларускай мове, знішчылі суд па беларускаму праву, ліквідавалі вунію, пачалі «авелікарушванне» народа, шырокае ўкараненне велікарускай культуры ў беларускую.

Напэўна, невыпадкова і сёння мы з'яўляемся сведкамі таго, як сучасныя русіфікатары выкарыстоўваюць вопыт тых сумнавядомых заходне-русаў і славянафілаў-чорнасоценцаў, што сістэматычна травілі беларускую прэсу, беларускіх пісьменнікаў і публіцыстаў, раздушылі беларускія палітычныя партыі, культурна-асветныя арганізацыі, закрылі «Нашу Ніву» і іншыя прагрэсіўныя выданні, забаранілі публікацыю твораў на беларускай мове.

А пачалося ўсё з т.зв. «белых плямаў» у дзяржаўных газетах пасля першых прэзідэнцкіх выбараў у Рэспубліцы Беларусь, звальнення з працы тагачасных рэдактараў некаторых рэспубліканскіх газет, выгнання з БТ вядомых журналістаў. Напярэдадні другіх прэзідэнцкіх выбараў дзяржаўнае прадпрыемства-манапаліст «Белпошта» выключыла з падпіснога каталогу на 2006 год 16 газет. З прычыны эканамічнай дыскрымінацыі з боку ўладаў спынілі выпуск такія выданні, як «Салідарнасць» і «БДГ. Деловая газета», былі закрыты газеты «Згода», «Тэлескоп» (Ліда) і інш. Ну, і ўжо зусім непрыкрытым выпадам супраць нацыянальна-арыентаванай інтэлігенцыі стала адхіленне ад пасадаў галоўных рэдактараў часопісаў «Полымя», «Маладосць» і «Нёман», а таксама стварэнне т.зв. холдынгу «Літаратура і мастацтва» на чале з зацятым працівнікам беларушчыны Сяргеем Касцянам. Сёння жорсткі ўціск і перашкоды ў ажыццяўленні прафесійнай дзейнасці зведваюць рэдакцыі і журналісты «Народнай волі», «Нашай нівы», «Новага часу» і іншых выданняў.

У гэтым жа забаронна-абмежавальным рэчышчы можна разглядаць сістэматычны пераслед дзейнасці беларускіх палітычных партый і грамадскіх аб'яднанняў, праваабарончых арганізацый, стварэнне праўладнага Саюза пісьменнікаў і прама-такі нясцерпных умоў для плённай творчай дзейнасці членаў незалежнага Саюза беларускіх пісьменнікаў. Нельга без шкадавання і болю ў сэрцы ўсведамляць, што сёння за кратамі або пад падпіскай аб нявыездзе знаходзяцца абвінавачаныя ў т.зв. «масавых беспарадках» 19—20 снежня 2010 года ў Мінску кіраўнікі і актывісты зарэгістраваных ці не зарэгістраваных Аб'яднанай грамадзянскай партыі, Беларускага народнага фронту, Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Народная грамада), Беларускай хрысціянскай дэмакратыі, грамадзянскіх кампаній «Гавары праўду» і «Еўрапейская Беларусь», саюза «За мадэрнізацыю», маладзёжных арганізацый «Малады фронт», «Маладыя дэмакраты» і інш.?

Праўда, у адносна кароткі перыяд беларусізацыі 1920-х гадоў удалося крыху збавіць агрэсіўна-наступальны пыл русіфікатараў усіх кірункаў і адценняў. Аднак з канца гэтага дзесяцігоддзя, калі абазначыўся круты паварот да палітыкі «контрбеларусізацыі», тых людзей, хто яшчэ пісаў па-беларуску, размаўляў ці карыстаўся ў сваёй дзейнасці роднай мовай, абвінавачвалі ў «нацдэмаўшчыне», адразу залічвалі ў шавіністы, знішчалі фізічна. Апагеем гэтай беспрэцэдэнтнай кампаніі цкавання і надуманых абвінавачанняў вядомых дзеячаў беларускай навукі і культуры стала сфальсіфікаваная АДПУ БССР у 1930 годзе справа аб так званай «нацдэмаўскай, контррэвалюцыйнай, антысавецкай арганізацыі» пад кодавай назвай «Саюз вызвалення Беларусі» .

Абвінавачванне ў прыналежнасці да «СВБ» было прад'яўлена Янку Купалу, якому прыпісвалі ідэйнае кіраўніцтва гэтай арганізацыяй і сцвярджалі, што разам з творамі яўна савецкімі ў яго маюцца вершы кулацкага і прама контррэвалюцыйнага зместу. Вядомы факт, што ў выніку ўчыненага над арыштаваным паэтам псіхалагічнага гвалту і прымусова выбітых у яго паказанняў газета «Звязда» 30 снежня 1930 года змясціла на сваіх старонках ліст за подпісам Я.Купалы, у якім ён нібыта раскайваўся ў тым, што «прыняў самы блізкі ўдзел у контррэвалюцыйнай рабоце віднейшых беларускіх нацыянал-дэмакратаў, якія... праводзілі свае шкодніцкія нацыянал-дэмакратычныя ідэі на культурным фронце». Пад чэкісцкім прымусам былі вымушаны напісаць пакаяльныя лісты Я.Колас, Д.Жылуновіч, У. Ігнатоўскі, акадэмік С.Вальфсон і інш. Відавочна, што і сёння некаторыя супрацоўнікі спецслужбаў таксама не супраць выкарыстаць падобныя метады атрымання належнага «эфекту» сваёй дзейнасці.

### У пошуках «ворагаў народа»

У сваіх грунтоўных даследаваннях, прысвечаных рэпрэсаваным літаратарам, навукоўцам, работнікам асветы, грамадскім і культурным дзеячам, Леанід Маракоў раскрыў планамерны характар і стройную сістэму памкненняў бальшавіцкага рэжыму па вынішчэнні беларускай нацыянальнай культуры. А «самай чорнай ноччу» ў культурным жыцці тых змрочных часоў, на яго думку, лічыцца ноч з 29 на 30 кастрычніка 1937 года, калі ў Менску былі расстраляны 52 прадстаўнікі інтэлектуальнай эліты, у тым ліку 22 беларускія і яўрэйскія літаратары. А ўсяго за дзесяцігоддзе — з 1930 па 1939 год — рэпрэсавана не менш 350 беларускіх літаратараў, амаль палову з іх расстралялі. Трагічны і пакутніцкі лёс напаткаў Платона Галавача, Уладзіміра Дубоўку, Уладзіміра Жылку, Уладзіміра Хадыку, Язэпа Пушчу, Алеся Дудара, Міхася Зарэцкага, Тодара Кляшторнага, Валеры Маракова, Барыса Мікуліча, Алеся Звонака, Паўла Пруднікава, Алеся Пальчэўскага, Міхася Чарота і і інш.

Самай «чорнай ноччу» ў грамадска-палітычным жыцці Рэспублікі Беларусь стала ноч з 19 на 20 снежня 2010 года, калі сотні мірных грамадзянаў (у тым ліку жанчыны і пажылыя людзі) былі збіты, пакалечаны і кінуты ў турэмныя камеры толькі за тое, што хацелі адстаяць свае права на свабодны і дэмакратычны выбар, а значыць, і на незалежнае, годнае жыццё ўсіх беларусаў. Акрамя таго, былі арыштаваны і абвінавачаны ў арганізацыі і ўдзеле ў «масавых беспарадках» большасць былых кандыдатаў у прэзідэнты Рэспублікі Беларусь (беспрэцэдэнтны выпадак у гісторыі!), кіраўнікі іх перадвыбарчых штабоў, многія актывісты дэмакратычных партый, аб'яднанняў і рухаў.

Жахліва, але факт: у той вечар да паўсмерці быў збіты і зняволены прэтэндэнт на прэзідэнцкую пасаду, паэт і грамадскі дзеяч Уладзімір Някляеў, які наважыўся спыніць лавіну Хлусні на ўсіх узроўнях, дабівацца, каб усё наша жыццё вызначалі Праўда, Прыстойнасць і Павага да чалавека. Махавік неабгрунтаваных рэпрэсій не абышоў літаратуразнаўцу і публіцыста Аляксандра Фядуту, літаратара і палітыка Паўла Севярынца, сяброў Беларускай асацыяцыі журналістаў Наталлю Радзіну, Ірыну Халіп, Сяргея Вазьняка, Зміцера Бандарэнку.

**Працяг на стар. 3 (11)** ▸

ПАМЯЦЬ

# МУЗЕЙ ВАСІЛЯ БЫКАВА Ў СЕВЯРЫНЦЫ

**Новыя звесткі даходзяць у нашую рэдакцыю пра актыўную дзейнасць першага і пакуль што адзінага замежнага музея народнага пісьменніка Беларусі Васіля Быкава. Музей размяшчаецца ў сярэдняй школе мястэчка Вялікая Севярынка Кіравацкай вобласці Украіны — у той мясцовасці, дзе ваяваў і ледзь не загінуў пісьменнік.**

Школьнікі і настаўнікі перапісваюцца з роднымі і блізкімі Васіля Быкава, перыядычна папаўняюць музейныя фонды новымі матэрыяламі: лістамі, фотаздымкамі, кнігамі. Перыядычна выдаецца і «Музейний вісник».

Яшчэ восенню ў Вялікай Севярынцы з'явілася алея Славы, пасаджаная ў гонар 111 дывізіі, у шэрагах якой ваяваў славуты беларус. На базе школы прайшоў тыдзень музеяў і абласная канферэнцыя, у цэнтры якіх было імя Быкава.

«Дзяўчаты вывучылі словы песні, якую нам прыслала Валянціна Уладзіміраўна (сястра В.У.Быкава. — Рэд.), — паведамілі вялікасевярынкаўцы ў адным са сваіх лістоў, — а настаўнік музыкі запісаў нам мелодыю. І мы радыя, што гэтую песню пачулі і настаўнікі вобласці... Затым мы рыхтаваліся да абласнога семінара настаўнікаў замежнай літаратуры. Іх спецыяльна прывозілі да нас у музей Васіля Быкава».

А гэта — яшчэ з аднаго даслананага ліста: «Добры дзень, паважаныя прадстаўнікі Саюза беларускіх пісьменнікаў. Пішуць Вам вучні Вялікасевярынкаўскай школы. ...Вучні 6 класа, дзе кіраўнік Губенка Галіна Юр'еўна, высадзілі алею Славы. У цэнтры — дрэва Васіля Быкава. Гэта вечна-зялёны ядловец, які будзе сімвалізаваць вечную памяць аб тых, хто вызваляў нашае сяло. Падчас тыдня музеяў мы правялі многа экскурсій. Сярод настаўнікаў і вучняў была праведзена акцыя «Падыры кнігу Васіля Быкава ў музей». А яшчэ прайшлі тэматычныя музейныя ўрокі ва ўсіх класах па творах Васіля Быкава... Пішыце нам, расказвайце нам пабольш пра Васіля Быкава. Яшчэ мы марым стварыць у нашым музеі куток беларускай культуры. Калі можна, прышліце нам Сцяг, Герб і Гімн Беларусі... А яшчэ мы хочам вывучыць беларускую мову. Калі можна, дашліце нам беларуска-расійскі слоўнік. Тады мы зможам чытаць творы беларускіх пісьменнікаў на іх роднай мове. Дзякуй Вам за лісты, за фотаздымкі, за падтрымку».

Дзякуй і табе, маладая Украіна!



У музеі Васіля Быкава — маладыя экскурсанты

РОЗГАЛАС

# МАЕ КНІГІ — МАЯ БІЯГРАФІЯ: ІВАН ШАМЯКІН

**У Палацы Румянцавых і Паскевічаў Гомельскага палацава-паркавага ансамбля запрацавала выстава «Іван Шамякін. Мае кнігі — мая біяграфія...».**



Гомель быў абвешчаны культурнай сталіцай Беларусі 2011 года. Адным з першых значных юбілеяў года ў культурным жыцці краіны стала 90-годдзе з дня нараджэння народнага пісьменніка Беларусі Івана Шамякіна. Выстава, якая прымеркавана да знамянальнай даты і прысвечана юбілею пісьменніка, адлюстроўвае галоўныя этапы яго жыццёвага і творчага шляху. Усе тэмы экспазіцыі падпарадкаваныя агульнай ідэі: паказаць Івана Шамякіна не толькі як пісьменніка і творцу, адданага высокаму служэнню літаратуры, але і як чалавека, бацьку, сябра.

Асноўныя экспанаты выставы — прадметы з прыватнага архіва пісьменніка, якія захоўваюцца ў фондах Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры: фотаздымкі, асабістыя рэчы, кнігі з аўтографамі і інш.

Іван Пятровіч Шамякін нарадзіўся 30 студзеня 1921 года ў вёсцы Карма Добрушскага раёна Гомельскай вобласці. Удзельнік ІІ сусветнай вайны, герой Сацыялістычнай працы, узнагароджаны ордэнамі Леніна, Айчыннай вайны ІІ ступені, медалём Ф. Скарыны і інш.

Іван Шамякін увайшоў у гісторыю літаратуры як пісьменнік сучаснай тэмы, які асэнсоўваў праблемы чалавечага жыцця і лёс чалавецтва з сучасных яму пазіцый. Творы пісьменніка — гэта біяграфія цэлага пакалення, якое прайшло праз выпрабаванні вайны і будавала новае жыццё, якое спазнала Чарнобыль і пераломныя 90-ыя гады. Сярод найбольш вядомых — раманы «Глыбокая плынь», «Сэрца на далоні», «Атланты і карыятыды», «Вазьму твой боль», пенталогія «Трывожнае шчасце» і інш. І.Шамякін — аўтар шматлікіх аповесцей, апавяданняў, п'ес, публіцыстычных і літаратурна-крытычных артыкулаў. Большасць яго твораў інсцэніравана і экранізавана.

І.Шамякін — лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР (1951), Дзяржаўнай прэміі БССР імя Я.Коласа, Дзяржаўнай прэміі БССР у галіне тэатральнага мастацтва, кінематографіі, радыё і тэлебачання, лаўрэат Літаратурных прэмій імя Я.Коласа, Міністэрства абароны СССР.

ЮБІЛЕІ

# 90-ГОДДЗЕ «ЛЕТАПІСЦА ПАЛЕСКАЙ ЗЯМЛІ»

**8 лютага 2011 года ў Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры адбыўся вечар памяці «Летапісец Палескай зямлі», прысвечаны 90-годдзю з дня нараджэння народнага пісьменніка Беларусі Івана Мележа.**

Іван Паўлавіч Мележ нарадзіўся 8 лютага 1921 года ў вёсцы Глінішча Хойніцкага раёна Гомельскай вобласці. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, узнагароджаны ордэнамі Працоўнага Чырвонага сцяга, Чырвонай зоркі, «Знак Пашаны» і медалямі. Лаўрэат Літаратурнай прэміі імя Я.Коласа, Ленінскай прэміі, Дзяржаўнай прэміі БССР.

Дэбютаваў у 1939 годзе вершамі. Першае выступленне ў друку як празаіка адбылося ў 1943-м. Самымі дарагімі творамі Іван Паўлавіч называў тыя, якія прысвечаны перажытаму ім самім: «У завіруху», «Гарачы жнівень», «Мінскі напрамак». Прысвечаны падзеям Вялікай Айчыннай вайны, раман «Мінскі напрамак» стаў прыкметнай з'явай не толькі ў беларускай, але і ва ўсёй тагачаснай савецкай літаратуры. У ім пісьменнік імкнуўся паказаць усенародны характар барацьбы за вызваленне Беларусі, стварыць складанае, шматпланавае і шматгеройнае эпічнае палатно.

З асаблівай сілай талент Івана Мележа, шырыня яго пісьменніцкага погляду на гісторыю беларусаў раскрываецца ў галоўнай кнізе — трылогіі «Палеская хроніка», якая складаецца з раманаў «Людзі на балоце», «Подых навальніцы» і «Завеі, снежань». Алесь Адамовіч назваў трылогію «раманам-народам», бо галоўным героем у гэтых творах стаў сам народ. Кніга стала сапраўднай энцыклапедыяй жыцця беларускага сялянства, якая адлюстроўвае лёсы людзей у пераломныя моманты гісторыі. У многіх адносінах гэта народны раман, даніна павагі і ўдзячнасці роднай Палескай зямлі, адкуль бяруць вытокі жыццёвыя шляхі пісьменніка.

Праз свае шматлікія творы Іван Мележ імкнуўся раскрыць асабісты вопыт душы і памяць сэрца, не хаваючы сваіх, уласна аўтарскіх адносінаў да падзей і герояў. Яго творы — спроба захаваць душу вялікага і шматпакутнага беларускага народа. Ім характэрны праўдзівае адлюстраванне жыцця, псіхалагічнае абгрунтаванне ўчынкаў чалавека, паглыбленне ва ўнутраны свет сваіх герояў.

Ва ўсіх сваіх справах — літаратурных, грамадскіх, асабістых — Мележ быў сапраўдным Чалавекам з вялікай літары.

Падчас вечарыны ў Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры, у якой бралі ўдзел родныя, даследчыкі і аматары творчасці Івана Мележа, адбылася прэзентацыя выставы «Летапісец Палескай зямлі», на якой прадстаўлены матэрыялы з фондаў музея і Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва.

**(Эсэ Анатоля КУДРАЎЦА пра Івана МЕЛЕЖА чытайце на стар. 11 дадатка «Літаратурная Беларусь»)**

СУСТРЭЧЫ

# БЕЛАРУСКАЕ СЛОВА Ў СТАКГОЛЬМЕ

**Беларускія літаратары Барыс Пятровіч і Андрэй Хадановіч, кіраўнік Згуртавання беларусаў свету «Бацькаўшчына» Алена Макоўская па запрашэнні Саюза пісьменнікаў Швецыі наведалі Стакгольм. Увечары 7 лютага госці з Беларусі выступілі перад шведскай інтэлігенцыяй у найбуйнейшым культурным цэнтры Стакгольма Kulturhuset.**

Вечарына была пабудаваная ў форме пытанняў і адказаў. У якасці мадэратара выступіла шведская пісьменніца Агнета Плеель.

Свае творы чыталі для шведскай публікі Барыс Пятровіч і Андрэй Хадановіч. Алена Макоўская распавяла прысутным пра дзейнасць «Бацькаўшчыны», пра актуальнасць пытання культурнай ідэнтычнасці для беларусаў, пра новыя выклікі, што сталі перад грамадствам пасля 19 снежня 2010 года. Прысутным прадстаўнікам шведскай грамадскасці было вельмі цяжка ўявіць, што недалёк ад іх дома, у якіхсьці паўтысячы км, у Еўропе адбыліся падзеі, якія цалкам выпадаюць з еўрапейскага кантэксту.

Барыс Пятровіч адзначыў вялікую зацікаўленасць з боку шведаў да сітуацыі ў Беларусі.

«Сустрэча прайшла файна, было шмат цікавых пытанняў, асабліва спадабаўся вялікі інтарэс шведаў да падзеяў у нас. Шведскі бок праяўляў пастаянную глыбокую зацікаўленасць і маральную падтрымку. Мы вельмі востра адчувалі, што ім не ўсё роўна, што яны вельмі хочуць дапамагчы, асабліва тым, хто ў заключэнні», — сказаў Барыс Пятровіч.

Што да развіцця шведска-беларускіх літаратурных кантактаў, то ў хуткім часе павінна з'явіцца іх чарговае ўвасабленне. Рыхтуецца да выдання раман Барыса Пятровіча «Плошча» ў перакладзе на шведскую мову. Пераклад падрыхтаваў Дзмітры Плакс. Кніга выйдзе ў выдавецтве «Rámus». У 2008 годзе ў гэтым жа выдавецтве выйшла па-шведску кніга Барыса Пятровіча «Фрэскі», таксама ў перакладзе Дзмітры Плакса. Апошні, дарэчы, таксама прысутнічаў на сустрэчы ў культурным цэнтры Kulturhuset.

«Уражанні самыя добрыя, — распавёў Дзмітры Плакс. — Было шмат людзей. Размова ішла пра сітуацыю ў Беларусі, найперш — са свабодай слова. Андрэй Хадановіч і Барыс Пятровіч чыталі свае творы. Гучалі ўрыўкі з рамана Барыса Пятровіча «Плошча» на шведскай мове ў выкананні вядомай шведскай радыёжурналісткі Чэрсцін М. Лундберг. Потым былі пытанні ад публікі.»

Таксама падчас візіту ў Швецыю адбыліся сустрэчы Андрэя Хадановіча, Барыса Пятровіча і Алены Макоўскай з кіраўніцтвам Саюза пісьменнікаў Швецыі і Шведскага ПЭН-цэнтра. Госці з Беларусі далі інтэрв'ю шведскім СМІ.




Фота Вольгі Класкоўскай, «БелаПАН»

На фота: Барыс Пятровіч, Алена Макоўская, Андэй Хадановіч.

**Старонка падрыхтавана паводле ўласнай інфармацыі, а таксама budzma.org, interfax.by і zbsb.org**

**ПАЗІЦЫЯ**

# НА МЯЖЫ ЭТНІЧНАГА ВЫМІРАННЯ

◂ **Працяг. Пачатак на стар. 1 (9).**

I ўжо зусім у духу 1930-х гадоў выглядаюць высунутыя ў адрас дэмакратычных лідэраў і актывістаў (з падачы БТ і «Советской Белоруссии») абвінавачанні ў спробах дзяржаўнага перавароту і навязвання народу іншага палітычнага ладу, а таксама ў іх сувязі з замежнымі разведцэнтрамі. Так бы мовіць, знайшлі «апраўданне» афіцыйна дадзенай апазіцыянерам сталінскай мянушцы «ворагі народа».

Характэрна, што бальшавіцкі тэрор, які ў 1930-я гадыператвараўся ў сапраўдны генацыд беларускага народа і ахапіў фактычна ўсю нацыю, скіроўваўся супраць канкрэтных сацыяльных або нацыянальных групаў насельніцтва, і, у першую чаргу, супраць беларусаў. Таму што ва ўмовах Беларусі большасць гэтых групаў адначасова былі і нацыянальнымі, і сацыяльнымі групамі. Гэтым самым смяротны ўдар наносіўся ў самае сэрца нацыі, у яе «нясучую канструкцыю» — носьбітаў самабытнай культуры і мовы тытульнага народа Беларусі. Ды і сёння, ва ўмовах суверэннай Беларусі, пачынаючы з 1996—1997-х гадоў, пад амапаўскія дубінкі і пераслед чамусьці трапляюць пераважна рупліўцы на ніве беларушчыны, беларусы па сваёй самасвядомасці і духу.

У пасляваенныя гады і ў перыяд т. зв. «застою» і гарбачоўскай перабудовы партыйнае кіраўніцтва і падначаленыя яму карныя органы БССР з зайздроснай паслядоўнасцю ўсё ўзмацнялі барацьбу супраць тых, хто асмельваўся заявіць аб сваім законным праве на карыстанне роднай моваю. Адчувальныя ўдары ў гэтым сэнсе былі нанесены, напрыклад, па т.зв. «Акадэмічным асяродку», вальнадумным студэнцкім гуртку БДУ, маладзёжным творчым згуртаванні «Беларуская майстроўня», нефармальным маладзёжным аб'яднанні «Талака», «Беларускаму народнаму фронту «Адраджэнне» і інш.

Але, безумоўна, найбольш пільнай увагі з боку карных і ідэалагічных органаў, шчыраваўшых на ніве цэнзуры і барацьбы з нацыяналізмам, заўсёды «ўдастойваліся» беларускія пісьменнікі, якія здолелі падняцца не толькі да ўсведамлення трагічнага мінулага, але і рэальнага месца свайго народа ў сучасным свеце, вырашальнай ролі яго роднай мовы — асновы незалежнасці і суверэнітэту дзяржавы.

Наглядным сведчаннем гэтага сталі шальмаванне ў прэсе і забароны твораў Васіля Быкава, ідэалагічныя наскокі і непрымірымыя адносіны да творчасці Уладзіміра Караткевіча і Аляксея Карпюка, цэнзурныя купюры ў выданнях рэпрэсаваных Максіма Гарэцкага ды інш. З цяжкасцю праз партыйныя і галоўлітаўскія «рагаткі» прабівалі сабе дарогу да шырокага чытача асобныя творы Алеся Адамовіча, Янкі Брыля, Андрэя Макаёнка, Алеся Разанава, Уладзіміра Арлова і інш. Дасюль не знята забарона на публікацыю новых твораў Васіля Быкава, Рыгора Барадуліна, Ніла Гілевіча, Генадзя Бураўкіна, Сяргея Законнікава, а сёння ўжо і Уладзіміра Някляева.

Да таго ж, сёння з мэтай процідзеяння беларускай нацыянальнай ідэі, а значыць, і нармальнаму функцыянаванню беларускай мовы, устаноўлены пільны нагляд ідэалагічных цэрбераў за дзейнасцю ўсіх выдавецтваў, друкаваных і электронных СМІ, творчых саюзаў і культурна-асветных устаноў, за зместам навуковых даследаванняў, навучальна-выхаваўчага працэсу ва ўсіх звеннях сістэмы адукацыі.

## Пагроза поўнага знікнення

Янка Купала, які называў мову выразіцельскай душы і думак чалавека, папярэджваў, што выракацца роднай мовы мы не маем права. Якуб Колас, выступаючы супраць непрыхаванага здзеку з беларускай мовы, з трывогай адзначаў, што недастатковая ўвага да роднай мовы стварае сур'ёзную пагрозу для далейшага развіцця культуры рэспублікі.

Васіль Быкаў з трывогай падкрэсліваў, што нацыянальная мова беларусаў, якую зняважліва таптаці на ўсіх узроўнях, выцяснялі расійскай, патроху і памалу гіне і неўзабаве рызыкуе стаць рарытэтам. Барыс Сачанка на багатым фактычным матэрыяле раскрываў не толькі гаротнае становішча беларускай мовы, але і паказваў, як, якімі метадамі вялося з ёю змаганне з боку ўрадаўцаў і тых, хто яе не ведаў і не хацеў вывучаць. Ніл Гілевіч заўсёды актыўна адстойваў і адстойвае правы беларускай мовы як адзінай дзяржаўнай мовы краіны, пастаянна папярэджвае, што становішча з роднай мовай, калі яго не выправіць, можа мець самыя горшыя наступствы для нацыянальнай культуры і для самога лёсу нацыі.

Многія вядомыя пісьменнікі, навукоўцы, дзеячы культуры, настаўнікі, студэнты і проста неraўнадушныя грамадзяне афіцыйна звярталіся і звяртаюцца да ўладных структураў з лістамі-патрабаваннямі аб недапушчэнні ігнаравання карэнных інтарэсаў беларускага народа, які пранёс праз стагоддзі нягоды і няшчасцяў сваю багатую самабытную культуру, свой уласны голас у свеце і выразна стаіць на мяжы знікнення як цэласны нацыянальны, гістарычны арганізм.

У той жа час вынікі т.зв. «усенароднага рэферэндуму», які адбыўся ў 1995 годзе насуперак настойлівым патрабаванням і пратэстам грамадскасці, на справе далі новы штуршок рэзкаму згортванню працэсаў беларусізацыі ў розных сферах грамадскага жыцця і сталі свайго роду прысудам беларускай мове да яе поўнага заняпаду і ціхага скanання.

Такім чынам, беларуская мова дасягнула крайняй мяжы свайго выжывання, а беларускі этнас перайшоў той Рубікон, за якім ясна праглядваецца этнічнае выміранне. І калі нашыя высокія палітыкі і падначаленыя ім ідэолагі згодныя з адміраннем мовы, значыць, як падкрэсліў гісторык Леанід Лыч, яны згодныя і са знікненнем з гістарычнай арэны яе прыродных носьбітаў — беларусаў, трансфармацыяй іх у расейцаў, толькі больш нізкага статусу.

Паспяхова вырашыць праблему пераадолення катастрафічных наступстваў дэнацыяналізацыі можа толькі сапраўды беларуская ўлада — беларуская па сутнасці, па здольнасці ўсвядоміць нацыянальныя інтарэсы беларусаў, зберагчы і ахоўваць векавыя традыцыі і гістарычную спадчыну беларускага народа. Таму неабходна адшукаць, сканструяваць і трывала замацаваць тыя рычагі і механізмы, што дапамаглі б абараніць і навечна захаваць такія ўніверсальныя сімвалы культуры і самасвядомасці беларусаў, як родная мова, нацыянальнае аблічча, самавызначэнне і традыцыйны нацыянальны лад жыцця.

**РОЗГАЛАС**

# ЯК ГІПНАТЫЗУЮЦЬ БЕЛАРУСАЎ

«Літаратурная Беларусь» ужо знаёміла з гэтай пісьменніцай і журналісткай — Інгай-Лінай Лінквіст, якая нарадзілася ў Беларусі, жыве ў Швецыі, а напачатку снежня 2010 года прымала ўдзел у літаратурным семінары і гасцявала ў нашай краіне. Думаецца, што яе ўражанні аб паездцы, апублікаваныя ў шведскай газеце «Aftonbladet» ды многіх старонках Сеціва, будуць цікавыя і чытачам Беларусі.

Інга-Ліна ЛІНКВІСТ

**За тыдзень да прэзідэнцкіх выбараў я пабывала на Радзіме. Звычайны аўторак. Прызямляюся ў аэрапорце сталіцы краіны Мінску, горадзе памерам прыкладна са Стакгольм.**

Аэрапорт практычна ў поўнай цемры. На пасадкавай пляцоўцы стаяць тры самалёты, усе належаць дзяржаўнай беларускай авіякампаніі. Уявіце сабе аэрапорт Стакгольма «Арланда», у якім усяго 3 самалёты і ўсе належаць шведскай кампаніі SAS…

Пусты аэрапорт Мінска — сімвалічны малюнак ізаляцыі гэтай краіны.

За тыдзень да прэзідэнцкіх выбараў адбыўся народны з'езд. Гатэль, у якім я спынілася, напоўнены дэлегатамі гэтага з'езда. Усё як у старыя савецкія часы. Усё добра захавалася. Апазіцыйны пісьменнік набліжаецца да мяне з жартам: «Мы, беларусы, любім прыродныя запаведнікі». Ён мае на ўвазе Белавежскую пушчу, дзе па лесе шпацыруе выміраючы від жывёлаў — зубры.

Гэтыя дэлегаты на самай справе нагадваюць зубраў: грузныя, змрочныя, самаўпэўненыя.

Я запрошаная ў арганізацыю незалежных пісьменнікаў, каб прыняць удзел у семінары аб ролі жанчыны ў сучасным грамадстве. Адна з удзельніцаў адразу ж падкрэслівае, што пытанні роўнасці палоў для яе не з'яўляюцца першачарговымі. У яе краіны ёсць, маўляў, шмат важнейшых і актуальных праблем. Недахоп дэмакратыі, жахлівая статыстыка аховы здароўя і эканоміка на гліняных нагах. Атмасфера нярвовая, але адчуваецца чаканне чагосьці важнага: застаўся адзін тыдзень да выбараў. Мы жвава абмяркоўваем пытанні, слухаем цікавыя выступы аб цярплівасці і аб роўнасці, смачна абедаем.

Усяго толькі праз тыдзень усё зменіцца.

Лідэра апазіцыі Уладзіміра Някляева зб'юць з ног і павязуць з ляхарні агенты спецслужбаў.

Мастацтвазнаўцу, які быў для нас турыстычным гідам, будзе прад'яўлена абвінавачванне, і ён абвесціць галадоўку на 15 сутак. Рэдакцыю, у якую мы заходзілі,



будзе штурмаваць беларуская міліцыя. Але за тыдзень да выбараў мы спакойна сядзім тут і нічога не ведаем аб тым, што неўзабаве адбудзецца. Або, можа, усё-ткі ведаем?

Апазіцыя ў Беларусі вельмі слабая і раз'яднаная. Гэта факт. Адміністрацыі Лукашэнкі не трэба было нічога фальсіфікаваць на выбарах або апранаць вязкавыя рукавіцы. У рэжыма ёсць даволі моцная падтрымка беларускага народа. Вядома ж, не 80% галасоў. Прыкладна 40-45%. Гэтага б хапіла для перамогі на выбарах.

Лукашэнка — геніяльны дэмагог і прапагандыст. Калі я скончыла выступ на семінары, то паехала ў горад Барысаў, што 70 км ад Мінска. Там стаіць дом, у якім я вырасла, ім усё яшчэ валодаюць мае сваякі.

Брат маёй мамы ледзь падняўся з канапы, калі я ўвайшла: ён слухае выступ прэзідэнта. «Гэта наш Гітлер, — кажа дзядзька. — Вось ужо тры гадзіны, як ён гаворыць, не перарываючыся». Я таксама саджуся на канапу і слухаю. І вельмі хутка я ўжо пачуваюся, як Карын Боўэ (Karin Boye), якая пасля прамовы Герынга ў палацы спорту ў Берліне выказалася так: «Бліскучая прамова. Рыторыка вялікага маштабу. Шчырасць — прыкмета гонару. Гэта мяне глыбока кранула».

Лукашэнка кажа рэчы, якія вельмі моцна мяне кранаюць. Ён кажа аб адзінстве беларускай нацыі. Аб тым, што ў Беларусі няма меншасцяў, ні нацыянальных, ні сэксуальных. Усе ў Беларусі роўныя і ўсе належаць да беларускага народа. Вельмі хараша сказана. У гэты момант я нават забываю аб тым, што дзяржава дазваляе пераследы гомасэксуалістаў. Вось якое значэнне прапаганды! Нельга перамяншаць яе гіпнатызуючае значэнне. А я ж прыехала з вольнай Швецыі з яе вольным тэлебачаннем. А цяпер увяцце, што робіцца ў галаве ў беларусаў, якіх кормяць толькі малюначкамі дзяржаўнага тэлебачання з раніцы і да ночы…

Мой дзядзька выключае тэлевізар, як толькі змаўкае Лукашэнка.

Ён распавядае мне, што хутка пераязджае да сваіх дзяцей, якія служаць у ізраільскім войску. Я не ведаю, куды мне глядзець і што мне думаць. Стрыечны брат, які ваюе ў Ліване, гэта не тое, чым я магу моцна ганарыцца. Але ёсць як ёсць. Ізраіль рэкрутуе маладых габрэйскіх хлопцаў з Беларусі, абяцае ім добрыя грошы.

Мае габрэйскія сваякі жылі ў Беларусі з XVIII стагоддзя. Яны гавораць па-расійску. Гістарычна расійская мова ў Беларусі — гэта мова ўладнай эліты, мова службоўцаў, а беларуская мова падтрымліваецца толькі высілкамі радыкальна настроенай моладзі і інтэлектуаламі.

Тое, што дзяржаўны орган «Советская Белоруссия» вінаваціць нашага шведскага амбасадара ў Беларусі Стэфана Эрыксана ў сувязі з экстрэмістамі, залежыць менавіта ад гэтага моўнага аспекту. Ён гаворыць па-беларуску настолькі ідэальна, што нават здольны перакладаць беларускую паэзію. І нават на афіцыйных сустрэчах ён прамаўляе па-беларуску.

Аднаго таго, што чалавек выбірае размаўляць па-беларуску, досыць, каб яго затаўравалі як крытыка рэжыму. А адтуль ужо недалёка да таго, каб да чалавека ставіліся як да экстрэміста.

Белоруссия ці Беларусь? Белорусский ці беларускі? Вось такі выбар слоў паказвае, на якім баку чалавек знаходзіцца.

Вечарам я зноў еду ў Мінск. Спрабую злавіць таксі, але адна за адной машыны праязджаюць міма. Я нічога не разумею. У выніку спыняецца пажылы мужчына і пачынае гаварыць са мной па-беларуску. Я адказваю яму па-расійску, што мне трэба ў гасцініцу «Юбілейная». І калі я саджуся ў аўтамабіль, ён кажа мне: «Я ўжо збіраўся праехаць міма вас. Падумаў, што вы — цыганка, вы ў такім доўгім футры. А цыганы — гэта заўсёды звады, за імі заўсёды палюе міліцыя».

Увесь астатні шлях я еду моўчкі і думаю аб прамове Лукашэнкі; ці не ён толькі што казаў аб тым, што ў Беларусі няма ніякіх этнічных супярэчнасцяў.

Да выбараў засталося некалькі дзён. Некалькі дзён засталося да таго, як усё пойдзе да чарцей. І гэта слаба сказана.

СВЕДЧАННЕ

# ІМЕМ ЛЮБОВІ

Віктар ЯРАЦ

**Пачаўся Новы год — трывожны і няпэўны, аглушаны петардамі і ўзаемнымі абвінавачваннямі, з дакорам і расчараваннямі, з пякучымі пытаннямі, на якія чалавецтва імкнецца адказаць столькі вякоў, колькі жыве пад векавечным небам. Што рыхтуе новы віток часу? Чым ён усцешыць і супакоіць? Чым парадуе і абнадзеіць?**



За некалькі дзён да мінулых выбараў Уладзімір Някляеў падпісаў мне сваю новую кнігу паэм: «Віктару Ярцу на КОН, на ўдачу, — Ул. Някляеў. 15.12.2010». Было гэта ў Гомелі, у зале гасцініцы «Надзея», дзе на сустрэчу з кандыдатам у прэзідэнты сабралася столькі народу, што многія стаялі ва ўсіх праходах і ў доўгім калідоры, які вёў у суседняе памяшканне з размешчаным там атрыбуткай для жадаючых прагаласаваць датэрмінова. На гэтую сустрэчу я прыйшоў па дзвюх прычынах. Першая: даўно хацеў убачыць свайго калегу-літаратара, пачуць яго голас, ягоныя думкі-меркаванні. Другая: на мясцовым тэлебачанні і на БТ бясконца-масіравана ішлі сюжэты, у якіх настойліва-бадзёра, з нейкай паталагічнай эйфарыяй паказвалі, што на сустрэчу з адпаведнымі кандыдатамі прыходзіць нейкая жменька людзей, а то нават двое-трое чалавек. Узнікала жаданне ўвачавідкі пераканацца: няўжо гэта сапраўды так, як нам вяшчаюць?

Сустрэча заняла роўна дзве гадзіны. Дзясяткі пытанняў. Сярод іх — і з разлікам на тое, што выступоўца недзе сарвецца, кінецца ў крайнасці, у эмацыянальны перабор, — і будзе за што зачапіцца ягоным апанентам з ліку «слуг народа». Менавіта яны загадзя занялі цалы рад у канцы залы: каб усіх бачыць, усіх кантраляваць, усё адсочваць-зафіксоўваць. Тут былі і мажныя, сур'ёзныя мужчыны, і такія ж наменклатурныя дамы — з яўным прыцэлам-намерам «заваліць» прэтэндэнта ў прэзідэнты сваімі ў большасці крыкліва-істэрычнымі рэплікамі. Гэтая публіка не вельмі слухала тое, пра што гаворыць Някляеў, а раскрывала падрыхтаваны ёю сцэнарый. Сцэнарый, які лопнуў, як мыльная бурбалка, на вачах усіх прысутных.

Сярод пытанняў маладых і сталых слухачоў было і пытанне пра Плошчу. Някляеў без папуліцкіх рэверансаў і стылёвых красвордаў адказваў прама і даходліва, настойваючы на тым, што арганізацыя сталічнага мітынгу мае на мэце выключна мірны характар: ніякага экстрэмізму-агрэсіі, ніякага бунту-пагрому, ніякай сутычкі-бойкі. Ён, Уладзімір Пракопавіч, нават пажадаў-параіў, каб міліцыя ў якасці саюзніка дзеля захавання парадку выкарыстала дружыннікаў з мітынгуючай масы, разлічваючы на іхнюю рэальную дапамогу. Пра гэта ён даводзіў ясна і недвухсэнсоўна, даючы разгорнутыя і зразумелыя адказы. Пра тое ж ён гаварыў і ў сваіх зваротах да выбаршчыкаў на рэспубліканскім тэлебачанні.

У той жа дзень, 15 снежня, у яго была яшчэ адна сустрэча, але ўжо ў зале намнога большай — у Палацы хімікаў. Там таксама не было дзе яблыку ўпасці. Мае знаёмыя, хто быў там, расказвалі, што кандыдат агучваў у сваіх адказах і развагах толькі лозунгі мірнага, толькі цывілізаванага правядзення акцыі — з выказваннем кожным асабістых ацэнак і бачання сітуацыі ў краіне падчас правядзення выбарчай кампаніі. Але ж выказванне зусім не заклік да рэвалюцыйных дзеянняў.

Чалавек мае права на ўласнае бачанне, на сваё разуменне таго, што ўвогуле адбываецца ў свеце і ў ягоным родным доме — таксама. Хто б ні быў на вяршыні ўладнай піраміды, ён заўжды павінен разумець, усведамляць прапісную ісціну: для ўсіх ніколі добрым не будзеш. І сонца не ўсім роўна свеціць. Яшчэ вялікі немец Іаган Вольфганг Гётэ, зыходзячы не з аднаго ўласнага вопыту, сфармуляваў: «Самае смешнае жаданне — гэта жаданне спадабацца ўсім».

Дык у чым віна Уладзіміра Някляева? У тым, што ён думае па-свойму? У тым, што ягонае разуменне сённяшніх рэалій адрозніваецца ад клішыраваных, афіцыйных лозунгаў і ўказанняў? Дык хіба ж за гэта чалавека ў дэмакратычным грамадстве кідаюць за турэмныя краты? Няўжо ў гісторыі так любяць паўтарацца атавізмы інквізіцыі — змрочнага сярэднявечча?

Хіба за свой асабісты погляд на жыццё, на грамадска-палітычныя падзеі так неабходна пазбаўляць волі, неба і сонца таго, хто прагне быць карысным, патрэбным свайму народу? Пазбаўляць паветра Айчыны таго, хто ў паэме «Вера» спавядаўся без пустога шматслоўя:

*Шлях мой зямны, Айчына…*
*На схіле*
*кожнай вярсты*
*Толькі ты за плячыма,*
*Наперадзе —*
*Толькі ты.*

Пазбаўляць паветра Бацькаўшчыны паэта, які сёння задыхаецца, губляе прытомнасць у турэмных скляпеннях, паэта, які на мяжы крохкага жыцця і бязлітаснай смерці? Прыгадваюцца даўнія словы Яўгена Яўтушэнкі: «Люди, люди! Вы всегда плюете в душу тем, кто хочет вам добра…»

Шкада, вельмі шкада, што сёння для многіх у Беларусі да сённяшняга часу не дайшла адна надта істотная, надта важкая ідэя: калі б не было ў нас у пачатку 20-га стагоддзя нацыянальнай літаратуры, то не было б і ніякай беларускай дзяржавы. Чаму? А таму, што прагрэсіўная беларуская літаратура фарміравала ідэалогію нацыянальнага адраджэння. Таму, што яна рыхтавала глебу для пабудовы ўласнай краіны, сеяла зерне самасвядомасці і самапавагі да сваіх каранёў і вытокаў, прадвызначала будучы росквіт самабытнай культуры, усёй духоўнасці малавядомай нават не зусім аддаленым народам славянскай нацыі.

Зусім невыпадкова, што і першым кіраўніком БССР з'яўляўся беларускі пісьменнік, празаік і публіцыст, грамадскі дзеяч Дзмітрый Фёдаравіч Жылуновіч (Цішка Гартны). Гэта яны, нашы пісьменнікі, ішлі ў астрог (Якуб Колас), арыштоўваліся і ссылаліся на катаргу ў Іркуцкую губерню на 10 гадоў (Алесь Гарун), звальняліся з работы, знаходзіліся пад пільным наглядам паліцыі (Янка Маўр).

Гэта яны выступалі за адкрыццё школ на роднай мове, за святое права «людзьмі звацца» (Янка Купала), за нацыянальную перыёдыку і кнігу на мове сваіх продкаў, за тое, каб не згінуў у немаце, у глухаце стагоддзяў «Забыты шлях» да свайго — крэўнага, спаконвечнага, роднага (Максім Багдановіч).

І таму, хто б ні быў кіраўніком Беларусі сёння і ў будучым, патрэбна добра ўсведамляць: не было б самаахвярнай працы беларускіх дзеячаў літаратуры — галоўных «званароў» свайго краю, — пад вялікім-вялікім пытаннем было б і стварэнне беларускай дзяржаўнасці. Былі б нашы землі ці ў расійскіх, ці ў польскіх абшарах: цалкам або кавалкамі. Таму, госпада, панове, таварышы, здыміце капелюшы са сваіх разумных галованек перад беларускай літаратурай! Гэта дзякуючы ёй вы маеце магчымасць станавіцца прэзідэнтамі, прэм'ерамі, губернатарамі і мэрамі самастойнай краіны ў цэнтры Еўропы. Магчыма, былі б вы на піку кіраўнічай лесвіцы, але зусім іншых тэрыторый, у іншых дзяржаўных утварэннях.

**Калі б не было ў пачатку XX стагоддзя нацыянальнай літаратуры, то не было б і беларускай дзяржавы. Літаратура фарміравала ідэалогію нацыянальнага адраджэння**

Беларускія пісьменнікі не толькі будзілі памяць народную. Яны самі ішлі ў паход па Бацькаўшчыну, ведучы за сабой тысячы і тысячы суайчыннікаў. І за гэта ўсё ім — нізкі паклон ад сучаснікаў і наступных пакаленняў.






І тое, што зрабілі ў нядаўнім мінулым для Беларусі яе геніі Васіль Быкаў і Уладзімір Караткевіч, не толькі творчы, але і грамадзянскі подзвіг. Яны адкрылі шырокаму свету «зямлю пад белымі крыламі» — з яе драматычнай і трагічнай гісторыяй, з яе мужным, гераічным, а часта — і даверліва-рахманым людам. Яны пакінулі свае сумленныя запаветы нашчадкам. Іхнюю эстафету падтрымалі не толькі старэйшыя сябры і аднадумцы Рыгор Барадулін, Ніл Гілевіч, Анатоль Вярцінскі, Васіль Зуёнак, Генадзь Бураўкін, Янка Сіпакоў, Анатоль Кудравец, Уладзімір Дамашэвіч, Віктар Карамазаў, але і маладзейшыя — Віктар Казько, Леанід Дайнека, Святлана Алексіевіч, Валянціна Коўтун, Генрых Далідовіч, Вольга Іпатава, Алесь Разанаў, Уладзімір Някляеў, Юрка Голуб, Сяргей Законнікаў, Алесь Каско…

У дружнай кагорце аўтараў, народжаных у першыя пасляваенныя гады, менавіта творчасць Уладзіміра Някляева — адна з найбольш яркіх старонак беларускай літаратуры канца 20-га — пачатку 21-га стагоддзя. У асобе Уладзіміра Някляева Беларусь мае паэта еўрапейскага і сусветнага ўзроўню, вартага Нобелеўскай прэміі. Ягоныя паэмы, балады і вершы перакладаюцца на многія мовы, яны карыстаюцца вялікай папулярнасцю ў нашых суседзяў — рускіх і ўкраінцаў, палякаў, літоўцаў і латышоў.

Такія паэмы, як «Прошча», «Паланэз», «Ложак для пчалы», «Гарбун», «Саракавіны», «Індыя», «Вялікдзень» і шэраг іншых запісалі б у свой актыў і самыя багатыя літаратуры нашай планеты. Адметным почыркам пазначана і экспрэсіўная, шчодрая на дэталі і рэаліі сучаснасці проза майстра. Ягоныя апавяданні, эсэ і аповесці — значная з'ява сучаснай белетрыстыкі. З'ява, якая сведчыць, што ў асобе мастака слова крыюцца вялікія задаткі і неардынарнага празаіка, які можа істотна пашырыць тэматычныя і псіхалагічныя абсягі беларускага «краснага пісьменства».

Дык у чым жа віна Уладзіміра Някляева?

Віна — у любові.

У любові да свайго народу, да роднай зямлі-маці, да мовы і спадчыны продкаў.

Віна ў тым, што ён неабыякавы да лёсу сваёй Беларусі, што ён хоча, каб у ёй было светла, вольна і ўтульна ўсім, хто тут жыве даўно альбо пасяліўся нядаўна: беларусам і рускім, палякам і ўкраінцам, яўрэям і татарам… Віна — у любові?

Упэўнены, што не за гарамі той час, калі будуць пісаць грунтоўныя навуковыя даследаванні аб ролі канкрэтных пісьменнікаў у станаўленні і развіцці нашай дзяржаўнасці. Пачэснае месца ў галерэі славутых імёнаў будзе належаць і Уладзіміру Някляеву. Тое — будзе!

А сёння думаю, хвалююся, непакоюся за жыццё Валодзі. Як ён там — за мурамі-сценамі? Хто і ў чым спрые, дапамагае там яму? Ці даходзяць да яго весткі ад родных, сяброў і блізкіх? Як з лекамі, так неабходнымі ў ягоным становішчы?

Вязню Уладзіміру Някляеву прысвячаю свой першы верш распачатага года ў завірушным, калюча-ветраным свеце:

*Снег ідзе, як ішоў неаднойчы*
*сотні год над зямлёю людзей,*
*на якой прасвятляюцца вочы*
*вышынёй, чысцінёю надзей.*
*Снег ідзе — ён так хоча аб нечым*
*расказаць пракаветнай зямлі,*
*на якой столькі ран чалавечых —*
*ад любві, ад любві, ад любві…*

АПОВЕД

# ПРА МОЦЮ І ЯГО СЯСТРЫЧКУ

## З ЦЫКЛА «ПРА МОЦЮ»

Віктар КАЗЬКО

**Моця пад вечар быў непадобны сам на сябе. Так непадобны, што не мог і прыдумаць, на каго ён на самой справе падобны. Хутчэй на дзьмухаўца, які ўжо адкрасаваў, а цяпер белым пухам завіс па-над зямлёй, гатовы ў неба, на другое адраджэнне. Прарастанне, завязь, цвіценне, і зноў — у палёт, у неба. І каб ніколі не злазіць з яго, хай яму і есці туды падаюць, адно марожанае ды цукеркі. Хаця пасля іх можна адзін-другі і дранік, толькі на масле і з вяршкамі.**



Расчулены, насалоджаны такімі думкамі, ён і сам не прыкмеціў, як пачаў цалаваць бабулю. У вусны і з прыцмокам, чаго да гэтага цураўся, нават грэбаваў. Здзівіцца не паспеў. Здзівілася бабуля. Доўга выцірала губы на рагі па-піянерску завязанай пад падбароддзе белай у зялёны гарошак хусцінкай. І мала таго — адварочвалася і плявалася:

— Здзяцінеў ты ці што?

— І зусім не здзяцінеў, пасталеў, падрос, параўняўся з бацькам… А ты чаго смаркаешся?

— А таго, — адказала бабуля. — Сама што таго.

–Ну, тады можаш, — дазволіў Моця. — Тады можаш і ў кулак, і на дарогу жабаў і жабянят пускаць. Я сёння добры, бо крыху шалёны.

— Во дзіва, — сказала бабуля, — толькі крыху. Ты заўсёды і быў…—Такім чынам сапсавала Моцін настрой бабуля. Зняла, скінула, сцягнула з самага што ні на ёсць сёмага неба. Абзямлячыла.

Моця ледзь не кінуўся біцца з ёй. Але хоць і на зямлі, на калдобінах з цвілой і без доўгіх дажджоў застаялай у іх і адчувальна смярдзючай вадой разважлівасць і надвячоркавая лагода перамаглі. Старая, парахня, што яна можа разумець у яго сённяшнім жыцці, калі даўно ўжо і забылася на яго, на палёты ў сне і на яве. Пэўна, ніколі і не ведала: кухня, хлеў, венік і яго, Моцяў, каршэнь, а да гэтага — бацькаў, і стогн, стогн — якія ж дзеці пайшлі, горш учорашніх. Адно толькі — заўсёды белая, па-піянерску на рагі хустка ў вечназялёны гарошак пад падбародак. Таму не варта з ёй сварыцца, тым больш біцца. Звязвацца сабе даражэй.

З гэтым ён і даклыпаў да хаты. А там замілаванне і шалёная ўзнёсласць зноў узялі верх. Не, жыццё, нават не гледзячы на бабулю, усё ж мае сэнс. Нездарма, нездарма прыдумалі яго. Варта, варта жыць і ўвечары, нават уначы, калі цябе прымушаюць класціся ў ложак. У ложак…

Моця наледзь дачакаўся маці, так яго распірала, поўніла вар'яцкай радасцю недарэмна пражытага дня. І толькі маці ступіла на парог, як ён адразу ж і вельмі голасна, столь падскочыла і збялела:

— А я сёння спаў са Светкай!

Твар маці на нейкае імгненне стаў падобны да столі, сутаргава сцяўся і расцяўся. Але ж яна вельмі хутка ўзяла сябе ў рукі. Толькі аднаго разу вохкнула ды двойчы развяла рукі і пляснула далонямі, што Моця ўспрыняў як апладысменты:

— Ты сёння… спаў… са Светкай?

— Ага ж, у адным ложку і цэлыя дзве гадзіны.

— Дзіва, дзіва,— амаль бабуліным голасам мовіла маці.

І Моця адчуў, што ніякага дзіва тут ёй няма. Нібыта ён усё жыццё спаў са Светкай, і не па дзве гадзіны ўдзень, а дзень і ноч напралёт, не пакідаючы ложку. І яна загадзя ўжо ведала, што ён будзе спаць са Светкай. Прывыкла ведаць і ніколькі не здзіўляецца.

«Ну чаму яны такія, — з прыкрасцю падумаў Моця.– Што бабуля, што маці. Дзе і калі яны згубілі здзіўленне. Раздзяцінелі. Дзе і калі яны так паразумнелі, што назаўсёды страцілі… не, не толькі здзіўленне, а саму радасць здзіўляцца. Згубілі, згубілі патаемнасць таго ж дзьмухаўца, што ўжо адкрасаваў, але адчуваннем асалоды таго, што ён вось-вось памножыцца, адскочыць ад амярцвелай, струпам збялелай сівой галоўкі, былой сваёй і чалавека ўцехі, і кінецца ў белы свет, залунае, залунае, куляючыся пад сонцам і блакітам неба. Паляціць, паляціць па-над зямлёй, а мо і прэч ад зямлі — у сусвет, невядомыя жыцці, планеты, як лётае, не адчуваючы ні цела, ні ног ён, Моця, як лётаў і сёння дзве гадзіны, пакуль спаў са Светкай і працягвае лятаць і цяпер. Толькі нябачна.

І гэтая нябачнасць прымусіла Моцю больш пільна прыгледзецца да маці, мо яна саромеецца яго, хавае сябе перад ім. А на самой справе яны аднолькавыя, і адчуванні іх аднолькавыя. Толькі маці не выказвае сябе. Бо яна ўсё ж маці, яго маці. Але якраз у гэтым уся і справа: абодва яны не могуць далёка адбегчыся адно ад аднаго.

Але вынік гэтай глыбокадумнасці і пільнасці да выразу твару і постаці маці быў зусім інакшы і вельмі нечаканы нават для Моці. Падсвядома, усё ж нешта маючы ў галаве, як гэта бывае толькі ў раннім дзяцінстве і ў дзяцей, ён некуды пранік. Патрапіў у недасягальнае яшчэ яму і яго розуму, мо і зусім не чалавечае, хутчэй звярынае, а найбольш верагодна ўвогуле нікому з жывых неўласцівае. Зноў жа, апроч дзяцей у пэўным узросце, дараванае невядома кім, мо нябёсамі, а мо і зямлёй, падзямеллем. Дараванае толькі на імгненне і цалкам і адразу з узростам адабранае. Адабранае нейкім найвышэйшым, каб чалавек не надта вытыркаўся па-над зямлёй і з зямлі сярод тых жа чалавекаў.

— Нешта апошнім часам ты надта патаўсцела, маці, раздалася ўперадзі і ўшыркі.

Маці зачырванелася і прысела на крэсла каля стала. Але Моцін промільг, пэўна, ужо скончыўся, і паперла з яго ўжо звычайная будзёншчына, уласцівая кожнаму ў сталасці цвярозасць і разважлівасць.

— На дыету трэба садзіцца, маці, надта ты ўжо прыпадаеш да мучнога і салодкага. Абмяжоўваць трэба сябе дыетай.

— Дыета тут не дапаможа, сынок, — уздыхнула маці і расквецілася ўсмешкай.

— Усім дапамагае, а табе не? — здзівіўся Моця. — Так не бывае. Зірні ў тэлевізар, якія там трэскі, вешалкі і фасолі. І як жа яны выдзыгаюцца, хаця, я думаю, пешкі, сваімі сарочымі нагамі не кожная з іх і да могілак дапне… А ў Светкі ножкі спраўныя, абедзьве…

— Як у нашага кабанчыка? — спытала маці.

— Уга, як у нашага кабанчыка, хаця яна таксама на дыеце са сваёй маці. Тыдзень на садавіне, тыдзень на кефіры, а ў дадатак яшчэ гербалайф, крамлёўскія таблеткі, паасобнае харчаванне па… па…

— Ну, ты і адукаваны, — папраўдзе ўжо здзівілася маці.

— Дурная справа не хітрая, — па-даросламу разважліва адказаў ёй сын. — Звар'яцелі дзеўкі. І ўсе адразу і ўсе разам.

— Ну, разумнік, ну, разумнік, і ў каго ты толькі такі.

— А табе лепш ведаць, — сказаў Моця. — Табе і бацьку. Якім ужо зрабілі.

Але сказаў, пэўна, нешта не тое, бо маці ўсердзілася і ўхапіла яго за віхор:

— То ты спіш са Светкай, то… Як жа гэта ты спадобіўся перaспаць з ёй?

— Адпусці, — буркнуў Моця, — тады скажу. А так гаварыць не буду.

— Будзеш, яшчэ як будзеш, — запэўніла яго маці.

— Не буду, хоць табе, бачу я, вельмі ўжо цікава, як спяць хлопчыкі з дзевачкамі.

— Ды не так ужо і вельмі, — сумелася маці і адпусціла віхор. — І ўсё ж як гэта было?

— Было, — сказаў Моця.

— Як?

— А вельмі проста, калі ўжо так карціць табе ведаць.

— Проста?

— Зусім не проста. Спрэс адна мітрэнга і бязладдзе… Рамонт у нашай спальні быў. Ложкі павыкідвалі, і на ўсіх не хапіла. І я прапанаваў Светцы спаць са мной. Леглі і заснулі…

— І ўсё?

— Ну, не зусім. Не без таго ўжо… Пагаварылі, пабуськаліся. І дамовіліся, што заўсёды будзем спаць разам, пакуль не пажэнімся. А тады ўжо і як ты з бацькам, паасобку.

— Чаму ж гэта так: я з бацькам паасобку…Паасобку я з бацькам. Бач ты, паасобку.

Моця ніяк не мог зразумець, чаму маці так расхвалявалася, што крыўднага ёй ён сказаў. Праўду сказаў, і нічога балючага ў гэтай праўдзе няма. Чаму гэтыя дарослыя такія пераменлівыя і не трываюць ні хлуслівай, ні праўдзівай праўды. Якой жа трасцы ім трэба. На самой справе ўсім ім на дыету садзіцца трэба: мазгі ці то падсушыць, ці набрацца іх. Ён так і сказаў маці, хаця і быў супраць. Падобна, такой жа думкі прытрымлівалася і маці, бо пачала смяяцца. Ды так увішна, весела і голасна, што цяпер ужо ўсердзіўся Моця.

— Здзекуешся, усё жыццё здзекуешся. А вось Светка лепшая за цябе. Ніколі, ніколі з мяне не смяецца.

— Дурненькі, ох і дурненькі ж ты. — Маці ўстала з крэсла, выйшла з-за стала. Падышла да Моці, падняла на ногі і яго, але чамусьці зноў за віхор. І Моця хацеў ужо канчаткова раззлавацца, але маці прытуліла яго тварам да сябе, да свайго раздабрэлага ўшыркі, а больш уперад жывата.

— Чуеш? — амаль у самае вуха, што ад нечаканасці і абурэння стала бураковым і зусім не чуйным, ціхенька і ласкава спытала маці.

— Нічога не чую, — адказаў Моця.

— Ну як жа, яна ж голас табе падае і брыкаецца. Вітае і ўжо крочыць насустрач табе.

— Хто, хто вітаецца і крочыць? — перахопленым ад неспадзяванкі голасам, узбуджаным і зноў крыху відушчым нябачнае і непазбежнае, як ачужэлым яму сэрцам, спытаў Моця.

— Сястрычка. Твая сястрычка.

— Як, як яна ў жывот табе трапіла?

— Трапіла, родненькі, трапіла.

— Ты праглынула яе?

— Але ж, Моцечка, але ж…

— Ну і што ты нарабіла, што я з табой рабіць буду? Гэта ж злачынства!

— Ды не ж, Моцечка, не. Гэта не злачынства, а зусім нават наадварот.

— Як… як зусім наадварот, калі яна ў цябе ў жываце і квакае.

У жываце ў маці нешта, здаецца, сапраўды квакала, як жабяня па вясне на купіне ў балоце, калі яно ўжо ўгрэецца і пачынае набываць мову. І гэта мова чэрава матулі была ніколькі не горкай, не жаласлівай. Нейкая абвяшчальная яна была. Так абвяшчае сябе жаўтароты верабейка, што першы раз хапіў, каўтнуў з зялёнага лістка бярозы кропельку, слязінку вады, маладой расы. Мо так нікому не чутна падае голас і пушынка дзьмухаўца перад тым, як набыць крылы, залунаць пад небам і ўгрэўным сонейкам. І то быў голас, здалося Моці, яго, калі ён прачнуўся пасля ціхага часу ў ложку разам са Светкай.

І адчуванне гэтага ўласнага голасу нібыта апякло Моцю. Апякло як загадзя, як крыху наперад, пякучым агнём і зыркім полымем будучыні. Яго ўласнай і непазбежнай будучыні.

— Што ж гэта значыць, што ж гэта значыць? — вусцішна і амаль нема закрычаў Моця. — Гэта і ў Светкі цяпер можа завесціся жабянё?

— Ды не, сынок, не. Дзеці зачынаюцца зусім інакш.

— Як, як інакш?.. Толькі не трэба мне ля-ля пра капусту і бусла. Я ўжо прыглядаўся да капусты. Вусені там, вусені адны, што карaеды пражэрлівыя і брыдкія, зялёныя ўсярэдзіне ад соку капусты.

— Вой-вой, — адсланілася ад Моці матуля. — Прагледзела, не ўпільнавала капусту. Пабягу ж зараз…

— Не пабяжыш, не ўцячэш…— сказаў Моця. — Ад мяне і праўды не ўцячэш… І пра буслоў мне не трэба. Бачыў я, як той буслік цягнуў у кубло сабе гадзюку. Вось толькі на што і здольныя вашыя белыя буслы. Гадзюк прыносяць, а не дзяцей. Брыдота, а не птушка. Я не хачу, не жадаю быць параджэннем бусла. Але ўсё ж тады… Як, адкуль, ад каго?

— Ад радасці, ад кароткага нашага шчасця… Ад таго, што мы таксама часам лётаем… Вось лётала, лётала і заляцела. — Маці ўнурылася і замоўкла.

— Чаму ж ты тады не радая ад таго, што можаш лятаць? Я вось рады, рады, што не з капусты і не ад бусла. Рады таму, што і ты, мая матулька, здольная лётаць. Рады… — Моця гаварыў гэта, але ўжо не зусім верыў, што ён сапраўды рады. Мімаволі яму здавалася , што час яго палётаў заканчваецца. Ці ж давядзе яго да дабра гэтае жабяня ў жываце маці. Дагэтуль ён быў адзіны, непаўторны і любы. А цяпер гэтую непаўторнасць і любасць бацькам прыйдзецца дзяліць надвое. І якая доля дастанецца яму?

Ён зноў наблізіўся да маці, прыхіліўся да яе жывата:

— Дай паслухаць. — Прыпаў вухам, амаль да голага распранаючы маці. І яму так урэзалі па вуху, нібыта ён рабіў нешта вельмі і вельмі непрыстойнае. Так урэзалі, што ён адхіснуўся, адпаў ад чэрава маці, як адпадае перасычаная п'яўка ад цела чалавека.

— Брыкаецца. Глядзі ты, брыкаецца цялічка-сястрычка. Біцца будзем, вой будзем біцца…

Падумаў, памаўчаў і нечакана загадаў маці:

— Садзіся і разяў рот.

І такая рашучая непрыхільнасць чулася ў яго голасе, што маці без ваганняў адразу ж і падпарадкавалася, як дзевачка.

Моця схіліўся да шырока разяўленага рота матулі:

— Дабранач. Дабранач, сястрычка!

ВЕРШЫ

# НАДЛОМ ПЛАНЕТЫ



Янусь МАЛЕЦ

**Янусь (Іван Вільгельмавіч) МАЛЕЦ 8 лютага адзначыў 60-гадовы юбілей. Вядомы найперш як гумарыст і сатырык (як аўтар зборнікаў «Бедны конь» і «Трава ў вушах»), ён прапанаваў «Літаратурнай Беларусі» нізку філасофска-грамадзянскіх вершаў, якія шмат у чым выяўляюць паэтавы «юбілейныя» настрої і думкі…**

## Незагойная рана

*Я параніў душу…*
*Кроў нябачна цячэ.*
*Боль, што ў сэрцы нашу,*
*Невыносна пячэ.*

*І навошта была*
*Гэта гнеўная злосць? —*
*Празвінела страла*
*Праз пачуцці наскрозь!*

*Як жа ўсё перажыць?*
*Як жа моцна баліць!*
*На крутым віражы*
*Лёс на снезе ляжыць.*

*Замярзае мой лёс*
*Ад памылкі маёй;*
*Вецер сумна панёс*
*Слёзы-лёд над зямлёй.*

*Я параніў душу…*

## Надлом планеты

*Да заўчасна пайшоўшых паэтаў*
*Нешта цягне магнітна душу,*
*Надламалася наша планета,*
*Я над безданню страшнай вішу…*

*Цяжка людзям, каменню і дрэвам,*
*Цяжка сёння крынічнай вадзе:*
*Разгулялася гора залевай,*
*Ад якой не схавацца нідзе.*

*Дапамогу не хочацца клікаць:*
*Дапамогуць — прымусяць служыць,*
*А навошта такая мне літасць,*
*Не змагу ў клетцы птушкаю жыць.*

*Надламалася наша планета,*
*І праз сэрцы праходзіць надлом,*
*Душы рана памерлых паэтаў*
*Напаўняюць начамі мой дом…*

*Цяжка людзям, каменню і дрэвам.*

## Унучцы

*Добра табе, маленькая дзяўчынка!*
*Пад яркім сонцам і пад небам вечным*
*Ляціш, звышбестурботная малеча,*
*Вясёлай і шчаслівай аблачынкай.*

*Няхай жа ў вочках радасць не згасае,*
*Будзь доўга чыстай, лёгкай*
*як анёлак!*
*Прыветных і лагодных ноччу зорак*
*І ранку мірнага над родным краем*
*Над Беларуссю,*
*што ў чарнобыльскіх пылінках*
*Чакае і чакае лепшай долі…*
*Дык, можа, хоць табе дасць*
*Божа волю:*
*Ляцець, як у маленстве, светла*
*Аблачынкай!*

## Успамін пра Хрыстова

*Над маёй Пастаўшчынай дажджы,*
*Вецер гоніць змрочныя аблокі;*
*Дзевы лік з імглістай паранджы*
*Позіркам свіціцца цемнавокім.*

*Вобраз дзіўны зноў апанаваў,*
*Стомлена душа і ныюць целы;*
*У Хрыстове — панскі хворы стаў*
*Памірае лужынай збялелай.*
*Там ужо даўно няма бацькоў,*
*Я ад месц радзімых адарваны,*
*Штось шукаў, дзівак, і не знайшоў,*
*Сэрца і душа ў балючых ранах.*

*Каб сціраць памылкі і грахі,*
*Сціркі не знайшлося на дарогах,*
*Ды сярод сляпых, сярод глухіх*
*Лёс ад д'ябла вёў усё ж да Бога.*

*Дык даруй мне, Божа! Ты адзін*
*Зразумееш, што я не ад злосці*
*Для Хрыстова быў не лепшы сын,*
*Не цвярозым быў нярэдка госцем.*

*Грэшнаму дазволь мне пастаяць*
*Ля магілак продкаў маіх светлых,*
*Дзе аблокі плачуць і ляцяць*
*Можа, восенню, а можа, летам…*

## Эмацыянальны трыпціх

### 1. Не!!!

***Нядобразычліўцам***
***Н. С. Гілевіча***

*Не!*
*Па-воўчаму выць ён не стане!*
*Не!*
*Лісіцай не будзе хітрыць!*
*І бясплатнаю шклянкай смятаны*
*Вам сумленне яго не купіць!*

*На балючае сэрца паэта*
*Сыпце смецце і ліце ваш бруд,*
*Ды дарэмна вы робіце гэта —*
*Прыйдзе час і асудзіць вас Суд!*

*Суд высокага светлага сонца*
*Вас аслепіць, адкіне наўзбоч —*
*Не бывае паскудства бясконцым,*
*Не бывае бясконцаю ноч!*

### 2. Змрочная гіпербала

***…чалавек па сваёй біялагічнай прыродзе досыць свалачное стварэнне.***
*Мікалай Амосаў,*
*акадэмік медыцыны, вучоны.*

*Людзі вы, людзі…*
*Чым более храмаў —*
*Больш разрастаецца грэх!*
*Змрочныя злосна вішчаць піларамы,*
*Чуецца д'ябальскі смех.*

*Душы тупою пілой разрываюць*
*Д'яблы з крывёй на руках.*
*Божа! І што яны ўсё ж адчуваюць,*
*Творачы гэтакі жах?*

*Войны, забойствы, грызня з-за даляраў,*
*Дач дармаедскіх муры,*
*З голымі попамі ў тэлеках лярвы,*
*Сучкі прадажнай пары!*

*Як ратавацца?*
*Куды, Божа, бегчы,*
*Дзе асвятліць нам душу,*
*Выкінуць вон сатанінскія рэчы,*
*Боскую ўбачыць шашу?*

*Ды не глядзім мы туды, дзе больш светла,*
*Вечны дзе ўзводзіцца храм —*
*Ножанькі нашы вядуць нас у пекла,*
*Любы нам «спеў» пілараm.*

*Людзі мы, людзі…*
*Бязбожныя людзі…*
*Большасць — то хлус, то хітрэц!*
*Мусіцьбыць, будзе,*
*Усё-такі будзе*
*Белага свету канец?!*

### 3. Але…

*Ляцяць бязлітасна гады,*
*Мільгаюць, быццам ашалелі,*
*Імчаць з прасторы маладых*
*У край трывожны састарэлых.*

*Закон прыроды не змяніць*
*І не вярнуць вясну маленства,*
*Ні дня ў юнацтве не пажыць*
*Ці хоць бы ў нейкім падабенстве.*

*Але душа, душа, душа —*
*Яна імкнецца маладзіцца,*
*І песні даўнія ў вушах*
*Бруяцца чыстаю крыніцай.*

*Дык будзем жыць і маладзець*
*У думках нашых несупынна,*
*Яшчэ павінны мы паспець*
*Убачыць ранак над Айчынай!*

**2010 г.**

## Акрыяю!

***(Сумбурна-раптоўны экспромт)***

*Па небе коні праплываюць*
*Імклівa, бела і ружова,*
*Нярвовы вецер іх цугляе,*
*Падбіць імкнецца ім падковы.*

*Яны ж няскорана, бунтоўна,*
*Шалёна ўздыблівають грывы,*
*Ляцяць адчайна і натхнёна*
*У край дзівосны і шчаслівы.*

*Плывіце, гордыя аблокі,*
*У сінявокі край, далёкі,*
*Плывіце, змораныя хмары,*
*За морамі знайдзіце мару!*

*І я шукаў, ды не знайшоў*
*Сярод людзей, сярод гадоў.*
*Я памыляўся, як і ўсе,*
*Над прорвай чорнаю вісеў…*

*Кахаў жанчын, гарэлку піў,*
*Сяброў, здаралася, судзіў.*
*Даруй мне, Божа, за грахі,*
*Прабач, як зможаш, што такі!*

*Змарыўся я, ды адчуваю:*
*З малітвай к небу — акрыяю!*

**1.09.2003 г.**

АПАВЯДАННЕ

# ПАЎСТАНЕЦ

Віталь БЫЛЬ

— Ты дзе?.. Я еду дадому, ужо ў аўтобусе... Ды ты што, як шкельца!.. Так, купіў... Ну, добра...

З агідаю суну ў мабільнік у кішэню джынсаў, абцёр пот з залысінаў. Фу, нарэшце, дажыў, вечар пятніцы, прыеду, пад душ і на канапу, да тэлевізара.

— Не любіце мабільныя тэлефоны? — пачуў над вухам.

Гэта мой сусед, я яго і не разгледзеў. Не маю звычкі разглядваць людзей у транспарце. Няветліва, ды і нецікава. Хіба што хто на нагу наступіць. Я не чапаю цябе, ты не чапаеш мяне.

Але гэты суб'ект, здавалася, вельмі мной зацікавіўся. Вось яшчэ, не хапала. Крыху нядголены твар, акуратны пінжак, чырвоныя стомленыя, нейкія неспакойныя вочы.

— А што, нельга?

—Ды не, можна. Яшчэ як можна! Нават трэба! — тып страпянуўся і схіліўся бліжэй. — І не проста не любіць, а ненавідзець! Пытанне стаіць так: мы ці яны!

— Вы гэта пра што? — не зразумеў я, але на ўсякі выпадак крыху адсунуўся — на колькі дазваляла сядзенне.

— Ды вось пра гэтага маленькага вырадка ў вашай кішэні...

Я памацаў кішэню — там быў толькі мабільнік. Сусед перахапіў мой позірк.

— Так-так, гэта ён, паразіт. Ён і яго суродзічы. Цэлая армія гэтых стварэнняў.

Гэты псіх схіліўся яшчэ ніжэй, учапіўся мне ў рукаў. Я адчуваў, як ён дрыжыць. Нібы на марозе, а не ў гэтай аўтадухоўцы.

— Ты глядзеў фільмы пра Тэрмінатара? Пра паўстанне машын? — ён перайшоў на свісцячы шэпт. — Машыны перамаглі. Яны намі кіруюць. Яны даюць нам загады. Яны не могуць без нас, а то б даўно знішчылі. Але яны разумныя. Ве-ельмі разумныя! Яны — паразіты. Яны зрабілі так, што мы не можам без іх.

Шыпенне над вухам паралізоўвала — я нават не мог загадаць яму заткнуцца. А той усё больш узбуджаўся, працягваў:

— А ты ведаеш, з каго свет гарыць? З вось гэтых маленькіх ублюдкаў. Ім мала быць паразітамі, хочуць стаць тут гаспадарамі... Гэта акупацыя!

Адступаць ужо не было куды — я споўз на самы край і ўперся ў чыйсьці агромністы азадак.

— Скажы, ты жанаты? — спытаў раптам суб'ект.

— Так, ёсць жонка, Ленай завуць, — чамусьці выгукнуў я. Мне даўно была непрыемная гэтая размова, непрыемны гэты тып, я хацеў усё скончыць, але не мог.

— І дзеці, мабыць, ёсць? Два сынкі-карапузы?

— Ёсць. Толькі дачка, Ліза. У дзясятым класе.

— Мабыць, і бацькі яшчэ жывыя?

— Маці. Бацькі гады два няма... (Чорт! Што за халерная шчырасць!)

— Я ўпэўнены, што іх усіх разам узятых ты бачыш, з імі размаўляеш, бавіш час менш, чым са сваім маленькім сябрукам! Так?



Я маўчаў. Але ён мае рацыю...

— Так ці не?!

— Так...

— Не ты адзін такі. Цяпер усе так. Устаюць пад будзільнікі на мабілах. Па мабільніках сварацца, сябруюць, кахаюцца, робяць грошы... Ды што там, нават нашай краінай кіруюць па мабілах! Ты толькі ўяві, усе мы жывем праз гэтыя д'ябальскія камякі пластмасы. А што будзе далей? Ведаеш, ім трэба нашыя дзеці. У цябе ёсць дзеці?

— Ёсць. Дачка. У дзясятым...

— Ты бачыў нашых дзяцей? Яны не выпускаюць гэтых монстраў з рук! Гульні, музыка, мульцікі — а што пасля?

— І што рабіць?

— Змагацца! — я ўбачыў яго вочы, з такімі вачыма, відаць, Матросаў кідаўся на кулямёт. — Можна, канешне, жыць, як быццам нічога не адбываецца. І пакуль яны дазваляюць. Але гэта не жыццё, павер...

— Змагацца? Як?

— Як заўгодна. Трушчыць гэтых пачвар. Знішчаць іх гнёзды. Ты іх ведаеш, гэтыя гнёзды. Магазіны, салоны сотавай сувязі — гэта сапраўдныя гадзючнікі. Але самае галоўнае — казаць людзям праўду! Толькі — цс—с! — ён раптам уздрыгнуў і спалохана азірнуўся. — Гэта вельмі небяспечна. Яны не цярпяць супраціву... Адзін маленькі промах — і за табой прыйдуць.

— Хто, мабільнікі? — да мяне паціху вяртаўся цвярозы розум.

— Іх людзі. Іх ланцужныя сабакі.

— А чаму я павінен табе верыць? Можа, ты мабільнікавы правакатар? — я ўжо яўна здзекаваўся з яго.

Мой субяседнік скрывіўся. Здзеку ён не заўважыў.

— Я некалі быў іх чалавекам, — павольна, цяжка адказаў ён. — Паплечнікам і рабом. Я працаваў у салоне мабільнай сувязі, на рагу Казлова і праспекта Незалежнасці, ля метро. Я прадаў гэтым д'яблам сваю душу. А пасля пачаў задумвацца. Яны нешта западозрылі і выкінулі мяне адтуль.

— Цябе трэба было адразу здаць у дурдом! — гучна сказаў я, бо ў акне ўжо віднеўся родны прыпынак.

— Ты не верыш?

— Псіх ненармальны! — з палёгкай выгукнуў я, праціскаючыся ля неабдымнага азадка.

— Падумай! Вось тэлефон, як што — звані, мяне Лёхам звацць, — ён ухітрыўся ўсунуць мне ў кішэнь шматок паперы. — Толькі не з мабільнага!

***

«Той учарашні мужык у аўтобусе — псіх. Гэта відавочна. Ясна, як Божы дзень. І нёс ён лухту. Хаця былі і цвярозыя рэчы. Вельмі цвярозыя... Колькі разоў я сам аб гэтым думаў, ну, не думаў, хутчэй адчуваў...»

Я ляжаў, заплюшчыўшы вочы, каб не адпускаць рэштак ужо адляцелага сну. Калі ўздымеш павекі, ты ўжо здаўся дню з яго справамі і клопатамі. А так ты на мяжы — ні туды ні сюды...

Раптам над вухам піскліва загарлапаніла танная падробка пад класіку. Чорт, будзільнік! Якой халеры? Сёння ж субота, я быццам бы яго не ставіў! Хіба што ён сам. Сам? Сам?!

Мабільнік пішчаў усё мацней, аж трэсся ад старання ды хітра падміргваў экранам. «Пад'ём!» — пульсавалі літары.

— Пад'ём!.. Ага, разагнаўся! Выкусі! — я згроб гэты нахабны кавалак пластмасы, які спалохана забіўся ў маёй руцэ, і націснуў на клавішу. Можа, сон адляцеў яшчэ не далёка? Вось толькі апушчу павекі...

Ччорт! Зноў ён! Што яму цяпер трэба? Ненавіджу! Ага, «Напомніць: Дзень народзінаў Галі». Якой, к чорту, Галі? Якая твая справа, маленькі ты засранец? Я сам разбяруся з Галямі і народзінамі!!!

Стомлена адкідваюся на падушку і безнадзейна ўздыхаю: сон не вернеш ужо дакладна. Хоць так паляжу...

Ізноў мярзотны піск падробкі пад класіку. З нянавісцю гляджу ў яхідна міргаючае вока. Гэта будзільнік — паўтор званка... Не, гэта здзек...

— Я цябе ненавіджу! — крычу проста ў твар. — Замачу, падла!

Смачны ўдар пластмасы аб сцяну вяртае мяне да прытомнасці. Божа, я еду з глузду! Сварыцца з мабільнікам! Хутка я буду праведаваць у аўтобусах аб змовах машын-масонаў!

А ўсё ж будзільнік я не ставіў... І паўтор не ўключаў...

Я сядзеў на падлозе ля сцяны і глядзеў, як маленькі злачынец, адгарлапаніўшы, прыкідваўся мёртвай шэрай скрыначкай. У галаве быццам распускалася кветка, якая даўно там расла, але яшчэ ўчора была зялёным бутонам.

Недзе ў кішэні джынсаў — тая паперка з нумарам. Патэлефаную яму. З хатняга тэлефона. Проста так.

Масіўная трубка, спіральспружына проваду, дыск з лічбамі — так па-старасвецку, так супакойвае...

— Алё? — насцярожаны мужчынскі голас.

— Добрай раніцы. А можна... э-э-э... Аляксея?

— Ён захварэў, яго забралі ў бальніцу.

— Забралі?..

— Так, забралі. А хто яго пытаецца?

З бразгатам кідаю трубку на рычажкі. Адчуваю вострую патрэбу схапіць малаток. А, вось ён, у скрыні на верхняй паліцы. Вяртаюся з ім у спальню. Там у той жа позе мой мабільнік працягвае прыкідвацца бязвіннай скрыначкай.

— Здохні, — кажу яму проста ў цёмны экран і з размаху апускаю малаток. Мярзотнік гэтага яўна не чакаў. Войкнуўшы, разляцеўся на кавалкі.

Раптоўна вярнулася адчуванне вакацый. Я стаяў, моцна сціскаючы малаток, і адчуваў, як сонца лашчыць мой твар. Зусім як тады, калі школьнікам кожны год слухаў апошні званок, што пачынаў сапраўднае лета. Лета без званкоў.

Не, гэта сапраўды цудоўна! Жмурачыся ад задавальнення, знішчаю зарадны блок, нават не паленаваўся знайсці і парваць на шматкі картонную скрынку, інструкцыю і гарантыйныя дакументы. Нечаканая свабода п'яніла, хацелася лётаць, танчыць ці трушчыць.

Трушчыць!

Чую, мая доня ў прыхожай зноў балбоча з сяброўкай па сваім «Нокіа». Што ж, чакай, зараз тата пакажа табе, што ёсць сапраўдная свабода!

— Дай сюды! — крычу, кідаючыся да яе.

Вялікія вочы Лізачкі, здаецца, занялі ўвесь твар. З віскатам яна кінулася на кухню:

— Мама-а! На мяне тата напаў! З малатко-ом!

— Дай мне гэту маленькую дрэнь! — патрабаваў я, залятаючы следам.

Жонка збялела і, сціснуўшы ў руках вялікі нож з прысталымі кавалачкамі цыбулі, засланіла Лізу, якая аж калацілася.

— Не падыходзь... — ледзьве не прашыпела Лена. Блiскучае лязо глядзела мне ў твар з самым сур'ёзным намерам.

Я збянтэжыўся. Убачыў гэтую сцэну збоку... Божа, як недарэчна!

— Ды вы што, гэта не тое, што вы падумалі! Зусім не тое! Лізачка, гэта ж я не табе! Гэта ўсё мабільнікі...

— Не падыходзь!!! — віскнула жонка. У адказ на мой рух лязо ўздрыгнула і заззяла яшчэ больш рашуча.

— Чорт з вамі! — разззлавана выходжу з кухні. Там Лена, сама ў слязах, супакойвае доччыну істэрыку. Хоць бы міліцыю не выклікалі.

На балкон, прыхапіўшы па дарозе цыгарэты. Мне зараз проста неабходна крыху нікаціну і кіслароду. Гэта заўсёды мяне супакойвае...

Ля пясочніцы — тры падлеткі з суседняга пад'езда. Сядзяць, хто на чым, і торгаюцца пад гангстарэп. А музыка адкуль? Раве на ўсю гучнасць нейкая крутая мабіла. І тут гэтае шоу марыянетак!

— Алё, міліцыя? — чую ў прыхожай Ленін голас.

Толькі я адчыняю дзверы ў прыхожую, Лена з ускрыкам выпускае з рук трубку і кідаецца на кухню. Я і забыўся, што малаток яшчэ ў мяне...

— Алё, міліцыя? — на кухні, відаць, па мабільніку. Ненавіджу мабільнікі!

Хутка апранаюся і выходжу з кватэры. У мяне ўжо ёсць дакладны план. Мой дзядуля-партызан, напэўна, ганарыўся б сваім унукам. Можа, я і звар'яцеў, але каму пра гэта меркаваць? Тым псіхам, што лічаць сябе здаровымі?

У гаражы мой стары добры патрыманы «рэно» сустрэў мяне дакорлівым позіркам мутнаватых фар. «Ну чаму ты ездзіш на аўтобусе, калі ў цябе ёсць я? — маўкліва пытаў ён. — Я б зберог цябе ад гэтых трывог». — «Я ведаю. Я цябе люблю, — таксама маўкліва адказваю я, праводзячы далонню па цёплым метале. — Але аўтобусы — тое, што яшчэ яднае людзей. І аўтобусы часам адкрываюць вочы».

Невялікія прыгатаванні — і я ўжо сціскаю руль. Побач на суседнім сядзенні той няшчасны малаток. Проста так.

Бадзёра вурчыць матор. Па радыё замест папсы сёння чамусьці перадаюць рок-н-рол. Добры знак. Нібы ў галівудскім фільме.

Праспект. Як заўсёды, людны і шумны. А вунь і метро. Месцаў для паркоўкі няма, таму я выруліваю проста на тратуар перад салонам мабільнай сувязі. Я хутка.

Мінакі абыякава зірнулі на мужчыну сярэдніх гадоў, які са звычайным вялікім пакетам рушыў праз тратуар.

— Добры дзень, што вас цікавіць? — міла ўсміхнулася чысценькая панечка ў дзелавым касцюмчыку з фірменным лагатыпам.

Я ўсміхнуўся ў адказ, дастаў з пакета каністру і пачаў разліваць бензін. На падлогу, на крэслы, на пісьмовы стол, на паперы.

Прыгожыя вочы паненкі акругліліся, тонкія бровы папаўзлі ўгару. Яна тоненька закрычала. За ёй закрычалі, забегалі, замітусіліся іншыя акуратненькія хлапцы і дзяўчаты ў дзелавых касцюмчыках з фірменнымі лагатыпамі. Але мяне гэта не клапаціла. Мяне больш клапаціла, што шэрагі маленькіх ублюдкаў за шклом у вітрынах могуць ацалець ад агню. Крыўдна было б.

Локцем з размаху выношу вітрыну. Звініць узарванае шкло, бездапаможна рассыпаюцца маленькія засранцы. Крута! Як у кіно! Толькі балюча крыху. Пустою каністраю дабіваю апошнія прытулкі гэтых гадаў.

Хутка за мной прыйдуць. Але адным гадзючнікам будзе меней. Чыркаю запалкай і галівудскім рухам кідаю яе на стос мокрых ад бензіну рэкламных праспектаў. Яшчэ адну — на цёмную пляміну на дыванку, затым — на крэсла... З дзяцінства неверагодна люблю глядзець, як шугае полымя. Але трэба ісці, я ж машыну не замыкаў.

Удалечыні праз гарадскі шум прабіваюцца сірэны. На тратуары перад салонам пачалі збірацца цікаўныя.

— Шаноўнае спадарства, вы глядзелі фільмы пра Тэрмінатара? — ветліва звярнуўся я да іх. — Пра паўстанне машын? Дык вось, віншую: паўстанне адбылося, машыны перамаглі. Яны намі кіруюць. Яны даюць нам загады. Яны не могуць без нас, а то б даўно знішчылі. Але яны разумныя. Ве-ельмі разумныя! Яны — паразіты. Яны зрабілі так, што мы не можам без іх.

Праз дзверы салона валілі клубы дыму. Пахла палёнай пластмасай. Гарэлі ЯНЫ. Я зларадна адчуваў, як яны курчацца там, у самым пекле, сцякаюць пластмасавымі слязьмі...

— А вы ведаеце, спадарства, з каго свет гарыць? — працягваў я. — З вось гэтых маленькіх ублюдкаў. Ім мала быць паразітамі, хочуць стаць тут гаспадарамі. З кожным днём іх усё болей і болей. Гэта акупацыя!

Людзі з бела-сініх машын выкруцілі мне рукі і балюча прыціснулі тварам да асфальта.

— Змагайцеся! Трушчыце... — удар міліцэйскага чаравіка па рэбрах збіў увесь пафас.

Пажарныя пачалі раскручваць шлангі. Але я ўбачыў, як праз вітрыну мне падміргнуў агонь: «Не бойся, я ўжо ўсё зрабіў».

Я не баяўся і падміргнуў яму ў адказ.

АПАВЯДАННЕ

# ПРАВА ДАРАВАЦЬ

Сяргей ЕГАРЭЙЧАНКА

**Як цёпла было ў маі… Свет быў такім лагодным, у ім не было анічога, акрамя шчасця, літаральна разлітага ў вясновым паветры, шчасця простага, бязглуздага, недарэчнага і нечаканага, якім поўніўся кожны сонечны праменьчык.**

Яна не любіла слова «травень». Ведала, што правільна казаць так, але ўпарта казала «май». Напэўна, нават яна сама не магла растлумачыць сутнасць сваёй звычкі.

Гэта быў яе любімы месяц. Яна нібыта прачыналася са сну разам з зялёнымі дрэвамі, разам з імі радавалася жыццю і наваколлю, і цягнулася, цягнулася наверх, да яснага сонейка, якое наталяла яе сваім боскім сонечным элексірам. Яна не засыпала ўвосень разам з прыродай. Але кожную вясну і кожны травень атрымлівалася так, нібыта яе жыццё пачыналася зноўку — чыстай старонкай, новымі памкненнямі і натхненнем, кожны раз яшчэ больш моцным і яскравым, чым год таму.

Яна мела шмат сяброў. Такое насамрэч Сонечнае Кацянятка не магло не збіраць вакол сябе людзей, якія таксама марылі дацягнуцца да сонца ці хаця б падставіць яму сваю галаву і лашчыцца, лашчыцца да яго, размаўляючы з сусветам на мове шчаслівых усмешак ад вуха да вуха. Яна магла навучыць гэтаму людзей. І яна вучыла.

Часам яе бачылі сумнай. Вельмі рэдка, хутчэй выпадкова, наваколныя заўважалі рэдкія ноткі суму, якія адлюстроўваліся на яе твары, калі заставалася адна і лічыла сябе схаванай ад вачэй. І ніхто не ведаў, што за блюз грае ў яе душы.

Між іншым, яна любіла блюз, але слухала яго заўжды толькі адна — часцей за ўсё ў слухаўках, уваткнутых у старэнькі плэер «Jagga». Гэтая музыка была для яе нечым абсалютна інтымным, чымсьці, што трэба перажываць сам-насам з сабой, і ні з кім не дзяліцца пачутым і асалодай ад яго. Прынамсі ні з кім, акрамя самых дарагіх. А такіх, якія сталіся для яе насамрэч часткай уласнай душы, было няшмат.

Дакладней, яна сама магла назваць толькі дваіх.

Першым быў ціхі і непрыкметны хлопец — Данік, Данііл. Ён жыў заўжды сваім жыццём і ніколі не пускаў нікога корпацца ў сваёй душы. Яму падавалася, што варта толькі на імгненне адчыніць дзверы ў яе, і яна адразу пераўтворыцца ў прахадны двор, дзе кожны хоча пакінуць след ад сваіх брудных ботаў. Можа быць, калісьці хто-небудзь здолеў бы пераўпэўніць яго ў адваротным, ды толькі ён ніколі не спрачаўся ні з кім на гэтую тэму. Не хацеў спрачацца. А людзі й не настойвалі. Людзям толькі зрэдку бывае цікава, што адбываецца ў душах тых, хто не імкнецца адкрыць таямніцы свайго сэрца кожнаму сустрэчнаму. Што ж, такая чалавечая натура. Хто ведае, ці не было б менш болю, калі б усё сталася інакш? Правільна, ніхто…

Ён не пісаў вершаў. Не быў сэрцам гулкіх кампаніяў. Ён толькі быў ідэальным сховішчам чужых тайнаў. Любы псіхолаг пазайздросціў бы таму эфекту, які выклікала шчырая споведзь у гэтага чалавека. Ён мог гадзінамі слухаць кагосьці, хто п'яны ці цвярозы плакаўся яму ў рукаў, і, нават, калі ён не казаў ані слова — ні суцяшальнага, ні, наадварот, асуджальнага — спавядоўцу станавілася куды прасцей несці свой цяжар далей. Такі чалавек ведаў — больш ён не адзін, і, самае галоўнае, ягоная тайна была схаваная куды больш надзейна, чым магло гарантаваць любое сховішча ў свеце. Напэўна, у гэтым і было прызначэнне хлопца: слухаць іншых. Слухаць і без усялякага дазволу ад Бога і ад чалавека адпускаць ім грахі.

Сам жа ён спавядаўся толькі аднойчы — нашаму Сонечнаму Кацянятку, і з таго часу паміж імі й усталявалася нябачная чужому воку сувязь, якая мусіла суправаджаць іх усё жыццё, ідучы поруч, альбо аддзеленых адзін ад аднаго тысячамі кіламетраў. Больш блізкіх людзей у Даніка не было. Сям'я развалілася даўно і назаўжды, а сябры… сябры — гэта тыя, хто хоча цябе зразумець. Хацела толькі яна. І ён быў за гэта ўдзячны.

Другім блізкім чалавекам была яе сястра Дыяна — старэйшая за Кяцянятка на паўтара гады, яна жыла зусім іншым жыццём, іншымі людзьмі, іншымі надзеямі і прагненнямі. Тым не менш, яна не ўяўляла свайго жыцця без сястры, яе сонечнай усмешкі і яе прагі да жыцця.

Менавіта Дыяна прымусіла Кацянятка ўслед за сабой з'ехаць з роднага дому ў Віцебску дзеля навучання ў Менску. Дыяна нават дамагалася, каб яе сястру падсялілі ў інтэрнаце ў яе блок — апякаваць Кацянятка яна лічыла сваім прамым абавязкам.

Сапраўды, Дыяна хацела падавацца больш дарослай і сур'ёзнай, чым яно, магчыма, было на самой справе. Часам складвалася такое ўражанне, што яна ненавідзіць свае дваццаць два гады і марыць аб тым, каб ёй адразу споўнілася сорак — толькі дзеля таго, каб яе слова мела на іншых большы ўплыў.

Сонечнае Кацянятка не напружвала гэтае апекаванне. Яе цалкам задавальняла жыццё. Ні ў якім разе нельга сказаць, што яна была бестурботнай істотай у ружовых акулярах, не, проста яна жыла па прынцыпе «кожны жыве як яму дазваляе сумленне». Іншых такая занадта сур'ёзная сястра раздражняла б, а Кацянятка любіла яе настолькі, наколькі гэта ўвогуле было магчыма.

У свеце не было амаль аніводнага чалавека, за якога б Дыяна аддала сваё жыццё. Яна была прагматыкам, які перадусім бачыць толькі ўчынкі і іх наступствы. Чаму «амаль»? Ды таму, што адзіным выключэннем з правілаў была яе сястра — маленькі чалавечак з агромістай душой і сэрцам, адкрытымі кожнаму навокал.

Дыяна таксама мела шмат сяброў, яле яе сябры былі з той катэгорыі людзей, якія страцяць сваю актуальнасць пасля таго, як жыццё развядзе з імі ў розныя бакі. Яна прадчувала гэта, але не баялася такога развіцця падзей. Яна мела сваё ўласнае Сонечнае Кацянятка, і ніхто ў жыцці больш не мог пахваліцца такім.

Іх дзень пачынаўся заўжды аднолькава — яны ўтраіх збіраліся на кухні ў блоку Дыяны і Кацяняткі і пілі зялёную гарбату. Гэткім эпітэтам, прынамсі, яны называлі не тое, што прадаецца пад такой назвай у крамах — травы Кацянятка збірала сама: святаяннік, ліпа, чабор, лісткі суніцы, штосьці яшчэ, што надавала збору своеасаблівы церпкі пах… Кацянятка нікому не давярала рабіць гарбату, нават Дыяне — гэта была толькі яе справа, і яна любіла яе.

**Ён адчуў сябе абсалютна шчаслівым — калі прачнуўшыся на досвітку, стаяў на каленях на беразе Нёмана і маліўся яму**

Час нібыта літасціва аберагаў іх. Кожны дзень цягнуўся для іх цэлую вечнасць, але гэта не толькі не напружвала, а наадварот усцешвала. Яны жылі ў шчасці самі з сабой, а да турботаў ставіліся як і трэба гэта рабіць — з іроніяй і верай у лепшае.

Кацянятка любіла Менск. Нават родны Віцебск быў для яе не такім прыгожым і светлым, як сталіца краіны. Яна любіла ў Менску літаральна ўсё — завулкі старога горада, праспекты, па якіх нават уначы хадзілі сотні й тысячы людзей, велічную плошчу Якуба Коласа (Інкуба? Сукуба? — гэтак яны жартавалі з Дыянай кожны раз, калі механічны голас у метро абвяшчаў гэты прыпынак). З усіх яе сяброў толькі Данік не разумеў гэтай апантанасці. Ён не любіў, калі вакол яго таўкліся розныя людзі, а каменныя джунглі наўпрост прыціскалі яго да зямлі. Ён быў чалавекам прасторы і вольнага ветру, якога так бракавала гарадам. Толькі раз за жыццё ён адчуў сябе абсалютна шчаслівым — калі прачнуўшыся на досвітку, стаяў на каленях на беразе Нёмана і маліўся яму. Даніку падавалася, што наўпрост само беларускае паветра наталяе ягонае цела і ягоную душу чымсьці такім, што недасяжна іншым, чымсьці, што раз і назаўжды ўзнёсць яго над усімі, хто аніразу ў жыцці не адчуваў нічога падобнага.

Сонечнае Кацянятка не магла стрываць у жыцці толькі адной рэчы: калі камусьці побач з ёй было балюча, — балюча целам ці душой — гэта было ўжо не так істотна. Нават калі яна не магла дапамагчы справай, яна шчыра і ад сэрца імкнулася дапамагчы словам — і, о цуд! — яе слова сапраўды ратавала душы. Яна хацела жыць так, каб навокал усім падавалася, што ёй самой ніколі не бывае балюча, толькі дзеля таго, каб іншыя думалі, што калі б яны не звярнуліся да яе па падтрымку і дапамогу, іхні зварот ніколі не станецца несвоечасовым.

Людзі памыляліся, нават ёй часам было балюча. Раз-пораз знаходзіліся такія, у якіх атрым-



лівалася параніць гэтае святое, хоць і маленькае сардэчка, а, часам здаралася так, што балюча біла само жыццё, нібыта выпрабоўваючы на стойкасць, мужнасць і… святасць.

Кацянятка сумленна здавала ўсе іспыты на трываласць, ані словам, ані поглядам не даючы іншым зразумець, што нават ёй бывае цяжка. Для іншых цяжка ёй не было ніколі. Яна лічыла, што не мела права на ўласны боль. Занадта шмат было чужога болю.

Маленькай дзяўчынцы, якую сябры па-за вачыма называлі Сонечным Кацяняткам, ішоў дваццаць першы год.

Яна заўжды верыла ў тое, што злых людзей не бывае, бываюць толькі прадузятыя і эгаістычныя адзнакі. Напэўна яна будзе верыць у тое праз усё жыццё, нягледзячы на ўсё, што сталася з ёй той халоднай ноччу. Хіба ж не за гэтую святую наіўнасць яе любілі сябры? Пра ўсіх не магу сказаць, але тыя два, якіх я апісаў вышэй, плакалі па-за дзвярыма бальнічнай палаты, пасля таго, як яна сказала, што не абвінавачвае аніводнага ў свеце чалавека ў тым што здарылася, і што трэба дараваць усё. Гэтыя двое не разумелі яе, і яны прагнулі аднаго — помсты за той боль, які перажыла Кацянятка. Іх можна было зразумець. Яны былі ўсяго толькі людзьмі. Яна ж была святой. Так лічылі яны. І, напэўна, яны мелі рацыю ў сваіх поглядах. Але дараваць разам з ёй у іх не атрымлівалася. Ды яны й не імкнуліся да гэтай святасці.

Яны збіраліся нядоўга. Як заўжды, усе ўтраіх — Кацянятка, Данік і Дыянка. Галоўнае было цёпла апрануцца: ніхто не ведаў, калі для іх скончыцца гэтая ноч.

Да апошняга моманту яны не маглі вырашыць, ці трэба ўрэшце ім ісці. Спрачаліся да хрыпаты — такога не было ніколі. Дацягнулі да таго, што, здавалася, можна было ўжо й заставацца дома. Але яны пайшлі.

Страшная памылка, чорная іронія лёсу — спазненне сталася трагедыяй. Прыйшоўшы паловай гадзіны раней, яны б вырваліся, як вырваліся тысячы іншых. А цяпер было позна.

Бегчы не было куды. Навокал яна магла бачыць толькі роўныя сценкі з Чорных, якія сабой утваралі адмысловыя калідоры — каб не даць анікому вырвацца і паслгнуць раскрытай пашчы зялёнага «спецМАЗу». Людзі цягнуліся па гэтых калідорах — крок управа, крок улева, і ахвяра адразу атрымлівала дрынам па галаве. Цікавая асаблівасць: білі толькі па галовах, куды радзей па спіне альбо руках. Нават дзяўчын, нават старых, паваленых на акрываўлены снег, білі нагамі, імкнучыся трапіць у галаву.

Чалавек дзвесце, куды трапілі Кацянятка, Данік і Дыяна, яшчэ трымаліся. Іх заціснулі паміж сценкамі нейкіх будынкаў, і абодва выхады раптоўна аказаліся перакрытымі металічнымі шчытамі. Кожны разумеў, што ратавання не будзе, і яны рыхталіся. Невядома да чаго, але кожны настройваў сябе толькі на тое, каб не паказаць страху — гэтым Чорным, сваім навакольным і, галоўнае, самім сабе.

Нарапад, бліжэй да шчытоў ірвануліся хлопцы — найбольш мужныя, найбольш адказныя; яны штурхалі дзяўчын, разам з імі заціснутых у капкане, у цэнтр, дзе было больш бяспечна, самі падстаўляючыся пад першыя ўдары. Данік схапіў Дыяну і Кацянятка і прыцісную іх да цаглянай сцяны будынка. Ён таксама хацеў пайсці туды, наперад, але дзяўчаты схапілі яго і з усіх сілаў прыціснулі да сябе.

Кацянятка адчувала, нібыта ў паветры падвесілі магутную струну, і зараз яе расцягвалі з абодвух бакоў магутнымі абцугамі, рызыкуючы парваць. І струна звінела, гучала нейкай незямной, да невераготнасці прыгожай і, у той жа час, страшнай нотай, якую не даводзілася чуць раней і наўрад ці давядзецца пачуць яшчэ калі-небудзь.

Гэтая музыка гучала ўсяго некалькі кароткіх імгненняў. А потым струна парвалася.

Клін Чорных уварваўся ў натоўп мірных людзей як гарачы нож у масла. З абодвух бакоў Кацянятка пачула крыкі, страшныя крыкі людзей, якія раптам зразумелі, што цяпер іх будуць забіваць. Яна не бачыла, што адбывалася там — не хапала росту. Затое ўсё бачыў Данік.

Хлопцы — найбольш адважныя, са сціснутымі кулакамі спрабавалі кідацца на роўныя металічныя шыхты. Аніводзін з іх не здолеў прабіцца. Раз-пораз з шыхта вырывалася рука са шчытом, і той — агромістая, важкая металічная пласціна — апускаўся з налёту на галаву смелага, адразу разбіваючы твар у чырвонае месіва. Людзі падалі, многія нават без крыкаў — гублялі прытомнасць яшчэ падаючы, але нават пасля гэтага іх білі далей — нагамі, дрынамі, забіваючы і калечачы. Тыя, хто ўпалі, адразу зніклі за чорнымі шэрагамі, шыхт няўмольна крочыў наперад, па новыя ахвяры.

Данік прыціснуў дзяўчат да сцяны, наўпрост сваім целам, а потым раскінуў рукі, каб хоць як абараніць іх. Аніякага сэнсу ў гэтым ужо не было, але ён не мог рабіць іначай.

Першы ўдар прайшоў наводмаш, і хлопец нават не ўпаў. Але тут жа ён атрымаў ботам пад калена і сагнуўся ад болю. Зверху на яго навалілiся Чорныя, падымаючы і апускаючы магутныя рукі са сціснутымі ў далонях дрынамі.

Кацянятка крычала. Яна спрабавала закрыць Даніка ад удараў, працягваючы свае рукі наперад, і адразу некалькі дубінак перабілі іх, паламаўшы танюткія косткі.

Дыяна з усіх сілаў цягнула Кацянятка назад, да сябе, але было ўжо позна. Яе падхапілі было пад рукі, калі ў яе жывот уляцела нага ў цяжкім баявым боце. На кароткае імгненне Дыяна паспела зазірнуць у вочы таго, хто біў. Нават праз шкло ягонага шлема яна ўбачыла ў іх вар'яцкі агонь прагнага да крыві драпежніка, але не гэта больш за ўсё ўразіла яе. За шклом хаваўся твар не проста маладога хлопца — гэты ва'рят на выгляд быў маладзейшы за тую, каго ён біў!

Такога ўдару не вытрымалі нават магутныя чорныя рукі, якія трымалі дзяўчынку. Яна зноўку ўпала на снег, перакуліўшыся і заціхшы з раскінутымі рукамі, нібыта жадаючы абняць родную зямлю, шчодра палітую маладой крывёй.

А яе цела зноў апынулася пад градам бязлітасных удараў звяроў, якія нават не разумелі, што іхняя ахвяра ўжо не не супраціўляецца...

Білі па ўсім целе, палкамі і нагамі. Гэтая вакханалія ўсё ніяк не скончвалася, і Дыяна, якую цягнулі ў МАЗ пад рукі, абарочвалася назад і не магла спыніць цяжкі плач, які рваўся з яе грудзей і які заліваў яе вочы слязамі настолькі, што яна ўжо, часам, пераставала бачыць сваю сястру.



Не было грамадства, засталася толькі грамадзянская вайна. У гэтай вайне не магло быць пераможцаў. Яна б скончылася падзеннем усяго, што было здабыта ў мірных баталіях

Ужо потым, у бальніцы, куды скалечанае дзіцятка прывезлі пасля бясконцых катаванняў, далёкая ад палітыкі маладая доктарка, кінуўшы на Кацянятка толькі адзін позірк, павярнулася да Чорнага.

— Вашы білі?

— Мае, — з незразумелым гонарам у галасе адказаў ён.

— Поскудзі, — прашаптала дзяўчына і рэзка адвярнулася ад яго.

— Ты што сказала, сука? — зароў Чорны і схапіў яе за плячо.

Дзяўчына павярнулася на абцасах і падкрэслена спакойным голасам, гледзячы ў твар Чорнаму, адчаканіла:

— Я сказала, што хачу толькі аднаго: каб такія, як вы, дохлі, павольна захлынаючыся сваёй крывёй, ці што ў вас там замест яе, дохлі гадзінамі, цяжка; і я, калі раптам буду побач, не толькі не дапамагу вам, але буду з вялікім задавальненнем назіраць за тым, упершыню парушыўшы клятву Гіпакрата. Але я ані хвіліны не пашкадую аб тым, таму што яна — для людзей, а вашае імя — поскудзі, і толькі што я пра гэта ўжо сказала.

Яны вырвалася і, падняўшы, галаву, хутка пайшла за каталкай, на якой санітары везлі Кацянятка на аперацыю, пакінуўшы Чорнага ярыцца на ўваходзе.

***

Данік не дараваў ніколі. Як і Дыяна. Яны ненавідзелі Чорных, яны хацелі забіваць іх сваімі рукамі. А людзі навокал не разумелі гэтай жорсткасці. Людзі, якіх там не было, казалі ў твар высокія і прыгожыя словы пра гуманізм і пра тое, што кожны мае права на памылку.

Часам Данік зрываўся і крычаў на іх. Якое права мелі гэтыя гуманісты казаць пра дараванне, калі яны самі не бачылі, як тыя, Чорныя, лілі кроў, без жалю, без літасці, без ценю шкадавання ў вачах, схаваных за нябіткім шклом? Якое права яны мелі дараваць за чужых людзей, за якіх яны не адчулі і ценю таго болю, які маглі б адчуць за сваіх блізкіх? Дараваць мела права Сонечнае Кацянятка. І яна даравала. Даніку падавалася, што калі яна закрывае вочы, вакол яе галавы ажывае белае святло, боскае і святое, нябачнае для іншых. Гэта было не больш чым падманам зроку, але хлопец нездарма гатовы быў стаяць перад ёй на каленях, маліцца ёй і прасіць прабачэння за тое, што не выратаваў, не выцягнуў з-пад гумавых палак.

Ён не мог больш глядзець у тэлескрыню. Не тое, каб ён і раней часта рабіў гэта, але пасля фатальнай начы яго проста ванітавала ад усяго, што ён бачыў там. Нават шматлікія відэафайлы ў сеціве, якія распаўсюджваліся незалежнымі блогерамі, выклікалі ў яго толькі нянавісць да ўсяго навакольнага.

Аднойчы ён знайшоў запіс, на якім ужо былыя лідэры, з тых, за кім пайшлі пад дубіны невінаватыя людзі, спрачаліся аб тым, што руху «патрэбная новая нацыянальная ідэя». Данік толькі на імгненне затрымаўся, каб перайсці на іншы сайт і не слухаць гэтага трызнення, якое сядзела ўжо нават не ў пячонках, а дзесьці ў горле, калі штосьці прымусіла яго спыніцца. У кадры з'явіўся адзін з самых маладых выступоўцаў. Ён не стаў прамаўляць доўга і прыгожа. Ён памаўчаў некалькі секундаў, гледзячы на сівыя шэвелюры сваіх апанентаў, потым стомлена прыгладзіў свае ўласныя валасы, па якіх сівізна прайшлася толькі ў апошнія дні, і сказаў:

— Новая нацыянальная ідэя, кажаце? У чым жа яна? Можа быць, у нас саміх, тых, хто так і не падняў за сабой абяцаных мільёнаў? У міфічным краху эканомікі, якія мы прадказвалі апошнія дзесяць гадоў ледзь не кожны месяц? Альбо ў тым самым новым Каліноўскім, якога так чакаюць нашыя «змагары»? — Ён замоўк на паўхвіліны, з нечаканай для яго злосцю ўглядаючыся ў пачырванелыя ад гэткага выпаду твары тых, хто сядзеў побач з ім. — Вам сказаць, нарэшце дзе яна, тая нацыянальная ідэя?! Вы, панове — як, у прынцыпе, і я — не маеце да яе ніякага спрычынення, як бы вам таго не хацелася, і не чырванейце вы ў сваім справядлівым гневе. Новая нацыянальная ідэя ў разбітых на дзясяткі аскепкаў руках той самай дваццацігадовай дзяўчынкі, якая адна каштуе больш чым мы ўсе тут разам узятыя. Новая нацыянальная ідэя ў гумавых дрынах, якія разбівалі яе цела, ператвараючы яго ў суцэльную крывавую масу, цела маладой прыгожай дзяўчынкі, якая па НАШЫМ, панове, закліку прыйшла туды… Вы добра ведаеце мяне, панове, я міралюбівы чалавек. Але маё бачанне таго, што вы сабраліся тут абмяркоўваць, толькі ў тым, каб адправіць на ўранавыя руднікі падонкаў, якія не палічылі ніжэйшым за сябе падняць сваю брудную валасатую лапу нечалавека на гэтае безабароннае спалоханае цельца, у якім ад страху калацілася маленькае сардэчка — насмрэч большае за сэрцы ўсіх нас.

Дзе быў той край, за якім заканчвалася грамадства і пачыналася клетка з жывёламі, брудны і магутнымі гарыламі, якім эвалюцыя ўклала ў рукі палку не дзеля таго, каб стаць праз працу чалавекам, а наадварот — каб скаціцца назад па лесвіцы ў цемру дацывілізаваных стагоддзяў?

Яна не ведала гэтага краю. Не ведаў і ніхто. Не было грамадства, засталася толькі грамадзянская вайна. У гэтай вайне не магло быць пераможцаў. Яна б скончылася падзеннем усяго, што было здабыта ў мірных баталіях. Грамадзянская вайна сама па сабе ніколі не пачынаецца. Пакуль яшчэ ёсць грамадства — яна немагчымая. Але кропку заўжды ставіць кроў.

Кропку ставіла кроў маленькай дзяўчынкі, чыстай і светлай.

Дзе заканчваўся гэты шлях? Дзе пачынаўся новы дзень? Сонечнае Кацянятка не ведала гэтага. Яна толькі хацела жыць далей, хацела, як ніколі дагэтуль.

Людзі жылі, каб помсціць, альбо, закутаўшыся ў коўдру з галавой, забыцца й не бачыць нічога.

І толькі яна жыла, каб дараваць.

Яна мела на гэта права.

І яна жыла.

**3–7 студзеня 2011 г.**

ДЭБЮТ

# МАРКОТА СНОЎ

Святлана КАНЬКОВА-ДУДАРЭНКА

## Маёй Беларусі

*Сонца промнямі срэбна-зыркімі*
*Ахінае ласкава зямлю*
*І вітае апошнімі зоркамі*
*Беларусь дарагую маю.*

*Тут лясы дзень і ноч калыхаюцца,*
*Шэпчуць песні свае для яе,*
*І лугі і палі адгукаюцца.*
*Беларусь голас іх пазнае…*



*Веснавою парою празрыстай*
*Мне і дыхаць, і марыць лягчэй…*
*Ад любімай старонкі вячыстай*
*Не магу я адвесці вачэй…*

* * *

*Схавайся ад мяне ў журбе —*
*Прашу і слёзна заклінаю.*
*Я не магу прагнаць цябе,*
*Я ўсё яшчэ цябе кахаю.*

*Ты, быццам спуджаны анёл,*
*За мною зводдалі цікуеш*
*І не спускаешся на дол,*
*Каб казку падарыць якую.*

*Табе я верыць не хачу,*
*Што быццам ты мяне кахаеш.*
*Я ведаю, я недзе чуў,*
*Як ты каханнем забіваеш.*

*Таптаць мужчынскія сляды —*
*Твая дзявочая прывычка…*
*Навекі знікні —*
*І тады*
*Каханне згасне, нібы знічка…*

* * *

*Зімовы вечар ахінае плечы,*
*І вусны мне цалуюць маразы.*
*А я хачу,*
*Быць можа, недарэчы,*
*Зноў прыгадаць цяжкія каласы.*

*І позірк неба разамлела-сіні,*
*І намі прытаптаную траву,*
*Куды з табою я хавала цені*
*І светлую ад шчасця галаву…*

*Адчуць жадаю дотык твой стамлёны,*
*Твой сарамлівы шэпт у забыцці*
*І цёплую далонь, што ты, натхнёны,*
*Паклаў на косы ўпершыню ў жыцці…*

*Зімовы вечар ахінае плечы.*
*А летні дзень прыходзіць зноў і зноў…*
*Блакіт вачэй тваіх зрабіўся вечным,*
*І стала вечнаю маркота сноў…*

* * *

*Неба імклівай маланкай рассечана,*
*Пахне нявыпаўшым,*
*прэлым дажджом.*
*Наша з табой узаемнасць скамечана.*
*Нейкім няродным здаецца твой дом.*

*Свецяцца шчыліны ў сценах шпалерныя.*
*Выдзьмулі ветры былое цяпло.*
*Гутаркі нашыя сталі манерныя.*
*Пыл засцілае нямытае шкло.*

*Шчыльна завешана фортка фіранкаю —*
*Некалі моднае нешта, пад лён…*
*О, як хачу спапяліць я маланкаю*
*Нашых аднасінаў гэты нейлон!..*

* * *

*Ласкавы сонечны прамень*
*Няхай, дзіця, цябе люляе*
*І будзе добрым гэты дзень,*
*Гадзінай кожнай забаўляе.*

*Няхай расце тваё святло*
*І лашчаць матчыныя рукі,*
*Каб чуў і ведаў ты жытло,*
*І словы родныя, і гукі.*

*Каб не забраў ніхто ў цябе*
*Свабоды вечнае жаданне,*
*Ні песень жаўраў на сяўбе,*
*Ні казак родных спавяданне.*

*…Адкрыўшы дзедаўскі сундук,*
*Успомнім мову і Скарыну…*
*Пад старадаўняй дудкі гук*
*Уславім родную Айчыну!..*

* * *

*Не цурайся, не мінай*
*Мовы роднай беларускай.*
*Крочыць сцежкай пачынай —*
*Хай яшчэ пакуль што вузкай!..*

## Я — беларуска — Я

*Тонкімі далонямі*
*Узнімаю косы я —*
*Моцная сплятаецца*
*Светлая каса.*
*Ты пляціся, любая,*
*У адно сабраная,*
*Быццам поле жытняе*
*З кветкай васілька.*

*У касу далучыцца,*
*Сонцам апалёная,*
*Белафарбаваная*
*Лета чысціня…*
*Белыя і русыя,*
*Вы мае славянскія*
*Косы беларускія…*
*Беларуска я!..*

ПАРЦЭЛЫ

# ДЗЯВОЧЫЯ ВОЧЫ ПОЎНАЧЫ

Алесь МАКРАЦОЎ



* * *

*Галоўны*
*мастацкі твор*
*беларусаў…*
*Родная мова…*

* * *

*Мяккі,*
*гаротны знак…*
*Чакае*
*рэабілітацыі.*

* * *

*Сіняе неба*
*закрэсліл*
*самалётамі…*
*Бы крэйдай.*

* * *

*Дзявочыя*
*вочы поўначы,*
*захопленыя*
*пралескамі…*

* * *

*Дзіцячы*
*садок…*
*Прырода*
*ў вальеры.*

* * *

*Душа…*
*На зямлі*
*сонечны*
*зайчык…*

* * *

*Выдатны*
*ў жанчыны густ…*
*Мяркую:*
*не горшы ў мужа.*

* * *

*Лебедзяў*
*пара…*
*Сям'я*
*баптыстаў.*

* * *

*Схаваная*
*будучыня…*
*Грыбніца*
*пад мохам.*

* * *

*Люк*
*на паперы…*
*Пастаўленая пячаць.*

* * *

*Званочкі ліловыя*
*ў лузе*
*поўдзень гайдае…*
*Лета звініць…*

* * *

*Нібы легкавушка*
*жыццё засела…*
*Буксуе ў нягодах.*

* * *

*Зямная*
*вандроўка душы*
*ў целе*
*эканомкласа…*

* * *

*Шэлест*
*паэтычнага*
*прозвішча*
*сябра…*

* * *

*На помніку*
*маці*
*вершы*
*надрукаваў…*

* * *

*Праўна*
*ў сэрцы…*
*Ненажэрны*
*вусень…*

* * *

*Гняздо*
*ў бур'яне…*
*Вёсачка*
*між лясоў.*

* * *

*Сэрца…*
*Святлафор*
*мігае*
*зялёным…*

* * *

*Родная*
*хата…*
*Маміна*
*«турма».*

* * *

*Чапля*
*на градцы…*
*Каліва*
*часнаку.*

* * *

*Вера,*
*як супраціў*
*нізасці*
*свету…*

* * *

*Узвысіўся*
*над зямным:*
*цяжкасці*
*палягчэлі…*

ЗГАДКА

# ЗАСТАВАЦЦА МЕЛЕЖАМ

Анатоль КУДРАВЕЦ

**У пасляваеннай беларускай літаратуры, відаць, няма больш драматычнай постаці, як Іван Мележ. «Драматычнай» у сэнсе ўражлівасці сэрца, хваравітабалючай рэакцыі на кожны нават нязначны знешні штуршок, ці то штуршок быў пахвалой ці крытыкай. Паляшуцкая зацятасць характару не давала нават намёку на магчымасць нейкага панібратства, хто б у яго не набіваўся. Ён ведаў сабе цану, і гэта давала права моцна стаяць на зямлі.**

У той год, а гэта было незадоўга да яго смерці, цераз парк над Свіслаччу я спяшаўся на працу. Дзень быў цёплы, можа, нават гарачы. На адной з лавачак, а іх тады стаяла шмат у парку, убачыў Івана Паўлавіча. Нягледзячы на гарачыню, ён быў цёпла адзеты: кашуля, нешта пад кашуляй, пінжак. Ён грэўся на сонцы, ён убіраў у сябе сонца, і адчувалася, што цяпла гэтага яму было мала.

Гаворка нашая абышлася некалькімі звычайнымі ў паспешцы фразамі. Але я зразумеў, што Івану Паўлавічу было цяжка. Праўда, зразумеў я гэта пасля, адышоўшы.

Т а д ы, у той момант, я не ведаў пра яго хваробы. Жывы чалавек заўсёды думае пра жывое і думае, што сам ён вечны. І сёння мне помніцца яго вочы: «Спяшаешся? Спяшайся..» — і яго пасунутае наперад крутое плячо, як засцярога, быццам ён чакаў нейкага ўдару.

Чаго-чаго, а гэтага яму хапала…

Нашмат пазней, ужо ў дзесяцітомным Зборы твораў пісьменніка, у лісце да Г. М. Маркава я прачытаю тое, у чым ён сам прызнаўся, хаця зрабіць гэта яму было няпроста.

*«…В моей жизни в последние два–три года произошло значительное ухудшение здоровья. Я и прежде не мог похвастаться здоровьем, старая, с фронтовых времен болезнь почек (нефрит) изрядно омрачала мне жизнь и прежде, лишала меня многих радостей жизни, но в последние годы будущее моё вообще, похоже, затянуло тучами, в которых почти не видно просвета. У меня началась почечная недостаточность, упорная гипертония, головные боли и т.п. Очень плохо со сном. Годами мучает непроходящая усталость…»*

Тады ж я паспяшаў на працу, пакінуўшы Івана Паўлавіча на лавачцы з яго нялёгкімі думкамі.

«Усё правяраецца смерцю…» «Помні пра смерць…»

«І ўсё ж як цяжка, проста немагчыма гаварыць пра Івана Мележа ў мінулым часе. Цяжка ўспамінаць пра тое, што не ёсць у с п а м і н ы, а што ёсць жывы чалавек, што ёсць само жыццё, хоць жалобная музыка стараецца ўзарваць непрыныцце гэтага як рэальнай зададзенасці…»

Такія словы напісаў я на лісце паперы 10 жніўня 1976 года, на другі дзень пасля смерці Івана Паўлавіча Мележа. Такія думкі не пакідалі мяне і на трэці дзень пасля смерці, калі пахавальная працэсія павольна, нібы стараючыся затармазіць, падоўжыць у часе апошні з я м н ы ход гэтага чалавека, ішла ад Дома літаратара ўбок праспекта, і я ішоў наперадзе яе, несучы перад сабой партрэт Івана Паўлавіча ў нязвычнай трагічна-чорнай абводцы…

Ішоў і думаў, чаму лёс такі неспагадны для беларускай літаратуры?

Адкрыўшы для ўсяго свету мацярык прыгожых палескіх людзей, пра якіх раней калі і гаварылі, то з пэўным гумарным скепсісам, як пра нешта туземнае і экзатычнае, Мележ сцвердзіў сябе як вялікі мастак і вялікі патрыёт.

Дуб падае ў лесе — адкрываецца прагал. Велічыня прагалу можа даць нейкае ўяўленне пра тое, я к о е гэта было вялікае дрэва. Пройдуць гады, прагал зарасце хмызам і драбналессем. Але ўся гэтая зеляніна, як бы яна не раскашавала і не рвалася ўгору, ніколі не можа расказаць пра тое, як тут буйна расло, шумела, зелянела, цвіло, словам, жыло гэтае дрэва, як добра было схавацца пад яго раскідзістай кронай ад дажджу, сонца, ці проста прыхінуцца плячыма да магутнага ствала, палюбавацца моцай і прыгажосцю, далучыцца да ягонай зямной сілы і самому адчуць сябе лепшым, мацнейшым, прыгажэйшым.

Гэта пра лес і пра дрэва. З людзьмі яшчэ складаней. А калі чалавек гэты — мастак, сапраўдны мастак, — а вялікі пісьменнік не можа не быць мастаком, — і хай пісьменнік пакідае людзей не ўвесь, хай ён застаецца ў сваіх кнігах, і яны могуць расказаць, я к і пісьменнік пайшоў, ш т о ён зрабіў і ш т о не паспеў зрабіць, але адчуванне, што прагал, які ўтварыўся пасля яго адыходу, н і х т о не можа закрыць, заўсёды выклікае пратэст, нязгоду.

Гавораць: час — найлепшы лекар. Можа, і так. Але прайшлі гады, як не стала Івана Мележа, а з кожным новым годам мы ўсё вастрэй адчуваем, што шырыня прагалу, які ўтварыўся пасля яго адыходу, не звужаецца, і ўсё вастрэй шчыміць сэрца ад болю і не даюць супакаення незакончаныя творы пісьменніка і ягоная постаць, мужыкавата-непрычасаная, чужая ўсякаму штучнаму прыхарошванню, можа, і прыцягальная гэтай неадольнай мужыкаватасцю, — па-новаму прыгожа паўстае перад намі.

Ён ніколі не быў шумна-вясёлы. Нават калі ўсміхаўся, нават калі смяяўся, пячатка суму, як аблачынка на ясным небе, не пакідала ягоных вачэй. Ён нібы ўвесь час слухаў сябе, нібы прыслухоўваўся да сябе, нібы нешта чуў у сабе. Пасля яго смерці стала зразумела, адкуль гэта ішло. Вайна, цяжкое раненне, а пасля — хвароба. Яна цягнула з яго сокі, падточвала здароўе, як чарвяк-крывасмок, чарвяк-прыліпала. Ён не любіў пра гэта ні з кім гаварыць. Але сам ён пра гэта ведаў!..



Незадоўга да смерці Кузьма Чорны запіша такія роспачныя словы: «Хто за мяне напіша мае раманы?..»

Ніхто не напіша, ніхто не напісаў.

Мележа таксама хвалявалі тыя ж трывогі.

16 верасня 1975 года ён запіша ў дзенніку:

«Надвор'е сёння зранку хмурнае. А пад вечар праяснілася. Усе дні найболып сонечна, неба сіняе. І цёпла, уночы ўжо холадна. Але я адчуваю сябе кепска. Стомленасць агульная і апатыя да ўсяго. У тым ліку да рамана. Не хочацца (і не можацца) нічога рабіць. Ляжыць мая кніга, якую чакаюць у «Полымі» (напаміналі).

Відаць, так і застанецца недапісанай мая абяцаная «Палеская хроніка».

Так яно і сталася. Уся хроніка, як яе замысліваў пісьменнік, засталася недапісаная. Але хроніка «Людзі на балоце», «Подых навальніцы», «Завеі, снежань…» была напісана.

У 1962 годзе паралельна з вучобай на аддзяленні журналістыкі я працаваў у «Калгаснай праўдзе». Газета тады выходзіла на дзвюх мовах — беларускай і рускай. Сярод журналістаў і не толькі журналістаў раптам прайшлі чуткі, што Іван Мележ напісаў раман пра вёску, пра Палессе. Каму ж, як не «Калгаснай праўдзе», расказаць пра гэта вяскоўцам, тым жа палешукам?.. Не памятаю ўжо, хто з рэдакцыі вёў перамовы з Іванам Паўлавічам. Тады раз у два тыдні, ці раз у месяц абавязкова рыхтавалася і выходзіла ў «калгаснай» газеце «Літаратурная старонка». І вось з'яўляецца мележаўская старонка з загалоўкам: «У беларускай літаратуры свята!». Фота пісьменніка, слова пра яго і раздзел з раману.

Сапраўды, гэта было свята беларускай літаратуры, свята чытачоў і, вядома ж, свята тых, хто рыхтаваў «старонку». Усяго адзін раздзел з рамана. Але за кожным сказам яго, за кожным словам чулася дыханне Палесся, яго глыбіннае жыццё, дагэтуль схаванае, невядомае, але такое цікавае, такое сапраўднае, такое народнае. І такое прыгожае — людзьмі, прыродай, мовай.

Гэта было свята беларускай літаратуры.

Для самога пісьменніка «Людзі на балоце» сталі той вехай, тым рубяжом, пасля якога ён упэўнена пайшоў далей сваёй няспешнай, цвёрдай хадой. «Няспешнай» — у сэнсе, паслядоўнай, немітуслівай, хоць сам пісьменнік і спяшаўся, вельмі спяшаўся.

1972 год. За раманы «Людзі на балоце» і «Подых навальніцы» Івану Мележу прысуджана Ленінская прэмія — самы высокі ў СССР знак прызнання дасягненняў чалавека на абранай ім ніве дзейнасці. Чаканне, спадзяванне, драматызм калізіяў, якія папярэднічалі прысуджэнню прэміі, засталіся ззаду. А «калізіі» гэтыя арганізоўвалі і падштурхоўвалі па зайздрасці, а можна сказаць, і па подласці, не хто іншыя, як сябры-паплечнікі па беларускім пісьменніцкім цэху… Але…

Вечарам таго дня, калі сталі вядомыя вынікі галасавання ў Камітэце па Ленінскіх прэміях, набіраю нумар мележаўскага тэлефона. Трубку здымае сам лаўрэат.

— Іван Паўлавіч, а ўсё-такі ёсць Бог на свеце!..

— Ёсць, Анатоль, ёсць. — Голас, як заўсёды, глухаваты, але мяккі, улагоджаны. З Богам, са справядлівасцю лягчэй дыхаецца, працэй гаворыцца!..

1974 год. Выдавецтва «Мастацкая літаратура». Выдавецтва маладое, сталага месца яшчэ не мае і цесніцца ў невялічкім цагляным дамку «пад касцёлам», паміж сталоўкай-рэстаранам «Папараць-кветка» і гатэлем «Мінск». Дырэктар выдавецтва Мікола Ткачоў і галоўны рэдактар, ён жа аўтар гэтых словаў, цесна суседнічаюць у адным пакоі — адно акно, два сталы, некалькі крэслаў. Дырэктара няма. Нястомны таптун, ён у вечных паходах — то гарсавет, то гаркам, то Дом друку… Выдавецтва маладое, але ўжо замахнулася на сто пяцьдзясят кніжак у год. А гэта грошы, папера, паліграфія… Гэта рэдактары, карэктары, машыністкі… Усім патрэбна месца для працы, усім патрэбна зарплата, усім патрэбны кватэры…

Заходзіць Іван Паўлавіч. У яго добры настрой. Нарэшце лёг на паліграфічныя машыны шосты — апошні — том Збору твораў. Гаворка пра кнігі, пра гэты том. Іван Паўлавіч сабраўся выходзіць з пакою і раптам, ужо ад дзвярэй:

— Ну вось, хутка будзеш намі кіраваць! — Гэта галоўнаму рэдактару. Іван Паўлавіч жартуе. Ён жартуе рэдка. Але сёння ў яго такі харошы дзень…

Праз некалькі дзён званок з ЦК КПБ. Звоніць Уладзімір Гніламёдаў, загадчык сектару літаратуры:

— Станіслаў Антонавіч Марцалеў хоча цябе бачыць.

Марцалеў — загадчык аддзелу культуры.

Першыя думка: нешта ў выдавецтве «не так». Але што «не так»? Здаецца ж, усё як трэба: планы вытрымліваюцца, кнігі выходзяць, і добрыя кнігі. Пытаюся ў Гніламёдава: «Не ведаеш, чаго кліча?». Партыйная дыпламатыя не дае збою, не дае права сказаць праўду. Гаворыць: «Не ведаю». Кажу Міколе Гаўрылавічу: так і так, клічуць у ЦК. Паварушыў рыжымі кусцістымі бровамі, неяк адчужана-спакойна, быццам нехаця, адказаў:

— Ат, схадзі…

Гаворка ў аддзеле культуры не зацягнулася.

— Як вы глядзіце на тое, каб пайсці на працу да нас? — Гэта словы да мяне, яны як абухам па галаве.

— Станіслаў Антонавіч, я чалавек канкрэтнай работы. Быў часопіс «Маладосць», цяпер выдавецтва, кнігі…

— У нас вельмі канкрэтная работа…

Вось і жарцікі, Іван Паўлавіч.

Як я зразумеў пазней, з ім раіліся, шукаючы кандыдатуру для працы ў сектары літаратуры. І у тым, што Анатоль Кудравец на некалькі гадоў трапіў на «вельмі канкрэтную работу», безумоўна, была заслуга і Івана Паўлавіча Мележа. Ягоны аўтарытэт у тыя гады — не толькі як пісьменніка, а як грамадскага дзеяча, як акумулятара і выразніка агульнанацыянальнай думкі быў выключна высокі.

…Ёсць фота 1972 года: Іван Мележ і Пётр Машэраў. Машэраў — першы сакратар ЦК КПБ, вышэйшая ўладная асоба рэспублікі, далікатна паклаўшы сваю руку на руку пісьменніка, нешта гаворыць. Мележ уважліва слухае. Па тварах відаць, што гаворка сур'ёзная. На жаль, ні аднаму, ні другому лёс не даў дажыць да часу, калі ў Беларусі з'явіўся шанец выйсці на шлях самастойнай дзяржавы. Кажу «на жаль», хоць нікому невядома, як кожны з іх паставіўся б да гэтага часу і як час паставіўся б да кожнага з іх…

ЗАПІСЫ

# ДЗЕВЯНОСТА ТРЭЦІ

## «ЗАНАТОЎКІ ДЛЯ СЯБЕ», ЗРОБЛЕНЫЯ Ў ЧАС ПАСЯДЖЭННЯЎ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

«Літаратурная Беларусь» працягвае друкаваць дзённікі народнага паэта Беларусі Ніла Гілевіча — ягоныя сведчанні пра працу ў Парламенце маладой і незалежнай краіны, пра наш лёсавызначальны 1993 год…

Гэтыя занатоўкі — не стэнаграфічныя запісы, а суб'ектыўныя ўражанні, ацэнкі і думкі колішняга дэпутата Вярхоўнага Савета, своеасаблівы адбітак-адлюстраванне ягонага стану душы ў той вельмі складаны і пераломны час.

Сваёй шчырай суб'ектыўнасцю яны найперш і цікавыя сучаснаму чытачу.



Ніл ГІЛЕВІЧ

**11-га чэрвеня**

«Рознае». Дэп. Сапронаў выказаў абурэнне, што на яго запыт міністру няма ніякага адказу. «Гэта дзяржава — ці што? Адно прадпрыемства спаганяе з другога плату ў валюце, не маючы ніякага юрыдычнага права! Ідзе нарастанне крытычнай масы! Скора выбухне!..

Дэп. Сумар — аб бясчынствах у сферы рынку збыту, аб бедах вытворцаў гароднінай прадукцыі.

Дэп. Зяленін: што за парадак і дысцыпліна? Зарэгістравана 232 дэпутаты, а ў зале — 156. Суседзі рэгіструюць адсутных! Трэба пазбавіць такіх дэпутатаў мандата і правесці ў акругах новыя выбары! Чаму пакрываем мы іх?

Пытанне «Аб статусе дзяржаўнай граніцы». Дэп. Бачароў зрабіў добры аргументаваны даклад. Прагаласавалі: за — 202. Упэўнена прайшло.

Цікава, як некаторыя пытанні праходзяць. Здавалася б, у пафасе многіх прамоўцаў: «Ніякіх граніц! Ні з Украінай, ні з Расіяй!». А вось жа прагаласавалі. Значыць, за «адмежаваную» Беларусь?..

**15-га чэрвеня.**

У «Розным» — дэп. Піскароў, іранічна кагосьці цытуе: «Вярхоўны Савет працуе добра?». Нельга так ацэньваць работу ВС — калі рэзка павышаюцца цэны, ідзе сацыяльнае расслаенне грамадства. «Даць сацыяльна-эканамічную інфармацыю», — гэта — да Шушкевіча і Кебіча.

Дэп. Вярцінскі А. І. даў адпор выдавецтву «Эрыдан» за яго праект Закона аб мовах. Зачытаў зварот гр. Саламонава ў абарону беларускай мовы.

Дэп. Лукашэнка: патрабуе неадкладнай справаздачы кіраўнікоў дзяржавы аб сацыяльна-эканамічным становішчы ў краіне. І прафсаюзаў таксама! І нельга спешна згортваць работу Сесіі! (А гэта правільна.)

Закон Аб дзяржаўнай службе (працяг абмеркавання).

Дэп. Заблоцкі. Зноў: у служачых трэба прымаць прысягу!

Паставілі на галасаванне. За — усяго 167. Завязалася спрэчка. За прысягу выступілі дэпутаты Вярцінскі (А. І.), Грыб. А дэп. Савіцкі супроць (іранічна-здзекліва). Дэп. Бабачонак: або здымайце законапраект зусім — або абавязкова з прысягай! Яшчэ раз заклікае галасаваць за прысягу Заблоцкі, спасылаецца на Гарыбальдзі: «Создали идеалы, теперь создадим гражданина» (мудра!). Зноў на галасаванне — і зноў недабор. Не праходзіць! Цікава! Не хочуць нашыя дэпутаты цырыманіялаў!

**16-га чэрвеня.**

Рознае. Дэп. Валчэцкі (з нашай Камісіі) зачытаў пастанову прафсаюза аб забастоўцы настаўнікаў з 1-га верасня, калі не павялічаць зарплату. (Правільна! Колькі можна цярпець жабрацкае становішча?)

Дэп. Какоўка зачытаў Зварот калектыва рабочых завода і гарадскога Савета дэпутатаў (г. Наваполацак). Б'е Кебіча за… мае час наведаць фестываль у Маладзечне, лікёра-гарэлачны завод і пахваліць прадукцыю, а на наш горад часу не мае.

Дэп. Баршчэўскі. Услед за Валчэцкім гаворыць пра мізэрную зарплату работнікаў адукацыі. Зарплата служачых у прамысловасці ўсё ж на 50 і нават на 70 працэнтаў большая, чым у настаўнікаў.

Дэп. Бойка — аб папярэджанні рабочых прафсаюзаў: патрабуюць адмяніць падаткі на дабавачную вартасць. Ужо на гэтай сесіі трэба разгледзець пытанне аб эканамічна-сацыяльным становішчы ў Рэспубліцы.

Аб прыватызацыйных чэках.

Дэп. Кудравец. «Прыхватызацыя» ідзе ўжо на мільярды, а не на мільёны. Трэба вярнуць усё да нуля назад — дзяржаве і тады пачаць спачатку — сумленна, па закону. (Гэта тысячу раз правільна! Толькі так!)

Дэп. Баршчэўскі і ўслед дэп. Трусаў: ні ў якім разе не прыватызаваць бібліятэкі і музеі! Гэта пярэчыць Закону аб культуры! Паставілі на галасаванне. За іх прапанову — 220. Брава! Хоць гэтыя аб'екты культуры пакінулі дзяржаве.

**17-га чэрвеня**

У «Розным». Дэп. Лябедзька: 240 дэпутатаў прагаласавалі за агульныя стратэгічныя (ядзерныя) сілы (СНД-1). Гэта не клопат пра нейтральную Беларусь. А дзе гарантыя?

Дэп. Пазьняк: без пэўных вызначальных палажэнняў прымаць Канстытуцыю няма сэнсу. БНФ — за парламенцкую рэспубліку! (Правільна! Толькі так! Толькі парламенцкая!).

**Аб праекце Канстытуцыі РБ.**

Дэп. Шаладонаў. Прапануем тры блокі законапраекта — тры варыянты: першы — на чале дзяржавы прэзідэнт, другі — улада прэзідэнта абмежаваная, трэці — дзяржава без прэзідэнта, парламенцкая рэспубліка. Прагаласавалі за кожны. Вынікі засведчылі адсутнасць адзінага погляду на форму вярхоўнага кіравання ў дзяржаве. І аднак жа блок першы (з моцным прэзідэнтам) набраў 213 галасоў, каб яшчэ 17 — і прайшоў бы. І мне страшнавата: на першую ролю вылезе антыбеларус — і Беларусі каюк! А нашай мове — перш за ўсё.

**29-га чэрвеня.**

Напачатку — сустрэча з Лехам Валенсам.

Натуральна, яму першаму і далі слова. Выказаўся з дыпламатычнай далікатнасцю, але і з яўнымі сімпатыямі да ўсходняй суседкі. Не сказаў бы, што ў зале важную асобу слухалі ўважліва і з дастатковай павагай. Калі ж сказаў, што «Салідарнасць» будзе супрацоўнічаць з Беларускім Народным Фронтам — у радах зашумелі яшчэ больш. Пайшлі галасы, і чуць гэта было непрыемна. Калі скончыў сваю надоўгую прамову — воплескі былі досыць рэдзенькія. Адным словам — не «герой часу».

Далей пайшло «Рознае». Дэп. Качан: Што далі рэспублікам суверэнітэты? Патокі крыві? Куды вы, Станіслаў Станіслававіч, нас вядзеце? У 17 век? У грамадстве — «растление»! А што робіцца з асвятленнем нашай гісторыі? Нацыянальнымі героямі становяцца здраднікі тыпу Вацлава Іваноўскага! Народ вам не даруе гэтага! Да якога часу вы, Станіслаў Станіслававіч, будзеце разбураць тое, што стварыў народ?

Дэп. Трафіменка злосна «пахваліў» Валенсу: той пацвердзіў ленінскі тэзіс, што дзяржавай можа кіраваць «кухарка». А ў нас з ленінскага тэзіса смяюцца.

Дэп. Холад. Аб крымінальных справах у Барысаве. Камісія ВС праверыла, а вынікі праверкі разглядзелі не на Прэзідыуме ВС, а ў Мінскім аблвыканкаме. Б'е Кебіча за патуранне «нягоднікам».

Дэп. Антончык. Мае артыкулы аб канкрэтных злачынствах. «Звязда» не друкуе («здымі прозвішча міністра»), «Народная газета» не друкуе (рэдактар Сярэдзіч зрабіў высновы, бо сам хоча стаць кампаньёнам будаўнікоў). Вось такія сур'ёзныя абвінавачванні. З такой высокай трыбуны.

Дэп. Грыб: мы, дэпутаты ВС, маем права на непасрэдную інфармацыю аб міжнародных падзеях, справах, а бяром яе з друку, у інтэрпрэтацыі журналістаў. Напрыклад, аб забастоўках у блізкіх суседзяў, аб заяве ўрада Расіі — што мы ведаем з дакладных крыніц? Трэба, каб у нас быў свой інфармацыйны цэнтр.

Дэп. Жукоўскі. Заяўляю пратэст супроць зневажання ветэранаў і гераізму народа ў Вялікай Айчыннай вайне. Іваноўскага рабіць героем — ганьба! А верх — апафеоз — гэтага — намер правесці вечар 50-годдзя Саюза Беларускай Моладзі. У савецкай Беларусі, іменна ў савецкай, былі створаны ўмовы для суверэннай дзяржавы! (Усё гэта — з вялікім-вялікім пафасам, нават большым, чым заўсёды).

**Пытанне аб Камітэце Дзяржаўнай Бяспекі: каму КДБ павінен належаць — Савету Міністраў ці Вярхоўнаму Савету?**

Дэп. Грыб за першае — за Савет Міністраў. (Вельмі кепска слухае зала. Старшыня дае званок за званком. Крыкі: «Галасуем!».)

Зноў разгарэліся спрэчкі. Дэп. Грыбанаў: ні ў якім разе нельга ў СМ! Заклікаю не галасаваць! Дэп. Майсееў: чаму Кебіч так цягне КДБ у СМ, пад сваё крыло? Задумаліся? Прашу вас устрымацца ад непрадуманага кроку! Дэп. Баршчэўскі: Хай вырашыць новы Вярхоўны Савет! У вас усё роўна не пройдзе! Гэта пытанне канстытуцыйнае. Толькі пасля прыняцця новай Канстытуцыі вырашыцца. Дэп. Навумчык: у 1991 годзе паводзіны старшыні КДБ Шыркоўскага былі годнымі. Вы ж не захацелі!.. Вы ж не захацелі!.. Вы ж!.. Вы!.. Дэп. Папоў: КДБ павінен быць падпарадкаваны Савету Міністраў! Урад адказвае за бяспеку дзяржавы! Як без КДБ ён забяспечыць? З юрыдычна-прававога пункту гледжання — толькі СМ! (у зале шум, крыкі, поўны хаос! Кузняцоў яўна не спраўляецца з залай. Трыбуну захапіў дэп. Папкоў. Крычыць: «Мікрафон выключылі за трыбунай! Мікрафон дайце!». Да Кузняцова падляцеў Пазьняк, нешта крычыць яму ў твар, што — не чую. Каля мікрафона на праходзе галяпуе Германчук: дайце звесткі! дайце звесткі аб.. ! Затым махнуў рукой і пайшоў на праводзіны Леха Валэнсы, недзе там жа і Шушкевіч. А тым часам прагаласавалі. Трох галасоў для перамогі Саўміна не хапіла. Засталося, як было.

**Пра падпісанне Шушкевічам Дагавора аб калектыўнай бяспецы.**

Старшыня ВС Шушкевіч тлумачыць, чаму да гэтага часу Дагавор не падпісаны. (Ой, зараз будзе гвалт! Ой, будзе!) Доказвае, чаму нам ні ў якім разе нельга падпісваць гэты Дагавор. У Таджыкістане ўжо загінула сто тысяч чалавек. Дык што — і мы ўцягнемся туды? (Добра гаворыць, пераканаўча. Вельмі пераканаўча!) Ва Узбекістане насельніцтва ў два разы больш, чым у Беларусі. А армія ў пяць разоў меншая).

Дэп. Ганчар: «Сем пятніц на тыдні. Абвергніце, што гэта не датычыць вас», «Ці маеце права кіраваць калектыўным органам?». (О, куды хапіў! Ды як бесцырымонна!)

Дэп. Гетц: Дзе карані — чаму пагаршаецца эканамічнае становішча?

Шушкевіч: Нельга адной нагой стаяць у чоўне прыватызацыі, а другой — у чоўне планавай эканамічнай сістэмы! Прыклад трэба браць з Польшчы! (Г. зн. усё прыватызаваць).

Дэп. Навумчык: Ці не лічыце вы неабходным зрабіць кадравыя перамены, калі ва Урадзе такі развал?

Шушкевіч: Не пра асобы гаворка, а пра канцэпцыі!

Дэп. Казлоў. Дамагаецца, каб Шушкевіч выказаў свае асабістыя адносіны да Дагавора.

Дэп. Новікаў (генерал). Што перашкаджае вам выслухаць ваенных, афіцэраў? Апошняя вашая сустрэча з вайскоўцамі была 2 студзеня 1992 г.

Шушкевіч. Армія павінна быць па-за палітыкай.

Дэп. Мачуленка. Вы падпісалі ці не падпісалі Дагавор? У вашым лісце ў СНД няма ні слова аб тым, што Вярхоўны Савет РБ — за далучэнне Беларусі да Дагавора аб калектыўнай бяспецы. (Усё гэта — з веданнем працэдуры, юрыдычнага боку справы. О, як зацята, як настырна і як ядавіта!).

Дэп. Мінько. Ці ўхваляеце вы ўдар ЗША па Іраку? (У зале рогат.)

Дэп. Сарокін (генерал). Чаму тут няма членаў Урада, калі абмяркоўваецца такое важнае пытанне? Дзе Кебіч, міністр Казлоўскі і іншыя?

Усе гавораць на расійскай мове, і Шушкевіч таксама — нібыта адпаведна пытанню. Хаця — а чаму? Хай яны пытаюцца па-расійску, а ты — сячы ім на дзяржаўнай беларускай!

Дэп. Камай. Можна думаць, што вы перагледзелі сваю пазіцыю, якую займалі ў Віскулях? Так ці не?

Шушкевіч. Жыццё ідзе наперад, і трэба ўлічваць новыя рэаліі і рабіць адпаведныя карэктывы.

Дэп. Лукашэнка. «Игра!» Ён прымае нас за студэнтаў! «Только двусторонние отношения!» — заяўляў у Віскулях.

(Ох, і кусаюць! Ох, і грызуць Старшыню! Пра павагу і гаворкі няма.)

Шушкевіч. Калі вы хочаце «на калені» — то я «на калені» не хачу! І каб Беларусь падала на калені — не хачу! Вядома, трэба ісці па шляху двухбаковых зго-

даў, хаця я не выключаю і іншых пагадненняў.

Дэп. Новік (Шушкевічу): Колькі праз Беларусь на захад прайшло зладзейства? Ці лічыце вы, што калі б мы не засцерагліся і дапусцілі, наш Урад пайшоў бы на здачу беларускай Дзяржаўнасці, нашай незалежнасці?

Шушкевіч. Не хачу, каб з майго дакладу рабіліся такія высновы…

(Рэпліка Станкевіча — напаўголаса, для блізкага акружэння: «Столькі выпіўшы, можна яшчэ і не так гаварыць!». О-о-о, усе ў адну дудку!)

Дэп. Скарынін. Здзекліва іранізуе, што Шушкевіч не ведае зместу Дагавора аб калектыўнай бяспецы. О, як прыпірае Станіслава да сцяны!

Дэп. Вайцянкоў: Паедзьце з Кебічам у Маскву, і праз два тыдні мы тут збярэмся і абгаворым сітуацыю. Бо сёння ў зале надта многа істэрыкі. Вы досыць паспешліва і нечакана для многіх праінфармавалі, а трэба спакойна, не так, як сёння… З'ездзіце пагаварыце ў Маскве…

**30-га чэрвеня.**

У «Розным». Дэп. Ніканчук — аб школьных падручніках: сітуацыя на сёння катасрафічная, вучыцца няма па чым.

Дэп. Звераў. Мільёны даляраў пускаюць на чорт ведае што, а на лекі дзецям няма і цэнта! (Малайчына, Звераў!)

Па дакладу С. С. Шушкеіча (працяг).

Дэп. Грыб. Вельмі настойліва — у абарону Дагавора аб калектыўнай бяспецы. (З унутраным напорам супраць Шушкевіча.)

Дэп. Слямнёў. Спакойна тлумачыць, што праблемы з падпісаннем Дагавора па сутнасці няма. Апраўдвае дзеянні Шушкевіча.

Дэп. Піскароў. Рэкамендуе Шушкевічу ехаць у Маскву да Ельцына, а не ў Злучаныя Штаты да Клінтана.

Дэп. Грынёў. Гаворыць спакойна, разважліва, — але! Як і Піскароў, рэкамендуе паехаць у Маскву, а не ў Амерыку.

Дэп. Скарынін. Патрабуе прагаласаваць за давер Шушкевічу па галоўных пытаннях: Дагавор, КДБ, Рэферэндум і інш.

Дэп. Зданевіч. Спакойна, але настойліва гне сваё (прыватызацыю). Дае ў косці і Шушкевічу — за непаслядоўнасць, за непадтрымку ў многіх пытаннях дэмакратаў.

Дэп. Сцепаненка (Шушкевічу): Ці ёсць у вас крэда? Лінія? Дзе паслядоўнасць? Што за «изворотливость»? Гэта ж палітычная спекуляцыя! Вы — як прафесійны акцёр! Перастаньце хітраваць! (Бросьте лукавить!) Патрабую: даклад Шушкевіча не прымаць! Паездку ў ЗША адмяніць! На чарговай сесіі паставіць пытанне аб даверы Шушкевічу!

(Даўно падазраваў, што гэты былы першы сакратар з Жыткавічаў належыць да ліку крайніх ачмурэлых. Помню, як ён не захацеў сустрэцца са сваім дэпутатам ВС Васілём Быкавым — ухіліўся, схаваўся ад гасцей. Прыехалі — у яго была нарада ў райкаме, і нас папрасілі пачакаць. А потым — няма! Знік! Сакратарка: «Наверное, куда-то срочно позвали…». Куды? У Мінск? Дык папрасі прабачэння — і госць-дэпутат зразумее…)

Дэп. Майсееў: Прэм'ер-міністра — неадкладна ў адстаўку!




Наш Савет здольны на разумныя рашэнні.

Дэп. Трусаў А. З чаго пачалося ў нас канфліктаванне? З пытання аб уласным войску. «Увесь урад сёння ж у адстаўку!»

Дэп. Дзейка (у працяг Трусава): Хто і сёння ў дзяржаўных крэслах? Усе тыя ж чыноўнікі антыбеларускай загартоўкі! (Малайчына, Дзейка!)

Дэп. Гілевіч. (Колькі гаварыў — увесь час бачыў, як генерал Піскароў вульгарна паводзіць сябе, ёрнічае, «лыбіцца», бо — за трыбунай «не той», і не тое, што ім трэба, кажа. Ды яшчэ і не на той мове.)

**1-га ліпеня**

У «Розным». Дэп. Даўлюд. Падобна, што дэпутаты Лукашэнка, Станкевіч, Скарынін і інш. страцілі чалавечае сумленне…

Дэп. Даўгалёў. (Ад групы «Згода».) Урад не здольны вырашаць найважныя праблемы, структуры — усе — камуністычных часоў. Змянілі вывескі — і толькі! (У зале шумяць — не падабаецца. А ён — ох і пляжыць. Ох і пляжыць!) Няма канстытуцыйнага ўрада! Ёсць прапановы па новых назначэннях.

Абмеркаванне даклада Шушкевіча (працяг).

Дэп. Грынёў. Трэба распрацаваць доўгатэрміновую эканамічную палітыку. Для гэтага — Шушкевічу сустрэцца з Ельцыным.

Шушкевіч прымае прапанову. Падтрымалі і галасаваннем.

Дэп. Трусаў. Адмяніць паездку афіцыйнай дэлегацыі начале з Шушкевічам у ЗША, а заняцца тут наспелымі праблемамі.

Дэпутата Вярцінскага А. І. заглушылі. Заглушаюць і дэп. Заблоцкага крыкуны з фракцыі «Беларусь».

Дэп. Карпенка паездку падтрымаў, але… з агаворкамі. Паездкі фармальныя, гасцявыя, з жонкамі і дзеткамі — навошта? Дайце праграму паездкі! (Даўно бачу, што Карпенку наш спікер нечым не задавальняе.)

Шушкевіч дакладвае, што ў праграме, але скомкана.

Дэп. Цярэшка. Заклікае: Будзем памяркоўнымі! Гэта не проста візіт старшыні ВС, а візіт кіраўніцтва дзяржавы. Прадугледжана падпісанне многіх пагадненняў. (У зале шумяць, крычаць, адчуваецца агульная непрыязнасць да ЗША.)

Дэп. Гетц. Чаму не ў кампетэнцыі ВС задума паездкі? Іменна Вярхоўны Савет павінен рашаць! (Крычыць.) Чаму іменна гэтыя ў дэлегацыі людзі?

Дэп. Мачуленка. Не трэба сёння галасаваць прапановы!

Дэп. Станкевіч. Уключыць у склад дэлегацыі міністра Краўчанку!

Шушкевіч упарціцца, стаіць на сваім.

Паставілі пытанне на галасаванне. Супроць паездкі ў ЗША — усяго 44 галасы. Дробны крыкун за спіной у мяне крычыць і крычыць — ну проста як дурнаватая вясковая баба. Мае права! Дык чаму ж не?

Дэп. Цумараў. Коратка і ясна — звольніць з пасадаў увесь Прэзідыум ВС — і не менш!

Дэп. Булахаў. Горача падтрымаў Цумарава.

Дэп. Ганчар. Зноў у атаку на Шушкевіча і Прэзідыум.

Дэп. Карпенка. Зноў пра маральны бок у справах дзяржаўных.

Спрэчкі скончыліся галасаваннем. За недавер Шушкевічу — 166, за давер — 27,астатнія, больш сотні, не галасавалі ніяк.

На перапынку члены прэзідыума сабраліся ў пакойчыку за сцэнай. Апрача Шушкевіча і Кузняцова былі Грыб, Слямнёў, Савіцкі, Кулічкоў, Леўчык, Сасноў, Гілевіч… угаворвалі Шушкевіча папрасіць прабачэння ў ВС за пераход у спрэчках на пярсоны, бо гэта, маўляў, на шкоду яму самому. Вядома, карэктнасць трэба захоўваць. Пасада!

**2-га ліпеня.**

У «Розным». Дэп. Кучынскі робіць «утык» Кебічу, што і ён вінаваты (а не толькі кіраўніцтва ВС) у знішчэнні зброі, якая патрэбная нашай рэспубліцы.

Дэп. Навумчык. Заўвага ў адрас рэдакцыйнай камісіі ВС — крытыка радыё і тэлебачання за тэндэнцыйны характар інфармацыі, за напады на тых, «што не хацелі ўдзельнічаць у камуністычным шабашы, у спробе камуністычнага перавароту».

Дэп. Герасюк. Падстаў крыўдзіцца на Шушкевіча шмат… Але — хто раскрадае дзяржаўныя, народныя багацці, хто шыкоўна будуецца? Кебіч, Кенік, Мясніковіч — не хопіць часу, каб назваць усіх.

Пытанне аб імянных прыватызацыйных чэках.

Дакладчык — старшыня камісіі Козік. Вельмі складанае, цяжкае пытанне. З дакладу мне стала ясна адно: для зладзюганаў тут магчымасці пажывіцца і нажыцца агромністыя. Пачаліся гарачыя, вострыя спрэчкі.

**6-га ліпеня.**

У «Розным». Дэп. Ціхіня. Абвінавачвае ва ўсім Шушкевіча і пагражае: сыходзь! (Нічога не дайшло да шаноўнага?)

Дэп. Гілевіч. Дзяржаўныя мужы (Кебіч і іншыя) не перадолелі псіхалогіі залежнасці, паслухмянасці, падпарадкавання Крамлю — захавалі звыклы стан душы, свядомасці: там, там разумнейшыя, мудрэйшыя, там ведаюць лепш, як павінна быць, як трэба, — там! Яны бяруць на сябе адказнасць — і нам так лепш, лягчэй і прасцей, зручней. Нашыя мужы не падняліся ў душы, у свядомасці, да самастойнасці, да незалежнасці, да самапачування гаспадарамі ў сваім доме, да ўсведамлення: «Мы вырашаем, як і што, мы самі! Мы і толькі мы! Мы бярэм на сябе ўсю адказнасць!».

Дэп. Майсееў. Выказаўся ў падтрымку Шушкевіча.

Дэп. Новік. Таксама абараняе пазіцыю Шушкевіча.

Дэп. Дзейка. Робіць запыт старшыні КДБ Шыркоўскаму (паўторна, ужо нядаўна рабіў): якімі фактамі валодае КДБ? «Патрабую поўнай інфармацыі!»

Дэп. Крыжаноўскі. Абвінавачвае былых партакратаў у ганебнай пазіцыі. Затым пра дэп. Станкевіча, які нібыта яму прыгразіў: «Мы тебя сделаем инвалидом» (У зале шум, незадавальненне. Відаць, Станкевіч гаварыў жартам).

Пытанне аб прыватызацыйных чэках.

Прэамбулу да размовы зрабіў Шушкевіч. Але дакладчык Козік папрасіў на некалькі гадзінаў адкласці абмеркаванне.

А ў гэтага, што ў мяне за спіною, не зачыняецца рот — зусім не помніць чалавек, дзе ён знаходзіцца: крычыць па ўсякім повадзе і без повада.

Пытанне аб пакаранні смерцю — уводзіць ці не ўводзіць у Беларусі гэту вышэйшую меру пакарання за цяжкае злачынства.

Старшыня Вярхоўнага Суда Каравай прапанаваў адмяніць смяротнае пакаранне за эканамічныя злачынствы (якія б цяжкія яны не былі).

Нечакана разгарэлася вялікая спрэчка, здаецца, ёй не будзе канца.

**7-га ліпеня.**

У «Розным». Дэп.Качан. Зноў той жа крык — і гэта ўжо сумна.

Адкладзенае пытанне аб прыватызацыйных чэках.

Дакладчык — Козік. Пачалася вострая гаворка — і законапраект сёння не прынялі.

**Пытанне аб Рэферэндуме.**

Дакладчык — старшыня Камісіі Леўчык. Фактычна даклада не зрабіў, сказаў дзве-тры фразы і — «Законапраект у вас у руках. Чытайце! Рашайце! Галасуйце!».

Дэп. Баршчэўскі. Гаворыць без паперкі. Як прафесійны прамоўца. Ды і голас пастаўлены. Пра рэферэндум — вельмі перакануўча.

Дэп. Навумчык. Б'е Шушкевіча за згодніцтва з партакратамі.

Дэп. Прывалаў. О, які баявіты палкоўнік! Цікава, хто яму напісаў гэты лямант? Колькі нецярпімасці, нянавісці, варожасці да… Тон — падкрэслена ваенны, загадны. Патрабуе не выносіць пытанне пра Дагавор аб Калектыўнай бяспецы на рэферэндум. Увогуле — рэзка супроць правядзення рэферэндуму. Калі ж і праводзіць, то: «Что делать с языком, на котором в Беларуси говорят 90 процентов населения?». О, які гадзюк! Крыві, крыві хочуць, таварышы палкоўнікі!..

Дэп. Сарокін, генерал. У тую ж дудку, што і палкоўнік. Адна нянавісць да Беларусі, да нашай незалежнасці, да нашай мовы.

Дэп. Казлоў. Нібыта спакойна і культурна. Спаслаўся на артыкул Н. Г. аб расійскай мове ў Беларусі, аб яе статусе па Канстытуцыі (мова міжнацыянальных зносінаў). «Гэта ўсё мы адрэгулюем! Мы павінны ставіць пытанне на рэферэндуме!»

Дэп. Зданевіч. Дае ў косці і Шушкевічу за балансаванне сярод правай большасці.

Дэп. Скарынін. Дубасіць Шушкевіча па ўсіх лініях. Пазіцыю спікера характарызуе як «верх цынізму». Гэта ў Шушкевіча — цынізм? Дзе?

Дэп. Пракопаў. Патрэбны неадкладныя выбары прэзідэнта!

Дэп. Какоўка. Здзекуецца з партакратычнай большасці ў зале.

Дэп. Пазьняк. Як і Какоўка, бязлітасна здзекуецца з пракамуністычнай бальшыні ў зале, але яшчэ больш здзекліва — з Шушкевіча. Вось гэта і ёсць мы, беларусы. Толькі так! Толькі есці адзін аднаго! Інакш мы не можам!

Дэп. Жукоўскі. О, які галасок! Толькі на плошчу! Толькі на мітынг! Стары ідэалагічны кадр з тых, што не турбуюцца — слухаюць іх людзі ці не слухаюць, ведае, што перакрычыць усіх. Поўныя вушы, поўная галава крыку, бухання ў мікрафон! І навошта так галяпаваць?

Дэп. Ганчар. Ад пачатку да канца — суцэльны здзек з Шушкевіча…

Дэп. Даўгалёў. О, як з'еў Ганчара! Аж запляскалі ў зале.

Шушкевіч. Заключнае слова. Адбіваецца, як можа. Амаль нічога не прызнае. І зноў сарваўся (у дачыненні да Ганчара).

Божа, як сумна, горка і брыдка! Як горка! Нішто не аб'яднае нас, нішто! Тое, што магло нас аб'яднаць — таго ў душах няма. Свяшчэнны доўг перад Беларуссю — г. зн. перад мовай і культурай Беларусі, перад Святым Духам Беларусі, — няма! Думаюць пра іншае — пра свае чыноўніцкія амбіцыі, пра сваю ўласную пыху…

Працяг будзе

ФРАГМЕНТЫ

# ТЭОРЫЯ ЗМОВЫ

## (УРЫВАК РАМАНА)

**Уладзіслаў АХРОМЕНКА**

— ...жны ці!.. кога шчэ было веце!..— стэрэафанічнае рэха пругка адбівалася ад старажытных замкавых муроў і шыфравала словы, што гарохам сыпаліся з бляшанага рэпрадуктара. — ...ігу рода ыць ах!..

Сухія галінкі грыфельна раскрэслівалі чыстае травеньскае неба. Памаранчавае сонейка плёскалася ў срэбных калюжынах. Манументальная спаруда, укрытая белым прасцірадлам, міжволі вабіла зрок таргачоўцаў, сабраных на замчышчы з нагоды святкавання Перамогі. Меланхалійная абыякавасць твараў абсалютна не адпавядала тэзісам:

— ...кожны трэці! ...такога яшчэ не было ў свеце!.. подзвігу народа жыць у вяках!..

Старшыня таргачоўскага выканкама Качан, немалады мужчына з дробнымі тупымі вушкамі, спрактыкавана гнаў тэкст у мікрафон. Рэпрадуктар паслухмяна азываўся гудкім вакзальным рэхам, кідаючы ў паветра зліплыя словы:

— ...ля сых ашых едзяў та ўдная ба!..

Пры фразе «Для ўсіх нашых суседзяў гэта сапраўдная бомба!» лядашчы ветэран, што стаяў каля загадкавай спаруды, бляўкнуў медалямі медна-нікелевага сплаву і голасам камандзіра расстрэльнага ўзвода скамандаваў:

— З Богам!..

Прасціралда надзьмулася пухіром і спаўзло паволі. Прысутныя адно захаўкалі.

— Ні х-х-храна сабе... — тупа прамовіў нехта.

З басейна, абліцаванага блакітнай сантэхнічнай кафляй, тырчэў магутны п’едэстал. На ім высілася сапраўдная пяцісоткілаграмовая авіябомба. Пёркі стабілізатара выторкваліся інфернальнымі рожкамі. Надпіс «За Беларусь!» на жахлівым боепрыпасе ззяў свежым лакам. Двое бетонных эсэсаўцаў, тыповыя Фрыц з Гансам, ваяўніча цэлілі са шмайсераў у пратакольны лозунг. Кампазіцыю давяршала масяндрковая шыльда, якая тлумачыла недасведчаным: такая ж самая бомба была на борце самалёта Мікалая Францавіча Гастэлы «ТБ-3ф» падчас апошняга гераічнага вылету.

— Наш раённы аддзел культуры заўсёды змагаўся за духоўнасць і культуру ў нашым раёне, — засведчыла Манда Іванаўна, мажная цётка ў аксамітнай спадніцы з нашытымі ружамі. — Усё ж такі Мікалай Гастэла — амаль наш зямляк, яго дзеда хрысцілі ў тутэйшым касцёле... Подзвіг народа несмяротны!

— Хацелі які танк ці самалёт паставіць, дык грошай не хапіла. Каб не шэфская дапамога нашых славянскіх братоў з вайсковай базы «Волга-Волга» — не было б у нашай сінявокай Беларусі гэтай бомбы... — старшыня райвыканкама Качан задуменна пачухаў патыліцу і пасунуўся з трыбуны, дэманструючы прысутным дупу, сплясканую старшынёўскім фатэлем. — Што б там некаторыя ні гаварылі, а без Расіі нам не жыць!



Цыцкастая малалетка з пірсінгам у пупе абсмактала бомбу хцівым позіркам, пасля чаго яшчэ больш непрыстойна аблізала вусны.

— Ваў! Як прыкольна! — ацаніла яна.

— От, Лалітка, як бы такую бомбу на Нью-Ёрк скінуць, так бы з фашыстаў-піндосаў усе кішкі і шкваркнулі! — павучальна патлумачыў малалетчын тата капітан Капейкін.

Іржавае рыпенне вентыля заглушыла наступныя словы расейскага афіцэра. З аўтаматных руляў Ганса і Фрыца шуганулі пругкія струмяні, і над бомбай сюррэалістычным німбам расквітнела вясёлка. Па кафляным дне фантана паволі распаўзалася калюжына.

Ад перасоўнага буфета, размешчанага пад руінамі замка каралевы Боны, цягнула апетытным куродымам мангалаў, і бутэлечнае ззянне на сталах натхняла на працяг святкавання Перамогі. Сусальным золатам блішчэў тульскі самавар. Змораны чаканнем народ з энтузіязмам пасунуўся да пачастунку.

Рэпрадуктар урачыста грымнуў:

*Усё вышэ, вышэ і вышэ*
*Страмім мы палёт нашых пціц!*

Неўзабаве пераможныя маршы змяніліся эстраднымі спевамі, папулярнымі ва ўстановах другой нацэначнай катэгорыі. Народ з аднаразовымі талеркамі і пластыкоўкамі атабарыўся пад старажытным мурам.

Шчарбатыя зубцы адкідалі на твары фантасмагарычныя цені. У контурах смецевых кантэйнераў угадваліся абрысы падбітых фашысцкіх танкаў. Колькі стомленых і ўчадзелых ужо адпачывалі ў аплылым замкавым рове.

— Таварышы, я ўсё разумею, — Качан распусціў вузел гальштука, нацурболіў поўную чарку і дэмакратычна пасунуўся да паспалітага людства. — Мой тата таксама працаваў у калгасе простым чалавекам, як і вы ўсе. Але ж тут у нас самы цэнтр Еўропы, так што піце акуратна, а то на мінулыя святы ажно трох пераможцаў «Дажынак» камбайнам пераехала...

Спякотнае сонца схавалася ў аблоках. Рулі шмайсераў спраўна палівалі бомбу. У вірлівай вадзе фантана куляліся пластыкоўкі, кружлялі абгорткі ад марозіва і папяровыя сцяжкі.

**«Амерыканцы пасылаюць фінанцы!» — позіркам пракаментаваў Качан загадчыцы Дома культуры. «Вядома ж, любіць іхнюю «Жыве Беларусь!» можна адно за грошы!»**

Народ паволі перацякаў ад помніка да буфета і ад буфета да помніка. У руінах касцёла хаваліся рамантычныя пары. Зухаватыя маладзёны апетытна прыкладаліся да піўных двухлітровікаў. Па Дняпры ў пеністай стужцы прайшла «ракета», і зеленкаватыя хвалі накацілі на пляж белым зубчастым шумам.

Малалетка Лаліта выцягнула пірсінг з пупка, зашпіліла яго ў вуха і ўзялася крытычна вывучаць у бакавым люстэрку выканкамаўскага «мерседэса» ўласны адбітак.

Капітан Капейкін жлукціў гарэлку з армейскай біклажкі і размаўляў з бомбай ласкавым расейскім матам. Ён абяцаў неадкладна распачаць палавую сувязь з самім боепрыпасам, з капітанам Гастэлам і яго маці, а таксама са старажытнымі замкамі, сінявокімі краінамі, заакіянскімі фраерамі і нават з пархатым валацужным сабакам, які недарэчна круціўся пад нагамі.

Манда Іванаўна згорбілася, акуратна адляпіла вільготную блузку ад разамлелых цыцак і добразычліва паглядзела на гіганцкі торт, толькі што выстаўлены на стол. Святочны бісквіт у выглядзе ДОТу з «Лініі Сталіна» аздабляў каліграфічны крэмавы надпіс «Ніхто не забыты, нішто не забытае!». Загадчыца Дома культуры пацэліла нажом у вафельны танк Т-34.

— Пятровіч, пайшлі торт есці! — Манда Іванаўна цягнула шыю, выглядаючы Качана.

— А як наконт на брудэршафт выпіць, за мілых дам? — імпэтна адрэагаваў старшыня райвыканкама.

Сонечны прамень праслізнуў у аблоках. Пляшкі на сталах успыхнулі шматабяцальнымі знічкамі. З сядзібы пад замчышчам данеслася інтымнае рохканне.

— Іванаўна, чуеш? — сентыментальна пасміхнуўся старшыня выканкама. — Гэта мой Аўка... Сумуе, падшыванец!

— Дагэтуль кабанчыка гадуеш? — Манда Іванаўна засяроджана кроіла кулінарна-патрыятычны шэдэўр.

— А то! Ты ж пры сваім Доме культуры калісь таксама свінчо трымала...

— А я вось думаю, неўзабаве павінна дырэктыва выйсці, якая ўсім дзяржслужачым прыватных кабанчыкаў забароніць... — на ілбе Манды Іванаўны прарэзалася трагічная зморшчына.

— А ты не думай. Я ўжо гадоў пятнаццаць, як не думаю. Рабі, што кажуць, і ўсё будзе добра. Бач, мерапрыемства ўдалося. Народу падабаецца. Усім, здаецца, дагадзілі.

— Ніхто не забыты, нішто не забытае! — па сітуацыі азвалася загадчыца Дома культуры.

— Куды там розным еўропам! — натхняўся Качан. — У нас тут, як у лепшых дамах, сама ведаеш чаго... Ну, давай, за стабільнасць!

Знянацку ад фантана данесліся стрыманыя мацюгі. Галовы прысутных лянотна павярнуліся да недарэчнага замяшальніцтва. Натоўп хаатычна завіраваў; так здараецца, калі падпітыя дзядзькі ловяць жвавага парсючка.

Качан глянуў убок помніка, сутаргава зглынуў торт і праліў гарэлку на гальштук.

На кафляны парапет помніка-фантана ўзбіўся нязграбны маладзён з экстрэмісцкім надпісам на футболцы. Яго анемічны твар выяўляў незадаволенасць жыццём і далікатнасць псіхікі. Гэта быў малады спецыяліст Скіргайла, летась размеркаваны з Менска. У Таргачове яго ўспрымалі як бяскрыўднага вар’ята: піша адраджэнскія вершыкі, з усімі гаворыць па-беларуску, але сацыяльна бяспечны, у стацыянар можна не выпраўляць. На дзяржаўным мерапрыемстве адраджэнец глядзеўся абсалютна недарэчна, як запаленая паходня ў бомбасховішчы. Двое разамлелых праваахоўнікаў нязлосна зганялі маладзёна наніз.

— Ніхто не мае права біць паэта! — імпэтна адбіваўся Скіргайла, і пырскі з аўтаматных руляў эсэсаўцаў ляцелі яму проста ў твар. — Спадары міліцыянты, вы з народам, ці як?

— Скіргайла, ну злазь, Хрыстом-Богам прашу! — амаль спачувальна папрасіў цыбаты сяржант. — Я ўсё разумею, сам беларускую школу канчаў. Толькі вось «спадаром» мяне абзываць не трэба... У нас у Таргачове за такое лыча чысцяць!

— Зноў гэты адраджэнец... — Качан са скрухай адставіў недапітую чарку. — І чаго яму яшчэ трэба? Не можа святкаваць, як нармальныя людзі?

— Напэўна, вершыкі хоча пачытаць... — здагадалася Манда Іванаўна і нечакана прапанавала: — А хай пачытае... Свята ж — яно для ўсіх!

Праваахоўнікі каля фантана паглядалі пытальна. Качан павагаўся, дапіў-такі чарку і няпэўна варухнуў пальцамі.

— Ну, хай чытае... Толькі, каб гэтага не было. Ну, самі ведаеце, чаго...

Адраджэнскі паэт выцягнуў з кішэні пакамечаную паперку, расправіў вузкай белай далонню.

— Шаноўнае спадарства, усе, каму неабыякавы лёс нашай Бацькаўшчыны і матчынай мовы, мусяць ведаць, што Мікалай Гастэла — не толькі Герой Савецкага Саюза, але і нашчадак слыннага шляхецкага роду! Яго прапрадзед браў удзел у паўстанні Каліноўскага, а больш далёкія продкі служылі Бацькаўшчыне пры двары каралевы Боны са Сфорцаў і нават самому Папежу Кліменту VII... Карацей, Жыве Беларусь!

Узнікла пачуццё ненатуральнасці, нібы ўсе разам апынуліся на вулічных кіназдымках.

«Амерыканцы пасылаюць фінанцы!» — позіркам пракаментаваў Качан загадчыцы Дома культуры. «Вядома ж, любіць іхнюю «Жыве Беларусь!» можна адно за грошы!» — спрактыкавана адказаў позірк.

Адраджэнскі паэт храбуснуў пальцам і кропнуў потам на аркуш.

*Дзе ж ты падзеўся, крылаты анёл?*
*У краі пануе рагаты казёл...*

Паветра наэлектрызавалася імгненна. Твары таргачоўцаў зліліся ў адну дрыготкую пляму. У несвядомым натоўпе нехта піскнуў і захлынуўся, прыкрыўшы далонькай рот.

Качан наліўся жоўцю, дробныя тупыя вушкі пачырванелі. Сітуацыя вымагала неадкладнага адлупу. Старшыня райвыканкама рашуча падняўся і браняносна паплыў праз натоўп, пракладаючы дарогу локцямі і жыватом. Манда Іванаўна сунулася следам і выбачалася:

— Вы ж самі ўсё бачыце... Прадаўся і адпрацоўвае!..

Народ індыферэнтна саступаў дарогу начальству, дэманструючы паказальную недатычнасць да скандалу.

Але дабрацца да злоснага адраджэнца не атрымалася...

[...]

— ...а за «казла» адкажаш! І за зрыў мерапрыемства! І за ўсё астатняе!.. — гупаў Качан у дзверы Скіргайлавага пакойчыка.

— Ну, чаго табе яшчэ трэба? — цяжка сіпела Манда Іванаўна. — Працай забяспечаны. Жытлом таксама. Вуліцы чыстыя. Батарэі гарачыя. Ёсць нават шанец што-небудзь у «Суперлато» выйграць!

Адраджэнец нярвова каўтаў піва, лыпаў на дзверы рахманымі, бы ў цяляці, вачыма і прыкідаў наступствы паэтычнай чытанкі.

Наступствы паабяцалі неадкладна.

— ...ведаеш, чым такія, як ты, канчаюць? — грымнуў старшыня выканкама. — Турмой! А пятнаццаць сутак ты ўжо зарабіў!

— ...хочаш па-беларуску гаварыць? Калі ласка, гэта ж не забаронена! — памяркоўна дэкларавала загадчыца Дома культуры. — Але ж нашто нашым людзям свята паганіць?

Скіргайла шморгнуў носам і незалежна выпрастаў спіну.

— «...хай пачуюць, як сэрца начамі аб радзімай старонцы баліць!..» — не ўтрымаўся малады спецыяліст ад пафаснага шэпту.

Качан з Мандой Іванаўнай яшчэ крыху патаўкліся за дзвярыма. Першы цікавіўся наяўнасцю ў Скіргайлы мазгоў, патрыятызму, сумлення і жадання жыць, як усе нармальныя людзі. Другая спрабавала вытлумачыць нястачу ўсіх гэтых якасцяў выключна несвядомасцю і маладосцю.

— Ён жа нацыяналізмам атручаны! — абураўся старшыня выканкама.

— Нічога, знойдзем супрацьяддзе! — супакойвала загадчыца Дома культуры.

Галасы падазрона хутка сцішыліся. Нанізе бразнулі дзверы — старажытная кераміка на паліцы і пустыя бутэлькі на падвоканні азваліся тужлівым ценьканнем. Малады спецыяліст дажлукціў пляшку, адкаркаваў наступную і ўключыў ноўтбук. Змоўніцкі скавытнуў вінчэстар. Лёгкі подых кулера зварухнуў на сцяне выявы Вітаўта Вялікага, Канстанціна Астрожскага, Станіслава Булак-Балаховіча і іншых герояў адраджэнскай міфалогіі. У чарупіне, што бялела за лядоўняй, з кулямётным грукатам закалаціўся скручаны кран.

Ноўтбук загрузіўся. Паэт блазнавата пасміхнуўся, заканэкціўся ў Сеціва і зайшоў на ўлюбёны рэсурс — www.ZalatyViek.vkl. Сайт гэты, змайстрачаны нейкім ананімным web-адраджэнцам, уражваў звышпрасунутай трохмернай графікай. Сярод лічбавых замкаў, ратушаў і бажніцаў блукалі шляхотныя маршалкі і вытанчаныя князёўны, мужныя ваяры і патрыятычныя ваўкалакі. Малады спецыяліст уцякаў сюды ці не штодня, каб адпачыць душою і целам.

На маніторы разгарнулася анімацыйная застаўка: геральдычны вершнік лунае на тле сцяга адпаведных колераў і памераў.

— Рэзервацыя... Гета... Проста Лукішкі нейкія... І адно быдла, быдла навокал!.. — дэпрэсіўна прашаптаў Скіргайла, але праз хвіліну забыўся на сваю крыўду; ён ужо перасяліўся ў ВКЛ.

Сінтэтычны голас у дынаміках пафасна абвесціў:



**Я ведаю, чаго хочуць такія, як ты. Зрабіць аборт маці Івана Жахлівага. Павесіць генерал-губернатара Мураўёва. Як мінімум...**

— ВКЛ у Еўропу! Жыве Беларусь!

Нечакана з-за дзвярэй данеслася:

— Ну, а што я гаварыў? Там ён! Усе чулі антыдзяржаўныя лозунгі? Скіргайла, адчыняй неадкладна! Не хочаш? Іванаўна, давай сюды слесара і ўчастковага. А я папільную, каб не ўцёк...

— Вось ты і дагуляўся... Вязень сумлення! — уздыхнула загадчыца ДК і паслухмяна зацокала абцасамі.

Маладзён уцягнуў голаў у плечы.

— І дзе я жыву! — з надрыўным трагізмам выдыхнуў ён. — Ну чаму я не нарадзіўся за часамі якога-небудзь Жыгімонта! Я б усё аддаў, каб жыць не ў цяперашнім быдлячым часе, а ў...

І тут над Скіргайлавым вухам зацурчэў зманлівы, бы ў русалкі, голас:

— Яснавяльможны спадар Скіргайла сапраўды гэтага хоча?

Лоб спадара імгненна спатнеў. Міжволі падумалася пра вышэйшыя сілы, паранармальныя з'явы, матэрыялізацыю волі і перамогу цуду над розумам.

Паэт адставіў пляшку і здзіўлена зірнуў у інтэрфэйс:

— Няўжо нарэшце на вышэйшы ўзровень выбіўся?

— Пакуль ты адраджэнец найніжэйшага ўзроўню, але з маёй дапамогай... — шматабяцальна прагучала над другім вухам.

— Здаецца, і не зашмат выпіў сёння... — прашапталі засмяглыя вусны.

Скіргайла зазірнуў пад стол, за лядоўню, у чарупіну і нават уліп вокам у рыльца пустой бутэлькі.

Калі ж ён узняў вочы, то пабачыў перад сабой незнаёмую панначку. Чорныя прамяні зіхцелі ў гламурнай фрызуры. Клятчастыя калготкі аблівалі літыя ногі. Гострыя цыцкі выторкваліся з-пад паўпразрыстай блузкі сярэднявечнымі сценабітнымі таранамі. Незнаёмка глядзелася ў інтэр'еры пакойчыка гэтак жа недарэчна, як карона Вітаўта Вялікага на галаве старшыні райвыканкама.

Паэтаў твар застыў у рэжыме стоп-кадра.

— Пі... пі... — хліпнуў ён горлам.

— Піва? — незнаёмка па-шалберску выцягнула з-пад скураной спадніцы пляшку «Аліварыі».

Нафарбаваны пазногаць лоўка шпокнуў коркам. Красуня гарэзліва падняла павекі, і яе сінія вочы заззялі спагадай і ласкай.

— Часу на роздум — шэсць з паловай хвілінаў. За гэты час ты мусіш выслухаць маю прапанову і даць адказ.

Скіргайла механічна каўтануў з рыльца — рэльефны кадык таргануўся над футболкай з экстрэмісцкім надпісам.

— Спадарыня... не ведаю, як вас зваць... па маю душу?.. Адтуль, з «ВКЛ»?

— Хай спадар не крыўдуе, але структура, якую я маю гонар прадстаўляць, нашмат мацнейшая. Падрабязнасці крыху пазней. Неўзабаве Манда Іванаўна дабудзіцца слесара і прывядзе яго сюды.

Пякельная красуня выцягнула з-пад прыполу доўгі хвост з эстэтным бухматым пэндзлікам. На стале зашаргацеў пергаментны аркуш з адбіткам казлінага капыта.

— «Кантракт на запродаж душы» — прачытаў Скіргайла, ушчыкнуў сябе за шчаку і чужым сіплым голасам удакладніў: — А што ўзамен?

— Тое, пра што мроіш: апынешся не ў цяперашнім быдлячым часе... Са свайго боку гарантую, — прафесійнай скарагаворкай менеджаркі пасыпала хвастатая панначка, — па-першае, магчымасць пакласці жыццё за Беларусь... а калі не, дык хаця б моцна яго скалечыць. Па-другое, шанец змяніць гістарычны шлях Бацькаўшчыны на свой розум.

Адраджэнец імгненна ўявіў сябе ў Віленскім замку, з гетманскай булавой у правай руцэ і скарынаўскай Бібліяй — у левай. Запродаж душы не падаўся яму празмернай платай за падобную перспектыву.

— Перакідацца ў вялікіх князёў, канцлераў, гетманаў, маршалкаў і гуманістаў катэгарычна забаронена, — ласкава папярэдзіла пякельная прыгажуня. — Але ў іх памагатых — калі ласка! Дык кім бы спадар Скіргайла хацеў стаць?

— Ну... тады паплечнікам якога-небудзь тытана Адраджэння! — апошняе слова паэт вымавіў з вялікай літары.

— Падобных вакансій мала.

— Хаця б самым дробненькім! — прашаптаў маладзён умольна.

— Дробненькім паплечнікам якога-небудзь вялікага адраджэнца? А вось гэта можна! — нечакана дазволіла сінявокая. — Раю адразу вызначыцца з мэтай.

У скіргайлавым мазгу нібы ўспыхнуў бікфордаў шнур, і фантанчык жарынак папоўз да дэтанатара. Паэт з асалодай прымружыўся, нібы цэліў праз снайперскую оптыку...

— Толькі не гэта! — энергічна запярэчыла красуня. — Я ведаю, чаго хочуць такія, як ты. Зрабіць аборт маці Івана Жахлівага. Павесіць генерал-губернатара Мураўёва. Як мінімум... Жаданні ўхвальныя, але не глабальныя. Ёсць вечныя святыні.

— Мова? Сымболіка? Жыве Беларусь? — аўтаматычна вылецела са Скіргайлы.

Панначка выразна агледзела пакойчык, аздоблены рыхтык кабіна нацыяналіста-дальнабойшчыка. Ад сцяжкоў, гербаў, вымпелаў і партрэтаў стракацела ўвачу.

— Для цябе і табе падобных галоўнае — лозунг, эмблема, цытата. Карацей — фетыш... І сымбаль твой — забыты краю родны.

— Анягож не! — паэт дурнавата хаўкнуў пашчэнкай.

Незнаёмка беспардонна села на стол побач з ноўтбукам і матлянула хвастом. Скіргайла неўпрыкмет слізгануў позіркам па ладных нагах у клятчастых калготках і пачырванеў. Хаця ён днямі і напісаў пранікнёны эратычны трыялет, але ж у душы заставаўся цнатлівым і несапсаваным маладзёнам.

— Ты чуў калі-небудзь пра Дзіду Лангіна? — з інтанацыямі спагадлівага следчага запыталася панначка. — Пра дзіду, якой рымскі цэнтурыён Гай Касій Лангін вызваліў на Галгофе ад пакутаў Збаўцу?

— Найвялікшая суперзброя цывілізаванага свету? — уразіўся адукаваны адраджэнец. — Дзіда, якая потым належала Язэпу Арымафейскаму, Святому Маўрыкію, рымскаму імператару Канстанціну, візантыйскаму Юстыніяну, уладару франкаў Карлу Вялікаму... ды іншым славутым героям?

— Усе гэтыя героі, маючы найвялікшую суперзброю цывілізаванага свету, разбівалі ворагаў ушчэнт! — падступна нагадала красуня.

— І што, я буду мець шанец здабыць яе і... пазабіваць усіх ворагаў беларушчыны?

— Гарантую.

Сапсаваны кран манатонна цурболіў у чарупіну. Уладары Вялікага Княства, асветнікі, святыя і інсургенты маркотна глядзелі з пацвілых сценаў. Бікфордаў шнур дагарэў — у Скіргайлавых мазгах выбухнула:

— Згодны!

— А гвалту мы дамо адпор! — панначка па-сяброўску абняла Скіргайлу.

Ад замочнай адтуліны данеслася зайздроснае шморганне.

— Вы толькі гляньце на яго! — прасіпеў Качан. — Ужо якуюсь дзеўку ў свой прытон зацягнуў... А што будзе, калі гэтыя нацыяналісты да ўлады дапнуцца? Прададуць нашу Сінявокую! Іванаўна, ну дзе ты там?!

У наманікюраных пальцах панначкі халодна бліснула тонкая голка.

— Я сама разумею, што гэта — сярэднявечнае цемрашальства, — сінявокая рухам амбулаторнай медсястры накалола палец Скіргайлы. — Але што паробіш — традыцыя...

Чырвоная кропля расплылася на пергаменце нязграбным павучком. Адраджэнец падзьмухаў на палец.

— Толькі каб нашыя беларускія літаратары пра кантракт не дазналіся... А то потым у сваіх livejournal'ах панапісваюць: маўляў, спадар Скіргайла замест таго, каб паэму пра Ефрасінню Полацкую пісаць, душу нячысцікам запрадаў...

— Гарантую абсалютную канфідэнцыяльнасць, — панначка абярэжна скруціла пергамент хвастом і сунула пад спадніцу.

— А калі потым і дазнаюцца... будуць адно шалёна зайздросціць! Ведаю я тых беларускіх літаратараў!

Па той бок дзвярэй пранізліва завішчала дрэль. Свярдзёлак бязлітасна знявечыў замок. На падлогу пасыпаліся трэскі.

Красуня хіжа ўхапіла паэтаву руку і позіркам паказала на манітор з вершнікам:

— Мо панясліся?

Прасвідраваны замок хрумснуў і дзінькнуў на падлогу. Качан з Мандой Іванаўнай застылі ў парозе з вылупленымі вачыма і разяўленымі ратамі...

Зламысны адраджэнец паволі распускаўся на дым. Ноўтбук, бы той пыласос, усмоктваў імклівы струменьчык. Раптам з камп'ютара выткнулася худая рука з бел-чырвона-белай бранзалеткай, схапіла пляшку «Аліварыі» і здзекліва растала на тле экрана. Нетутэйшая прашмандоўка ўвішна падхапіла ноўтбук і знікла з ім у чарупіне. Вадаправодныя трубы азваліся кароткім стэрэафанічным рохканнем.

— Ні х-х-храна сабе... — толькі і здолеў вымавіць выканкамаўскі старшыня.

ПЫТАННІ

# ТЭКСТЫ І ЛЮДЗІ

**На працягу лютага тэлефанаванні ды электронныя лісты нашых чытачоў пабілі рэкорд мінулых месяцаў. І амаль усе яны зводзіліся да наступных двух:**

1. *Як рэдакцыя «Літаратурнай Беларусі» ставіцца да «паэтычных шэдэўраў» галоўнага сенатара Беларусі Анатоля Рубінава? У прыватнасці, да такіх яго радкоў:*

*Ох, народ ты наш, народ,*
*Ох, народище!*
*Из полтысячи пород —*
*Одна породища!*

*Наш один — за их двух —*
*Только дай борща…*
*И раз в двадцать крепче дух…*
*Из туалетища.*

2. *Ці атрымаў афіцыйнае запрашэнне на 18-ты Мінскі кніжны кірмаш Саюз беларускіх пісьменнікаў, сярод членаў якога — найбольш слынных творцаў сучаснасці?*

На першы варыянт пытанняў, па-праўдзе, адказваць не хацелася: паколькі працытаванае не мае анічога агульнага з паэзіяй і нават не мае права агучвацца на старонках літаратурнага выдання. Аднак… Вось каментар старшыні Саюза беларускіх пісьменнікаў Алеся Пашкевіча: «Асабіста для мяне аніякай навіны ў з'яўленні на нашым небасхіле новай «паэтычнай зоркі» не было. Бо меў магчымасць чуць падобныя рыфмаманскія тэксты яшчэ ў 2003 годзе — калі спадар Рубінаў узначальваў Вышэйшую атэстацыйную камісію. Было каля трох сустрэчаў, падчас якіх акадэмік-фізік вымагаў адазваць абароненую мной доктарскую дысертацыю па беларускай літаратуры ды ў рэкламна-шчырых паўзах чытаў некаторыя свае вершы… На сустрэчы ж чацвёртай — на Прэзідыуме ВАКа — дазволіў сабе «павучыць» літаратуры ды літаратурнай навуцы і майго навуковага кансультанта Алега Антонавіча Лойку, вядомага пісьменніка і член-карэспандэнта НАН (светлая апошняму памяць)…

А да сотняў цяперашніх водгукаў на паэтычны дэбют Анатоля Рубінава ў газетах ды Сеціве цяжка ўжо штосьці-кольвек дадаць. Адно хочацца падкрэсліць: дзве яго непрафесійныя і нятанныя кнігі выдадзеныя на працягу аднаго года дзяржаўным выдавецтвам за кошт падаткаплацельшчыкаў. Выдадзеныя ў той час, калі лепшыя з лепшых і прафесіяналы з прафесіяналаў мусяць безвынікова чакаць сваіх выданняў гадамі і дзесяцігоддзямі! Высноваа напрошваецца адна: гэта злоўжыванне службовым становішчам ды «майстэрская» праява карупцыі адным з самых высокапастаўленых чыноўнікаў краіны».

Старшыня СБП адказаў і на пытанні другога плану:

«Што тычыцца афіцыйнага запрашэння на 18-ты Мінскі кніжны кірмаш афіцыйна зарэгістраванай старэйшай творчай арганізацыі Беларусі — Саюза беларускіх пісьменнікаў, — яго, запрашэння, як і пяць папярэдніх гадоў, не было. Калі не лічыць запрашэння ад ганаровага госця кірмашу — Нямеччыны, з боку Амбасады ФРГ...».




РОЗГАЛАС

# МІЖНАРОДНЫ КНІЖНЫ КІРМАШ І НАЦЫЯНАЛЬНАЯ ВЫДАВЕЦКА-КАМУНАЛЬНАЯ «КУХНЯ»

**З 9 па 13 лютага ў Мінскім НВЦ «Белэкспа» працаваў 18-ты Мінскі кніжны кірмаш. У ім узялі ўдзел прадстаўнікі 23 краінаў. Ганаровым госцем кірмашу стала Нямеччына.**




Акрамя «гарачага» адкрыцця выставы-кірмашу міністрам інфармацыі Алегам Пралясковскім і першым намеснікам кіраўніка адміністрацыі прэзідэнта Аляксандрам Радзьковым (не зважаючы на высокую Ды рэктыву, узнялі ў рабочы час кілішкі з гарэлкай), яшчэ адной «інтрыгуючай» навіной выставы былі кнігі Анатоля Рубінава, вершы з якіх ужо месяц актыўна абмяркоўваюцца ў інтэрнэце.

Раней традыцыйна прысутнае на кірмашы выдавецтва «Время», у якім выходзяць тамы Поўнага збора твораў Васіля Быкава, у якім з'явіліся кніга-білінгва Рыгора Барадуліна і кніга Уладзіміра Някляева, сёлета адмовілася ад удзелу у форуме.

«Прэзентацыя зборніка паэзіі Уладзімера Някляева «Акно» адбудзецца толькі пасля вызвалення аўтара», — паведаміў БелаПАН генеральны дырэктар выдавецтва «Время» Барыс Пастарнак. Прэзентацыю кнігі спачатку планавалася правесці, аднак Барыс Пастарнак адмовіўся ад удзелу ў выставе. Прычым сваё рашэнне ён назваў «хутчэй эмацыйным, чым рацыянальным». Ён паведаміў, што ў кнігу «Акно» ўвайшлі ў асноўным выбраныя вершы Някляева ў перакладзе на расійскую мову, а таксама яго арыгінальныя расійскамоўныя паэтычныя творы. Прадмову да зборніка напісаў паэт Яўген Еўтушэнка, які падтрымаў вылучэнне Някляева на пасаду прэзідэнта і назваў гэта «адказным грамадзянскім учынкам» паэта. А пасля арышту Някляева Еўтушэнка распачаў розныя дзеянні ў абарону беларускага паэта. Дырэктар маскоўскага выдавецтва мяркуе, што «неяк не па-людску праводзіць прэзентацыю кнігі Някляева ў некалькіх кіламетрах ад месца, дзе паэт сядзіць пад хатнім арыштам». Вось чаму, паводле яго слоў, прэзентацыя кнігі адбудзецца толькі пасля таго, як Някляеў выйдзе на свабоду і правядзе прэс-канферэнцыю.

Яшчэ адной гарачай навіной кірмашу-выставы сталі… «два метры» беларускай кнігі ад незалежных выдавецтваў, цікавасць да якіх, мяркуючы па прададзеных выданнях, перавышала інтарэс да афіцыйна-«рубінаўскіх» стэлажоў.

Пра свой супольны ўдзел у кірмашы абвесцілі восем партнёраў: выдавецтвы «Лімарыюс», «Логвінаў», «Галіяфы», выдавец Зміцер Колас, ГА «Саюз беларускіх пісьменнікаў», МГА «Згуртаванне беларусаў свету «Бацькаўшчына»», а таксама рэдакцыі часопісаў «Дзеяслоў», «ARCHE-пачатак», «pARTisan».

Супольна яны арэндавалі на кірмашы мінімальна магчымую выставачную прастору (2 квадратныя метры), але паспрабавалі сабраць з гэтага лапіка максімум «культурнага ўраджаю».

Партнёры стэнда выдаюць кнігі і часопісы на беларускай мове. Акцэнт робіцца на сучасную мастацкую і гістарычную літаратуру — як арыгінальную, так і перакладную. Ідэя аб'яднаць фінансы, высілкі ды імпэт дзеля прадстаўлення на кірмашы актуальнай беларускай кнігі належыць выдаўцу Марыне Шыбко, дырэктарцы выдавецтва «Лімарыюс». «Выдавецтва можа прадукаваць 20 кніг у год, але вартымі экспазіцыі на міжнародным узроўні палічыць толькі адну-дзве з іх. Гэта нармальна. І добрае рашэнне тут — аб'яднаныя стэнды», — адзначыла яна ў гутарцы «Новаму часу».

ГА «Саюз беларускіх пісьменнікаў» прэзентаваў на стэндзе заснаваную ў 2009 годзе серыю «Кнігарня пісьменніка» (выйшла 8 кніг, сярод іх — зборнікі прозы Уладзіміра Някляева, Віктара Казько, Дануты Бічэль).

МГА «Бацькаўшчына» прадставіла серыю кніг «Бібліятэка Бацькаўшчыны», якая была заснаваная ў 2004 годзе з мэтай папулярызацыі ведаў пра беларускую дыяспару. У серыі друкуюцца кнігі, прысвечаныя беларускай дыяспары (гісторыі і сучаснасці, падзеям і дзеячам, арганізацыям і друкаваным органам). З 2008 году друкуецца падсерыя «Людзі Беларусі», а з 2010 — падсерыя «Пераклады».

Аб'яднаны стэнд прыватных выдаўцоў насіў эксперыментальны характар. Праца двухметровага латка-выставы адбывалася ў рэжыме хэпенінгу з элементамі батлейкі, балагану і высокага мастацтва.

Абавязковы пункт праграмы — сустрэчы з найлепшымі аўтарамі выдавецтваў і часопісаў, сярод якіх былі Уладзімір Арлоў, Альгерд Бахарэвіч, Адам Глобус, Зміцер Вішнёў, Артур Клінаў, Валянцін Акудовіч, Валер Булгакаў, Арцём Кавалеўскі, Андрэй Хадановіч, Анатоль Вярцінскі, Алесь Разанаў ды іншыя літаратары і перакладчыкі.

ПРЭМІІ

# КОНКУРС ДРУГОЙ КНІГІ

**Паважаныя паэты і празаікі! Шаноўныя аўтары з ліку тых, хто ўжо апублікаваў дэбютныя зборнікі!**

Саюз беларускіх пісьменнікаў абвяшчае Конкурс на найлепшы рукапіс другой кнігі і ласкава запрашае дасылаць-перадаваць да 30 сакавіка на суд нашага журы свае паэтычныя ці празаічныя зборнікі — на наступныя адрасы: 220012, Мінск, вул. Кузьмы Чорнага, д. 31, пак. 906; e-mail: ubw.office@gmail.com.

Чаму менавіта Конкурс другой кнігі? Як сведчыць беларуская выдавецкая ды і быццёвая практыка, менавіта ў стварэнні і выданні другой кнігі літаратары маюць найбольшыя праблемы і клопат.

Удзел у Конкурсе могуць браць аўтары і аўтаркі самых розных мастацкіх кірункаў і стыляў. Перавага аддаецца літаратурнай моладзі.

Пераможца Конкурсу атрымае адпаведны падарунак — бясплатнае выданне сваёй кнігі!

**Прэсавая служба Саюза беларускіх пісьменнікаў**

ПРЭМІЯ

# ПРЭМІЯ «ДЭБЮТ» ІМЯ МАКСІМА БАГДАНОВІЧА

***Журы літаратурнай прэміі «Дэбют» імя Максіма Багдановіча, заснаванай Саюзам беларускіх пісьменнікаў і Беларускім ПЭН-Цэнтрам, мае гонар абвесціць шорт-ліст яе намінантаў.***

**Паэзія:** Ірына Бельская («…Бо ранак раніц», вершы, «Дзеяслоў», 2010, №1).

Ігар Кулікоў («Закон узаемнае невылечнасці», вершы, «Дзеяслоў», 2010, №4).

Віталь Рыжкоў («Дзверы, замкнёныя на ключы», Мінск: «Выдавец Логвінаў», 2010).

**Проза:** Сяргей Егарэйчанка («Аповесць пра чалавека, які не хацеў быць Богам», аповесць, «Літаратурная Беларусь» / «Новы час», кастрычнік 2010).

Анка Упала. («Інь-Ян. Іранічныя аповеды», «Дзеяслоў», 2010, №4).

Наталка Харытанюк («Трынаццаць гісторый пра мёртвага ката», Мінск: «Выдавец Логвінаў», 2010).

**Пераклад:** Антон Францішак Брыль (Дж. Р. Р. Толкін, «Каваль зь Вялікага Вуталу», Мінск: «Выдавец Логвінаў», 2010).

Наста Лабада (Тувэ Янсан, «Маленькія тролі і вялікая паводка», Мінск: «Выдавец Зміцер Колас», 2010).

Вольга Цьвірка (Мікаэль Ніемі, «Папулярная музыка зь Вітулы», Мінск: «Выдавец Логвінаў», 2010).

Уручэнне галоўных і заахвочвальных узнагародаў адбудзецца 21 сакавіка — у Сусветны дзень паэзіі.

Кіраўнік праекта «ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ» Алесь ПАШКЕВІЧ. Рэдактар Барыс САЧАНКА. Тэлефон для даведак: (8-017) 200-80-91.
Адрас электроннай пошты: sbp@tut.by

## 4 САКАВІКА, ПЯТНІЦА

### 1

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 00.15** Навіны.
**06.05, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.10** Зона Х.
**07.30, 11.55** Дзелавое жыццё.
**08.35** Сфера інтэрасаў.
**09.10** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**10.05** Серыял «Маршрут літасці» (Расія).
**10.50** Крымінальная меладрама «Зацьменне» (Расія-Украіна).
**11.40** Актуальнае інтэрв'ю.
**12.10** Меладрама «Фабрыка шчасця».
**14.05** «Школа доктара Камароўскага».
**14.30** Кулінарнае шоў «Кухар дома» (ЗША).
**15.15, 19.10** Навіны рэгіёна.
**15.35** Патрабуецца.
**15.50** Дэтэктыўны серыял «Жураў-2».
**16.50** Жаночае ток-шоў «Жыццё як жыццё».
**17.50** Крымінальная меладрама «Зацьменне» (Расія-Украіна).
**19.25** «КЕНО».
**19.30** «Зона Х». Вынікі тыдня.
**19.55** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**21.00** Панарама.
**21.45** Актуальнае інтэрв'ю.
**22.00** Дэтэктыў «Запомніце, мяне завуць Рагозін» (Расія).
**00.25** Дак. цыкл «Неразгаданая гісторыя».
**01.20** Дак. цыкл «Зброя будучыні» (ЗША).
**02.10** Дзень спорту.

### Н

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Жыць здарова!».
**10.20** «Мая жонка мяне прычаравала». Шматсерыйны фільм.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Смак».
**11.50** «Тата на ўсе рукі». Камедыйны серыял.
**12.20** «Дэтэктывы».
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Кантрольны закуп».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.50** «Зразумець. Прабачыць».
**15.25** «Хачу ведаць».
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**17.05** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Чакай мяне». Беларусь.
**18.55** «Хай кажуць».
**20.00** Час.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** «Што? Дзе? Калі?» у Беларусі. Вясновая серыя гульняў.
**22.35** Фільм «Іспанскі англійскі».
**00.55** «Наша Белараша».
**01.30** Начныя навіны.

### СТВ

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** «Апошні сакрэт Майстра». Серыял.
**09.30** «Аўтапанарама».
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.40** «Трымай мяне мацней». Тэленавэла.
**11.30** «Далёкія сваякі».
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Агонь кахання». Серыял.
**13.50** Фільм «Увага! Усім пастам…». СССР, 1985 г.
**15.30** «Хірамант». Серыял.
**16.50** «Рэпарцёрскія гісторыі».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** Ток-шоў «Лёс».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.35** Фільм «Да чорта каханне!». ЗША-Германія, 2003 г.
**22.55** «Гарачы лёд».
**23.25** «Відзьмо-невідзьмо». Агляд міжнароднага шоў-бізнэсу.
**00.10** Фільм «Крама «Імперыя». ЗША, 1995 г.
**01.40** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.

### ЛАД

**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Камедыйны серыял «Інтэрны».
**08.35** Час футболу.
**09.05** Дэтэктыўны серыял «Чыста англійскія забойствы» (Вялікабрытанія).
**10.00** Серыял «Ты маё жыццё».
**11.00** Меладрама «Асабістая справа суддзі Івановай» (СССР).
**12.35** Кінаспробы.
**12.55** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**13.50** Жывы гук.
**14.35** Гаспадар.
**15.05** Мультсерыял «Сямейка піратаў».
**15.30** Пазакласная гадзіна.
**15.45** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».
**16.35** Дэтэктыўны серыял «Чыста англійскія забойствы» (Вялікабрытанія).
**17.30** Усё аб бяспецы.
**18.00** Серыял «Ты маё жыццё».
**19.05** Дэтэктыў «Пятроўка, 38» (СССР).
**20.45** «Калыханка».
**21.00** Тэлебарометр.
**21.05** «Рэпарцёр «Беларускай часіны».
**21.55** «Бітва экстрасэнсаў».
**22.55** «Пра мастацтва».
**23.25** Дыялогі аб рыбалцы.
**23.50** Вольная барацьба. Міжнародны турнір на прызы А.Мядзведзя.

### РОССИЯ ТЕЛЕКАНАЛ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.20** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**10.10** «Мой срэбны шар».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** «Кулагін і партнёры».
**12.00** Тэлесерыял «Індус».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.25** «Рускі шакалад». Тэлесерыял.
**16.15** Тэлесерыял «Дворык».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.20** «Кулагін і партнёры».
**17.50** Тэлесерыял «Сустрэчная паласа».
**18.50** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.30** Фільм «Восеньскія клопаты». 2009 г.
**22.20** Фільм «Апошні загад генерала».
**00.10** Навіны - Беларусь.
**00.20** Фільм «Ехалі ў трамваі Ільф і Пятроў».

### НТВ

**06.05, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**06.10** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.35** Серыял «Таксістка».
**09.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.20** «І зноў добры дзень!».
**11.15** «Справа цёмная». Гістарычны дэтэктыў.
**12.05** «Да суду».
**13.35** «Суд прысяжных: галоўная справа».
**15.05** «Справа густу».
**15.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.25** Серыял «Вуліцы пабітых ліхтароў».
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.35** «Следства вялі…».
**20.35** «Надзвычайнае здарэнне. Расследаванне».
**21.05** «Нтвшнікі».
**22.15** Прэм'ера. Баявік «Святаяннік».
**00.00** Дэтэктыў «За межамі закона».

### EUROSPORT

**09.30** Лёгкая атлетыка.
**10.00, 17.45** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы ў памяшканні (Парыж, Францыя). Дзень 1-ы. Прамая трансляцыя.
**12.30** Лыжнае двааборства. Чэмпіянат свету ў Нарвегіі (Осла). Камандныя спаборніцтвы. HS 134.
**13.30** Лыжныя гонкі. Чэмпіянат свету ў Нарвегіі (Осла). Мужчыны. Эстафета. 4х10 км. Прамая трансляцыя.
**15.15** Скачкі з трампліна. Чэмпіянат свету ў Нарвегіі (Осла). HS 134.
**16.45** Лыжнае двааборства. Чэмпіянат свету ў Нарвегіі (Осла). Камандныя спаборніцтвы. 4х5 км. Прамая трансляцыя.
**20.00** Лыжныя гонкі. Чэмпіянат свету ў Нарвегіі (Осла). Мужчыны. Эстафета. 4х10 км.
**21.00, 01.15** Лыжнае двааборства. Чэмпіянат свету ў Нарвегіі (Осла). Камандныя спаборніцтвы. 4х5 км.
**22.00** Самыя моцныя людзі планеты. Гран-пры суперсерый (Гётэборг, Швецыя).
**23.00** Цімберспорт. Чэмпіянат свету ў Аўстрыі (Санкт-Йохан).
**23.30** Цімберспорт. Чэмпіянат свету ў Аўстрыі (Санкт-Йохан).
**00.00** Кіберспорт. Турнір Intel Extreme Masters (Кёльн, Германія).
**00.30** Экстрэмальны спорт. Freeride Spirit.
**00.45** Лыжныя гонкі. Чэмпіянат свету ў Нарвегіі (Осла). Мужчыны. Эстафета. 4х10 км.
**02.00** Лёгкая атлетыка.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў.
**07.20** Гарачы каментар (публіцыстычная праграма).
**07.30** «Эстонія, маё каханне», маст. фільм, 2004 г., Германія.
**09.05** «Бульбаны», мультсерыял: «Пчаляр».
**09.15** Праект «Будучыня» (навукова-папулярны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**09.40** «Школа на сanцапёку», серыял: 14 серыя .
**10.10** Форум: «Па-за законам».
**10.50** Рэпартэр (інфармацыйна-публіцыстычная праграма).
**11.20** Гісторыя пад знакам Пагоні (спазнавальная праграма).
**11.30** «Беспрацоўныя», дак. фільм, 2009 г., Польшча.
**12.00** Аб'ектыў.
**12.05** «Эстонія, маё каханне», маст. фільм, 2004 г., Германія.
**13.35** «Бульбаны», мультсерыял: «Пчаляр».
**13.45** Праект «Будучыня».
**14.10** «Школа на сanцапёку», серыял: 14 серыя.
**14.40** Форум: «Па-за законам».
**15.25** Рэпартэр (інфармацыйна-публіцыстычная праграма).
**15.50** Гісторыя пад знакам Пагоні (спазнавальная праграма).
**16.00** «Беспрацоўныя», дак. фільм, 2009 г., Польшча.
**16.35** «Зінаіда Бандарэнка», 2008 г., Беларусь.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Таямніца Сагалі», серыял: 1 серыя, 1996 г., Германія–Польшча.
**17.30** «Трэці афіцэр», дэтэктыўны серыял: 9 серыя.
**18.20** Форум: «Па-за законам».
**19.05** Маю права (прававая праграма).
**19.30** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.35** Гарачы каментар (публіцыстычная праграма).
**19.45** Калыханка для самых маленькіх.
**19.50** На колах (аўтамабільны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**20.25** «Генерал няскончанай вайны», дак. фільм, 2009 г., Беларусь.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.20** Сцяна, дак. цыкл.
**21.35** Госць «Белсату».
**21.50** Невядомая Беларусь: «Няскораная», дак. фільм, 2010 г., Беларусь: ч. 1.
**22.25** «Пітбуль», серыял: 1 серыя.
**23.10** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы (сатырычная праграма): «Метро».
**23.20** Аб'ектыў.
**23.45** Гарачы каментар (публіцыстычная праграма).

## 5 САКАВІКА, СУБОТА

### 1

**07.10** Мультфільм.
**07.30** Існасць.
**07.55** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**09.00, 12.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**09.10** Здароўе.
**09.45** Кулінарнае шоў «Кухар дома» (ЗША).
**10.15** Школа доктара Камароўскага.
**10.50** Камедыйны серыял «Сваты-3».
**12.10** Камедыйная меладрама «Вялікая змена» (СССР). 3-я серыя.
**13.40** Відэафільм АТН «Млын моды: Дэфіле ў бравурным стылі».
**14.10** Відэафільм АТН «Кандрат Крапіва. Таямніцы біяграфіі».
**14.35** «Зона Х». Вынікі тыдня.
**15.15** Навіны рэгіёна.
**15.35** Вакол планеты.
**16.15** Nota Bene.
**16.45** Дак. цыкл «Атлас «Дыскаверы» (ЗША).
**17.40** Відэафільм АТН «Трынаццаць галасоў Воранаўскага аргана» цыклу «Зямля беларуская».
**18.00** «Ваша лато».
**18.50** Латарэя «Пяцёрачка».
**19.25** «КЕНО».
**19.30** Святочны канцэрт, прысвечаны Дню міліцыі.
**21.00** Панарама.
**21.40** Фільм тыдня. Містычная драма «Ванільнае неба» (ЗША-Іспанія).
**00.15** Канцэрт лаўрэатаў прэміі «Залаты грамафон» (2007г.) (Расія) Частка 1-я.
**02.00** Дзень спорту.

### Н

**07.00** «Суботняя раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** Серыял «Мая выдатная няня».
**09.45** «Здароўе».
**10.35** «Смак».
**11.15** «Смак жыцця».
**12.20** «Разумніцы і разумнікі».
**13.05** Фільм «Лэсі».
**15.00** «Сведкі».
**16.00** Нашы навіны.
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** Прэм'ера. Фільм «Міхаіл Гарбачоў. Ён прыйшоў даць нам волю».
**18.00** «Адзін супраць усіх».
**19.00** «Я спяваю».
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** «Клуб Вясёлых і Знаходлівых». Вышэйшая ліга.
**23.10** Прэм'ера. Фільм «Котачка».

### СТВ

**06.35** «Анфас».
**06.50** «Адважны партны». Германія, 2008 г.
**07.50** Фільм «Да чорта каханне!». ЗША-Германія, 2003 г.
**09.35** «Давай паспрабуем?».
**10.30** «Мінск і мінчане».
**11.05** СТБ прадстаўляе: «КультУРА!».
**11.40** «Салдаты. Залатыя серыі».
**13.25** «Новыя падарожжы дылетанта».
**14.00** Фільм «Карчма на Пятніцкай». СССР, 1977 г.
**15.45** «Відзьмо-невідзьмо». Агляд міжнароднага шоў-бізнэсу.
**16.30** «24 гадзіны».
**16.45** «Наша справа».
**17.00** «Вялікі горад».
**17.35** Фільм «Дараваная нядзеля». Украіна, 2007 г.
**19.30** «24 гадзіны».
**20.00** «СТБ-спорт».
**20.10** «Зорны рынг».
**21.30** Фільм «Вердыкт за грошы». ЗША, 2003 г.
**23.55** Фільм «Ля тваіго парогу». ЗША, 2006 г.
**01.35** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.

### ЛАД

**07.20** Нашы тэсты.
**07.50** Усё аб бяспецы.
**08.15** Рэальны свет.
**08.50** Дыялогі аб рыбалцы.
**09.25** Жансавет.
**10.05** Дача здароўя.
**10.50** Тэлебарометр.
**10.55** Біятлон. Чэмпіянат свету-2011. Ханты-Мансійск. Спрынт. Мужчыны. Прамая трансляцыя.
**12.15** «Халі-галі». Скетч-шоў.
**12.35** «Ты і Я». Забаўляльнае ток-шоў (Расія).
**13.35** «Запал па культуры».
**14.20** Лабірынты: каханне ў жыцці і творчасці Максіма Багдановіча.
**14.55** Біятлон. Чэмпіянат свету-2011. Ханты-Мансійск. Спрынт. Жанчыны. Прамая трансляцыя.
**16.20** «Вясновы жарт з…». Гумарыстычная праграма (Расія).
**17.35** Эксцэнтрычная камедыя «Дыяментавая рука» (СССР).
**19.30** Конкурс-віктарына «Дзеці новага пакалення».
**20.25** Тэлебарометр.
**20.30** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ер-ліга. Манчэстэр Сіці - Уіган.
**22.25** Жывы гук.
**23.15** Канцэрт «Depeche Mode. Touring the Angel» (ЗША).
**00.50** Вольная барацьба. Міжнародны турнір на прызы А.Мядзведзя.

### РОССИЯ ТЕЛЕКАНАЛ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.15** «Пакой смеху».
**10.25** «Ранішняя пошта».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** Тэлесерыял «Дворык».
**12.05** Прэм'ера. «Другое пахаванне Сталіна». Дакументальны фільм.
**13.05** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**14.30** «Гарадок». Дайджэст. Забаўляльная праграма.
**15.00** Прэм'ера. «Руская без Расіі. Рускі француз Аляксандр Аляксееў». Дак. фільм.
**16.10** «Улада факту». Дак.фільм.
**17.20** «Суботні вечар».
**19.00** «Карціна свету».
**19.55** Надвор'е на тыдзень.
**20.30** Прэм'ера. «Крывое люстэрка».
**22.55** «Дзяўчаты».
**23.30** Фільм «Журботная дама чарвякоў».

### НТВ

**06.05, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**06.10** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.15** «Авіятары».
**08.45** «Выратавальнікі».
**09.20** «Іх норавы».
**10.15** Прэм'ера. Авантурная камедыя «Джэк з Пікадзілі».
**12.05** «Да суду».
**13.35** «Суд прысяжных: галоўная справа».
**15.10** «Справа густу».
**15.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.30** Серыял «Вуліцы пабітых ліхтароў».
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.30** «Прафесія-рэпарцёр».
**20.00** «Праграма Максімум».
**21.15** «Руская сенсацыі».
**22.20** «Ты не паверыш!».
**23.20** «Музычны рынг НТБ».

### EUROSPORT

**09.30** Экстрэмальны спорт. Freeride Spirit.
**09.45, 12.15** Лыжнае двааборства. Чэмпіянат свету ў Нарвегіі (Осла). Камандныя спаборніцтвы. 4х5 км.
**10.45** Біятлон. Чэмпіянат свету ў Расіі (Ханты-Мансійск). Мужчыны. Спрынт. Прамая трансляцыя.
**12.45** Лыжныя гонкі. Чэмпіянат свету ў Нарвегіі (Осла). Жанчыны. Мас-старт. 30 км вольным стылем. Прамая трансляцыя.
**14.30** Горныя лыжы. Кубак свету ў Італіі. Жанчыны. Хуткасны спуск.
**14.45** Біятлон. Чэмпіянат свету ў Расіі (Ханты-Мансійск). Жанчыны. Спрынт. Прамая трансляцыя.
**16.15, 00.30** Скачкі з трампліна. Чэмпіянат свету ў Нарвегіі (Осла). Камандныя спаборніцтвы. HS 134. Прамая трансляцыя.
**18.10** Снежныя выходны. Агляд. Часопіс.
**18.15** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы ў памяшканні (Парыж, Францыя). Дзень 2-і. Прамая трансляцыя.
**20.00** Біятлон. Чэмпіянат свету ў Расіі (Ханты-Мансійск). Жанчыны. Спрынт.
**21.00** Баявыя мастацтвы. Байцоўскі клуб. Janus Fight Night.
**23.00** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы ў памяшканні (Парыж, Францыя). Дзень 2-і.
**01.45** Біятлон. Чэмпіянат свету ў Расіі (Ханты-Мансійск). Мужчыны. Спрынт.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў.
**07.20** Гарачы каментар.
**07.30, 12.20** На колах.
**08.00** «Трэці афіцэр», дэтэктыўны серыял.
**08.50** «Таямніца Сагалі», серыял: 1 серыя.
**09.15** Калыханка для самых маленькіх.
**09.45, 00.00** Прыватная калекцыя.
**10.15** Маю права (прававая праграма).
**10.35** Невядомая Беларусь: «Няскораная», дак. фільм, 2010 г., Беларусь: ч. 1.
**11.10** Госць «Белсату».
**11.30** Асабісты капітал.
**11.45** «Генерал няскончанай вайны», дак. фільм, 2009 г., Беларусь.
**12.50** «Таямніца Сагалі», серыял: 1 серыя.
**13.15** Калыханка для самых маленькіх.
**13.45** Форум: «Па-за законам».
**14.30** «Эстонія, маё каханне», маст. фільм, 2004 г., Германія.
**16.10** «Ранча», серыял: 37 серыя.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Загадкі Мэрдака», серыял: 1 серыя.
**18.00** Незвычайнае жыццё звычайных людзей: «Прадаецца!», дак. фільм, Балгарыя.
**19.30** Гісторыя пад знакам Пагоні.
**19.45** Калыханка для самых маленькіх.
**19.55** Еўропа сёння.
**20.20** Вагон.
**20.30** «Россия XX век. Взгляд на власть», 2009 г., Расія.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.15** Два на два (тэледыскусія).
**21.45** Суботні сеанс: «Вінаватыя сэрцы», драма, 1999 г., ЗША.
**23.05** «Камунізм – гісторыя адной ілюзіі», дак. фільм, 2005 г., Германія. 3 серыя: «Камунізм: гісторыя адной ілюзіі».
**00.30** Навігатар.
**00.45** Аб'ектыў.

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ



## 6 САКАВІКА, НЯДЗЕЛА

### 1

**08.05** Мультфільмы.
**08.45** «Зброя». Цыкл дакументальны фільмаў (Беларусь).
**09.00, 12.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**09.10** «Арсенал».
**09.40** У свеце матораў.
**10.15** «Культурныя людзі».
**10.50** Камедыйны серыял «Сваты-3» ( Украіна).
**12.15** Камедыйная меладрама «Вялікая змена» (СССР). 4-я серыя, заключная.
**13.40** «Сінематэка».
**14.35** Зямельнае пытанне.
**15.15** Навіны рэгіёна.
**15.35** Відэафільм АТН «Млын моды. Auto Party у Берліне».
**16.00** Прэм'ера. Камедыя «Цётка Клава фон Гетэн» (Расія).
**18.05** Суперлато.
**19.20** Дакументальна-біяграфічны цыкл «Мая праўда» (Украіна).
**20.30** «Спортлато 5 з 36». Забаўляльнае шоў.
**20.50** «КЕНО».
**21.00** У цэнтры ўвагі.
**21.55** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Відэачасопіс.
**22.30** Прэм'ера. Меладрама «Пра любоff» (Расія).

### ОНТ

**07.00** АНТ прадстаўляе: «Нядзельная раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** Нядзельная пропаведзь.
**09.20** Камедыйны серыял «Мая выдатная няня», 2004 год.
**09.55** Фільм «Дайце кнігу скаргаў».
**11.35** АНТ прадстаўляе: «Ранішняя пошта».
**12.10** Прэм'ера. «Ія Савіна. Грымучая сумесь са званочкам».
**13.10** Камедыя «3 13 у 30».
**15.00** АНТ прадстаўляе: «Брэйн рынг».
**16.00** Нашы навіны.
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** АНТ прадстаўляе: «Давай ажэнімся!».
**17.25** АНТ прадстаўляе: «Эстрадны кактэйль».
**18.45** АНТ прадстаўляе: «Зачыстка».
**20.00** Контуры.
**21.05** Прэм'ера. «Вярніся, каханне!». Канцэрт Аляксандра Сярова.
**22.55** «Пражэктарпэрысхілтан».
**23.35** Камедыя «Скажы «так».

### СТВ

**05.50** «Кароль - жабяня». Германія, 2008 г.
**06.50** Фільм «Вердыкт за грошы». ЗША, 2003 г.
**09.00** СТБ прадстаўляе: «Гаворыць і паказвае Мінск».
**09.30** «Аўтапанарама».
**10.00** «Відавочнік прадстаўляе: самае смешнае».
**10.50** «Вялікі сняданак».
**11.30** «Салдаты. Залатыя серыі».
**13.15** «Добры дзень, доктар!».
**13.50** Фільм «Нядзельны тата». СССР, 1985 г.
**15.30** «Далёкія сваякі».
**15.40** Ток-шоў «Лёс».
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** «Праўда».
**17.30** Канцэрт М.Задорнава.
**19.00** «Аўтапанарама».
**19.30** «Тыдзень». Інфармацыйна-аналітычная праграма.
**20.40** Фільм «Жыццё, або нешта накшталт таго». ЗША, 2002 г.
**22.40** «Прафесійны бокс».
**23.40** Фільм «Па той бок неба». Мексіка, 2006 г.
**01.30** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.

### ЛАД

**07.30** Дабравест.
**07.55** Мір вашай хаце.
**08.10** Эксцэнтрычная камедыя «Дыяментавая рука» (СССР).
**10.00** Медычныя таямніцы.
**10.40** Медычныя таямніцы +.
**10.55** Біятлон. Чэмпіянат свету-2011. Ханты-Мансійск. Гонка праследу. Мужчыны. Прамая трансляцыя.
**11.40** Школа рамонту.
**12.45** Тэлебарометр.
**12.50** Кінаспробы.
**13.10** «Правы чалавека».
**13.25** Біятлон. Чэмпіянат свету-2011. Ханты-Мансійск. Гонка праследу. Жанчыны. Прамая трансляцыя.
**14.10** Нашы тэсты.
**14.45** Бухта капітанаў.
**15.25** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ерліга. Ліверпуль - Манчэстэр Юнайтэд. Прамая трансляцыя.
**17.30** Эксцэнтрычная камедыя «Тры жанчыны і мужчына» (Беларусь - Расія).
**19.20** Конкурс-віктарына «Дзеці новага пакалення».
**20.15** «Навіны надвор'я».
**20.40** Смешная часіна.
**21.15** Рамантычная драма «Рамэа + Джульета» (ЗША).
**23.25** Культасвет.
**23.55** Камедыйная меладрама «Даверся мужчыну» (ЗША).

### РОССИЯ

**07.00** «Крывое люстэрка».
**09.15** Фільм «Журботная дама чарвякоў».
**11.00** Весткі.
**11.15** «Сам сабе рэжысёр».
**12.05** Мультфільмы.
**12.20** Фільм «Мама выйшла замуж».
**14.00** Весткі.
**14.15** «Смехапанарама Яўгенія Петрасяна».
**14.45** «Рамантыка раманса».
**15.35** «Казачныя прыгажуні. Жыццё пасля славы». Дакументальны фільм.
**16.35** Фільм «Яна вас кахае?».
**18.15** Прэм'ера. «Смяяцца дазваляецца». Гумарыстычная праграма.
**20.00** Весткі.
**20.25** Прэм'ера. «Танцы з Зоркамі». Сезон - 2011.
**23.10** Фільм «Жанчына, не схільная да авантур».
**01.05** Творчы вечар Алены Якаўлевай.

### НТВ

**07.30** Мультфільм «Дзюймовачка».
**08.00** Сёння.
**08.15** «Іх норавы».
**09.25** «Ямо дома!».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Першая перадача». Аўтамабільная праграма.
**10.55** «Дачны адказ».
**12.05** Меладрама «Вакзал для дваіх».
**14.45** «І зноў добры дзень, дарагія жанчыны!» Спецвыпуск.
**15.50** Серыял «Мент у законе».
**19.00** Сёння.
**19.30** Серыял «Мент у законе».
**00.25** Крымінальная драма «Раўніна, што палае».

### EUROSPORT

**09.30** Біятлон. Чэмпіянат свету ў Расіі (Ханты-Мансійск). Мужчыны. Спрынт.
**10.45** Біятлон. Чэмпіянат свету ў Расіі (Ханты-Мансійск). Мужчыны. Гонка праследу. Прамая трансляцыя.
**11.45** Горныя лыжы. Кубак свету ў Італіі. Жанчыны. Супергігант. Прамая трансляцыя.
**13.15** Біятлон. Чэмпіянат свету ў Расіі (Ханты-Мансійск). Жанчыны. Гонка праследу. Прамая трансляцыя.
**14.15** Лыжныя гонкі. Чэмпіянат свету ў Нарвегіі (Осла). Мужчыны. Мас-старт. 50 км вольным стылем. Прамая трансляцыя.
**16.25** Снежны выходны. Агляд. Часопіс.
**16.30** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы ў памяшканні (Парыж, Францыя). Дзень 3-і. Прамая трансляцыя.
**19.00** Веласпорт. Велагонка Парыж-Ніца. Пралог.
**20.00** Лыжныя гонкі. Чэмпіянат свету ў Нарвегіі (Осла). Мужчыны. Мас-старт. 50 км вольным стылем.
**21.00** Біятлон. Чэмпіянат свету ў Расіі (Ханты-Мансійск). Мужчыны. Гонка праследу.
**21.45** Біятлон. Чэмпіянат свету ў Расіі (Ханты-Мансійск). Жанчыны. Гонка праследу.
**22.30** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы ў памяшканні (Парыж, Францыя). Дзень 3-і.
**00.00** Веласпорт. Велагонка Парыж-Ніца. Пралог.
**01.00** Біятлон. Чэмпіянат свету ў Расіі (Ханты-Мансійск). Жанчыны. Гонка праследу.
**01.30** Лыжныя гонкі. Чэмпіянат свету ў Нарвегіі (Осла). Мужчыны. Мас-старт. 50 км вольным стылем.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў.
**07.10** Еўропа сёння.
**07.40** «Загадкі Мэрдака», дэтэктыўны серыял: 1 серыя.
**08.25** «Зорны пірат», серыял: 5 серыя.
**08.55** Калыханка для самых маленькіх.
**09.20** «Россия XX век. Взгляд на власть», 2009 г., Расія.
**09.50** «Камунізм – гісторыя адной ілюзіі», дак. фільм, 2005 г., Германія. 3 серыя: «Камунізм: гісторыя адной ілюзіі».
**10.40** Незвычайнае жыццё звычайных людзей: «Прадаецца!», дак. фільм, 2008 г., Балгарыя.
**12.10** Два на два (тэледыскусія).
**12.40** Еўропа сёння.
**13.10** «Зорны пірат», серыял: 5 серыя.
**13.35** Калыханка для самых маленькіх.
**14.05** «Вінаватыя сэрцы», драма, 1999 г., ЗША.
**15.30** Гісторыя пад знакам Пагоні.
**15.45** Навігатар.
**16.00** «Ранча», серыял: 38 серыя.
**17.00** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**17.15** «Час гонару», серыял: 19 серыя.
**18.05** Дакументальная гадзіна: «Сальвадор Алендэ», дак. фільм, 2004 г., Чылі.
**19.45** Калыханка для самых маленькіх.
**19.55** Гісторыя пад знакам Пагон.
**20.05** ПраСвет.
**20.30** Басанож па свеце: «Вануату».
**21.00** Тыдзень у «Аб'ектыве».
**21.30** Эксперт.
**22.00** Фільматэка майстроў: «Праўдзівая рамантыка», маст. фільм, 1993 г., ЗША.
**23.45** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы: «Глабальнае пацяпленне».
**23.55** Тыдзень у «Аб'ектыве».

---

# Шаноўныя чытачы!

**На жаль газету «Новы час» не магчыма купіць у шапіках або крамах. Няма нас і ў дзяржаўнай сістэме распаўсюду Белпошты. Але можна падпісацца на «Новы час» і кожны тыдзень атрымліваць газету.**

Падпісацца можна на любую колькасць месяцаў, аформіўшы банкаўскі ці паштовы перавод і накіраваўшы копію плацёжнага дакументу на адрас рэдакцыі. (Глядзіце ўзоры квітанцый). Нашы рэквізіты: **рахунак 3012741108019 у аддзяленні №539 ОАО «Белінвестбанк», код банка 153100739. Адрас банка: 220004, Мінск, вул. Калектарная, 11. Адрас рэдакцыі: 220113, Мінск, вул. Мележа, 1, офіс 1234.**

Акрамя таго падпісацца можна ў нашых рэгіянальных прадстаўнікоў:

Магілёў: (8 029) 604 34 57, Юрый.
Віцебск: (8 029) 308 49 78, Юрый.
Масты: (8 029) 138 79 94, Дзмітрый.
Мінск: (8 029) 968 79 73, Аляксей,
(8 029) 178 31 68, Вольга

БЕЛПОЧТА

ф. ПС 112

**ЭЛЕКТРОННЫЙ ДЕНЕЖНЫЙ ПЕРЕВОД**

№ ______ (вход, по карте отправки)

ВЫРУЧКА ☐ НАЛОЖЕННЫЙ ПЛАТЕЖ ☐

(сумма цифрами) (сумма прописью)

ПОЛУЧАТЕЛЬ___ Г-та «Новы час», р/с 3012741108019 отд. №539 ОАО «Белинвестбанк», код 153100739, УНН 190790926

КУДА 220004, г. Минск, ул. Коллекторная, 11
почтовый код, адрес получателя, телефон)

ОТПРАВИТЕЛЬ ____________
почтовый код, адрес отправителя, телефон)

АДРЕС ____________

Доставка ☐ уведомление ☐ простое ☐ заказное ☐ электронное

(назначение платежа)

(письменное сообщение)

Отметки отделения почтовой связи места приема:
(почтовый код, оттиск контрольно-переводной печати, кол. шт.)
№ перевода по ф. 5 ____________
Время приема ______ ч. _____ мин.
Подпись

## Паважаныя чытачы!

З 1 студзеня 2011 года падпісны кошт аднаго нумара газеты 750 руб. аднаго месяца — 3000 руб.

«Новы час» запрашае да супрацоўніцтва распаўсюджвальнікаў газеты ва ўсіх рэгіёнах Беларусі.

**Даведка па тэл: (8 029) 651 21 12.**

КВИТАНЦИЯ

ЧИУП «Час навінаў»
(получатель платежа)
отд. №539 ОАО «Белинвестбанк»
(наименование банка)

Счет получателя 3012741108019 Лицевой счет Код 739

УНП* 190790926

(фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|
| Период подписки указывает абонент | | | | |
| | | | | |

Плательщик

Пеня ________
Кассир Всего ________

**Для тых, хто прымае рашэнні!**

НОВЫ ЧАС

**www.novychas.org**

СКАНДАЛ

# ЧАГО ЗАСЛУГОЎВАЕ ЛУІ СЕЛІН?

Алег НОВІКАЎ

**Французская інтэлектуальная эліта перасварылася з-за пытання, адзначаць ці не юбілей смерці класіка французскай літаратуры, які супрацоўнічаў з гітлераўцамі.**



«НЧ» ужо пісаў пра тое, што напачатку года яўрэйскія арганізацыі Францыі забілі трывогу. 19 студзеня Аб'яднанне нашчадкаў дэпартаваных з Францыі яўрэяў патрабавала выключыць з календара памятных культурных дат 1 ліпеня. У гэты дзень Міністэрства культуры збіралася адсвяткаваць 50-ю гадавіну смерці Луі-Фердынанда Селіна.

Луі-Фердынанд Селін (сапраўднае прозвішча Дзетуш) — французскі пісьменнік, лекар па адукацыі. У 1932 годзе выйшаў яго раман «Падарожжа на край ночы» (Voyage au bout de la nuit), які меў аглушальны поспех і быў адразу ж перакладзены практычна на ўсе мовы свету. Аднак далейшы лёс пісьменніка склаўся трагічна. Апублікаваныя на мяжы 1930–1940-х гадоў антысеміцкія памфлеты замацавалі за Селінам рэпутацыю антысеміта, расіста і чалавеканенавісніка. У канцы другой сусветнай вайны абвінавачаны ў супрацоўніцтве з акупацыйнымі ўладамі пісьменнік быў змушаны бегчы за мяжу. У Даніі яго змясцілі ў турму. У 1951 годзе па амністыі ён вярнуўся ў Францыю і фактычна да канца жыцця практыкаваў у якасці лекара для бедных.

Пра Селіна зноў пачалі казаць літаральна напярэдадні ягонай смерці, калі выйшла два тамы яго аўтабіяграфічнай трылогіі «З замка ў замак» і «Поўнач». Апошняя частка трылогіі выйшла праз восем гадоў пасля смерці пісьменніка, у 1969 годзе. А ў 1970-я, калі перажывала бум андэграўндная літаратура, яе флагман — Чарльз Букоўскі — назваў Селіна сваім настаўнікам. Па тыражах Селін уваходзіць у тройку самых папулярных французскіх аўтараў XX стагоддзя. У гэтым плане ідэя адсвяткаваць гадавіну смерці пісьменніка, верагодна, падавалася чыноўнікам Мінкульта цалкам лагічнай. Аднак тут умяшалася грамадскасць.

21 студзеня з-за пратэстаў Мінкультуры адмовілася ад ідэі святкавання і нават прыбрала прозвішча Селіна са спісу славутых асоб Францыі. Міністр культуры заявіў, што перад тым, як прыняць рашэнне, спецыяльна пазнаёміўся з антысеміцкімі творамі Селіна і ў выніку вырашыў, што такога гонару той не варты.

Аднак справа Селіна аказалася больш складанай. У яго абарону выступіў шэраг вядомых культурных асобаў, якіх цяжка назваць антысемітамі або аматарамі рэвізіі гісторыі. Сярод іх, напрыклад, Клод Ланцман, аўтар дакументальнага фільму «Халакост». Філіп Салерс, вядомы сваімі ліберальнымі поглядамі пісьменнік. Каментуючы скандал вакол Селіна, ён згадаў словы Хемінгуэя пра тое, што «ў цяжкія часы за ўсё вінаватымі робяць пісьменнікаў». У дадатак Салерс абвінавацію міністра культуры ў цэнзуры. Супраць рашэння міністэрства выступіў вядомы французскі інтэлектуал яўрэйскага паходжання Бернар-Анры Леві. Ён кажа, што абсалютна нармальна адначасова быць вялікім пісьменнікам і абсалютным парсюком.

Выступы вядомых культурных персанажаў у падтрымку Селіна працягнулі скандал вакол брашуры Стэфана Федэрыка Эсэля. У мінулым годзе Эсэль, былы ўдзельнік антыфашысцкага супраціву і вязень канцлагеру, у свае 93 гады выдаў зборнік эсэ, які стаў выдавецкім феноменам. Ён напісаў пра тое, што чалавек павінен у любыя часы выступаць за свабоду і справядлівасць. Зборнік вытрымаў тры выданні. Усяго за 10 тыдняў было прададзенае 950 000 экземпляраў. Гэта паставіла Эсэля ў шэраг вядучых французскіх інтэлектуалаў і выклікала цікавасць да ягоных думак наконт іншых праблем сучаснасці. Стала шырока вядомая і ягоная пазіцыя адносна Ізраілю. Хаця Эсэль — француз яўрэйскага паходжання, ён крытыкуе палітыку Ізраіля і патрабуе эвакуацыі яўрэйскіх калоній з Усходняга Берагу ракі Іардан.

Частка яўрэйскай грамады абвінаваціла Эсэля ў антысемітызме. Не паспеў скандал заціхнуць, як тэма зноў вярнулася на старонкі друку дзякуючы Селіну.

Між тым, не менш арыгінальную думку ў абарону Селіна прапанаваў пісьменнік Фабрыс Лукіні, французскі акцёр тэатра і кіно. Ён літаральна заканспектаваў усю літаратурную спадчыну Селіна і сцвярджае, што пазітыву там значна больш, чым негатыву. Так, Селін быў антысемітам. Аднак адначасова ў сваіх творах ён выступаў крытыкам мілітарызму, каланіяльнай сістэмы, бяздушнай капіталістычнай эксплуатацыі. Што тычыцца антысеміцкіх тырад, то яны, па словах Лукіні, былі хутчэй выкліканы пацыфізмам. Ён — ветэран першай сусветнай вайны — баяўся, што яўрэйскія эмігранты з Германіі, якія прыбылі ў Францыю з-за пераследу нацыстаў, падштурхнуць яўрэйскую грамаду да патрабавання вайны з Берлінам.

З'явіўся тэзіс пра тое, што літаратурны авангардны стыль, з дапамогай якога Селін пісаў свае антысеміцкія пракламацыі, хутчэй кампраметаваў нацыстаў у вачах сярэдняга француза. Вядома пра канфлікт паміж Селінам і супрацоўнікам акупацыйнай адміністрацыі, які называў творы Луі-Фердынанда не агітацыяй, а «істэрыкай».

Якімі б добрымі матывамі ні кіраваліся абаронцы Селіна, іх тэорыі сталі легальнай глебай для адкрытых антысеміцкіх выступаў. Так, для вядомага пісьменніка Марка-Эдуарда Наба рашэнне міністра культуры — гэта выкананне замовы «асобнай групы грамадзян».

Самае цікавае, што ва ўсёй гэтай вакханаліі амаль не бяруць удзел правыя радыкалы, якія доўгі час спекулявалі на тэме «яўрэйскага лобі». Актыўна абараняе Селіна хіба што група Бруна Гальніша з Нацыянальнага Фронту. Гальнішу і яго сябрам таксама не падабаецца, што ў гэтым годзе Мінкультуры збіраецца адзначаць 50-я ўгодкі смерці Франца Амара Фанана — ідэолага руху за незалежнасць Алжыру.

Аднак дэкларацыі Гальніша не адлюстроўваюць пазіцыю ўсяго Нацыянальнага Фронту, новым лідарам якога з'яўляецца Марына Ле Пэн. Яна кажа, што «нельга забываць злачынстваў нямецкіх салдат, якія забівалі нашых дзядоў».

Фігурантам справы Селіна нечакана аказаўся прэзідэнт краіны. Нікаля Сарказі неяк прызнаўся, што Селін — яго ўлюбёны пісьменнік. Увогуле, Сарказі і літаратура — гэта асобная тэма. У французскіх інтэлігентаў шмат анекдотаў на гэты конт. Аднак, што тычыцца Селіна, то тут усё, здаецца, праўда. Яшчэ ў 1996 годзе, будучы адносна маладым палітыкам, Сарказі свабодна цытаваў пісьменніка падчас аднаго з інтэрв'ю. Яму належыць дастаткова вядомае выказванне: «Можна абараняць Селіна і не быць антысемітам, таксама як можна абараняць Пруста і не быць гомасэксуалістам».

## ЯНЫ ПРА НАС: ЗАМЕЖНАЯ ПРЭСА ПРА БЕЛАРУСЬ

Сэнсу ў стварэнні холдынгу МАЗа з КамАЗам з пункту гледжання вялікай карысці дадзенага праекта для беларускага боку незалежныя эксперты не бачаць. Па іх меркаванні, зліццё двух прадпрыемстваў можа быць цікавым расійскаму заводу з пазіцыі росту біржавых каціровак акцый ці перспектыўнага знішчэння канкурэнта на рынку краін СНД. А для МАЗа аб'яднанне з якім-небудзь з заходніх аўтагігантаў было б больш карысным.

**«Deutche Welle» (Германія)**

Бацька гарачыўся, яго распірала ад абурэння. Здавалася, яшчэ крыху — і ён загаворыць знаёмай яму мовай піўных падваротняў, дзе пагарджаюць усё замежнае і незразумелае. Але на тое ён і Лукашэнка, каб сябе кантраляваць. І пераходзіць толькі на непарламенцкія выразы. «Плявацьь я хацеў на ўсе іх каментары, — стомлена выдушыў з сябе Аляксандр Рыгоравіч, — гэта злыя і непрыстойныя людзі». Камісар, аднак, Бацька. Добры і прыстойны чалавек. Такога злыдням ні з Захаду, ні з Усходу не знішчыць ніколі. Баіцца ён толькі свайго «Тахрыра». Таму ў які раз за два апошнія месяцы, што прайшлі з 19 снежня, абяцае «апазіцыі» даваць «па галаве». Хоць навукоўцы папярэджваюць, што працяглы страх прыводзіць да з'ялення неўрозаў і іншых непрыемных для мужчын ускладненняў.

**«Ежедневный журнал» (Расія)**

Магчыма, камусьці ў Маскве і здавалася, што пасля разгону апазіцыйных выступаў у беларускай сталіцы і фактычнага разрыву кантактаў з Захадам Лукашэнка будзе больш гатовы на кампрамісы і пойдзе на рашэнне прынцыпова для расійскага кіраўніцтва пытання Абхазіі і Паўднёвай Асеціі. Аднак на практыцы апынулася так, што беларускаму прэзідэнту няма куды спяшацца. Стаўленне да Лукашэнкі ў Маскве ўсё адно не палепшылася, пра што сведчаць апошнія заявы Мядзведзева і Лаўрова. Але і ніякай альтэрнатывы зносінам з Лукашэнкам у расійскага кіраўніцтва ўсё адно няма, пра што сведчыць рашэнне пытання пра субсідаванне беларускай эканомікі. Таму Лукашэнка можа дазволіць сабе ў чарговы раз адкласці пытанне пра прызнанне незалежнасці Абхазіі і Паўднёвай Асеціі, прычым на нявызначаны тэрмін. Расійскае кіраўніцтва пасля заявы беларускіх парламентарыяў можа апеляваць непасрэдна да Лукашэнкі. Але нішто не замінае беларускаму прэзідэнту зноў нагадаць пра важнасць парламенцкага рашэння. І так — да бясконцасці. Гэта мёртвая бясконцасць у адносінах з Расіяй і Захадам ужо стала сутнасцю беларускай знешняй палітыкі

**Паліт.ру (Расія)**

Дзяржава, як кажуць аналітыкі, дазваляе моладзі любіць краіну толькі ў строга вызначаных ідэалагічных рамках пад чырвона-зялёнымі сцягамі і пад эгідай БРСМ. Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі — самая масавая на сённяшні моладзевая арганізацыя, як сцвярджае міністэрства юстыцыі. Створаная па ініцыятыве Аляксандра Лукашэнкі, беларускім прэзідэнтам яна аблашчана і ўзятая на поўнае дзяржаўнае забеспячэнне. Толькі «аддачы ад укладзеных мільярдаў — на капейку», выказаў незадаволенасць сам Лукашэнка на нядаўняй нарадзе. Прэзідэнт заявіў, што моладзевая палітыка ў краіне правалена з-за фармальнага падыходу.

**BBC (Вялікабрытанія)**

## МІЖНАРОДНЫЯ НАВІНЫ

### ІСПАНІЯ. ПЕРАМОГА НАЦЫЯНАЛІСТАЎ

Упершыню ў гісторыі Краіны Баскаў прафсаюз LAB будзе прадстаўляць інтарэсы цэлага сектара працоўных. LAB перамог на выбарах у калектывах настаўнікаў, якія вырашалі, якому прафсаюзу даручыць права прадстаўляць на перамовах з адміністрацыямі. Поспех LAB можна лічыць сенсацыяй. Па-першае, згаданы прафсаюз вядомы як блізкі да баскскіх нацыяналістаў. Раней ён падтрымліваў стасункі з забароненай цяпер партыяй «Батасуна» (палітычнае крыло тэрарыстычнай арганізацыі ЕТА). Прафсаюз прынцыпова вядзе сваю прапаганду выключна на баскскай мове. Па-другое, LAB удалося пасунуць Працоўныя камісіі (СС ОО) — самы моцны іспанскі прафсаюз. Камісіі праваліліся з-за сваёй асцярожнай палітыкі ў часы цяперашняга крызісу. Замест таго, каб абараняць інтарэсы настаўнікаў, яны прапанавалі шукаць кампраміс з Мінадукацыі. Гэта дазваляе шмат каму казаць, што перамога LAB — гэта хутчэй не ўздым нацыянальнай свядомасці ў асяроддзі педагогаў, а пратэст супраць СС ОО.

**Па матэрыялах іспанскай прэсы**

### ГЕРМАНІЯ. ПАЛІЦЫЯ СУПРАЦЬ РЭПЕРА



Напярэдадні выбараў у парламент Гамбургу выбухнуў скандал. Яго галоўны герой Дэвід Шутц, якога большасць бюргераў, асабліва моладзь, хутчэй ведае пад мянушкаю Holger Burner. Такі псеўданім Дэвід абраў для выступу на мясцовай рэп-сцэне. Спявае ён някепска. Інакш бы на яго не паклалі вока мясцовыя палітыкі, якія думаць, як прыцягнуць да сябе галасы моладзі. Найбольш творчасць Шутца спадабалася партыі Левых. Музыка ў сваіх песнях крытыкуе капіталізм, буржуяў, несправядлівасць і г.д. Шутц пагадзіўся пайсці на выбары, аднак тут у справу ўмяшалася паліцыя. Паліцэйскія кажуць, што змест песняў рэпера напоўнены заклікамі да антысацыяльных учынкаў, у прыватнасці да забойстваў паліцэйскіх. Таму яны просяць партыю Левых адмовіцца ад ідэі даць Шутцу месца ў выбарчым спісе. Заклік падтрымалі кансерватыўныя партыі і нават некаторыя левыя: яны баяцца, што выбаршчык будзе ўспрымаць Левых як партыю хуліганаў. Зараз Левыя шукаюць выйсце з сітуацыі. Увогуле, справа Шутца — гэта фрагмент больш комплекснай праблемы левых. У адрозненні ад Усходу, дзе ў левых з часоў краху ГДР моцны электарат, на Захадзе даводзіцца адбудоўваць структуры з нуля. У выніку ў выбарчыя спісы Левых часам трапляе абы-хто. Так раней ад Левых балатаваўся старшыня нямецкай Кампартыі, які не лічыць дэмакратыю ідэальнай сістэмай.

**Па матэрыялах «Welt» (Германія)**

### РАСІЯ. ЛІБЕРАЛЫ АБАРАНЯЮЦЬ ФАШЫСТАЎ




Цікава адрэагавалі расійскія лібералы на рашэнне маскоўскіх уладаў часова прыпыніць дзейнасць арганізацыі «Рух супраць нелегальнай эміграцыі» (ДПНИ). Рух, у прыватнасці, абвінавачваюць у экстрэмізме, а канкрэтна ў арганізацыі атак футбольных фанатаў на прадстаўнікоў каўказскай дыяспары. Здавалася б, правільнае рашэнне ўладаў выклікала адмоўную рэакцыю сярод ліберальных апанентаў сістэмы. На ліберальных сайтах пішуць пра тое, што забараняць рух няма сэнсу, паколькі ён нікога не прадстаўляе. Гэта мёртвая структура, якая хутка сама памрэ (гэта, дарэчы, абсалютная праўда). У выніку лібералы прыйшлі да высновы: «Забарона сёння ДПНИ паводле «антыэкстрэмісцкага» заканадаўства — гэта палітычныя рэпрэсіі заўтра супраць апазіцыйнай сцэны. Наступнымі могуць быць левыя з групоўкі «Левы Фронт» або лібералы з Аб'яднага грамадзянскага Фронту ці руху «Іншая Расія». Дыскусія пра тое, як лібералам ставіцца да пераследу ДПНИ, працягваецца.

**Па матэрыялах расійскай прэсы**

МЕРКАВАННЕ

# ЧАМУ ВЫБУХНУЛА ЛІВІЯ?

**Татальная адсутнасць традыцыі дэмакратыі, інфармацыйная ізаляцыя, някепскія сацыяльныя стандарты. Нягледзячы на наяўнасць усяго пералічанага, Лівія паўстала і патрабуе дэмакратыі. Пра феномен і прычыны лівійскага бунту журналіст «НЧ» Алег Новікаў размаўляе з Аляксандрам Бяловым, былым беларускім студэнтам, які вучыўся ў Трыпалі.**



У Лівіі нельга ўладкавацца на працу без пратэкцыі. Галоўны крытэр пры працаўладкаванні — не дыплом, а прыналежнасць да таго або іншага клану

***— Яшчэ ўчора, калі гутарка заходзіла пра перспектывы пратэстаў у Лівіі, адразу знаходзілася шмат песімістаў. Спасылаючыся на высокі ўзровень лівійскай сацыялкі, яны казалі, што «рэвалюцыя» і «Лівія» — словы-антонімы. Што ўяўляе сабой сацыяльная сістэма Лівіі?***

— База лівійскай сацыяльнай сістэмы — бясплатная адукацыя і бясплатная медыцына. Прычым вучыцца пры жаданні можна за мяжой: дзяржава аплаціць усе выдаткі. Акрамя таго, лівійцы могуць браць беспрацэнтныя крэдыты памерам да 20 тысяч дынараў (прыкладна 15 тысяч долараў), што сапраўды дапамагае ў выпадку беспрацоўя. І гэта не разавыя крэдыты: на працягу жыцця можна браць тыя крэдыты некалькі разоў. Застаецца дадаць, што цяперашні харчовы крызіс амаль не закрануў Лівію. У адрозненні ад Тунісу і Егіпту, кошты ў лівійскіх крамах застаюцца стабільнымі. Сярэдні заробак у лівійцаў, дарэчы, складае прыкладна 500 долараў ЗША.

***— Калі ўсё так добра, нашто бунтаваць?***

— Першымі пачалі бунтаваць у горадзе Бенгазі і суседніх раёнах. Усход краіны (тут знаходзіцца Бенгазі) традыцыйна больш палітычна актыўны. Яшчэ ў час італьянскай каланізацыі менавіта тут знаходзіўся галоўны арэал супраціву, звязаны з прозвішчам легендарнага партызана Амара аль-Мухтара. Дарэчы, не так даўно ў Бенгазі былі вулічныя беспарадкі — следства скандалу вакол балгарскіх дактароў (заражэнне ў мясцовым шпіталі дзяцей на вірус СНІД, у якім вуліца абвінаваціла балгарскіх спецыялістаў, што там працавалі). Акрамя таго, ёсць эканамічны чыннік для пратэстаў: лівійцы даўно патрабуюць, каб працэс размеркавання прыбыткаў ад продажу нафты быў больш празрыстым. Адпаведна «Зялёнай кнізе», якая выконвае функцыю канстытуцыі, усе даходы ад продажу нафты павінны размяркоўвацца паміж усімі грамадзянамі. Фармальна так яно, быццам, і ёсць. Кожны год адпаведнае міністэрства робіць адпаведную справаздачу. Аднак народ лічыць, што большасць грошай крадуць. Па словах лівійцаў, штогод у кішэні прадстаўнікоў кланаў, блізкіх да Кадафі, трапляе да 50–70 мільярдаў долараў.

***— Ці ёсць у Лівіі палітычная апазіцыя?***

— Наколькі я ведаю, палітычная апазіцыя амаль цалкам знаходзіцца ў эміграцыі, у Лондане. Але адсутнасць выразных палітычных лозунгаў не значыць, што людзі не патрабуюць палітычных зменаў. За 41 год улады Кадафі ў краіне сфармаваліся шырокія сацыяльныя групы насельніцтва, якія жадаюць пераменаў. Існуе рэгіянальная апазіцыя. Кадафі карыстаецца папулярнасцю галоўным чынам у сталіцы і на поўдні. Шмат каму не падабаецца палітычны валюнтарызм лідара. Лівія ўкладвае вялікія сродкі ў вельмі супярэчлівыя геапалітычныя праекты кшталту стварэння Афрыканскага Саюза (аналаг Еўрапейскага Саюза ў Афрыцы). Некалькі рэжымаў у Афрыцы фактычна існуюць за кошт датацый Трыпалі. Людзі патрабуюць, каб тыя грошы заставаліся ў краіне. Лівійцы ў гэтым плане глядзяць на Арабскія Эміраты, а не на Егіпет. Папулярная думка, што лівійскія грамадзяне ўвогуле могуць не працаваць, паколькі ў краіне і так хапае нафтадолараў. У сваю чаргу, моладзі не падабаецца карупцыя. У Лівіі нельга ўладкавацца на працу без пратэкцыі. Галоўны крытэр пры працаўладкаванні — не дыплом, а прыналежнасць да таго або іншага клану. Кіраўнікі фірмаў зацікаўлены, каб праз сваіх супрацоўнікаў наладзіць сувязі з уплывовымі сем'ямі.

***— Афіцыйная лівійская прапаганда кажа, што Лівія — гэта краіна наўпраставай дэмакратыі. Палітычныя структуры пабудаваныя на аснове «Зялёнай кнігі». Адпаведна ёй, уся ўлада належыць мясцовым Народным камітэтам, якія кантралююць усю выканаўчую галіну, уключаючы ўрад.***

— Мне даводзілася бачыць працу Народных камітэтаў. Фармальна яны сапраўды могуць патрабаваць адстаўкі прэм'ера або перагляду бюджэту. Аднак людзі з вялікай апатыяй ставяцца да ўдзелу ў працы камітэтаў. Усе звыкліся, што краінай кіруе некалькі кланаў і сыны Кадафі.

***— Ці ёсць у Лівіі ісламісты?***

— Не. Іслам з'яўляецца часткай афіцыйная дактрыны. «Зялёная кніга» — праграмны дакумент лівійскай Джамахірыі — напісана са спасылкамі на тэксты Карану. І, акрамя таго, цяперашні іслам — гэта сацыяльнае вучэнне для бедных людзей. Лівійцы, наадварот, належаць да прывілеяванай часткі грамадства. Як правіла, усю брудную і цяжкую працу ў краіне выконваюць эмігранты з Егіпту і чорнай Афрыкі. Яны складаюць палову насельніцтва краіны, пры гэтым не маючы практычна ніякіх праў. Шмат іх увогуле жыве нелегальна.

***— Як эмігранты ставяцца да пратэстаў?***

— Цяжка сказаць. Аднак той факт, што ўлады выкарыстоўваюць наёмнікаў з афрыканскіх краін для падаўлення паўстання ў Бенгазі, дастаткова цікавы.

***— Які твой сцэнар развіцця падзей?***

— Пакуль нельга нічога прагназаваць. З іншага боку, відавочна, што за 41 год існавання сістэма персанальнага дыктату ў Паўночнай Афрыцы сябе зжыла, заіржавела. У гэтым плане цікавы Алжыр. Там сітуацыя традыцыйна не вельмі стабільная. Ёсць моцная, прадстаўленая ў парламенце апазіцыя, дасюль працягваецца вайна з ісламістамі, алжырцы цікавяцца палітычным працэсам у Францыі, дзе жыве шмат родзічаў-эмігрантаў. Аднак Алжыр дасюль так і не паўстаў. Адсутнасць абсалютнай стабільнасці, якой ганарыліся Туніс і Лівія, аказаліся выратаваннем для алжырскага прэзідэнта і яго атачэння. Рэжым у Алжыры, каб выжыць, навучыўся рабіць манеўры, весці дыялог з праціўнікамі, гуляць у складаныя палітычныя пасьянсы. Сыходзячы з гэтага, можна сказаць, што вяртанне да мадэлі чыстай дыктатуры ў краінах Магрыбу немагчымае.

ЦІКАВА

# ДРЭС-КОД ДЛЯ ЎСІХ АДЗІНЫ

Алег НОВІКАЎ

**Пачынаючы з 21 лютага для ўсіх супрацоўнікаў дзяржаўных устаноў Чачні дзейнічае адзіны стандарт адзення. У Расіі пачаўся пераход на адзіны дрэс-код, да якога заклікаюць як праваслаўныя, так і мусульмане.**




Для дзяржслужбоўцаў Чачні з гэтага часу дзейнічае дрэс-код, заснаваны на «вайнахскай этыцы». Зараз з панядзелка па чацвер чачэнскія мужчыны павінны прыходзіць на працу ў пінжаках і з гальштукам, а ў пятніцу — у традыцыйным мусульманскім адзенні.

Што да жанчын, то яны не павінны з'яўляцца на працы з непрыкрытай галавой, а выключна ў «адпаведных галаўных уборах» — гэта значыць, у хустцы, а таксама сукенках і спадніцах ніжэй каленяў. У распараджэнні віцэ-прэм'ера Чачні ўказаная нават даўжыня рукавоў — тры чвэрці. Дарэчы, яшчэ ў 2007 годзе прадстаўнікоў слабога полу ў Чачні перасталі пускаць у дзяржаўныя ўстановы без галаўнога ўбору, а пазней і ў іншыя грамадскія месцы, у тым ліку ў месцы адпачынку.

Праваабаронцы ўлетку мінулага года таксама паведамлялі пра факты нападу ў грамадскіх месцах на жанчын без хустак. У іх стралялі фарбай з пэйнтбольных вінтовак. Рамазан Кадыраў тады заявіў, што не ведае, хто гэта рабіў, аднак не асуджае арганізатараў, больш таго — дзякуе ім.

У прынцыпе, нічога асаблівага Кадыраў не прыдумаў. Ён рэалізаваў на практыцы тое, пра што даўно кажуць у Маскве.

Напрыканцы студзеня кіраўнік сінадальнага аддзела РПЦ па ўзаемадносінах царквы і грамадства протаіерэй Усевалад Чаплін выступіў з адкрытым лістом з нагоды выгляду расіян. «Бесцырымонны знешні выгляд і бесцырымонныя паводзіны, — сказаў протаіерэй, — прамая дарога да няшчасця. Да пустых «каханняў на адзін раз». Да кароткатэрміновых шлюбаў, за якімі тут жа ідуць разводы. Да зламаных лёсаў дзяцей. Да адзіноты і адчаю. Да жыццёвай катастрофы... Як жанчыны паводзяць сябе ў публічных месцах, у інстытуце, на працы — не толькі іх асабістая справа. Калі жанчына апранутая ў офісе як прастытутка, то іншыя жанчыны павінны мець права ёй пра гэта сказаць».

Варта згадаць, што Чаплін з'яўляецца аўтарам ідэі пра тое, што ахвяры згвалтавання самі вінаватыя. «Калі яна носіць мініспадніцу, яна можа справакаваць... Калі яна пры гэтым п'яная, яна тым больш справакуе. Калі яна пры гэтым сама актыўна выклікае людзей на кантакт, а потым дзівіцца, што гэты кантакт заканчваецца згвалтаваннем, яна тым больш не мае рацыі», — заявіў протаіерэй.

І каб не даводзіць справу да жыццёвай катастрофы і засілля прастытутак у офісах, айцец Усевалад прапанаваў увесці агульнарасійскі дрэс-код.

Ідэю праваслаўнага іерарха неадкладна падтрымалі ісламскія духоўныя лідары. Глава выканкаму Усерасійскага муфтыяту, муфтый Пермскага краю Мухамедгалі Хузін так і сказаў: «Разумныя людзі цалкам падтрымліваюць ініцыятыву айца Усевалада пра дрэс-код. Чаму ж могуць навучыць сваіх дзяцей тыя, хто бессаромна агаляецца, людзі з завушніцай у носе, наколкамі на ўсё цела, з цыгарэтай у зубах і банкай піва ў руцэ? Толькі распусце і адыходу ад векавых традыцый».

Тое, што маральная дэградацыя — сапраўды праблема цяперашняй Расіі, відавочна. Аднак ці дапаможа абаронцам маралі адзіны стандарт адзення? І ўвогуле, цяжка ўявіць, што ўсе пяройдуць на адзіную форму.

У сувязі з гэтым нарадзіўся нават жанр раманаў-антыўтопій пра тое, што ў Расіі, быццам, адбылася маральная рэвалюцыя, якая, натуральна, закранула гардэроб кожнага чалавека.

Вось фрагмент аднаго з такіх опусаў. «Ён вярнуўся ў Расію праз дзесяць гадоў і не пазнаў краіну. Так, ён бачыў рэпартажы з Масквы па тэлевізары, але непасрэднае ўражанне ад вулічнага натоўпу апынулася нечаканым шакуючым. За акном таксі па праспекце Сароўскага рухалася шэрая, безаблічная маса. Усе мужчыны былі апранутыя ў аднолькавай шэра-чорнай гаме, быццам манахі: доўгія паліто, штаны, каракулевыя кепкі. Жанчыны ў спадніцах да пят і чорных кажушках усе, як адна, з пакрытымі хусткамі галовамі. Ён угледзеўся ў твары мінакоў. На ўсіх тварах застыў журботны засяроджаны выраз».

Паколькі такую карцінку нават уявіць сабе цяжка, большасць аглядальнікаў палічылі ініцыятыву РПЦ знакам, які сведчыць пра амбіцыі царквы або пра намер айца Усевалада прыцягнуць да сябе ўвагу. Гэта яму цалкам удалося. Супраць яго мабілізавалася не толькі феміністкі і праваабаронцы, аднак і ўвесь свет высокай моды.

Адзін з яе прадстаўнікоў гісторык моды Аляксандр Васільеў вельмі катэгарычна заявіў: «Гэта фашызм. Любое абмежаванне ці ўказанне ў адзежы, якое павінна казаць пра вашы рэлігійныя, сэксуальныя, якія заўгодна перавагі, завецца тэрмінам «фашызм». Тады ўсе глуханямыя павінны насіць зялёны пінжак, а сляпыя — клецістыя штаны, а мусульмане — аранжавыя шалікі!»

Аднак усё не так проста. Высвятляецца, што праблема свабоднага выбару адзення стаіць толькі перад метраполіяй, а ў правінцыі і так з-за беднасці даўно існуе свой дрэс-код. І норавы тут іншыя.

«Нядаўна ў Арэнбургскай вобласці простыя, аднак вельмі далікатныя людзі спыталі мяне, каму і навошта патрэбныя ток-шоў з лаянкай. «Нас бацькі вучылі: дай іншаму сказаць, потым сам скажаш...» Смешныя гэтыя рускія. Падобна, за скандалы і свінства галасуюць рэйтынгамі адны масквічы. Чым далей ад Масквы, тым дабраякасней народ. Але, каб гэта высветліць, трэба ездзіць па краіне асабіста — такую Расію па тэлебачанні не паказваюць», — піша журналіст газеты «Известия».

Як бачым, ініцыятыва Кадырава можа быць лёгка імпартаваная ў іншыя рэгіёны. Аднак у маральнай рэвалюцыі ёсць іншы бок. Ініцыятары дрэс-коду не хаваюць, што іх палітыка накіраваная на падтрымку нацыянальных і рэлігійных традыцый. Калі выхадцы кожнай этнічнай групы ў Расіі пачнуць, адпаведна закону, апранацца ў касцюмы з нацыянальнымі элементамі, то гэта хутчэй паскорыць дэзінтэграцыю і так вельмі кволага нацыянальнага расійскага адзінства.

**Калі выхадцы кожнай этнічнай групы ў Расіі пачнуць, адпаведна закону, апранацца ў касцюмы з нацыянальнымі элементамі, то гэта хутчэй паскорыць дэзінтэграцыю**

## ПАЛІТЫКІ ТЫДНЯ

### МІХАІЛ ФАРМУЗАЛ



Башкана (кіраўніка) Гагаузскай аўтаноміі (частка Рэспублікі Малдова) абвінавацілі ў спробах экспансіі Гагаузіі. Быццам ён падбіў жыхароў суседняга Тараклійскага раёна выступіць з ініцыятывай далучэння да аўтаноміі. У Тараклійскім раёне жывуць 5–6 тысяч чалавек. Яны і раней выступалі за далучэнне да Гагаузіі, аднак як палітычны фармат намер афарміўся толькі зараз. За інкарпарацыю ў склад Гагаузіі выступілі салідныя персоны, кшталту раённага пракурора. Цяпер у Тараклії збіраюцца подпісы пад просьбай да ўраду правесці рэферэндум. Гісторыя вакол магчымага ўзбуйнення Гагаузіі цікавая, паколькі большасць жыхароў Тараклії — этнічныя балгары. Афіцыйная Сафія супраць іх пераходу пад кантроль Гагаузіі. Аргумент наступны: Балгарыі будзе складаней аказваць падтрымку балгарскай дыяспары ў Малдове, калі тая будзе раз'яднана адміністрацыйнымі межамі. Супраць і Кішынёў. «Улады Гагаузіі спрабуюць перакроіць адміністрацыйна-тэрытарыяльную сістэму Малдовы ў святле верагоднасці яе федэралізацыі», — кажуць у цэнтры. Эксперты сцвярджаюць, што ўсё больш банальна — у гагаўзаў больш якаснае медыцынскае абслугоўванне, паколькі яны — этнічныя туркі і ім дапамагае Анкара. Стаіць Фармузал за ініцыятывай рэферэндуму ў Тараклії або не, у выпадку аншлюсу Тараклії ўвесь поўдзень Малдовы можа ўзняцца, патрабуючы ўваходу ў склад Гагаузіі. У гэтым плане варта згадаць, што Гагаузія вельмі шчыльна сябруе з Прыднястроўем, якое зацікаўлена ў дэстабілізацыі Малдовы.

### СЯРГЕЙ СЦІЛАВІН



Папулярны ў Расіі радыёвядучы выклікаў палітычную паніку, выклаўшы ў эфір наступную інфармацыю, якую быццам атрымаў ад свайго сябра. Той даслаў ды-джэю наступны ліст: «Працую ў японскай кампаніі. На тыдні амбасадар Японіі выклікаў усіх кіраўнікоў прадстаўніцтваў японскіх кампаній у Маскве (у амбасадзе ведаюць кожнага працуючага бізнесмена ў твар). Выклікаў і заявіў ім, каб усе былі «на валізах», гатовыя ў любую хвіліну адправіцца на радзіму. «Урад нашай краіны ў цяперашні момант разглядае магчымасць абвяшчэння вайны Расіі, з мэтай вяртання паўночных тэрыторый. Насельніцтва Японіі складае 125 мільёнаў чалавек, а насельніцтва Расіі —140 мільёнаў. Гэта цалкам задавальняючыя ўмовы для вядзення пераможных баявых дзеянняў, з улікам таго, што войска РФ у кепскім стане, а ўрад не гатовы да таго, каб ужыць ядзерную зброю». Вось такое паведамленне. Некаторыя яму паверылі і, аналізуючы расклад сіл, пагадзіліся, што ў выніку вайны Курылы Расія дакладна страціць. Адзінае выйсце, на думку шмат каго, хутка скалаціць рэгіянальны антыяпонскі блок з краін, да якіх Японія таксама мае тэрытарыяльныя прэтэнзіі, —гэта В'етнам, Кітай, Інданезія, Паўднёвая Карэя. Натуральна, большасць назіральнікаў лічаць гэта інфармацыю «качкай», хаця сітуацыя ў адносінах паміж Масквой і Токіа зараз сапраўды вельмі напружаная. Застаецца спадзявацца, што японскія дыпламаты вырашылі папросту напалохаць расійскае грамадства. Гэта ім удалося.

### ОЛАФ ШОЛЬЦ



Лідар філіялу сацыял-дэмакратычнай партыі (SPD) у Гамбургу вярнуў усім нямецкім эсдэкам веру ў свае сілы пасля таго, як перамог на выбарах у гарадскі парламент і стаў мэрам Гамбурга. Партыя Шольца мае дэпутацкую большасць (52 працэнты). Гэта папросту трыумф на фоне таго, як Хрысціянска-дэмакратычны саюз — галоўныя праціўнікі эсдэкаў — згубіў палову электарату. У ХДС зараз толькі 23 працэнты. Прычынай поспеху ружовых называюць эканамічныя праблемы гораду і крызіс ураду, з якога напярэдадні выбараў выйшлі Зялёныя. Апошнія, дарэчы, хаця і захавалі свае пазіцыі (11 працэнтаў), павінны быць расчараванымі не менш за хрысціянскіх дэмакратаў. Доўгі час сацыялагічныя апытанні давалі ім амаль 20 працэнтаў, аднак у выніку выбарчых усё роўна галасаваў або за эсдэкаў, або за кансерватараў. У Берліне, дзе праз год выбары, Зялёныя зараз апераджаюць SPD, аднак, як паказвае вопыт Гамбургу, гэта не гарантуе канчатковай перамогі. Між тым, Зігмар Габрыэль, старшыня SPD, ужо назваў падзеі ў Гамбургу «пачаткам новага часу».

ТВОРЧАСЦЬ

# БЕЛАРУСЫ МАГЛІ ВЫТКАЦЬ ЛЁС СЯБРОЎЦЫ І СІЛУ ВЕДЗЬМАКУ

**Майстар па ткацтву Наталля Кахановіч — чалавек харызматычны, і да ўсяго, як сама прызнаецца, з моцным характарам. Напэўна, таму яе дзеці здольныя і кашулі вышыць, і габелен выткаць. Майстрыха расказала, што яе сын — рэжысёр Аляксандр Кахановіч — у дзяцінстве здзіўляў працамі ручной работы, а цяпер дапамагае ёй аплачваць удзел у выставах майстроў суседніх краін. Наталля працуе выкладчыкам у Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэце імя Максіма Танка. Але інфармацыю пра яе лягчэй знайсці на расійскіх сайтах, дзе рэгулярна анасуюцца яе курсы ткацтва і майстар-класы для ахвочых. З майстрам Наталляй Кахановіч гутарыла журналіст Вольга Хвоін.**





— Ва ўсім «вінаватыя» дзеці. Я працавала ў някепскім месцы, але дачка захварэла, ёй быў патрэбны догляд. Недзе з год займалася надомнай працай, а потым узяла ткацкі станок і пачала ткаць. Пазней мая суседка параіла месца ў пазашкольным гуртку. І далей усё пайшло развівацца ў гэтым кірунку. Некалькі разоў была на курсах па народным ткацтве. Тонкія работы тады яшчэ не магла выконваць. Увогуле, у ткацтве ўсё ўплывае на якасць тканіны — запраўка ніткамі, нахіл элементаў станка. Гэтаму трэба вучыцца на практыцы.

***— Ці складана знайсці ткацкі станок?***

— Ёсць знаёмы, які робіць станкі. Маю і тры вясковых. У гарадскіх кватэрах зручна карыстацца разборнымі станкамі. Але я люблю працаваць на старых станках. Як кажуць, намолена (смяецца). Рушнік з нескладаным узорам можна зрабіць дзён за дзесяць, а браны рушнік са складаным арнаментам і за два тыдні не вытку.

***— Як да вас ставіліся мясцовыя жыхары ў этнаграфічных экспедыцыях, ці разумелі сэнс вашай працы?***

— Добра, калі мы прыязджаем у вёску да знаёмых. Калі ж навобмацак, то проста падыходзім да бабулек, што сядзяць на лаўках. Недзе гадзіны дзве размаўляем, і калі чалавек адкрываецца, тады можна нешта ўжо папрасіць паказаць. Але была гісторыя ў Смалявіцкім раёне, калі мне сказалі: «Мае ўзоры хай памруць са мной». Звычайна людзі ў вёсцы адгукаюцца, хіба што могуць адмовіць з-за таго, што куфар цяжка адкрыць. Цяпер нескладна знайсці посцілкі, добрыя рушнікі трапляюцца радзей. А паясы ўвогуле даволі рэдка сустракаюцца. У вёсцы Студзёнка Смалявіцкага раёна жанчына расказвала, што яе маці, думаю, канца XIX стагоддзя нараджэння, хадзіла кідаць уніты, то бок запраўляць станкі. Яшчэ ў некаторых вёсках я сутыкалася з такой практыкай. З маіх назіранняў, узоры ткаліся, калі жанчына іх упадабала, часта з чыёйсці падачы. Да рытуалаў узоры ткаліся паводле прынятага ў мясцовасці канону.

***— Пояс меў не толькі прыкладную, але і сакральную функцыю. Можаце прывесці прыклады абрадавасці?***

— Амаль ва ўсіх народаў пояс — гэта не толькі элемент адзення. Я сустракала радзільныя паясы, якія захаваліся ў жанчыны 1913 года нараджэння. У 1933 годзе яна зрабіла гэтыя паясы на дошчачках. Такія ж паясы я сустракала на поўначы Расіі, у Польшчы. Той пояс рыхтаваўся для дзіцяці. Добра, што я своечасова сустрэла гэтую жанчыну, бо яна хутка памерла, а яе пляменнікі — дзяцей яна не мела — павыкідалі многія рэчы. У Слонімскім раёне трапіўся браны пояс, які ткалі ў 1950-я гады для дзяўчынкі. Думаю, у беларусаў не было адзінага ўзору паясоў для такіх нагодаў.

Паясы дарылі падчас хрэсьбінаў. Дарэчы, цікава, што хрысцілі дзяцей звычайна ў шэсць тыдняў, калі надыходзіў час пераходнага стану паміж гэтым і тым светам. У літаратуры пішуць, што калі дзіця памірала да хрэсьбінаў, то яму абавязкова павязвалі такі пояс. Але я не сустракалася з такой практыкай. Вядомы даследчык Янка Крук піша, што дзіця не кармілі да хрэсьбінаў. Я не магу звязаць гэта з рэальнасцю, таму хацелася б аднойчы паразмаўляць з аўтарам. Хрысцільны пояс лічыўся моцным абярэгам, чалавек мусіў насіць яго ўсё жыццё, мыцца з ім у лазні. І калі пояс раптам рваўся, то гэта быў кепскі знак. Я прыйшла ў народную культуру з прамысловасці, таму многа чытала адпаведнай літаратуры, удзельнічала ў канферэнцыях, каб назапасіць веды па гэтай тэме.

***— Якую каляровую гаму абіралі беларусы ў вопратцы, побытавых рэчах?***

— Чырвоны колер — дамінанты. Я веру ў абярэжную сілу чырвонага колеру. Калі чалавек з кепскім вокам глядзіць на кагосьці, то яго першы позірк нясе найбольш пагрозы суроку, то бок рэч яркага колеру адцягвае позірк на сябе, і яе ўладальнік такім чынам мае абарону.

Граф Тышкевіч пісаў, што маладым на вяселлі слалі рушнік, а пад яго клалі чырвоны пояс. Але падрабязнасцяў выканання пояса я не даведалася. Увогуле, я давяраю першакрыніцам, аўтарам, якія працавалі напрыканцы XIX — пачатку XX стагоддзя. Усё астатняе ў большасці выпадкаў — гэта перадрукі ці інтэрпрэтацыя аўтара. Шырока распаўсюджаныя браныя паясы з геаметрычнымі ўзорамі.

У вёсках часта можна было сустрэць кавалкі тканіны — рушнік без аніякіх узораў, але з абодвух бакоў затканымі чырвонай паласкай. Казалі, што гэта рабілася для таго, «каб чорт не ўбіўся». Мне часта гавораць, я надта давяраю таму, што напаўпісьменная бабка расказала. Але той бабцы расказала яе маці, а маці — ейная бабка. Людзі жылі гэтым.

Чорнае, чырвонае і зялёнае ткацтва на Палессі абумоўленае блізкасцю Украіны. У мяне ёсць рушнік з Івана-Франкоўскай вобласці, выкананы чырвоным, чорным і зялёным колерамі. Людзі эмігруюць і прыносяць з сабой элементы новай культуры.

***— Якія матэрыялы выкарыстоўвалі нашы продкі ў ткацтве?***

— Сукно па сукне — гэта быў багаты варыянт ткацтва. Часцей — сукно ва ўтку, а лён у аснове. Мне расказвалі, што накрываліся некалькімі ільнянымі посцілкамі. Хто больш багаты, той, канешне, меў і пакрывалы з воўны.

***— У вас няма адчування, што гэты складаны народны промысел, які патрабуе часу і ведаў, паступова сыходзіць у нябыт?***

— Недзе ў 2000 годзе, калі я сама навучылася рабіць паясы, была выстава у Палацы дзяцей і моладзі. Дык вось, тады было прадстаўлена толькі дзесяць паясоў. Праз чатыры гады на аналагічнай выставе было ўжо каля сямісот паясоў. Мы даем веды студэнтам дзённага і завочнага аддзяленняў. Са мной складана дамовіцца, таму і хлопцы і дзяўчаты ткуць паясы. У іх застаецца памяць пра рамяство. І калі хоць адзін чалавек з выпуску застаецца ў ткацтве, то я лічу год удалым. Цяпер ёсць дзяржаўная праграма па падтрымцы дамоў рамёстваў. Я сябар праўлення Беларускага саюза майстроў, таму звычайна бываю ў журы розных конкурсаў і люблю, калі майстры звяртаюцца да традыцый сваёй мясцовасці. Але, натуральна, гэты промысел не можа быць масавым, бо ён затратны і фінансава, і па часе. Маленькія станкі цяпер не прадаюцца. Калісьці мой сын у дзіцячым садку на рамцы спрабаваў нешта ткаць, дачка таксама навучылася асновам ткацтва. Мае дзеці раслі ў гарадской, але традыцыйнай культуры. І сын, як я бачу, стараецца ў сваёй працы выкарыстоўваць элементы народнай творчасці.

***— Атрымлівается, што Аляксандр можа не толькі кіно зняць, але і пояс саткаць?***

— Больш таго! Аднойчы ён вышыў кашулю. Мне нават складана было паверыць, што гэта ён зрабіў. Потым, калі працавала ў пазашкольнай адукацыі, ён прыходзіў да мяне на працу. Вымушаны быў, як і мама, займацца габеленам (смяецца), недзе нават ляжыць вынік яго працы. Вуліца ў маіх дзяцей была на раскладзе. Увогуле, я зайздрошчу ў нечым вясковым дзецям, бо ў іх больш свабоды, яны набліжаныя да прыроды.

***— Беларусь, асабліва Палессе, вядомая сваімі знахарамі, сувяззю людзей з іншым светам. А якім чынам выкарыстоўвалася ткацтва для гэтых мэтаў?***

— Я ведаю пра падобную практыку. Але гэта спрэчна. У мяне студэнты мусяць рабіць вясельны рушнік з адпаведнай кампазіцыяй знакаў. Мая калега мяркуе, што я тлумлю галовы студэнтам, але я хачу давесці ім сімвалізм тых ці іншых вобразаў. У мяне ёсць рушнік са Слуцкага раёна, які можна падараваць сяброўцы, калі хочаш, каб яна разышлася з хлопцам. Маю пояс Клецкага раёна, да якога я вельмі асцярожна стаўлюся. Спрабавала прачытаць яго сімволіку, і ўсё паказвае, што ён зроблены для знахарства і варажбы. На Палессі напраўду многа знахараў, варажбітоў, але не магу сказаць, ці перадаюць яны гэтыя якасці дзецям.

***— Як можна наблізіць да людзей ткацтва, зацікавіць гарадскога жыхара гэтым рамяством?***

— У нас ёсць ідэя набыць некалькі хат у вёсцы і займацца ў кожнай пэўным рамяством. Пакуль гэта на ўзроўні задумы. Паводле нашых планаў, гэта не будзе турызм у стылі «прыехаць, паесці сала і выпіць гарэлкі». Мы хочам, каб чалавек, які прыехаў у вёску, навучыўся рамёствам, каб была пэўная экскурсійная праграма. Некалькі гадоў таму я гэты праект апублікавала ў адным са СМІ Беларусі. Але зразумела, што такая вёска мусіць быць недалёка ад турыстычных маршрутаў. У Кактэбелі ёсць сядзіба Максіміляна Валошына, дзе ў свой час летам маглі бясплатна жыць пісьменнікі, паэты. Думаю, было б карысна арганізаваць нешта падобнае і ў Беларусі. Цяпер сын, калі ездзіць са здымкамі, то прыглядае і для мяне вёскі.

Нядаўна я была ў Беластоцкім універсітэце. Там ёсць факультэт «Трэцяе стагоддзе», на якім за сімвалічную плату вучацца людзі ў асноўным пенсійнага ўзросту. Думаю, нешта падобнае можна было б арганізаваць у нас — пры камерцыйным ці дзяржаўным універсітэце. Пасля выхаду на пенсію многія адчуваюць сваю непатрэбнасць, і бабулі маглі б нечаму вучыцца, а потым перадаваць свае веды ўнукам. Нешта падобнае я спрабавала арганізаваць пару гадоў таму ў Фрунзенскім раёне, але не знайшлося памяшкання па прымальных коштах, адміністрацыя нам таксама не дапамагла з арэндаю.

У Маскве на мае курсы ткацтва прыходзяць дарослыя, бо ўсё платна. Часцей гэта выкладчыкі, людзі са сферы культуры, адукацыі. Я навучаю іх тэхналогіі ткацтва, якая за тысячу гадоў фактычна не змянілася. Ёсць дама, якая вучыцца ткаць, каб потым рабіць падарункі. Яна з катэгорыі жонак забяспечаных людзей. Масква — гэта вялікі горад, горад вялікіх магчымасцяў. У нас патрэбная падтрымка дзяржавы, але яе амаль няма.

ВАНДРОЎКА

# ПАРКІНГ ЛЯ БЕЛАГА ДОМУ

## ЦІ ВАРТА ВУЧЫЦЦА ДЭМАКРАТЫІ Ў АМЕРЫЦЫ?

Марыя МАРТЫСЕВІЧ

**Так атрымалася, што прыкладна праз гадзіну з моманту, калі мой самалёт прызямліўся ў Вашынгтоне, я стаяла перад Белым Домам. Вось так проста стаяла і абапіралася лбом у агароджу. На ўсходнім узбярэжжы Амерыкі была дзявятая гадзіна вечара, а ў Мінску — глыбокая раніца наступнага дня, і прыкласці да ілба нешта халоднае гэтым душным жнівеньскім вечарам было неабходна, каб не заснуць. А магчыма, я ўжо спала. І ўсё гэта мне снілася. Менавіта такім чынам я прабачалася перад амерыканскім сябрам, які сустрэў мяне ў аэрапорце імя Рэйгана і прывёз сюды ў спадзеве на прыгожы жэст, за тое, што я ніяк не рэагую на пабачанае. Хаця, здавалася, у іншых умовах дах, які так нечакана перамясцілі на подступы да Капітолію, мусіла знесці капітальна.**




Мой аднакласнік Дзіма — самае каштоўнае, што дала мне эпоха інтэрнэту. Калі б у 2004 годзе ў Гарвардзе не вынайшлі Фэйсбук, мы б не знайшліся ў 2007-м. Яго сям'я выехала ў эміграцыю яшчэ з СССР, калі Дзіму было 9, і ні я, ні мае бацькі не ведалі, у якую з краін Захаду. А вось секунда пошуку ў сацыяльнай сетцы дала адказ, што ў ЗША. Гэта была наша другая сустрэча пасля пасядзелак у пясочніцы. Раней ён ужо прыязджаў да мяне ў Еўропу.

З Дзімам, яго сям'ёй і сябрамі я прабавіла больш за тыдзень усяго часу, які займала мая паездка. Якім бы нетыповым ні быў гэты мой досвед дачынення з «простымі амерыканцамі» — апісваць я буду хутчэй яго. Пры пэўнай роднаснасці душаў, якая прывяло да нашага з Дзімам, як смяяліся бацькі, «інтэлектуальнага сяброўства» яшчэ на стадыі пясочніцы і пры рускай мове, на якой ён усё яшчэ няблага гаварыў, — стаў для мяне адкрытым космасам Амерыкі, з прамым выхадам да Белага Дому, іпатэкай і аўтаматамі на паркоўку.

### Народ

Да бацькоў Дзімы пасля самалёту ехаць запозна. Таму на адну ноч ён пасяляе мяне ў сваім пакоі, а сам спіць на першым паверсе ў гасцёўні. Дом, які яны здымаюць з сябрамі, планаваўся як жытло для сярэдняй сям'і, але цяпер тут жывуць аж сем чалавек з тых, каго мы называем «маладымі спецыялістамі». Здаровы мангал на ганку і непрыбраны падворак з галавой выдаюць сацыяльны статус жыхароў. Маладыя людзі ў доме адно начуюць, цэлымі днямі адпрацоўваючы першыя ў сваім жыцці крэдыты, — за вучобу ды машыну. Стол увечары застаўлены гатовай ежай з дарожных кафэ, мяне знаёміць з жыхарамі гэтай пост-студэнцкай «хазы».

Тод, Дэн, Рон, Біл, — прадстаўляе Дзіма сваіх сяброў. — Надзя, — дадае ён, калі мілая дзяўчына вызірае з кухні і вітаецца па-руску. Яна таксама — дзіця савецкай эміграцыі. Сцены гасцёўні завешаныя сцягамі, якія мне нічога не гавораць. Гэта штандары штатаў, з якіх насельнікі дому прыехалі «заваёўваць сталіцу».

Бліжэй да поўначы падцягваецца апошні насельнік камуны — Джэф. Ён займае ў доме выключнае памяшканне — «бэйсмэнт» — пўніцу з асобным уваходам. Яго рэдка бачаць, бо ён устае позна, вяртаецца позна, працуе і жыве ўначы. «Джэф — твой калега», — з павагай расказваюць пра яго хлопцы. Джэф скончыў школу журналістыкі і (хто б сумняваўся) піша кнігу. Але пакуль не напісаў, зарабляў на жыццё, робячы для прэсы апісанні пасяджэнняў адной з дзяржаўных структураў. Так, амаль усе жыхары Вашынгтону так ці іначай працуюць на дзяржаву. Можа, таму вакол мяне — адно «правільныя» маладыя людзі. Джэф узнімаецца на шум галасоў, каб нацадзіць бурбону і даўгой, дасціпнай, але не вельмі паліткарэктнай тырадай характарызуе сённяшняе пасяджэнне і яго ўдзельнікаў. За гады працы ён вывучыў сваіх чыноўнікаў і іх звычкі, як заатэхнік — куранят у інкубатары.

Я ўжо ведаю, што Надзя захапляецца мастацтвам, і пытаюся ў яе, якія музеі яна рэкамендуе. «Зразумела, Метраполітан!» — выгукае яна, наўпрост зневажаючы ўсе 18 музеяў Вашынгтону, якія, да таго ж, абсалютна бясплатныя.

«Усё найлепшае — у Нью-Ёрку!!!» — хорам выгукаюць мальцы. Надзіна апантанасць галоўным горадам свету, да якога ад іх дома ўсяго тры гадзіны цягніком, — гэта дазволены ў доме прадмет жарту, што да Надзі. Статыстыка кажа, што маладыя ды актыўныя не затрымліваюцца ў сталіцы ЗША даўжэй, чым на чатыры гады. Там нудна.

### Свабода

Мы паркуемся каля дому Дзімы — стаянка разлічаная на 2 машыны, але іх тут стаіць 5 — у Надзі ў «тачцы» няма патрэбы, а у кагосьці яна ў платным гаражы. Надзя ходзіць пешкі на працу ў Інстытут Здароўя, перад адыходам крояччы ў скрыначку абед з салаты і сырых шампіньёнаў. Падчас ланчу сакратаркі ў інстытуце ходзяць па офісах з кошыкамі, раздаючы супрацоўнікам садавіну.

Перад тым, як ставіць машыну, Дзіма вырашае няпростую задачу па ранішнім раз'езде. Ён перабірае працоўныя расклады суседзяў і пасля гэтага спрабуе запаркавацца, каб нікога не «падперці». Гэта сэканоміць час сябрам і ашчадзіць яго сон зранку.

З самых першых дзён у ЗША здалося, што амерыканскі чалавек халерна несвабодны. Менавіта таму, што сам сябе строга абмяжоўвае, каб не нарабіць шкоды бліжняму. Зрэшты, кажуць, менавіта гэта і ёсць — свабода.

### Закон

З чарговай экскурсіі мы вяртаемся вельмі позна — ужо каля поўначы. Штаты Вірджынія і Мэрылэнд прымыкаюць да Вашынгтона, але спрадвеку не могуць падзяліць важны грошапрыцягальны горад, і таму сталіца лічыцца асобнай «акругай Калумбія». Вуліцы абодвух штатаў увечары пустынныя, і на ўсіх скрыжаваннях гарыць чырвонае. Трэба спыніцца, міргнуць аварыйкай — і тады святло аўтаматычна мяняецца за зялёнае, можна ехаць (у нас у такіх выпадках уключаюць жоўты). Я пытаюся ў Дзімы, чаму ён не праедзе на чырвоны, калі ніхто не бачыць. 9 гадоў жыцця мой сябар правёў у СССР, але пытанне відавочна ставіць яго ў тупік. «А, ёсць нейкі сканер, мяне ўсё адно аштрафуюць», — праз пэўны час згадвае ён.

Павагу і нават культ закону прышчэплівае грамадзяніну ЗША з пялюшак. Ёсць толькі адно месца і адзін час у жыцці, дзе мараль негалосна дазваляе Закон парушаць. І гэтыя час і месца — каледж. «Ты зразумееш, пра што я, ты ж будзеш жыць у кампусе!» — рыхтуе мяне Дзіма.

### Выбар

«За каго ты галасаваў на апошніх прэзідэнцкіх?» — цікаўлюся я Дзімы, пакуль мы і яго малодшая сястрычка чакаем заходу ў дэльфінарый Балтымору. Горад збудаваны так, што яго галоўнай плошчай фактычна ёсць гавань, па якой плаваюць каляровыя караблікі ў форме цмокаў. Дзіма называе імя, якое мне абсалютна нічога не гаворыць. «Гэта трэці пасля рэспубліканца і дэмакрата кандыдат, а ўсяго іх больш за сто», — тлумачыць ён. «Навошта галасаваць за кандыдата, калі загадзя вядома, што ён прайграе?» — здзіўляюся я. «Сэнс у тым, каб такі палітык набраў хаця б адзін працэнт галасоў. І тады вырастае яго вага ў палітычнай сферы, і яго партыя зможа лабіраваць тыя погляды і рэформы, якія, я думаю, павінны быць».

У кавярні балтыморскага дэльфінарыя я яшчэ не ведаю, што беларускіх кандыдатаў у прэзідэнты, якія праз колькі месяцаў набяруць, па афіцыйных дадзеных, крыху больш за 1 працэнт галасоў, пасадзяць у турму, перад гэтым жорстка збіўшы. Тое, што ўладам гэта праходзіць беспакарана, даводзіць, што амерыканская мадэль выбараў беларусам зусім не патрэбная.

### Правы чалавека

Падчас амерыканскай паездкі я чатыры разы бачыла выбарчыя ўчасткі. Увосень 2010-га ў розных штатах праходзілі мясцовыя выбары, і на іх можна было натыкнуцца ў бібліятэках, холах універсітэтаў, шпіталях і нават гандлёвых цэнтрах. Мне расказалі, што гэта не надта папулярная падзея. Склалася ўражанне, што, каб завабіць на ўчасткі моладзь, у ліст галасавання ўключаюць розныя піяр-пытанні. Напрыклад: «Ці адмяняць забарону ў нашым штаце 19–21-гадовым знаходзіцца ў барах і клубах пасля 22:00 (але без права ўжываць алкаголь)?» Вядома, адмяняць! — кажа моладзь і заадно галасуе за тых ці іншых лакальных чыноўнікаў.

У штаце Аява падчас майго візіту туды такім гарачым пытаннем была забарона аднаполых шлюбаў, якія колькі гадоў таму дазволілі. Было важна прагаласаваць за тых ці іншых дэпутатаў у сенат штату, каб яны прынялі адпаведнае рашэнне. Дзіўна, але ў самым кансерватыўным штаце краіны дазвол на аднаполыя шлюбы ўвялі раней за Каліфорнію... У Аяве я нават пазнаёмілася з пажылым геем, які вярнуўся на малую радзіму з Сан-Францыска, пасля таго, як лаяльны закон быў прыняты.

У ЗША на храмах розных канфесій можна пабачыць вясёлкавы сцяг і абвестку: «Запрашаем!». У Беларусі Юры Станкевіч піша і выдае раман «П'яўка», які абвяшчаюць «найлепшай кнігай 2010 года». Што праўда, з агаворкай: «Нягледзячы на шавінізм і гамафобію аўтара».

### Падзел улады

Пра Абаму амерыканцы амаль не гавораць. Толькі дзеці і паэты. «А праўда, Абама купаўся з дачкой у Мексіканскім заліве?» — падслухоўваем шасцігадовую дзяўчынку. Барак і Мішэль — модная тэма найноўшай паэзіі. Я нават трапляю на паэтычнае чытанне з кнігі «Сто вершаў на сто першых дзён», дзе паэты з усёй Амерыкі метафарызуюць і абагаўляюць новага лідара нацыі. Паэтам ёсць каго любіць пасля васьмі гадоў Буша. Сімвалічна, што Абама праз шмат год перапынку вярнуў у цырымонію інаўгурацыі чытанне ўрачыстага верша — яго ў 2008 годзе прачытала паэтка Элізабэт Аляксандр. Каб даведацца меркаванні пра Абаму, у амерыканцаў трэба спецыяльна пытацца.

Дзіма ставіцца да абранага дэмакрата з сімпатыяй. Ён кажа, гэта яркая дэманстрацыя таго, што колер скуры больш няважны ў ЗША. Важны твой сацыяльны статус, адукацыя, багацце. Пакуль што ў белага насельніцтва больш выгодны стартавы капітал, але сітуацыя пакрысе мяняецца.

Як здаецца, адзін з самых галоўных абавязкаў прэзідэнта ў ЗША — быць сувенірам. У Сан-Францыска ў кітайскіх лаўках гандлююць мостам Залатая Брама, у Чыкага — галовамі быка, у Вашынгтоне — прэзідэнтам. Я слухмяна і нават з азартам раблю здымкі з кардонным чалавечкам — бо так павінны рабіць турысты.

Перад тым, як працягваць шлях з аэрапорту дадому, па дарозе на паркінг, мы з Дзімам выпадкова апынаемся на плошчы каля Белага Дому. З плошчы адкрываецца перспектыва на Капітолій, у святле ліхтароў тут танчаць танга прыгожыя пары розных рас і ўзростаў. Гэта зроблена нібы на замову — для ілюстрацыі «хвалёных амерыканскіх» свабоды, роўнасці, народнай волі, з якіх, уласна, і складаецца дэмакратыя. Толькі галоўны яе мэсідж, думаю я, сядаючы ў машыну, — што яна базуецца на прыватных рэчах і пачынаецца з чалавека, а не з дзяржавы.

*Імёны герояў артыкула і некаторыя іншыя дэталі зменены праз меркаванні прыватнасці.*

ЦІКАВА

# ПІТ ПАЎЛАЎ І БАРАЦЬБА

Аляксей ХАДЫКА



**У мінскім Палацы спорту 20 лютага завяршыўся розыгрыш Кубка свету па грэка-рымскай барацьбе, у якім узялі ўдзел 10 каманд. Беларуская зборная трыумфальна заваявала трэцяе месца. Але размова не толькі пра спорт.**

За беларусаў у малым фінале пераможна змагаліся Міхаіл Сямёнаў, Аляксандр Кікенеў, Цімафей Дзейнічэнка і Язэп Чугашвілі. Вырашальнай зрабілася апошняя схватка суперцяжаў. Менавіта з такой песняй — «Схватка» — Піт Паўлаў адчыняў турнір, выконваючы яе ў перапоўненай зале палаца проста ў цэнтры барцоўскага дывана. Яна ж гучала і на закрыцці турніру.

Пры чым тут знаны лідар-гітарыст гурта N.R.M. Піт Паўлаў і барацьба — спытаецеся вы. А справа вось у чым: мала хто ведае, але напачатку 1980-х, перад паступленнем у Мінскі радыётэхнічны інстытут, Піт паспяхова займаўся "класікай", беручы першыя месцы на чэмпіянатах горада, прызы — на рэспубліканскіх першынствах, і ўдзельнічаў у агульнасаюзных спаборніцтвах. Потым пытанне стала рубам: вучоба або спорт, і навука перамагла, а пазней яго захапіла музыка.

І вось вяртанне да захапленняў юнацтва: «Гэта вынік маёй паспяховай музычнай кар'еры, — заўважае Піт, — у спалучэнні з добрымі стасункамі ў спартовым асяроддзі».

Задача, якую вырашае Піт Паўлаў, не зводзіцца да простага выканання музычнай кампазіцыі перад спаборніцтвамі: ён прыйшоў як іх своеасаблівы рэжысёр, вызначаючы стыль прэзентацыі і афармленне залы. І прывёў з сабой новы каментатарскі «голас» — спевака і музыку Аляксандра Памідорава. Яны дэбютавалі два месяца таму на барцовых спаборніцтвах імя Караваева. З залы зніклі нафталінавыя саўковадажынкавыя букеты, з фанаграм — розныя «развітанні славянак», прыбавіўся строгі і выразны спартовы дызайн, дынамізм музычнага, пераважна «металічнага» аздаблення і экспрэсіўнае выкарыстанне асвятлення на ўрачыстых цырымоніях. Карацей, у вобраз спаборніцтва прыйшоў сучасны мастацкі дух.

Вядома, што алімпійскі спорт пачынаўся менавіта з барацьбы, папросту ў апошнія стагоддзе непаўторная атмасфера барцоўскіх цыркаў саступіла ў відовішчнай прывабнасці сучасным футболу і хакею. А цікаўнасць да барацьбы, мяркуе Піт, трэба вяртаць не толькі таму, што гэты від спорту нашмат дэмакратычней затратных гульнявых спаборніцтваў: дастаткова пасласць дыван — і, калі ласка, займайся ўдасканаленнем фізічнай формы і змагарнага духу. Але ж і славу беларускаму спорту прыносяць менавіта барцы: са шматлікіх сусветных спаборніцтваў ад Алімпійскіх гульняў да чэмпіянатаў свету і кантыненту беларусы рэгулярна прывозяць узнагароды розных проб.

Наша размова не магла не закрануць музычных навін, героем якіх рэгулярна з'яўляецца Піт Паўлаў. Ён паведаміў, што не збіраецца сыходзіць у цень, плённа працуе над новым дыскам. Прэзентаваная на спартовых спаборніцтвах кампазіцыя «Схватка» (якая і пра барацьбу, і пра тое, што жыццё — само па сабе змаганне) таксама з новых твораў.

АГЛЯД

# НОВЫЯ ВЫСТАВЫ

Аляксей ХАДЫКА





**У лютым цалкам абнавіліся экспазіцыі Музея сучаснага мастацтва, прыняўшы адначасова тры выставы.**

Першая з іх, «Казюкі», якая працуе па 6 сакавіка, аматарам беларускага мастацтва адразу прыгадае славуты твор жывапісца XIX стагоддзя Кануцыя Русецкага «Літоўка з вербамі». Менавіта вобраз каляровых плеценых вербаў, (сімвал хуткага свята каталіцкага святога Казіміра і звязанага з гэтай падзеяй вясёлага віленскага кірмашу «Казюкаў») зрабіўся крыніцай натхнення майстроў вырабу з лямцу, якія прадставілі ў музеі свае творы.




Як і трэба было чакаць, праект, што адштурхоўваецца ад ці не найбольш адметнай з'явы народнага мастацтва Віленшчыны, аб'яднаў беларускіх мастакоў з літоўскімі. Таварыства аматараў лямцу «Белыя вароны» пры падтрымцы Літоўскай амбасады ў Беларусі запрасіла да ўдзелу ў экспазіцыі літоўскіх майстрых: Інгу Самушэне, Даната Думчувене, Юргіту Міганене, Брыгіту Ракаўскене і Рэнату Краус. Апошнія прадставілі разнастайныя аксесуары і прадметы адзення, стылёва выробленыя з лямцу. Беларуская ж частка выставы напоўнена прадметамі, якія непасрэдна апелююць да формаў і колераў традыцыйных вербаў, толькі выкананых з той жа лямцавай матэрыі. Атрымліваецца сапраўднае свята колеру і дызайну.

У вялікай дольнай зале па 4 сакавіка можна пазнаёміцца з работамі творцаў дэкаратыўна-ўжытковага мастацтва пад агульным тытулам «Цаца ёсць цаца». Разам сабраныя габелены, ткацтва і кераміка сямі аўтараў — Тамары Васюк, Наталлі Сухаверхавай, Алы Непачаловіч, Максіма Калтыгіна, Алега Ткачова, Вольгі Рэднікінай, Уладзіміра Лісавенкі. Стрыжань, што яднае іх паводле творчай дэкларацыі, — «агульная ідэя захаплення разнастайнасцю прыгажосці навакольнага сусвету». "Цаца" — гэта народнае вызначэнне «прыгожага». Уласна і сваю эстэтычную канцэпцыю мастакі выбудоўваюць, адштурхоўваючыся ад першаснай народнай эстэтыкі простых рэчаў і простых матэрыялаў. Таму побач з амаль традыцыйнымі прадметамі ганчарства і ткацтва яны паказваюць пераўвасобленыя, насычаныя сучасным мастацкім мысленнем экспанаты. Яны дэкларуюць — глядзіце, старажытныя паганскія багіні Цаца (Цёця), Ляля (Лёля) нашымі намаганнямі пачынаюць ажываць у сучасным свеце. І быццам бы замыкаюць у кола вечнасці розныя эпохі.

Нарэшце, па 13 сакавіка ў малой верхняй зале можна пазнаёміцца з персанальнай выставай Таццяны Гардашнікавай «Гульня ў коткі». Мастачка працуе ў галіне жывапісу, плакату, кніжнай ілюстрацыі, дызайну, з'яўляецца дыпламантам конкурсаў «Мастацтва кнігі». Гэтым разам яна прадстаўляе 25 палотнаў, прысвечаных «аўтарскай інтэрпрэтацыі ўспрымання сутнасці катоў і котак».

ФЭСТ

# ПЕРАМАГЛІ ІРАНЦЫ

Андрэй РАСІНСКІ

**Міжнародны кінафестываль у Берліне, які завяршыўся 20 лютага, пацвердзіў сваю рэпутацыю палітызыванага форуму.**

«Залаты мядзведзь» Берлінскага кінафэсту адышоў іранскаму фільму «Надзін і Сімін, развод». Фільм Асхара Фархадзі распавядае пра сям'ю, што распадаецца, але, каб скасаваць шлюб, героі праходзяць выпрабаванне іранскай бюракратыяй. Лепшая мужчынская і жаночая роля таксама дасталіся гэтай карціне. Сябра журы — іранскі рэжысёр Джафар Панахі — у цырымоніі не ўдзельнічаў, бо на радзіме асуджаны на шэсць гадоў вязніцы.

Гран-пры атрымаў венгерскі класік Бэла Тар за нешматслоўную чорна-белую стужку «Турынскі конь». Карціна Ульрыка Кюлера «Сонная хвароба» пра герояў, якія лечаць афрыканскіх абарыгенаў, узяла «Срэбнага мядзведзя» за рэжысуру.

Карціна Аляксандра Міндадзэ «У суботу» — пра Чарнобыльскую катастрофу — прэмій не атрымала.

КІНО

# ПРА БЯСПЛЁННУЮ МІТУСНЮ

Андрэй КРЫНІЦЫН

**Карціна Вудзі Алэна «Ты сустрэнеш таямнічага незнаёмага» распавядае пра заблытана-легкадумныя сямейныя мітрэнгі, ускладненыя дурнымі прароцтвамі і чалавечым глупствам. Дзве зорачкі з пяці.**

Ад Гелен сыходзіць муж і стварае сям'ю з былой прастытуткай. Гераіня суцяшаецца прароцтвамі гадалкі — і не заўважае праблемаў уласнай дачкі. Сям'я дачкі таксама развальваецца: муж уцякае да прывабнай суседкі.

Карціна Вудзі Алэна — ілюстрацыя шэкспіраўскай фразы пра бязладнасць жыцця, што «распавядаецца ідыётам». Героі — у выкананні Энтані Хопкінса, Наомі Уотс, Джоша Броліна — спрачаюцца, сварацца, падманваюць адзін аднаго і не бачаць уласнага глупства. Яны цешацца падступнымі ілюзіямі і з іранічнаю лёгкасцю марнуюць жыццё.

Але фільм Вудзі Алэна занадта лёгкі, амаль незапамінальны. Ён выглядае прахадным — для самога майстра, і занадта тонкім — для аматараў найпрасцейшых камедый.

Новы Час
Агульнапалітычная штотыднёвая газета
Выдаецца з сакавіка 2002 г.
Галоўны рэдактар
Кароль Аляксей Сцяпанавіч

Зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі РБ. Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 206 ад 20 ліпеня 2009.

**ЗАСНАВАЛЬНІК:** Мінская гарадская арганізацыя ГА ТБМ імя Ф.Скарыны. Адрас: 220005, г. Мінск, вул. Румянцава, 13. Тэл.: 284—85—11.

**ВЫДАВЕЦ:** Прыватнае выдавецкае унітарнае прадпрыемства «Час навінаў». Пасведчанне №64 ад 12.01.2007 г.

**АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАЎЦА:**
220113, г. Мінск, вул. Мележа, 1-1234.
Тэл.: +375 29 651 21 12, +375 17 268 52 81
novychas@gmail.com; www.novychas.org

**НАДРУКАВАНА** ў друкарні УП «Плутас-Маркет». г. Мінск, вул. Халмагорская, 59 А.

Замова № 202

Падпісана да друку 25.02.2011. 8.00.
Наклад 7000 асобнікаў. Кошт свабодны.

Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.
Пры выкарыстанні матэрыялаў газеты спасылка на «Новы Час» абавязковая.
Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе мастацкія творы. Чытацкая пошта публікуецца паводле рэдакцыйных меркаванняў.